Пол Вэкслер

ГІСТАРЫЧНАЯ ФАНАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ



Пол Вэкслер

ГІСТАРЫЧНАЯ ФАНАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ

Мінск 2004

HISTORICAL PHONOLOGY OF THE BELORUSSIAN LANGUAGE

BY PAUL WEXLER

HEIDELBERG
CARL WINTER • UNIVERSITÄTSVERLAG
1977

Пол Вэкслер

ГІСТАРЫЧНАЯ ФАНАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЕ МОВЫ

Пераклад з англійскай

МІНСК
ВЫДАВЕЦ І. П. ЛОГВІНАЎ
2004

УДК 811.161.3'344
ББК 81.2 Бел-1
В 97

Пераклад з англійскай мовы А. Літвіноўскай, М. Раманоўскага
Навуковы рэдактар перакладу праф. Г. Цыхун

Пераклад зроблены па выданні:
Wexler, Paul. A historical phonology of the Belorussian language. – 1. Aufl. Heidelberg: Winter, 1977. – (Historical phonology of the Slavic languages; 3)
ISBN 3-533-02575-6
ISBN 3-533-02576-4

Вэкслер П.
В 97 Гістарычная фаналогія беларускае мовы / Пол Вэкслер; Пер. з англ. А. Літвіноўскай, М. Раманоўскага; Навук. рэд. пер. Г. Цыхун. – Мн.: Выд. Логвінаў, 2004. – 254 с.

ISBN 985-6701-41-4

Манаграфія Пола Вэкслера дае найбольш поўны агляд асноўных фанетычных працэсаў у развіцці беларускай мовы ад праславянскага стану да нашых дзён. Улічаны сведчанні старабеларускіх пісьмовых помнікаў (кірылічна-, лацінічна- і арабскаграфічных), а таксама шэрагу габрайскамоўных крыніц. Шырока асвятляюцца факты гісторыі беларускае літаратурнае і народна-дыялектнае мовы.

Кніга прызначаецца для спецыялістаў-мовазнаўцаў, студэнтаў-філолагаў, для кожнага, хто цікавіцца гісторыяй і развіццём беларускае мовы ў яе сувязях з іншымі славянскімі і неславянскімі мовамі.

УДК 811.161.3'344
ББК 81.2 Бел-1

Кніга выдадзеная пры падтрымцы
Аўтара,
Беларускага дабрачыннага фонду ў Вялікай Брытаніі,
Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва.

ISBN 985-6701-41-4 (бел.)
ISBN 3-533-02575-6 kart. (англ.)
ISBN 3-533-02576-4 Lw. (англ.)

© 1977 Carl Winter Universitätsverlag, gegr. 1822, GmbH. Heidelberg
© Літвіноўская А., Раманоўскі М., пераклад на беларускую мову, 2004
© Выданне на беларускай мове, афармленне. Выдавец І. П. Логвінаў, 2004

Змест

Генадзь Цыхун. Прадмова да беларускага выдання 9
Прадмова 13
1. Словы ўдзячнасці 13
2. Структура кнігі 13
Скарачэнні 15
Дыякрытычныя ды іншыя знакі 22

ЧАСТКА I

1. Стан гістарычнае фаналогіі беларускае мовы 23
2. Крыніцы дадзеных 27
Табліца 1. Крыніцы дадзеных 28
2.1. Тэксты 29
2.1.1. Праблемы інтэрпрэтацыі графічных сістэм беларускае мовы 29
2.1.1.1. Царкоўнаславянская мова ў Беларусі 33
Табліца 2. Беларускае дзвюхмоўе 35
Выбраная бібліяграфія старабеларускіх тэкстаў, пісаных кірыліцаю і лацініцаю 37
2.1.1.2. Беларускія матэрыялы некірылічным пісьмом 49
2.1.1.2.1. Беларускія матэрыялы цюркска-арабскім пісьмом 50
2.1.1.2.2. Беларускія матэрыялы габрайскім пісьмом 53
2.2. Тапонімы 56
2.3. Картаграфія гукавых зменаў у беларускай мове 60
2.3.1. Дыялектная геаграфія беларускае мовы 60
2.3.2. Дзвюхмоўная дыялекталогія 64
3. Мадэлі эвалюцыі ад праславянскае да беларускае мовы 69
Табліца 3. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Шахматава 71
Табліца 4. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Дурнаво 72
Табліца 5. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Лер-Сплавінскага і Трубяцкога 72
Табліца 6. Ад старажытнарускае да старабеларускае мовы 74
Табліца 7. Перагрупаванне ўсходнеславянскіх гаворак да XV–XVI стст. паводле Шавялёва 75
Карта прабеларускіх гаворак 77
Табліца 8. Назвы для гаворак, што бралі ўдзел у фармаванні беларускае мовы 78

ЧАСТКА II

4. Гістарычныя гукавыя змены 87
Табліца 9. Перыядызацыя гукавых зменаў 87
4.1. Сістэма фанем позняе праславянскае мовы 90
5. Дапісьмовы перыяд прабеларускіх гаворак: кіеўска-палеская і полацка-разанская дыялектныя групы з VI да XII ст. 90
Змены 1–34.
Змена 1. Другая рэгрэсіўная палаталізацыя (змякчэнне) заднепаднябенных 90
Табліца 10. Зрэз 1С. Сістэма зычных гукаў прабеларускае мовы да і пасля другое палаталізацыі заднепаднябенных 94
Змена 2. Развіццё насавых галосных 95
Змена 3. Страта спалучэнняў з *j*, I 95
Змена 4. Трэцяя (прагрэсіўная) палаталізацыя заднепаднябенных 99
Змена 5. Спрашчэнне спалучэнняў *tl*, *dl* не ў пачатку слова; замена ў дыялектах *tl*, *dl* на *kl*, *gl* 101
Змена 6. Дэлабіялізацыя агубленых галосных, I: $\bar{u}_1 > \bar{y}$ 103
Табліца 11. Зрэз 2V. Да і пасля дэлабіялізацыі $*\bar{u}_1$ 104
Змена 7. Дэлабіялізацыя (і палярызацыя) агубленых галосных, II: $_{o}\bar{a}$ 104
Табліца 12. Рэфлексы $_{o}\bar{a}$ ў прабеларускіх гаворках 105
Табліца 13. Зрэз 3V. Прабеларуская сістэма галосных гукаў у сярэдзіне IX ст. 105
Змена 8. Метатэза ў OSC-групах і поўнагалоссе ў COSC-групах 113
Табліца 14. Параўнанне рэфлексаў праславянскіх поўнагалосных групаў у прабеларускіх (полацка-разанскіх) дыялектах і сучаснай беларускай літаратурнай мове 118
Змена 9. Дэлабіялізацыя агубленых галосных, III і развіццё рэдукаваных 120
Табліца 15. Заднія агубленыя галосныя верхняга ўздыму з VI да IX ст. 123
9.1. Абагульненне прабеларускіх зменаў VIII–IX стст. 123
Табліца 16. Зрэз 4V. Прабеларуская сістэма галосных к IX ст., пасля развіцця рэдукаваных 124
Змена 10. Развіццё групаў С*ъr*С, С*ъl*С, С*ьr*С; С*il*С > С*ъl*С > С*óи*С/С*аи*С 124

Змена 11. Скарачэнне галосных 126
Змена 12. Развіццё *е* і новага *о* з *ѣа* 127
Змена 13. Спірантызацыя *g* 130
Змена 14. Леніцыя (аслабленне) *ʒ' > ź'* і *ʒ' > z'* 137
Змена 15. Страта насавых галосных 138
Табліца 17. Зрэз 5V-С. Прабеларуская сістэма зычных і галосных гукаў к X ст. 142
Змена 16. Статус мяккіх зычных у прабеларускіх дыялектах X ст., I 143
Змена 17. Змешванне ў гаворках свісцячых з шыпячымі 145
Табліца 18. Зрэз 6С. Прабеларуская сістэма зычных у канцы XI ст. 148
Змена 18. Лабіялізацыя (агубленне) *е, ь > о*, II і статус палаталізацыі, II 149
Табліца 19. Стадыі агублення *е, ь > о* 151
Змена 19. Утварэнне ў дыялектах дыфтонгаў у новазакрытых складах 158
Змена 20. Развіццё *ě* 161
Табліца 20. Паглынанне $ě_8$ ў прабеларускіх гаворках 163
Табліца 21. Зрэз 7V. Сістэма галосных прабеларускае мовы ў канцы XII ст., пасля паглынання $ě_8$ 165
Змена 21. Страта рэдукаваных 166
Змена 22. Страта фанемнага статусу гуку *у*; палаталізацыя перад пярэднімі галоснымі, III 170
Табліца 22. Зрэз 8V. Прабеларуская сістэма галосных пасля страты *у* 172
Змена 23. Статус апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці ў сярэдзіне слова перад зычнымі і на канцы слова, IV 172
Змена 24. Узнікненне і захаванне морфафанемных чаргаванняў V||# 173
Змена 25. Узнікненне і трансфармацыя новых збегаў зычных: выпадзенне зычнага, устаўка галоснага, прыпадабненне і распадабненне зычных, падвойныя цвёрдыя і мяккія зычныя 175
Змена 26. Дыялектнае аглушэнне зычных у сярэдзіне і на канцы слова 180
Змена 27. Развіццё прыстаўных галосных у дыялектах 184
Змена 28. Развіццё перадвакальных *v* і *v'* з гукаў *w* і *w'*; чаргаванні *w||u, j||i* 186
Змена 29. Ацвярдзенне губных 189
Змена 30. Развіццё мяккіх заднепаднябенных у пазіцыі перад галоснымі 192
Змена 31. Развіццё якання і дыялектнага дысіміляцыйнага акання 194

Змена 32. Страта спалучэнняў з *j*, II і развіццё падвойных мяккіх зычных у гаворках 197
Змена 33. Ацвярдзенне *р'*, *р̄'* 201
Змена 34. Ацвярдзенне простых і падвойных зазубных зычных і *с'*, *с̄'* 204
Табліца 23. Зрэз 9С. Прабеларуская сістэма зычных пад канец XII ст. 208
6. Пісьмовы перыяд прабеларускіх дыялектаў ад XIII да XV ст. Змены 35–39 209
Змена 35. Страта поствакальнага *j* 209
Змена 36. Ацвярдзенне *с̄'*, *с̄'* 210
Змена 37. Пашырэнне прыстаўных зычных 210
Змена 38. Ацвярдзенне *с'*, *с̄'* 215
Змена 39. Развіццё новых *g*, *g'* праз запазычаныя словы 215
Табліца 24. Зрэз 10С. Прабеларуская сістэма зычных на пачатак XV ст. 216
7. Перыяд беларускае мовы ад XV ст. да сучаснасці. Змены 40–51 216
Змена 40. Развіццё *ы* і *і* пасля *р*, *л* паміж зычнымі 216
Змена 41. Вакалізацыя *л* (> *ў*) на канцы слова і перад зычнымі 218
Змена 42. Развіццё ў дыялектах *ф*, *ф'* праз запазычаныя словы 220
Змена 43. Афрыкатызацыя *т'*, *д'* > *ц'*, *ʒ'* 223
Змена 44. Развіццё цвёрдага *ʒ* і новага *ʒ́* 230
Змена 45. Пераход у дыялектах *о* (*а*) у *у*, найперш у атачэнні губных 232
Змена 46. Статус апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці, V: перад *е* 233
Змена 47. Развіццё ў дыялектах дыфтонгаў пасля губных; агубленне ў дыялектах *ы* > *у* пасля губных 234
Змена 48. Пазіцыйнае ацвярдзенне *л'* (> *л*) 234
Змена 49. Дыялектная лабіялізацыя *аў* (> *оў*) 234
Змена 50. Пашырэнне дыфтонгаў у дыялектах на гістарычна неапраўданыя пазіцыі 235
Змена 51. Развіццё поствакальнага *іу* > *іў* 235
Табліца 25. Зрэз 11С-V. Беларускія сістэмы зычных і галосных у XVI ст. 235
8. Абагульненне. Сучасныя беларускія фаналагічныя сістэмы ў іх гістарычнай перспектыве: працэсы, якія адбываліся пасля XVII ст. 236

Паказальнік беларускіх слоў і выразаў 244
Паказальнік сегментаў 251

ПРАДМОВА
да беларускага выдання

Прапанаваны пераклад класічнай працы Пола Вэкслера дае падставы сцвярджаць, што кніга не састарэла і праз чвэрць стагоддзя захоўвае сваю навуковую вартасць. Тым больш, што з часоў грунтоўных "Беларусаў" Я. Карскага ў беларускім мовазнаўстве не было зроблена захадаў, каб даць поўнае сістэматызаванае апісанне гісторыі развіцця гукавога складу беларускай мовы. Бліжэй за ўсё да вырашэння гэтай задачы ў свой час падышлі Пятро Бузук і Язэп Воўк-Левановіч. Першы з іх у сваёй працы "Спроба гісторыі дагістарычнай эпохі славянскай фонэтыкі"[1] зрабіў абгрунтаванне навуковай канцэпцыі, якая магла б скласці трывалы падмурак для гістарычнай фанетыкі беларускай мовы, аднак прапанаваная ім храналагічная табліца старажытнаславянскіх гукавых зменаў абмяжоўвалася X стагоддзем. Накіды гісторыі развіцця гукавога складу на аснове распрацаванай канцэпцыі былі зроблены ў дакладзе П. Бузука "Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў" на Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі ў 1926 г. Увесь пафас таго даклада адлюстроўваўся ў наступных высновах:

> *...утварэньне беларускай мовы, г. зн. узьнікненьне галоўных фонэтычных і морфолёгічных зьяў, характэрных для большасьці беларускіх дыялектаў, а таксама для бел. літаратурнай мовы, у XIII–XIV стал. было скончана, г. зн. прыблізна тады, калі сфармаваліся і іншыя славянскія мовы. Гаворачы аб гісторыі разьвіцьця кардынальных асаблівасьцяў, мы зусім не адчувалі патрэбы для высьвятленьня гэтага разьвіцьця ў гіпотэзе прарускай мовы*[2].

З крыху больш традыцыйных пазіцый падышоў да вырашэння пастаўленай задачы Я. Воўк-Левановіч у сваіх "Лекцыях па гісторыі беларускай мовы", размножаных коштам аўтара ў 1927 г. і перавыдадзеных друкарскім спосабам у наш час.

Дапускаючы, следам за А. Шахматавым, магчымасць усходнеславянскай прамовы, ён сцвярджаў:

---

[1] Запіскі Аддзелу гуманітарных навук. Працы клясы філёлёгіі // Інстытут беларускай культуры. Т. 1. Кн. 2. Мн., 1928. С. 1–44.

[2] Працы Акадэмічнае конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі // Інстытут беларускай культуры. Мн., 1927. С. 86.

Арыгінальнасць беларускай, як і ўсякай іншай мовы, характарызуецца прысутнасцю ў ёй сваёй, толькі ёй адной належнай арыгінальнай камбінацыі гэтых паасобных, агульных з іншымі славянскімі мовамі, рыс[1].

На жаль, распачатая названымі вучонымі айчынная традыцыя вывучэння паходжання і развіцця фанетычнай сістэмы беларускай мовы была гвалтоўна перапынена ў 1930-я гг. Праўда, па-за межамі БССР яна яшчэ нейкі час працягвалася, напр., у агляднай працы Яна Станкевіча "Месца беларускага языка сярод іншых славянскіх языкоў і час яго ўзьніку"[2]. Разгледзеўшы 35 фанетычных і 8 марфалагічных з'яваў, якія аб'ядноўваюць беларускую мову з іншымі славянскімі мовамі, ён следам за сваім настаўнікам, вядомым чэшскім вучоным О. Гуерам, прыходзіць да высновы, што на падставе гэтых фактаў нельга будаваць іерархіі славянскіх моваў, і канстатуе:

Дык у першых стагодзьдзях па Хрысту беларуская мова беспасярэдне з праславянскага языка разьвілася ў вапрычоны беларускі (начай званы крывіцкім) язык[3].

Выдадзеныя ў 1950-х гг. "Нарысы па гісторыі беларускай мовы" (Мн., 1957) уяўлялі ўсяго толькі сціслую кампіляцыю афіцыйных поглядаў пераважна расійскіх вучоных на некаторыя традыцыйныя праблемы гістарычнай фанетыкі беларускай мовы. Яшчэ больш сціслa, а часам і недакладна (пра што пісалі П. Вэкслер і В. Віткоўскі) падаюцца звесткі з фанетыкі і фаналогіі ў існуючых гістарычных граматыках беларускай мовы[4]. Таму з'яўленне ў свой час кнігі П. Вэкслера стала значным дасягненнем на шляху асэнсавання заканамернасцяў развіцця гукавога ладу нашай мовы. Сімптаматычна, што за гэтую працу на прапанову Юрыя Шавялёва (Шэраха) узяўся даследчык, які вельмі добра быў знаёмы з сітуацыяй у беларускім і ўкраінскім мовазнаўстве

---

[1] О. В. Воўк-Левановіч. Лекцыі па гісторыі беларускай мовы. Мн., 1994. С. 204.

[2] Родная мова. Вільня, 1930. №5. С. 97–109.

[3] Я. Станкевіч. Збор твораў: У 2 т. Мн., 2002. Т. 1. С. 234.

[4] Гл., напр.: Ф. М. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы. Выд. 3, выпраўленае. Мн., 1989; T. Rott-Żebrowski. Gramatyka historyczna języka białoruskiego. Lublin, 1992.

да пагрому ў канцы 1920-х гг. і пазней[1], што дало аўтару магчымасць працягнуць, гэтым разам – за межамі Беларусі, традыцыю спасціжэння глыбінных працэсаў, у выніку якіх была сфармавана фаналагічная сістэма сучаснай беларускай мовы.

Кніга П. Вэкслера падрыхтавана і выдадзена як трэцяя пазіцыя ў рамках серыі "Гістарычная фаналогія славянскіх моваў", заснаванай выдатным украінскім і амерыканскім славістам Юрыем Шавялёвым (George Y. Schevelov), і грунтуецца на адзіных універсальных прынцыпах, распрацаваных для ўсёй серыі. Разам з тым параўнанне асобных кніг, выдадзеных у гэтай серыі, сведчыць, што кожны з аўтараў падыходзіў творча да рэалізацыі пастаўленай задачы, што тлумачылася, з аднаго боку, яго папярэднім навуковым досведам і, з другога боку, непаўторным лёсам кожнай з славянскіх моваў. У гэтым плане манаграфія П. Вэкслера несумненна нясе на сабе адбітак яркай індывідуальнасці аўтара і яго навуковых зацікаўленняў. Гэта відаць, у прыватнасці, з шырокага выкарыстання ў якасці крыніц матэрыялу т. зв. некірылічных запісаў (перш за ўсё цюркска-арабскіх і габрайскіх) і дзвюхмоўнай дыялекталогіі, а таксама з паўсюднага ўліку сацыяльных фактараў. Пераважна ўкраіністычны ўхіл папярэдніх заняткаў аўтара адбіўся, відаць, на катэгарычнасці аднясення палескіх гаворак на тэрыторыі Беларусі да ўкраінскай мовы, што традыцыйна назіраецца ва ўкраінскай дыялекталогіі яшчэ з часоў К. Міхальчука. Між тым, як паказаў Ю. Шавялёў, трансфармацыя ў нацыянальныя мовы пасляпляменных рэгіянальных моўна-тэрытарыяльных адзінак Усходнееўрапейскай раўніны, умоўна названых ім Наўгародска-Цвярскім (НЦ), Полацка-Смаленскім (ПС), Мурамска-Разанскім (МР), Кіеўска-Палескім (КП) і Галіцка-Падольскім (ГП) рэгіёнамі, адбывалася не шляхам механічнага падзелу ("без рэшты") першапачатковага адзінства на "генетычныя" часткі, а своеасаблівым "перараскладаннем" названых моўна-тэрытарыяльных рэгіёнаў, у выніку якога ўзніклі новыя адзінствы. У сваёй працы "Чому общерусский язык, а не вібчоруська мова? З проблем східнослов'янської глотогонії" Ю. Шавялёў праілюстраваў

[1] Гл. яго папярэднюю кнігу: P. Wexler. Purism and Languge. A Case Study in Modern Ukrainian and Belorussian Nationalism (1840–1967). Bloomington, 1974.

гэты працэс наступнай схемай (якая, дарэчы, адрозніваецца ад той, што змешчана ў кнізе на с. 76, большай паўнатой і дэталізаванасцю)[1]:



Адносна Кіеўска-Палескага рэгіёну ён заўважае:

Власне внаслідок поступового ширення "литовських", себто в суті речі протобілоруських рис і інновацій, з одного боку, і києво-подільско-галицьких, з другого, терен КП регіону звужувався, і з півдня, і з півночі відбувалося розмивання поліського ядра. Коли факт входження до протобілоруської мови на півночі і до протоукраїнської мови на півдні став наявним, в осередку поліських говірок виник термін-самоозначення тутейші *(тутэйшыя), себто ті, що "тут" споконвічні і опираються обом експансіям – з півночі і з півдня.*

Не цяжка заўважыць, што канцэпцыя Ю. Шавялёва, якую прымае ў агульных рысах і аўтар гэтай кнігі, у шырокім плане працягвае канцэпцыю П. Бузука і з'яўляецца спробай адысці ад чыста генетычнай ("прамоўнай") схемы фармавання ўсходнеславянскіх моваў у кірунку арэальна-генетычным ці нават арэальна-тыпалагічным (напр., у плане балта-славянскіх адносін), што адпавядае агульнай для сучаснай лінгвістыкі тэндэнцыі пераадолення схематызму аднабаковых падыходаў, якія бяруць пачатак ад "радаводнага дрэва" А. Шляйхера ці "хвалевай тэорыі" Ё. Шміта. Празрыстая сістэмная і храналагічная ўпарадкаванасць зменаў, што назіраліся ў развіцці фаналагічнага ўзроўню беларускай мовы, сведчыць, што такі падыход, рэалізаваны ў кнізе, дае магчымасць у найбольш поўным і кампактным выглядзе ўзнавіць гісторыю працэсаў, што адбываліся на працягу VI–XVII стст.

Пры перакладзе кнігі была зроблена спроба захаваць непаўторны характар аўтарскага выкладу, хоць і не заўсёды гэтага ўдалося дасягнуць. Для нашага чытача можа падацца нязвыклым навуковы стыль П. Вэкслера, які спалучае ў сабе цвёрдую лагічнасць разгляду фанетычных працэсаў з вольнымі аўтарскімі каментарамі – своеасаблівымі "абертонамі" ў дачыненні да "чыстага тону", што надае выкладу поліфанічнае гучанне. Перакладчыкі і навуковы рэдактар не дазвалялі са-

[1] Другий Міжнародний конгрес україністів: Доповіді і повідомлення. Мовознавство. Львів, 1993. С. 60.

бе ўмяшання ў змест кнігі. Адзінай "інтэрвенцыяй", якая была зроблена са згоды аўтара, стала папаўненне выбранай бібліяграфіі да асобных раздзелаў кнігі некаторымі пазіцыямі, што маюць беспасярэдняе дачыненне да абмяркоўваных праблем і былі апублікаваны пасля 1976 г. (падаюцца ў курсіўных прастакутных дужках). Пераважна гэта манаграфічныя даследаванні па беларусістыцы, надрукаваныя ў Беларусі. У кнізе ў асноўным захавана аўтарская сістэма падачы бібліяграфічных крыніц і спасылак, што не заўсёды адпавядае стандартам, прынятым у Беларусі.

Мяркую, што кніга П. Вэкслера, выдадзеная па-беларуску, паспрыяе павышэнню ўзроўню даследаванняў гісторыі беларускай мовы ў Беларусі і выкліча цікавасць да праблематыкі ў шырокага чытача.

Генадзь Цыхун

ПРАДМОВА

1. Словы ўдзячнасці. Гэтае даследаванне рабілася часткова ў бібліятэках Вашынгтонскага і Гарвардскага універсітэтаў, Брытанскага музея, Тэль-Авіўскага і Габрайскага універсітэтаў, у Нью-Ёркскай публічнай бібліятэцы і Нацыянальнай бібліятэцы ў Парыжы; супрацоўнікі гэтых устаноў заслужылі на тое, каб спамянуць іх тут. Я асабліва ўдзячны бібліятэкарам Інстытута славянскіх даследаванняў у Парыжы і бібліятэкі Хельсінскага універсітэта. А. Адамовіч прачытаў увесь рукапіс кнігі і зрабіў шмат карысных заўваг. Таксама я дзякую біскупу Ч. Сіповічу і айцу А. Надсану за тое, што яны дазволілі мне карыстаць з Беларускае бібліятэкі імя Францыска Скарыны ў Лондане. Г. Т. дапамог мне здабыць мікрафільмы артыкулаў з савецкіх часопісаў, не вельмі даступных на Захадзе. Хацелася б выказаць удзячнасць Тэль-Авіўскаму універсітэту за яго шчодрую грашовую падмогу, якая дазволіла мне скончыць даследаванне ў Еўропе і Амерыцы ўлетку 197! г. Выданне гэтае кнігі шчодра фундавалі Тэль-Авіўскі універсітэт, Беларускі дабрачынны фонд у Лондане і біскуп Ч. Сіповіч. Але найперш я хачу падзякаваць Юрыю Шавялёву, рэдактару серыі, за ягоныя парады на розных этапах напісання працы.

2. Структура кнігі. Кніга складаецца з дзвюх частак. У першай (раздзелы 1–3) разбіраецца колькі метадалагічных праблем, з якімі мы спатыкаліся ў часе даследавання, а таксама змяшчаюцца прапановы для далейшага даследавання. У другой частцы (раздзелы 4–8) апісваецца фаналагічная сістэма беларускае мовы ў яе развіцці ад распаду праславянскае мовы да нашых дзён. Такая структура дазваляе чытачу разглядаць асобныя праблемы даследавання і дадзеныя незалежна.

Змешчаныя пасля большасці раздзелаў кнігі выбраныя бібліяграфіі забяспечаць чытача літаратурай на разгляданыя тэмы. У самім тэксце спасылкі калі і падаюцца, дык толькі пад прозвішчам аўтара. Тэмы, якія традыцыйна ігнаруюць у звычайных падручніках і бібліяграфічных даведніках, асвятляюцца намі больш поўна. Бібліяграфія падаецца ў храналагічным парадку, акрамя публікацый тэкстаў, размешчаных у алфавітным парадку. Назвы беларускіх кніг, выдадзеных у Заходняй Беларусі перад Другой сусветнай вайной і ў паваенны час беларускаю эміграцыяй, што не адпавядаюць сучасным савецкім правапісным нормам, а таксама назвы беларускіх выданняў XIX – пачатку XX ст., надрукаваных польскай лацініцай, пакінуты без зменаў. Мы таксама захоўваем арыгінальны правапіс беларускіх назваў да 1933 г., а не мадэрнізуем іх у адпаведнасці з афіцыйнай правапіснай рэформай 1933 г. Назвы на ўсіх іншых мовах падаюцца ў іх сучаснай звычайнай форме, апроч назваў артыкулаў, пісаных іўрытам і ідышам, якія перакладаюцца ў беларускую і змяшчаюцца ў квадратных дужках. Пасля назвы даецца памета *іўр.* – для тэкстаў на іўрыце і *ід.* – для тэкстаў на ідышы. Беларускія назвы паселішчаў падаюцца ў тэксце ў іх сучаснай афіцыйнай форме, але ў выпадку з балцкімі раёнамі, гістарычна звязанымі з беларускаю моўнаю тэрыторыяй, якія цяпер знаходзяцца па-за граніцамі БССР, мы аддаем перавагу беларускім назвам паселішчаў перад формамі, прынятымі ў іншых нацыянальных мовах. Так, напр., сталіца Літвы падаецца як Вільня ў самім тэксце і ў публікацыях да 1939 г. і як Вільнюс – у публікацыях пасля 1939 г. *[...]*

Тэль-Авіўскі універсітэт, 1974

СКАРАЧЭННІ

1. Часта цытаваныя перыёдыкі, серыі і кнігі

Акты — *Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов.* Вильня, 1865–1915.

АОИЗР — *Акты, относящиеся к истории Западной России.* Санкт-Петербург, 1846–1853.

Белорусы — Е. Карский. *Белорусы. Язык белорусского народа* 1. Москва, 1955; 2–3, 1956.

ВДВЯ — *Вопросы диалектологии восточнославянских языков.* Москва, 1964.

Весці — *Весці Акадэміі Навук БССР. Серыя грамадскіх навук.* Мінск, 1956 {і наступныя}.

ВЗР — *Вестник Западной России.* Вильня, 1864–1871.

ВМУ — *Вестник Московского университета.* Москва, 1946–1956. {Выданне працягвала выходзіць пад назвамі} *Вестник МГУ, историко-филологическая серия*, 1956–1959; *Вестник МГУ, серия VII. Филология, журналистика.* 1960–1965.

ВОВСНЯ — *Вопросы образования восточнославянских национальных языков.* Москва, 1962.

Временник — *Временник Императорского Московского общества истории и древностей российских.* Москва, 1849–1857.

ВТИЯ — *Вопросы теории и истории языка.* Ленинград, 1963.

ВУИ — *Варшавские университетские известия.* Варшава, 1870–1915.

ВЮЗЗР — *Вестник Юго-западной и Западной России.* Киев, 1862–1864.

ВЯ — *Вопросы языкознания.* Москва, 1952 {і наступныя}.

ГБНТ — *Гадавік Беларускага навуковага таварыства.* Вільня, 1933.

ДАБМ — *Дыялекталагічны атлас беларускай мовы.* Пад рэд. Р. Аванесава, К. Крапівы, Ю. Мацкевіч. Мінск, 1963.

ДБРМ — *Даследаванні па беларускай і рускай мовах.* Мінск, 1958.

ДУРМ — *Дослідження з української та російської мов.* Київ, 1964.

ЕС — *Еврейская старина.* Санкт-Петербург / Петроград, 1909–1924.

ЖМНП — *Журнал Министерства народного просвещения.* Санкт-Петербург / Петроград, 1834–1917.

Запіскі — *Запіскі Аддзелу гуманітарных навук. Працы клясы філёлёгіі*, 1–2. Інстытут Беларускай Культуры, Акадэмія Навук БССР. Менск, 1928–1929.

Запісы — *Запісы БІНіМ* (Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва). Мюнхен–Нью-Ёрк, 1962 {і наступныя}.

ЗБНТ *Запісы Беларускага Навуковага Таварыства.* Вільня, 1938.

ЗІФВ Українська Академія Наук, *Записки Історично-філологічного відділу.* Київ, 1919–1931.

ЗКІНО *Записки Київського інституту народньої освіти.* Київ, 1926–1930.

ИОРЯС *Известия Отделения русского языка и словесности.* Императорская Петербургская АН / Российская АН / АН СССР. Санкт-Петербург / Петроград / Ленинград, 1896–1932.

ИТ А. Селищев. *Избранные труды.* Москва, 1968.

КС *Киевская старина.* Киев, 1882–1906.

КУИ *Киевские университетские известия.* Киев, 1872–1918.

ЛГ *Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак.* Пад рэд. Р. Аванесава, К. Атраховіча, Ю. Мацкевіч. Мінск, 1969.

ЛД *Лінгвістычныя даследаванні.* Мінск, 1968.

МЕВ *Минские епархиальные ведомости.* Минск, 1869–1880.

Милетич *Сборник в чест на проф. Л. Милетич.* София, 1933.

МИРД *Материалы и исследования по русской диалектологии.* Москва, 1949–1958; новая серия, 1959–1962.

ММЗС *Матэрыялы да IV Міжнароднага з'езду славістаў.* Мінск, 1958.

Мов *Мовознавство.* Київ, 1967 {і наступныя}.

МоС *Могилевская старина* 1–3. Могилев, 1900–1903.

НК *Наш край.* Менск, 1925–1930.

ОЛЯ *Отделение литературы и языка.*

ПАК *Працы Акадэмічнае конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі.* Інстытут Беларускай Культуры. Менск, 1927. {Рэц. на} Я. Карскі, *Slavia* 6 (1928), 4.

ПБДУ *Працы Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту.* Менск, 1922–1932.

ПДПИ *Памятники древней письменности и искусства.* Санкт-Петербург / Петроград / Ленинград, 1878–1925.

ПИЕЯ *Проблемы индоевропейского языкознания.* Москва, 1964.

Праці *Праці XI республіканської діалектологічної наради.* Київ, 1965.

Працы *Працы Інстытута мовазнаўства АН БССР.* Мінск, 1954–1961.

ПСМ *Питання словьянського мовознавства.* Львів, 1948–1961.

ПСРЛ *Полное собрание русских летописей* 17. Санкт-Петербург, 1907.

РИБ *Русская историческая библиотека.* Санкт-Петербург / Петроград / Ленинград, 1872–1927.

РФВ *Русский филологический вестник.* Варшава–Москва–Петроград–Казань, 1879–1918.

СбОРЯС	*Сборник Отделения русского языка и словесности.* Императорская Петербургская АН / Российская АН / АН СССР. Санкт-Петербург / Петроград / Ленинград, 1867–1928.
СоСл	*Советское славяноведение.* Москва, 1965 {і наступныя}; *[*з 19 – Славяноведение*]*.
СФ	*Славянская филология.* Москва, 1958, 1963.
СЭ	*Советская этнография.* Ленинград–Москва, 1931 {і наступныя}.
СЯ	*Славянское языкознание* (Доклады советской делегации). Москва, 1963, 1968.
ТПКДРЯ	*Труды Постоянной комиссии по диалектологии русского языка.* Ленинград, 1927–1931.
Труды	Е. Карский. *Труды по белорусскому и другим славянским языкам.* Москва, 1962.
Узв	*Узвышша.* Менск, 1927–1931.
УЗИСл	*Ученые записки Института славяноведения.* Москва, 1949–1963.
УМЛШ	*Українська мова і література в школі.* Київ, 1963 {і наступныя}.
ФН	*Научные доклады высшей школы, Филологические науки.* Министерство высшего образования СССР. Москва, 1958 {і наступныя}.

ABS	*Acta Baltico-Slavica.* Białystok*[*–Warszawa*]*, 1964 {і наступныя}.
ACICS 1958	*American Contributions to the Fourth International Congress of Slavicists, Moscow.* The Hague, 1958.
ACICS 1963	*American Contributions to the Fifth International Congress of Slavicists, Sofia.* The Hague, 1963.
ASPh	*Archiv für slavische Philologie.* Berlin, 1876–1929.
AŠ	*Afn špraxfront.* {Гл.} *DYŠ.*
BNF	*Beiträge zur Namenforschung.* Heidelberg, 1949 {і наступныя}.
BPTJ	*Biuletyn Polskiego Towarzystwa Językoznawczego.* Kraków, 1927 {і наступныя}.
Caytš	*Caytšrift far yidišer gešixte, demografye un economik, literaturforšung, špraxvisnšaft un etnografye.* Менск, 1926–1931.
DYŠ	*Di yidiše šprax.* Київ, 1927–1931. {Выданне працягвала выходзіць пад назвай} *Afn špraxfront*, 1931–1933; серыя 2, 1934–1935; серыя 3, 1937–1939.
FY	*The Field of Yiddish*, 1. Edited by U. Weinreich. New York, 1954; 2, edited by U. Weinreich. The Hague, 1965; 3, edited by M. Herzog, W. Ravid, U. Weinreich. The Hague, 1969.
HŠ	*Historiše šriftn.* Warszawa, 1929–1939.

Навукова-педагагічная бібліятэка
Навукова-метадычнай установы
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
595769

IJSLP *International Journal of Slavic Linguistics and Poetics.* The Hague, 1959 {і наступныя}.

JBS *The Journal of Byelorussian Studies.* London, 1968 {і наступныя}.

JGOE *Jahrbücher für Geschichte Osteuropas, Neue Serië.* München, 1953 {і наступныя}.

JKGS *Jahrbücher für Kultur und Geshichte der Slaven, Neue Serië.* Breslau, 1925–1935.

Kir *Kiryat-Sefer.* Jerusalem, 1925 {і наступныя}.

La *Language.* Baltimore, 1925 {і наступныя}.

Leš *Lešonenu.* Tel-Aviv, 1928 {і наступныя}.

LKK *Lietuvių kalbotyros klausimai.* Vilnius, 1957 {і наступныя}.

LS *Lud Słowiański.* Kraków, 1929–1938.

LSc *Linguistica Slovaca.* Bratislava, 1939–1948.

LZ *Lingvistiše zamlung.* Менск, 1933–1936.

MK *Myśl karaimska.* Вільня, 1924–1939. {З 1948 г. выходзіць як} *PO.*

MS *Le monde slave.* Paris, 1917–1938.

PF *Prace Filologiczne.* Warszawa, 1885 {і наступныя}.

PFB Y. Šerech (G. Shevelov). *Problems in the Formation of Belorussian.* New York, 1953. (Дадатак да *Word* 9.)

PO *Przegląd Orientalistyczny.* Kraków, 1948 {і наступныя. Пераемнік} *MK.*

PoS G. Shevelov. *A Prehistory of Slavic.* Heidelberg, 1964; New York, 1965. {Спіс рэцэнзій і адказ на іх аўтара гл.} G. Shevelov. *Teasers and Appeasers.* Munich, 1971, 297–326.

PrO *Prace Onomastyczne.* Wrocław, 1955 {і наступныя}.

RÉS *Revue des études slaves.* Paris, 1921 {і наступныя}.

RR K. Būga. *Rinktiniai raštai,* 1–3. Vilnius, 1958–1961.

RS *Rocznik Sławistyczny.* Kraków, 1908 {і наступныя}.

RT *Rocznik Tatarski.* Vilno–Zamość–Warszawa, 1932–1938.

SB *Studi baltici.* Rome, 1931–1942; [новая серыя], 1952 {і наступныя}.

ScSl *Scando-Slavica.* Copenhagen, 1954 {і наступныя}.

SEER *The Slavonic and East European Review.* London, 1922 {і наступныя}.

Sl *Slavia.* Praha, 1922 {і наступныя}.

SlOr *Slavia Orientalis.* Warszawa, 1952 {і наступныя}.

SP *Slavica Pragensia.* Praha, 1959 {і наступныя}.

Spr *Sprawozdania z Czynności i Posiedzeń Polskiej Akademii Umiejętności.* Kraków, 1890 {і наступныя}.

SW	R. Jakobson. *Selected Writings*, 1. The Hague, 1962.
TA	G. Shevelov. *Teasers and Appeasers.* Munich, 1971 (*Forum Slavicum* 32).
TCLP	*Travaux du Cercle linguistique de Prague.* Prague, 1929–1939.
TŽ	*Tauta ir žodis.* Kaunas, 1923–1931.
WSJb	*Wiener slawistisches Jahrbuch.* Wien, 1950 {і наступныя}.
WSl	*Die Welt der Slaven.* Wiesbaden, 1956 {і наступныя}.
YB	*Yivo-bleter.* Вільня, 1931–1939.
YŠ	*Yidiše šprax.* New York, 1941 {і наступныя}.
ZPSS	*Z polskich studiów sławistycznych, seria 2, Językoznawstwo.* Warszawa, 1958, 1963, 1968.
ZSl	*Zeitschrift für Slawistik.* Berlin, 1956 {і наступныя}.
ZSPh	*Zeitschrift für slavische Philologie.* Leipzig, Heidelberg, 1924 {і наступныя}.

2. Назвы гарадоў, спамінаных у бібліяграфічных спасылках

У кірылічных выданнях

В	Вільня	М	Масква
К	Кіеў	Мн	Мінск
Л	Ленінград	С	Сафія
Лв	Львоў	СПб	Санкт-Пецярбург

У выданнях лацініцай

B	Берлін	Lo	Лондан
Bl	Блумінгтан	Lv	Львоў
Br	Брусель	Mu	Мюнхен
Bu	Бухарэст	NY	Нью-Ёрк
Camb	Кембрыдж, штат Масачусетс (ЗША)	O	Осла
		P	Парыж
Co	Капенгаген	S	Сафія
H	Гаага	Pr	Прага
Heid	Гайдэльберг	U	Упсала
J	Ерусалім	V	Вільня
Kau	Коўна	W	Варшава
Kr	Кракаў	Wies	Вісбадэн
Lei	Лейпцыг	Wr	Уроцлаў

3. Назвы моваў і гаворак

анг.	ангельская
араб.	арабская
балг.	балгарская
балц.	балцкія
бел.	беларуская
бел. габр.	беларуская мова габрайскім пісьмом
бел. ід.	беларускі дыялект ідышу
бел. лац.	беларуская мова лацініцай
бел. цюрк.	беларуская мова цюркска-арабскім пісьмом
в.-луж.	верхнялужыцкая
гоцк.	гоцкая
грэцк.	грэцкая
дарэф.	дарэформавая
дыял.	дыялектнае
зах.-бел.	заходнебеларуская
зах.-укр.	заходнеўкраінская
ід.	ідыш
і.-е.	індаеўрапейская
іўр.	іўрыт
к.-п.	кіеўска-палескія гаворкі
караім.	караімская
латыш.	латышская
лац.	лацінская
літ.	літоўская
літар.	літаратурная
макед.	македонская
ням.	нямецкая
паўдн.	паўднёвая
паўдн.-зах.	паўднёва-заходняя
паўдн.-усх.	паўднёва-ўсходняя
паўн.	паўночная
паўн.-усх.	паўночна-ўсходняя
перс.	персідская
полацк.	полацкая
польск.	польская
п.-р.	полацка-разанскія гаворкі
прабел.	прабеларуская
прасл.	праславянская
протагерм.	протагерманская
проталатыш.	проталатышская
проталіт.	проталітоўская
рас.	расійская
саларск.	саларская
санскр.	санскрыт (стараіндыйская)

с.-луж.	сербалужыцкія
серб.-харв.	сербска-харвацкая
славацк.	славацкая
стар.-в.-ням.	стараверхненямецкая
стар.-рус.	старажытнаруская
старабел.	старабеларуская
стараліт.	старалітоўская
старапольск.	старапольская
старапрус.	старапруская
старарас.	старарасійская
старасканд.	стараскандынаўская
стараўкр.	стараўкраінская
старачэшск.	старачэшская
суч.	сучасная
сярэд.-в.-ням.	сярэдняверхненямецкая
сярэд.-лац.	сярэднявечная лаціна
сярэд.-польск.	сярэдняпольская
татарск.	татарская
твярэцк.	твярэцкая
уйгурск.	уйгурская
укр.	украінская
усх.-бел.	усходнебеларуская
ц.-сл.	царкоўнаславянская
чэшск.	чэшская
эст.	эстонская

4. Рознае

адз.	адзіночны лік
асобн. выд.	асобнае выданне
буд.ч.	будучы час
В.скл.	вінавальны склон
Д.скл.	давальны склон
ж.р.	жаночы род
заг.л.	загадны лад
зак.тр.	закончанае трыванне
інф.	неазначальная форма дзеяслова (інфінітыў)
м.р.	мужчынскі род
М.скл.	месны склон
мн.	множны лік
н.р.	ніякі род
Н.скл.	назоўны склон
напр.	напрыклад
наст.	наступныя
незак.тр.	незакончанае трыванне

НС	новая серыя
пад.	падобная форма
памянш.	памяншальная форма
параўн.	параўнай
перадрук.	перадрукавана
прош.ч.	прошлы час
прым.	прыметнік
Р.скл.	родны склон
сяр.	сярэдзіна
Т.скл.	творны склон
С	зычны; кансанантызм
FS	юбілейны зборнік
NS	новая серыя
S	санант (плаўны; *р* або *л*)
Š	шыпячы
V	галосны; вакалізм

Дыякрытычныя ды іншыя знакі

˘	кароткі гук
¯	доўгі гук
´	1) націск (у літоўскай пазначае доўгі збежны тон, у праславянскай – узбежны тон); 2) доўгі гук (у чэшскай і славацкай мовах)
`	кароткі гук пад націскам (у літоўскай мове)
ˆ	выбухны зычны (у латышскай мове)
‿	калі стаіць над двума галоснымі, пазначае дыфтонг; калі стаіць над адным галосным, пазначае збежны тон (у праславянскай мове)
~	доўгі ўзбежны тон (у літоўскай і латышскай мовах)
˝	кароткі збежны тон (у сербска-харвацкай мове)
˛	паказвае, што гук насавы
’	змякчэнне
#	нуль гуку
[ ]	фанетычная транскрыпцыя
[ ]	дадатковая бібліяграфія
{ }	тлумачальныя рэмаркі ў выбранай бібліяграфіі
-	граніца марфемы
*	рэканструяваная форма
+	няправільна рэканструяваная форма або форма, якой ніколі не існавала
~	дублеты
||	чаргаванне
>	пераходзіць у
<	паходзіць з

Частка I

1. Стан гістарычнае фаналогіі беларускае мовы

Даследчык беларускае мовы цяперашнім часам не знойдзе ўсебаковага апісання гістарычнае фаналогіі беларускае мовы; ён мусіць вышукваць факты ў падручніках праславянскае, усходнеславянскае і расійскае гістарычнае фаналогіі, а таксама ў агульных даследаваннях на тэму класіфікацыі славянскіх моваў. І ў шмат якіх выпадках ён мае здаволіцца голай храналогіяй і скупой дакументацыяй.

Магчыма, адна з прычын такога становішча ў тым, што большасць сваіх адметных рысаў беларускія гаворкі дзеляць з суседнімі (на ўсходзе і поўдні) славянскімі мовамі; напр., аканне і зліццё *ѣ* і *е* ў *е* – з расійскімі гаворкамі (шырэй пра гэта гл. у змене 20), а з украінскімі (і ў нейкай ступені з паўднёварасійскімі) дыялектамі – фрыкатыўны *г* (гл. змену 13), падаўжэнне зычных перад *ьj* (змена 17) і ацвярдзенне *р'* (змена 33). Ёсць нават некаторыя цікавыя паралелі з заходнеславянскімі дыялектамі: напр., змешванне *с* і *ш* (гл. змену 32) і афрыкатызацыя *т'*, *д'* > *ц'*, *дз'*, якую беларускія мовазнаўцы называюць "цеканнем" і "дзеканнем" (гл. змену 43). Гэтая вялікая колькасць супольных рысаў у беларускай ды іншых славянскіх мовах шмат каго з мовазнаўцаў XIX – пачатку XX ст. наводзіла на думку, што беларуская мова не можа мець ні асобнае ад гісторыі расійскае і ўкраінскае моваў гістарычнае традыцыі, ні асобнае літаратурнае традыцыі ў сучаснасці[1]. Возьмем, напр., фармулёўку "Граматыкі польскае мовы" Т. Бені, Я. Лося, К. Ніча, Я. Развадоўскага і Г. Улашына, якая сцвярджае, што ўсходнеславянскія мовы складаюцца з расійскае, украінскае і "слаба дыферэнцыяванае беларускае". Яшчэ досыць нядаўна беларускую мову азначалі як (1) дыялект паўднёварасійскае мовы (Потебня); (2) дыялект украінскае мовы (Ogonowski); (3) дыялект польскае мовы або мешаніну польскае і гутарковых усходнеславян-

[1] Шмат хто з беларускіх незалежнікаў нападаў на такія азначэнні. Гл. асабліва артыкул В. Ластоўскага "Пагляд расійскіх вучоных на беларускую мову", *Крывіч* 1923, 2. Дадатковыя спасылкі даюцца ў нашай кнізе *Purism and Language. A Study in Modern Ukrainian and Belorussian Nationalism (1840–1967)*. Bl, 1974, 206 і наст.

скіх элементаў; (4) неапісальную мешаніну расійскіх, польскіх, украінскіх ды іншых элементаў; (5) мешаніну царкоўнаславянскае, расійскае, польскае і лацінскае моваў (Linde) або як (6) "пераходную" паміж польскаю і расійскаю мовамі[1].

З погляду на мадэль генеалагічнага дрэва моваў, унікальныя рысы беларускае мовы з'явіліся пераважна пазней, вось жа беларускую мову звычайна бачылі формай або адгалінаваннем расійскае мовы. Даследаванні, зробленыя ў рэчышчы хвалевае тэорыі генетычных адносін паміж мовамі, змянілі пытанне: "Калі ўзнікла беларуская мова?" на пытанне "Калі развіваліся *розныя рысы*, уласцівыя пісьмовым помнікам і сучасным гаворкам беларускае мовы?". Гэта быў добры знак. Аднак вялікае супадзенне рысаў беларускае і суседніх з ёю моваў адцягвае ўвагу мовазнаўцаў ад даследавання такіх важных пытанняў, як *калі* і *дзе* паўстала кожная з агульных рысаў і якой была ступень іх дыфузіі. Калі б гэтымі пытаннямі займаліся – магчыма, беларускую мову не азначалі б так адмоўна і яе аб'ектыўнае вывучэнне не адкладалася б на такі доўгі час.

Строгія патрабаванні параўнальнае храналогіі выконваюцца збольшага адно ў кароткіх артыкулах, прысвечаных асобным тэмам. Апісанні запазычанняў у беларускую мову і з яе, як і беларускіх графічных сістэм, звычайна не бяруць пад увагу храналогіі (гл. падраздзел 2.1). Мала таго, большасць даследаванняў гістарычнае фана-

[1] Тэрмін "пераходная" ўжываюць дзеля азначэння мовы, што не мае такіх рысаў, якіх бы не было хаця б у адной з найбліжэйшых моваў, і/або не мае унікальных, уласцівых толькі ёй адной рысаў. Такі погляд на беларускую мову як "пераходную" паміж польскаю і расійскаю, гл.: Martel 101; Lehr-Spławiński {ды інш.} 110; Kuraszkiewicz 45. Пра беларускую мову як пераходную паміж расійскаю і ўкраінскаю мовамі гл.: Trubetzkoy 289–290, 304; Филин 1970, 11. Падобная фармулёўка ёсць і ў творах Шахматава, які пiша, што беларусы – пераходнае племя паміж усходнімі і заходнімі славянамі. Мэт'юз разглядае беларускую фаналогію як пасярэдніка паміж літоўскаю і расійскаю сістэмамі (Matthews 1958, 337). Новым аргументам на карысць незалежнага статусу беларускае мовы з'яўляецца прапанова ван Вэйка, паводле якой, паколькі беларускую мову нельга разглядаць як трэці складнік усходнеславянскае сям'і моваў на падставе нейкіх яе унікальных рысаў, гэта можна рабіць на падставе таго, што яна мае агульныя рысы, з аднаго боку, з расійскай мовай і, з другога, – з украінскай, г. зн. сам "пераходны" характар беларускае мовы і ёсць яе *raison d'etre*.

логіі ўсходнеславянскіх моваў наагул і беларускае ў тым ліку – у рознай ступені – фрагментарныя; звычайна разглядаюць рысу за рысай у адвольным парадку, са зменамі ў сістэмах галосных і зычных гукаў, узятымі паасобку, нібы яны не маглі мець уплыву адна на адну.

Выбраная бібліяграфія

S. Linde. *O statucie litewskim ruskim językiem drukiem wydanym wiadomość.* W, 1816.

А. Потебня. *Два исследования о звуках русского языка.* Воронеж, 1866.

E. Ogonowski. *Studien auf dem Gebiete der ruthenischen Sprache.* Lv, 1880.

M. Murko. "Zur russischen Literaturgeschichte", *ASPh* 12, 1890.

Е. Карский. "К истории звуков и форм белорусской речи", *РФВ* 26, 1891; *Белорусская речь. Очерк народного языка с историческим освещением.* СПб, 1918.

И. Недешев. "Исторический обзор важнейших звуковых и морфологических особенностей белорусских говоров", *РФВ* 12, 1894.

"Древняя русская письменность. Опыт библиографического изложения истории ее изучения", *СбОРЯС* 50, 1895, 371.

П. Симони. "Мнение митрополита Евгения (Болховитинова) о русских наречиях…", *ИОРЯС* 1, 1896.

V. Jagić. "Einige Streitfragen", *ASPh* 20, 1898.

А. Соболевский. "О русских говорах вообще и белорусских в частности", *ИОРЯС* 9, 1904, 2; *Лекции по истории русского языка.* М, 1907[4]; Н, 1962.

П. Любецкий. "О белорусском литературном языке", *Чырвоны шлях.* Мн, 1913, 7–8.

А. Шахматов. *Очерк древнейшего периода истории русского языка.* СПб, 1915; *Введение в курс истории русского языка* 1. *Исторический процесс образования русских племен и наречий.* СПб, 1916. {Рэпрынт}, Н 1962.

T. Benni, J. Łoś, R. Nitsch, J. Rozwadowski i H. Ułaszyn. *Gramatyka języka polskiego.* Kr, 1923, vii–viii.

Н. Дурново. *Очерк истории русского языка.* М–Л, 1924. {Рэпрынт}, Н 1962; *[Избранные работы по истории русского языка.* М., 2000*].*

N. Trubetzkoy. "Einiges über die russische Lautentwicklung und die Auflösung der gemeinrussischen Spracheinheit", *ZSPh* 1, 1924.

N. van Wijk. "Remarques sur le groupement des langues slaves", *RÉS* 4, 1924; (1937a) "Les langues slaves de l'Est", *MS* 14, 1937, 3; (1937b) *Les langues slaves. De l'unité à la pluralité.* P, 1937; (1937c) "Parallelisme et divergence dans l'évolution des langues slaves", *MS* 14, 1937, 2.

П. Бузук. "Взаємовідносини між українською та білоруською мовами", *ЗІФВ* 7–8, 1926; "Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў", *ПАК* 1927.

[Я. Лёсік. Граматыка беларускае мовы: Фанэтыка. Мн, 1926, 1995[2].*]*

І. Воўк-Левановіч. *Лекцыі па гісторыі беларускай мовы.* Мн, 1927; *[*1994[2]*].*

А. Селищев. "Критические замечания о реконструкции древней судьбы русских диалектов", *SI* 7, 1928. {Перадрук. у} *ИТ.*

R. Jakobson. "Remarques sur l'évolution phonologique du russe comparée à celle des autres langues slaves", *TCLP* 2, 1929. {Перадрук. у} *SW.*

A. Martel. "La Russie blanche", *MS* 1929, 4.

B. de Courtenay. "Izoglosy w świecie językowym słowiańskim", *Sborník prací I. Sjezdu slovanských filologů v Praze 1929* I. *Přednášky.* Pr, 1932.

I. Lekov. "Bemerkungen zur Frage der Monogenese und Polygenese einiger Erscheinungen in den slavischen Sprachen", *Studia Hist.-Phil. Serdicensia* 1. S, 1938; И. Леков. *Характеристика на общите черти в български и източнославянски.* С, 1941; *Насоки в развоя на фонологичните системи на славянските езици.* С, 1960.

A. Isačenko. "Versuch einer Typologie der slavischen Sprachen", *LSc* 1–2, 1940.

Fr. Kopečný. "K otázce klasifikace slovanských jazyků", *SI* 29, 1949.

P. Kovaliv. "The Problem of the Typology of the Slavonic Languages", *SEER* 33, 1954–1955; П. Ковалів. *Слов'янські фонеми.* NY, 1965.

T. Lehr-Spławiński, Wł. Kuraszkiewicz i Fr. Sławski. *Przegląd i charakterystyka języków słowiańskich.* W, 1954, 110.

М. Булахаў. *Практыкаванні і матэрыялы па гісторыі беларускай мовы.* Мн, 1956.

T. Lehr-Spławiński. "Das Problem der Zusammenfassung der slavischen Sprachen zu Gruppen", *Vorträge auf der Berliner Slawistentagung (11–13. November 1954).* B, 1956. {Упершыню артыкул выйшаў у} *BPTJ* 14, 1955.

W. Matthews. "Phonology of the Palatal Plosives in East-European Languages", *Archivum Linguisticum* 8, 1956; "Phonemes and Phoneme-Patterns in Contemporary Russian and Lithuanian", *SEER* 36, 1958; *Russian Historical Grammar.* Lo, 1960, 153–177.

А. Бірала, М. Булахаў, М. Жыдовіч {ды інш.}, рэд. *Нарысы па гісторыі беларускай мовы.* Мн, 1957.

П. Юргелевіч. *Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі.* Мн, 1958; 1961[2].

E. Stankiewicz. "Towards a Phonemic Typology of the Slavic Languages", *ACICS* 4, 1958.

Z. Stieber. "O niektórych paralelach w rozwoju dialektów słowiańskich", *Slavia Occidentalis* 20, 1960, 2; *Zarys gramatyki porównawczej języków słowiańskich* 1. W, 1969.

Т. Багмут {ды інш.}, ред. *Порівняльна граматика української і російської мов.* К, 1961[2].

H. Bräuer. *Slavische Sprachwissenschaft* 1. B, 1961.

P. Garde. "Réflexions sur les différences phonétiques entre les langues slaves", *Word* 17, 1961.

М. Гурскі. *Параўнальная граматыка рускай і беларускай моў. Фанетыка і марфалогія.* Мн, 1962.

Ф. Филин. *Образование языка восточных славян.* М–Л, 1962; "О фонетических ареалах древнерусского языка", *Известия на Института за български език* 18, 1969; "Древнерусские диалектные зоны и происхождение восточнославянских языков", *ВЯ* 1970, 5; *Происхождение русского, украинского и белорусского языков: историко-диалектологический очерк.* Л, 1972.

В. Борковский и П. Кузнецов. *Историческая грамматика русского языка.* М, 1963.

A. Bidwell. *Slavic Historical Phonology in Tabular Form.* H, 1963.

V. Kiparsky. *Russische historische Grammatik* 1. Heid, 1963.

Wł. Kuraszkiewicz. *Zarys dialektologii wschodniosłowiańskiej.* W, 1963.

Р. Максімовіч. {Рэц. на} A. Kawecka-Gryczowa {ды інш.}, red. *Drukarze dawniej Polski od XV do XVIII wieku* 5. Wr–Kr, 1959, *Запісы* 2, 1963, 209.

В. Георгиев. *Вокалната система в развоя на славянските езици.* С, 1964.

В. Орлова. "Типы изоглосс по их значению для разработки вопросов исторической диалектологии", *ВДВЯ* 78.

О. Мельничук, ред. *Вступ до порівняльно-історичного вивчення слов'янських мов.* К, 1966.

М. Лекомцева. "К типологии фонологических структур слова в славянских языках", *СЯ* 1968.

*[*В. Чэкман. *Гісторыя проціпастаўленняў па цвёрдасці–мяккасці ў беларускай мове.* Мн, 1970; В. Чекмонас. "Из истории формирования белорусских говоров", *Беларусіка = Albaruthenica* 19. Мн, 2001.*]*

*[*Г. Хабургаев. *Становление русского языка.* М, 1980.*]*

*[*А. Міхневіч, рэд. *Беларуская мова*: Энцыклапедыя. Мн, 1994.*]*

*[*H. Dalewska-Greń. *Języki słowiańskie.* W, 1997.*]*

*[*L. Bednarczuk. Stosunki językowe na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego. Kr, 1999.*]*

*[*Б. Плотнікаў. *Беларуская мова ў сістэме славянскіх моў.* Мн, 1999.*]*

2. Крыніцы дадзеных

Даследчык гістарычнае фаналогіі беларускае мовы можа абапірацца на розныя крыніцы дадзеных. Адны крыніцы асабліва карысныя для рэканструкцыі дагістарычных перыядаў, ад якіх не засталося вестак; іншыя памагаюць апісаць і аднавіць фаналагічную сістэму тых гістарычных перыядаў, ад якіх да нас дайшлі нейкія дакументы.

Крыніцы можна аб'яднаць у наступную табліцу.

Табліца 1. Крыніцы дадзеных

Дагістарычны час	Гістарычны час
*індаеўрапейскія > *праславянскія > *усходнеславянскія дыялекты	усходнеславянскія дыялекты > беларуская мова
параўнальны метад	беларускія кірылічныя тэксты
тапаніміка	беларускія тэксты лацініцай
запазычанні з і ў беларускую мову	беларускія цюркска-арабскія тэксты
	беларускія габрайскія тэксты
	тапаніміка
	запазычанні з і ў беларускую мову
	лінгвагеаграфія
	дзвюхмоўная дыялекталогія

Не ўсім аспектам нашае табліцы даследчыкі гістарычнае фаналогіі аддавалі роўную ўвагу. Дзіўна, але дагістарычны перыяд – з поўнай адсутнасцю тэкстаў – у пэўных адносінах даследаваны лепей за гістарычны. Напр., распад індаеўрапейскае мовы, наступнае развіццё праславянскае мовы і, у сваю чаргу, развал апошняе досыць добра вядомыя. Заўвага, выказаная Атрэмбскім на VIII Міжнародным кангрэсе мовазнаўцаў у 1958 г., абагульняе сітуацыю з беларускаю моваю і ў вялікай ступені з большасцю іншых славянскіх моваў.

> Наша навука [гістарычнае мовазнаўства] утварылася спосабам, які хіба цяжка назваць натуральным, г. зн. да з'яўлення гістарычных граматык розных індаеўрапейскіх моваў. Якраз дзеля гэтага ў нашай навуцы ёсць багата гіпотэз, якія, вобразна кажучы, нам накінулі сілком.

Апошнім часам беларускія мовазнаўцы звярнулі ўвагу на гістарычнае развіццё літаратурнае мовы, але гістарычная граматыка і гістарычная дыялекталогія да гэтага часу збольшага нявывучаныя.

Выбраная бібліяграфія

E. Sivertsen, ed. *Proceedings of the Eighth International Congress of Linguists.* O, 1958.

2.1. Тэксты

2.1.1. Праблемы інтэрпрэтацыі графічных сістэм беларускае мовы. Тэксты – галоўны ключ у аднаўленні гісторыі гукавое сістэмы беларускае мовы. Аднак даступныя дакументы самі з сябе не могуць даць поўнага малюнку, і да сведчанняў, якія яны прапануюць, трэба падыходзіць асцярожна. Дакументы не могуць здаволіць нас з трох галоўных прычын.

1. Існаванне ўнармаванае пісьмовае традыцыі на Беларусі засланяе ад нас праўдзівую гутарковую мову. Пісьмовыя мовы часта падлягаюць унармаванню. Звычайна падставы ўнармавання звязаныя з павагаю (прэстыжам) і практычным патрабаваннем забяспечыць аднастайны наддыялектны код, які б мог ужывацца на шырокім абшары. У выніку гутарковыя рысы, уласцівыя абмежаваным дыялектным зонам, або нізка прэстыжныя, звычайна часткова зацямняюцца або зусім прыдушваюцца ўнармаваным правапісам. Зразумела, сцісласць нармалізацыі і ступень адданасці прадпісаным нормам можа змяняцца залежна ад перыяду. Напр., разам з паступовым размываннем нормаў царкоўнаславянскае мовы павялічваецца адлюстраванне нормаў гутарковае мовы. Смаленскія дакументы XIII–XIV стст. рэдка выяўляюць рысы гутарковае мовы, але ў дакументах XV ст. такія рысы ўжо з'яўляюцца.

2. Адпаведнасць фаналагічнае сістэмы графічнай робіцца асабліва складанай з прычыны рознае хуткасці зменаў на двух узроўнях – графічная сістэма развіваецца павольней за фаналагічную. Адпаведна, выяўленне змены на графічным узроўні не абавязкова з'яўляецца сведчаннем пачатку або нават нядаўняга заканчэння гукавое змены. Мы проста можам спаткаць графічную сістэму, якая запозна падхоп-

лівае фаналагічную *fait accompli*. Прыкладам можа быць адлюстраванне змены *е* > *о* перад цвёрдымі зычнымі (гл. змену 18). Яшчэ адной прычынай неадпаведнасці паміж гукавой сістэмай і пісьмом ёсць тое, што апошняя можа змяняцца нелінейным (іначай кажучы, эвалюцыйным) спосабам. Часта мова пазнейшых пісьмовых дакументаў можа быць архаічнейшая за мову ранейшых тэкстаў. Напр., людзі могуць аддаваць перавагу графічнай сістэме, якая пераймае некаторыя даўнейшыя нормы пісьма або вымаўлення і граматычныя правілы. Разгледзім, напр., *-л* у прошлым часе дзеясловаў (фанетычна [ў]), які ў XVII ст. у беларускіх тэкстах, пісаных цюркска-арабскім пісьмом, перадаваўся на перамену графемамі *в* і *л*; у XVIII ст. у правапісе панавалі фанетычныя нормы і дзеля гэтага ўжывалі толькі літару *в*, але ў XIX ст., магчыма, пад ціскам польскае арфаграфіі, зноў пачалі ўжываць літары *в* і *л* (Антонович 1968а, 1968б). Беларускія кірылічныя тэксты захавалі літару *ѣ* і канцавы *ъ* пад уплывам расійскае мовы да 1906 г., хоць гукаў, якія гістарычна абазначаліся гэтымі графемамі, у гукавой сістэме мовы ўжо не было.

3. Асабліва дражлівай праблемай у аднаўленні сістэмы фанем на падставе яе графічнага адлюстравання з'яўляецца аналіз вельмі розных формаў напісання, якія часта знаходзяцца ў адным сінхранічным зрэзе або рукапісе (дзеля адсутнасці ўнармавання, а таксама недасведчанасці пісара або ягонага клопату з прычыны неадпаведнасці паміж графічнаю і гукавою сістэмамі). Напр., суч. бел. *гусь* у кірылічных тэкстах пішацца як *гоусь*, *гусь*, *гжсь*; суч. бел. *увесь* – як *оувесь*, *ввесь*, *весь* і г. д. А ў беларускіх тэкстах, пісаных цюркска-арабскім пісьмом, маем 20 (!) варыянтаў напісання слова *унук* (Антонович, 1968а).

Асаблівыя праблемы даследчык мае, калі ўжывае пісьмовыя крыніцы, каб устанавіць храналогію гукавых зменаў. Трэба засцерагчы чытача, каб ён не лічыў нашы адносныя храналогіі вельмі дакладнымі, бо яны грунтуюцца на пісьмовых сведчаннях. Знойдзеныя ў тэкстах рысы звычайна старэйшыя за час іх першае фіксацыі ў помніку, які можна датаваць. Час паміж фаналагічнаю інавацыяй і яе графічным адлюстраваннем можа быць досыць вялікі. Варты ўвагі прыклад – адсутнасць акання ў тэкстах да XIV ст., хоць гэтая рыса, уласцівая блізка што ўсім беларускім гаворкам, амаль напэўна з'явілася шмат раней.

Іншамоўныя крыніцы таксама часта занадта спарадычныя і з'яўляліся нерэгулярна. Напр., у габрайскіх дакументах XV ст. з Заходняе Беларусі горад *Гродна* (раней вядомы як *Горадна*) паслядоўна пішацца з пачатковым фрыкатыўным гукам у форме *hʳrʳdnʳ*. Можна толькі быць упэўненым, што *да гэтага часу* праславянскае *g* > *h*, але габрайскія глосы не могуць памагчы нам вызначыць, калі сапраўды пачалася гэтая змена. Гэта было б магчыма адно ў тым выпадку, каб найраней датаваныя габрайскія тэксты падавалі *Гродна* як *⁺gʳrʳdnʳ* у процілегласць пазнейшым тэкстам з пачатковым *h*. *Rodūnė*, літоўская адаптацыя назвы беларускага горада, таксама сведчыць, што на час кантакту спрадвечны *g* у славянскай мове-крыніцы ўжо зрабіўся фрыкатыўным. Аднак немагчыма дакладна вызначыць час з'яўлення нашае літоўскае формы (сучасная літоўская мова мае *Gardinas*, *Gròdnas*)[1]. Урэшце неадпаведнасці гістарычных правапісных сістэм часта змушаюць нас лічыць *лінгвістычныя* довады каштоўнейшымі за графічныя для храналогіі гукавых зменаў, а графічныя сведчанні ўжываць як спосаб кантролю.

Магчымасці ўбачыць прыродныя (native) нормы маўлення, перададзеныя больш-менш дакладна, а не праз крывую прызму чужое ўнармаванае пісьмовае традыцыі, у кірылічных тэкстах няма (з невялікімі выняткамі) аж да канца XVIII ст., калі колькасць тэкстаў, што адбівалі рысы гутарковае мовы, павялічылася. У канцы XIX ст. з'яўляюцца падрабязныя сінхранічныя апісанні беларускіх гаворак (болей пра гэта гл. падраздзел 2.1.1.1)[2]. У ранейшыя перыяды здабыць інфармацыю пра гутарковую мову можна спадзявацца пераважна з адхіленняў на пісьме ад літаратурных нормаў. Дзеля гэтага важная праблема для мовазнаўца ў кожным асобным выпадку – вызначыць, ці з'яўляецца адхіленне ў напісанні памылкай, ці адлюстраваннем гутарковае

[1] Ёсць розныя думкі пра этымалогію назвы гэтага горада. Паводле некаторых навукоўцаў (Būga, Schmittlein 1948б), літ. *Gardinas* утварылася ад славянскага этымона тады, калі горад яшчэ называўся **Gardina*. Польск. *Grodno* атрымалася ў выніку народнае этымалогіі паводле мадэлі *gród* 'горад' і *-no*, суфікс, які спатыкаем і ў назвах іншых гарадоў, такіх як *Kowno* і *Wilno*. З іншага боку, Атрэмбскі мяркуе, што слова *Grodno* – аснова літоўскае формы *Gardinas*, і што дзеля гэтага балцкія формы нічога нам не памогуць у пошуках славянскае этымалогіі.

[2] Ранні прыклад сінхранічнага апісання гл.: Czeczot.

мовы пісара. З гэтага боку асабліва карыснымі дадзенымі з'яўляюцца гіперкарэктныя (звышправільныя) формы напісання. Запазычанні і тапаніміка таксама могуць быць важнай падмогай у высвятленні нормаў гутарковае мовы, бо яны – тая сфера, дзе ўплыў нормаў часта найслабейшы і інавацыі ў правапісе могуць выявіцца лягчэй. Напр., арабскія ўласныя імёны ў беларускіх тэкстах, пісаных цюркска-арабскім пісьмом, запісваюцца хутчэй фанетычна, чым у адпаведнасці з арабскімі правапіснымі нормамі (Антонович 1968а). Такім парадкам, тэксты, малацікавыя спецыялісту ў агульнай гісторыі або гісторыі літаратуры, могуць быць надзвычай цікавыя мовазнаўцу. На нашу думку, мова канцылярый і культурна-рэлігійных цэнтраў, дзеля таго што яна выраўноўвае мясцовыя дыялектныя рысы, менш прывабная для мовазнаўца за мову грамат, якая звычайна лепш захоўвае рысы гутарковае мовы. Беларускія дакументы, пісаныя цюркска-арабскім пісьмом у XVII–XIX стст., вельмі важныя для гістарычнае фаналогіі беларускае мовы, бо яны дакладней за пісаныя традыцыйным кірылічным алфавітам дакументы адбіваюць асаблівасці гутарковае мовы. Як літаратурныя тэксты, напісаныя небеларусамі і не для беларуса (у вузкім этнічным сэнсе гэтага слова), гэтыя дакументы не зрабілі ўплыву на агульнае развіццё літаратуры і дзеля гэтага зусім мала будуць цікавіць гісторыкаў беларускае літаратурнае мовы (пра гэтыя тэксты гл. падраздзел 2.1.1.2.1).

Выбраная бібліяграфія

J. Czeczot. *Piosenki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, z dołączeniem pierwotnych w mowie sławianokrewickiej.* V, 1844.

K. Būga. "Die litauisch-wießrussischen Beziehungen und ihr Alter", *ZSPh* 1, 1924. {Перадрук. у} *RR* 3.

И. Свєнціцький. "Правописні ціхи поділу староруського письменства ", *ПАК.*

Я. Станкевіч. "Мова дыплёматычнага ліста Рыскае рады 1271–1280 г.", *ЗБНТ.*

J. Jablonskis. *Istorijos archyvas* 1. *XVI amžiaus Lietuvos inventoriai.* Kau, 1934.

C. Stang. *Die westrussische Kanzleisprache des Großfürstentums Litauen.* O, 1935.

N. van Wijk. "Les langues slaves de l'Est", *MS* 1937, 3.

R. Schmittlein. (1948a) "Toponymes finnois et germaniques en Lituanie", *Onomastica*. P, 1948, 2; (1948b) *Toponymie lituanienne*. Baden, 1948 (= *Études sur la nationalité des Aestii*) 1, 255.

Н. Гурло. "Да пытання станаўлення беларускай арфаграфічнай сістэмы", *Ученые записки Гродненского педагогического института, Серия гуманитарная* 6, 1960.

O. Broch. "Zum Litauischen südlich von Vilna", *Norsk Tidsskrift for Sprogvidenskap* 19, 1960.

А. Булыка. "Адлюстраванне вымаўлення ў старабеларускай арфаграфіі", *Весці* 1966, 1; "Эвалюцыя графічнай сістэмы старабеларускай пісьменнасці", *тамсама* 1966, 2; "Да пытання аб беларусізмах у кніжна-славянскай мове", *тамсама* 1969, 1; *Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы*. Мн, 1970.

А. Антонович. (1968а) *Белорусские тексты, писанные арабским письмом*. В, 1968; (1968б) "Краткий обзор белорусских текстов, писанных арабским письмом", *Полесье*. М, 1968.

Ф. Филин. "О происхождении и развитии восточнославянского аканья", *Общеславянское значение аканья*. С, 1968.

J. Prinz. *Die Slavisierung baltischer und die Baltisierung slavischer Ortsnamen im Gebiet des ehemaligen Gouvernements Suwałki*. Wies, 1968.

У. Анічэнка. *Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі*. Мн, 1969.

J. Otrębski. "Die Ortsnamen *Kowno*, *Grodno* und *Olita* in Litauen", *BNF NS* 6, 1971.

2.1.1.1. Царкоўнаславянская мова ў Беларусі. Інтэрпрэтацыя беларускіх кірылічных тэкстаў асабліва складаная, бо некалькі стагоддзяў ад пачатку пісьмовае традыцыі пісьменства грунтавалася на нормах царкоўнаславянскае мовы – чужое стараславянскае літургічнае мовы. Роля царкоўнаславянскае мовы ў Беларусі грунтоўна розніцца ад ролі ўсіх іншых моваў на гэтай тэрыторыі з двух бакоў. Па-першае, царкоўнаславянская мова не была роднаю ні для воднае часткі грамадства, і, па-другое, царкоўнаславянская і беларуская мовы функцыянальна дапаўнялі адна адну. У Беларусі царкоўнаславянскай мовай пісалі, але яе ніколі не ўжывалі як гутарковую мову (дый ад самага стварэння яна мела быць моваю царквы без аніякіх камунікацыйных функцый), тым часам беларуская мова была найперш гутарковая і яе вельмі мала ўжывалі ў пісьменстве. Гэтыя суадносіны дзвюх славянскіх моваў былі ўласцівыя не толькі Беларусі: царкоўнаславянская мова грала падобную ролю на ўсіх славянскіх землях, дзе

яе ўжывалі, – ва Украіне, у Расіі, Сербіі, Македоніі і Балгарыі, хоць пры гэтым былі важныя розніцы ў дэталях[1].

Узаемадзеянне беларускае і царкоўнаславянскае моваў мае сур'ёзныя наступствы для рэканструкцыі гістарычнае фаналогіі беларускае мовы, бо рэканструкцыя ў вялікай меры грунтуецца на вельмі ўнармаваных кірылічных тэкстах, якія адлюстроўвалі больш чужыя, царкоўнаславянскія, як свае, родныя, нормы. Калі б гэтае ўзаемадзеянне працягвалася доўгі час, тады б аднавіць гутарковую беларускую мову было б надзвычай цяжка, бо існавала б вельмі мала (калі б яны наагул былі) пісьмовых дакументаў па-беларуску, і нам давялося б аднаўляць беларускую фаналогію амаль цалкам на падставе параўнальных дадзеных з іншых славянскіх моваў, а таксама спосабам унутранай рэканструкцыі на падставе сучасных дыялектаў. На шчасце, нам спрыяюць два фактары: (1) існаванне ў Беларусі шматлікіх нормаў, што нейкім спосабам дапаўнялі адна адну, было толькі частковае, дзеля гэтага некаторыя пісьмовыя жанры менш залежалі ад нормаў царкоўнаславянскае мовы, і (2) існавала тэндэнцыя да гэткае змены адносін паміж гэтымі мовамі, што на пісьмовую норму царкоўнаславянскае мовы рабіла ўплыў гутарковая мова пісараў. Распад званых часам дыягласіяй адносін паміж шматлікімі нормамі давёў да стварэння трэцяе нормы, беларускага варыянта, або беларускае рэдакцыі, царкоўнаславянскае мовы. Узнікненню трэцяе нормы, хоць тэарэтычна яе можна было б унікнуць, паспрыяла тое, што ў царкоўнаславянскай мовы не было бацькаўшчыны і людзей, якія б гаварылі толькі ёю і маглі абараніць чысціню яе нормаў і ўвечніць роўнае суіснаванне дзвюх моваў. Пра пачатак няўстойлівасці беларуска-царкоўнаславянскага дзвюхмоўя ў XV ст. сведчыць публікацыя царкоўнаславянскіх кніг з беларускімі глосамі (Luckevič). Зліццё беларускіх і царкоўнаславянскіх элементаў набывала розныя "сярэднія" формы. Часам мовазнаўцы не могуць дайсці згоды ў азначэнні пэўнага літаратурнага твора як па сутнасці "царкоўнаславянскага" або "беларускага". Класічны прыклад – пераклад Бібліі Скарынам у 1517–

[1] Лаціна як пісьмовая мова філасофскіх і матэматычных твораў займала ў сярэднявечнай Беларусі пазіцыю, падобную да царкоўнаславянскае мовы; аднак, генетычная сувязь паміж беларускаю і царкоўнаславянскаю мовамі спрыяла мяшанню моўных элементаў, чаго не было ў адносінах беларускае мовы з лацінаю.

1519 гг. (Прага), які П. Уладзіміраў назваў беларускім дакументам XVI ст., а крытыкі Уладзіміраву лічылі Скарынавы творы ў грунце рэчы царкоўнаславянскімі з беларускімі (і некаторымі чэшскімі) рысамі.

Зменлівыя адносіны паміж беларускаю і царкоўнаславянскаю мовамі можна абагульніць у наступнай табліцы.

Табліца 2. Беларускае дзвюхмоўе

Першая стадыя дзвюхмоўя:

царкоўнаславянская мова	беларуская мова
функцыі: пісьмовая; літургічная	гутарковая; часам пісьмовая
назва нормы: *славяноросси́йский*, *славянорусский*, *словенский*	*рус(ь)кая*, *простая мова* (*молва*, *малва*); *просты рускі дыялект*

Другая стадыя дзвюхмоўя:

царкоўнаславянская мова	беларуская рэдакцыя царкоўнаславянскае мовы	беларуская мова
функцыі: кананічныя рэлігійныя тэксты	царкоўныя і навуковыя творы; лісты і свецкае пісьменства; некананічныя рэлігійныя творы	гутарковая; дзелавыя і прававыя дакументы

Беларуска-царкоўнаславянскае дзвюхмоўе канчаткова распалася ў XVIII ст., калі царкоўнаславянская мова перастала быць галоўнаю моваю пісьменства і калі беларускую мову прававых дакументаў пазбавілі яе афіцыйнага статусу. Сітуацыя дзвюхмоўя змушае нас рэканструяваць беларускую мову даўнейшага часу на фоне нормаў царкоўнаславянскае мовы. Але нават паступовы распад роўнага суіснавання дзвюх моваў, які давёў да ўзнікнення беларускае рэдакцыі царкоўнаславянскае мовы, не абавязкова стварае для даследчыка гістарычнае фаналогіі беларускае мовы шмат лепшую сітуацыю. Нават пры магчымасці "ўзаемнага перацякання" двух складнікаў у розных пісьмовых жанрах немагчыма наперад сцвярджаць, што гутарковыя рысы беларускае мовы можна здабыць простай аперацыяй нейкага механічнага адымання: беларуская рэдакцыя царкоўнаславянскае мовы

м і н у с царкоўнаславянская мова = гутарковая беларуская мова. Бо няма пэўнасці, што беларускі складнік у беларускіх царкоўнаславянскіх тэкстах абавязкова ёсць дакладным адлюстраваннем гутарковых нормаў беларускае мовы. Усе гэтыя праблемы патрабуюць далейшага вывучэння.

Выбраная бібліяграфія

П. Владимиров. *Доктор Франциск Скорина, его переводы, печатные издания и язык.* СПб, 1888.

У. Пичета. "Скориниана (1776–1926)", *Чатырохсотлецьце беларускага друку 1525–1925.* Мн, 1926.

I. Ogijenko. "Język cerkiewno-słowiański na Litwie i w Polsce w ww. XV–XVIII", *PF* 16, 1929.

A. Luckevič. "Die weissruthenische Literatur in der Vergangenheit und Gegenwart", *JKGS NS* 7, 1931.

M. Rudzińska. "Charakterystyka języka urzędowego Wielkiego Księstwa Litewskiego", *II międzynarodowy zjazd sławistów. Księga referatów* 1. W, 1934.

Л. Шакун. "Значэнне царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы", *ДБРМ.*

Н. Толстой. "К вопросу о древнеславянском языке как общем литературном языке южных и восточных славян", *ВЯ* 1961, 1; "Роль древнеславянского литературного языка в истории русского, сербского и болгарского литературных языков в XVII–XVIII вв.", *ВОВСНЯ*; "Взаимоотношение локальных типов древнеславянского литературного языка позднего периода (Вторая половина XVI–XVII в.)", *СЯ* 1963; *[История и структура славянских литературных языков.* М, 1988; *Избранные труды* II: *Славянская литературно-языковая ситуация.* М, 1998*].*

Б. Кипарисов. "Старославянский язык и его отношение к восточнославянским литературным языкам на главнейших этапах их развития", *Ученые записки Башкирского гос. унив.* 9, *Серия филолог. наук.* Уфа, 1962, 3.

А. Жураўскі. "Да пытання аб ролі царкоўнаславянскай мовы ў развіцці беларускай літаратурнай мовы XVI ст.", *ММЗС*; А. Журавский. "Некоторые особенности взаимодействия древнеславянского и белорусского литературных языков", *СоСл* 1965, 2; А. Журавський. "Про білоруський варіант церковнослов'янської мовы", *Мов* 1967, 4.

У. Анічэнка. "Кніжна-царкоўнаславянскія традыцыі ва ўкраінскай і беларускай перакладной пісьменнасці XVI–XVII ст.", *SI* 35, 1966; *Беларуска-ўкраінскія пісьмова-моўныя сувязі.* Мн, 1969.

П. Охрименко. "Літературні звьязки українського та білоруського народів", *УМЛШ* 1968, 2.

Scoriniana 1517–1967 (= *Запісы* 5), 1970.

P. Wexler. "The Cartography of Unspoken Languages of Culture and Liturgy (Reflections on the Diffusion of Arabic and Hebrew)", *Orbis* 23, 1974.

[Мова беларускай пісьменнасці XIV–XVIII стст. Мн, 1988.*]*

[Францыск Скарына і яго час: Энцыклапедчны даведнік. Мн, 1988.*]*

*[*P. Wexler. "Christian, Jewish and Muslim translations of the Bible and Koran in Byelorussia: 16th–19th centuries", *JBS* 6, 1988, 1.*]*

[Франциск Скорина и его время: Энциклопедический справочник. Мн, 1990.*]*

*[*Л. Шакун. "Современные исследователи о языке изданий Ф. Скорины". *Великою ласкою: Францишек Скорина в традициях славянского просветительства.* М, 1994.*]*

*[*K. Gutschmidt. "Die Sprache der Vorreden Francisk Skorinas zu den Büchern des Alten Testaments und die Sogenannte "einfache Sprache" bei den orthodoxen", *Sprache – Text – Geschichte: Festschriff für Klaus-Dieter Seemann.* Mu, 1997.*]*

*[*У. Свяжынскі. "Праблема ідэнтыфікацыі афіцыйнай мовы Вялікага Княства Літоўскага", *Metricana* 1. Мн, 2001.*]*

Выбраная бібліяграфія старабеларускіх тэкстаў, пісаных кірыліцаю і лацініцаю

Пісаныя кірыліцаю і лацініцаю апублікаваныя беларускія тэксты, да якіх мы звярталіся, размешчаны ніжэй па стагоддзях паводле храналагічнага парадку. Дакументы падаюцца або пад назваю (у квадратных дужках), якая паможа іх ідэнтыфікаваць, або пад назваю таго твора, у якім яны апублікаваны; усе апублікаваныя даследаванні гістарычнага тэксту падаюцца адразу пасля яго першага спамінання. Бібліяграфіі, чытанкі і важнейшыя зборнікі тэкстаў або іх фрагментаў, што ахопліваюць некалькі стагоддзяў, падаюцца асобна ў канцы спіса. Калі ў назве выдання няма інфармацыі пра геаграфічнае паходжанне тэксту, яно заўсёды, калі гэта магчыма, даецца ў дужках пасля спасылкі.

Шмат якія тэксты з гэтага спіса публікуюцца са спрашчэннямі і мадэрнізацыяй мовы і напісання, што робіць іх непрыдатнымі або не вельмі прыдатнымі як помнікі гістарычнае фаналогіі; некаторыя ўключаюць украінскія тэксты поруч з беларускімі.

XI стагоддзе

[Фрагменты Тураўскага евангелля]: *Туровское Евангелие одиннадцатого века.* Публикация Виленского учебного округа. СПб, 1868; *[*И. Х. Тот {ды інш.}. "Туровские листки", *Acta Universitatis Szegediensis. Dissertationes Slavicae* 13, 1977; С. Богданова. "Туровское Евангелие. Текст. Индекс словоформ", *Годишник на Софийския унив. Факултет по славянски филологии* 72, 2, 1985*].*

XII стагоддзе

[Надпіс на крыжы Ефрасінні Полацкай (1161)]: С. Обнорский, С. Бархударов. *Хрестоматия по истории русского языка* 1. М, 1952; *[*G. Shevelov. "Язык надписей на кресте Евфросинии Полоцкой 1161 года и некоторые соображения о языке Руси XII века", *Festschrift für H. Bräuer.* Köln–Wien, 1986*].*

XIII стагоддзе

[Грамата князя Гердзеня (1264); Грамата полацкага епіскапа Якава (каля 1300 г.)]: К. Напьерский. *Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригой и ганзейскими городами в XII, XIII и XIV веках.* СПб, 1857; А. Сапунов. *Витебская старина* 5, 1888, 1.

[Грамата рыжан віцебскаму князю Міхаілу Канстанцінавічу (каля 1300 г.)]: И. Срезневский. *Древние памятники русского письма и языка X–XIV веков.* СПб, 1863; К. Напьерский. *Русско-ливонские акты.* СПб, 1868; Сапунов. *Витебская старина* 1, 1883; П. Бузук. "Некалькі слоў аб грамаце рыжан каля 1300 г.", *ПБДУ* 16, 1927; Б. Брэжга. "Жалаба рыскае рады канца XIII стаг.", *ЗБНТ*; Я. Станкевіч. "Мова дыплёматычнага ліста Рыскае рады 1271–1280 г.", *ЗБНТ.*

Т. Сумникова, В. Лопатин. *Смоленские грамоты XIII–XIV веков.* М, 1963; А. Соболевский. "Смоленско-полоцкий говор в XIII–XV вв.", *РФВ* 1886; V. Kiparsky. "Wer hat den Handelsvertrag zwischen Smolensk und Riga vom J. 1229 aufgeschrieben?", *Neuphilologische Mitteilungen* 61, 1960.

[Полацкае евангелле]: Д. Шулаева. *К истории языка в XIII веке.* Л, 1970 {аўтарэферат}; "Западнорусские приписки в рукописи СПб Пог. 12", *Вестник Ленинградского университета* 1962, 2.

XIV стагоддзе

[Дагавор Полацка з Рыгаю (каля 1330 г.)]: К. Напьерский. *Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригой и ганзейскими городами в XII, XIII и XIV веках.* СПб, 1857; А. Сапунов. *Река Западная Двина.* Витебск, 1893.

Я. Станкевіч. "Грамата смаленскага князя Александра Глебавіча, пісаная каля 1330 г.", *Крывіч* 1923, 2.

*[*Друцкае евангелле 1-й пал. XVI ст.]: *Друцк летапісны. Друцкае Евангелле.* Мн, 2001.*]*

Н. Каринский. "Исследование языка псковского Шестоднева 1374 г.", *ЖМНП* НС. 61, 1916.

[Даравальная грамата княгіні Юліанії (каля 1377 г.)]: *АОИЗР* 1, 1896, 5.

[Грамата караля Уладыслава князю Скіргайлу (1387)]: И. Срезневский. *Древние памятники русского письма и языка X–XIV веков.* СПб, 1863.

Е. Карский. "Западнорусский ярлык хана Золотой орды Тохтамыша к польскому королю Ягайлу 1392–1393", *Труды.*

[Даравальная грамата князя Анофрыя (каля 1399 г.)]: И. Срезневский. *Древние памятники русского письма и языка X–XIV веков.* СПб, 1863; *Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России* 1 (1361–1598). СПб, 1863; Н, 1970[2].

К. "Снимок с грамоты великого князя литовского Витовта Кестутьевича, данной бискупу Виленскому", *Вестник Европы* 23–24, 1827.

Летопись великих князей литовских. Под ред. А. Попова. СПб, 1854.

Документы, объясняющие историю Западно-русского края и его отношения к России и к Польше. СПб, 1865.

Л. Васильев. "Новгородское евангелие Императорской Публичной Библиотеки и его западнорусские вкладные", *РФВ* 47, 1902. {Перадрук. у} Л. Васильев. *Труды по истории русского и украинского языков.* Мюнхен, 1972.

"Грамота псковского князя Ивана Александровича", *ИОРЯС* 17, 1912, 3.

Documentele lui Ştefan cel Mare 2. Bu, {асабліва с. 358, 383, 391, 409, 483}.

В. Розов. *Українські грамоти* 1. *XIV в. і перша половина XV в.* К, 1928.

М. Драй-Хмара. "Фрагменти менського пергаменового апракоса XIV в.", *Збірник комісії для дослідження історії української мови* 1, 1931.

D. Bogdan. "Contribuţiuni la studiul diplomaticei vechi moldoveneşti", *Revista Istorica Română* 4. Bu, 1934.

C. Stang. *Die westrussische Kanzleisprache des Grossfürstentums Litauen.* O, 1935; *Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk.* O, 1939.

Е. Карский. "Два древнейших русских документа главного архива Царства Польского в Варшаве", *Труды.*

XV стагоддзе

[Даравальны запіс Г. Дружыловіча (1406)]: *ВЯЗЗР* 1, 1862.

[Дагавор Полацка з Рыгаю (1407)]: Напьерский. *Русско-ливонские акты.* СПб, 1868.

[Грамата палачан Рызе (1465)]: *тамсама.*

[Супрасльскі спіс хронікі (сярэдзіна XV ст.)]: *ПСРЛ*; М. Жыдовіч. "Да гісторыі беларускага пісьма і мовы. Арфаграфічныя і фанетычныя рысы супрасльскага летапісу", *Працы* 1, 1954.

[Літаратура "жидовствующих" (1462–1483)]: А. Соболевский. "Переводная литература Московской Руси XIV–XVII веков", *СбОРЯС* 74, 1903.

М. Карпинский. "Западнорусская четья 1489 г. с приложением Жития Бориса и Глеба", *РФВ* 21, 1889 (Навагрудак?).

[Віленскі спіс хронікі (1495)]: *ПСРЛ*; Е. Карский. "Особенности письма и языка рукописного сборника XV в., именуемого летописью Авраамки", *Труды.*

[Грамата Янкі Багдановіча (1498); Жыццё Ефрасінні Полацкай (XV ст.)]: У. Анічэнка ды інш. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы* 1. Мн, 1961.

Н. Тупиков. "Страсти Христовы в западнорусском списке XV века", *ПДПИ* 140, 1901.

В. Перетц. "Повесть о трех королях-волхвах в западнорусском списке XV века", *тамсама* 150, 1903.

П. Владимиров. "Житие св. Алексея, человека Божия, в западнорусском переводе конца XV в.", *ЖМНП* 252, 1887; В. Перетц, *тамсама*; Е. Карский. "Западнорусский сборник XV в.", *Труды*; В. Адрианова. *Житие Алексия, человека Божия в древней русской литературе и народной словесности.* СПб, 1917.

П. Никитин. *История города Смоленска.* М, 1847 [1848].

Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн, 1848.

А. Попов. "Летопись великих князей литовских", *Ученые записки II-го отделения Императорской Академии наук* 1. СПб, 1854.

И. Григорович. "Переписка протоиерея Иоанна Григоровича с графом Н. И. Румянцевым", *Чтения в Императорском Обществе истории и древностей российских* 2, 1862, ч. 1; И. Срезневский. "Сведения и заметки о малоизвестных и неизвестных памятниках", *Записки Императорской Академии наук* 7, 1865, 1, глава 10.

Н. Каринский. "Язык Пскова и его области в XV веке", *Записки историко-филологического факультета Императорского Санкт-Петербургского университета* 93. СПб, 1909.

В. Перетц. "До історії перекладу Біблії в Західній Русі. Книга Естери в перекладі кінця XV в.", *Філологічний збірник памьяті К. Михальчука.* К, 1915.

В. Ганцов. "Особенности языка Радзивилловского (Кенигсбергского) списка летописи", *ИОРЯС* 32, 1927; Т. Сушицький. "Західньоруські літописи як памьятки літератури", *Праці з історії письменства давньої України* 1. К, 1929.

А. Седельников. "«Послание от друга к другу» и западно-русская книжность XV века", *Известия АН СССР, Серия 7, Отделение гуманитарных наук* 1930, 4.

И. Матвеев. "Неизвестная полоцкая грамота второй половины XV в.", *Доклады и сообщения* (Институт русского языка АН СССР) 1953, 4.

XVI стагоддзе

[Віленская рада (1509)]: П. Батюшков. *Памятники русской старины в западных губерниях империи* 5–6. СПб, 1872.

"Материалы для истории гонения православных в бывших под властью Польши русских областях", *ВЮЗЗР* 3, 1862–1863 (1509).

"Материалы для истории города Полацка в эпоху зависимости его от Польши", *ВЮЗЗР* 4, 1862–1863 (1509, 1580).

A. Brückner. "Ruskopolski rękopis roku 1510", *SI* 7, 1928, 1.

Ф. Скарына. *Библия.* Прага, 1517–1519; *[Біблія: факсімільнае ўзнаўленне Бібліі, выдадзенай Францыскам Скарынаю ў 1517–1519 гг.* У 3 т. Мн, 1991; H. Rothe, F. Scholz, {выд.}. *Biblia ruska vyložena doktorom Franciskom Skarinoju. Praga 1517–1519. Kommentare. Apostol. Wilna 1525. Facsimile und Kommentar.* Paderborn, Mu–Wien–Zürich, 2002*]*; У. Анічэнка. "Моўныя асаблівасці выданняў Ф. Скарыны і рукапісных спісаў В. Жугаёва", *Весці* 1966, 1; [Кн. Руфі (пачатак XVI ст.)]: У. Анічэнка ды інш., *Весці* 1961; П. Владимиров. *Доктор Франциск Скорына, его переводы, печатные издания и язык.* СПб, 1888; М. Мурко. {Рэц. на} П. Владимиров. *Доктор Франциск Скорына, его переводы, печатные издания и язык* 1888, *ASPh* 12, 1890; Я. Воўк-Левановіч. "Мова выданьняў Францыска Скарыны", *Чэтырохсотлецьце беларускага друку.* Мн, 1926 {і асобн. выд.} Мн, 1927; *[*А. Булыка, А. Жураўскі, У. Свяжынскі. *Мова выданняў Францыска Скарыны.* Мн, 1990; Ф. Скарына. *Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія.* Мн, 1990*].*

"Материалы для истории православия в Литве", *ВЮЗЗР* 4, 1863–1864 (1528, 1599).

К. Яблонскис. *Статут Великого княжества Литовского 1529 г.* Мн, 1960; *[*Т. Альт. "Мова Літоўскага статута 1529 г.", *Беларуская лінгвістыка* 4. Мн, 1977; T. Alt. *The language of the Lithuanian Statue of 1529: orthography, phonology, inflections.* Ann Arbor, 1978*].*

И. Лаппо. *Полоцкая ревизия 1552 г.* М, 1905.

Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств (1552–1555). В, 1884; *Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем великом княжестве литовском, с присовокуплением грамот и привилегий на входы в пущи и на земли* (Пінск, 1554, 1559). В, 1867.

С. Будны. *Катіхісіс.* Нясвіж, 1562; Е. Карский. "Два памятника старого западнорусского наречия: 1) Лютеранский катехизис 1562 года и 2) Католический катехизис 1585 года", *Труды.*

"Статут Великого княжества литовского 1566 года", *Временник* 23, 1855; *[Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г.* Мн, 2003*].*

Ф. Леонтович. *Литовская метрика.* СПб, 1903 (= *РИБ* 20).

А. Антонович. “Вопросы фонетики белорусского актового языка XVI в. По материалам судебной (актовой) книги Каунасского земского суда 1566–1567 гг.”, *Kalbotyra* 1960, 2; “Графика и орфография судебной (актовой) книги Каунасского земского суда 1566–1567 гг.”, *Известия высшего учебного заведения Литовской ССР* 3. *Языкознание* 1961; *Язык судебной (актовой) книги Каунасского земского суда 1566–1567 гг.* {аўтарэферат}. В, 1961.

[[Фрагменты з Евангелля вучыцельнага (Заблудаў, 1569): Прадмова Рыгора Хадкевіча і Слова на Узнясенне гасподне Кірылы Тураўскага]: I. Łabyncew, Ł. Szczawinskaja. *W mieście zwanym Zabłudowem.* Białystok, 1995.*]*

П. Владимиров. “Предисловие Василия Тяпинского к печатному евангелию, изданному в Западной России, около 1570 года”, *КС* 24, 1889 (Полацк); О. Черепанова. “Некоторые черты западнорусского литературного языка XVI века по данным перевода Евангелия Василием Тяпинским”, *Юбилейная научно-методическая конференция северо-западного зонального объединения кафедр русского языка.* Л, 1969.

[Допісы Філона Кміты-Чарнабыльскага (1573–1574)]: *АОИЗР* 1848.

[Кніга запісаў Магілёўскага магістрата (1578)]: *Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской…* 32. В, 1906.

И. Лаппо. *Описание Полоцких владычных, монастырских и церковных земель ревизорами 1580 года.* М, 1907; *Iš Vyriausiojo Lietuvos Tribunolo istorijos.* Kau, 1926.

[[Гісторыя аб Атыле, каралі ўгорскім (каля 1580 г.)]: A. Zoltán. *Oláh Miklós Athila című munkájának XVI. századi lenguel és fehérorosz fordítása.* Nyíregyháza, 2004.*]*

А. Назаревский. *Язык Евангелия 1581 года в переводе В. Негалевского.* К, 1911 {і ў} *КУИ* 1911, 8, 11.

[Трыбунал (В, 1581)]: *Временник* 25, 1857; *[Решения Главного литовского Трибунала.* В, 1988*].*

[Кніга запісаў Мінскага гродскага суда (1582–1588)]: *Акты* 36, 1912.

[Вершы А. Рымшы (1580-я гг.)]: В. Перетц. “Малорусские вирши и песни в записях XVI–XVIII вв.”, *ИОРЯС* 4, 1889; В. Перетц. *Историко-литературные исследования и материалы* 1. СПб, 1900.

*[*A. Fałowski. *Język ruskiego przekładu katechizmu jezuickiego z 1585 roku.* Kr, 2003.*]*

И. Лаппо. *Литовский Статут 1588 г.* 2. Каунас, 1938; *[Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Даведнік. Каментарыі.* Мн, 1989*].*

“Материалы для истории древней Полоцкой архиепископии”, *ВЗР* 2, 1864–1865 (1588, 1601).

“К истории братств в Западной России”, *ВЮЗЗР* 2, 1863–1864 (1589).

Н. Иванишев. *О древних сельских общинах в Юго-западной России.* К, 1863. {Упершыню надрукавана ў} *Русская беседа* 3, 1857, 7, ч. 2.

F. Jewłaszewski. *Kronika białoruska z lat 1546–1604.* W, 1860; В. Антонович. "Дневник новгородского подсудка Федора Евлашевского (1546–1604)", *КС* 14, 1886; A. Nadson. "The Memoirs of Theodore Jeŭłašeŭski, Assessor of Navahrudak (1546–1604)", *JBS* 4, 1968; А. Жураўскі. "Заўвагі аб моўных асаблівасцях "Дзённіка" Ф. Еўлашоўскага", *SlOr* 17, 1968, 3; *[*У. Свяжынскі. *"Гістарычныя запіскі" Ф. Еўлашоўскага.* Мн, 1990*].*

[Кніга актаў Брэсцкага земскага суда. Фрагмент (1590)]: У. Анічэнка ды інш. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы* 1. Мн, 1961.

С. Зизаний. *Казанье... Кирилла... иерусалимскаго.* В, 1596.

"Материалы для истории города Витебска", *ВЮЗЗР* 1, 1863–1864 (1597).

Книга посольская метрика Велик. Кн. Литов., содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда-Августа 1–2. М, 1843 (XVI ст.).

"Западнорусские купчая и меновая", *Архив исторических и практических сведений* 3, 1859, ч. 5 (XVI ст.).

"Материалы для истории братств Западной России", *ВЮЗЗР* 4, 1863–1864 (XVI ст.).

"Документы касающиеся Люблинской унии", *ВЗР* 1, 1869, 1, ч. 1; 1, 1870, 1 (канец XVI ст.).

"Материалы для истории Киевской митрополии", *Киевские епархиальные ведомости* 1873, 11, ч. 2 (XVI ст.).

Х. Филалет. "Апокрисис" (канец XVI ст.), *РИБ* 7, 1862.

А. Веселовский. "Белорусские повести о Тристане и Бове в Познанской рукописи конца XVI века", *ЖМНП* 251–252, 1887; "Из истории романа и повести", *СбОРЯС* 44, 1888, 3.

Н. Петров. "Западнорусские полемические сочинения XVI в.", *Труды Киевской духовной академии* 1894, 2–4.

[Баркалабаўскі летапіс]: *КУИ* 38, 1898, 12; Е. Романов. "Баркалабовская летопись", *МоС* 1, 1900; М. Довнар-Запольский. *Баркалабовская летопись.* К, 1908; М. Карнеева-Петрулан. "Мова Баркалабаўскага летапісу", *Працы* 3, 1957; *[*Н. Вайтовіч. *Баркалабаўскі летапіс.* Мн, 1977*].*

М. Довнар-Запольский. *Акты литовско-русского государства* 1. М, 1899; 2, М, 1897.

"К истории города Могилева", *МоС* 3, 1902–1903.

[Рачынскі спіс летапісу (канец XVI ст.)]: *ПСРЛ.*

М. Сперанский. "Из истории отреченных книг. IV. Аристотелевы врата, или Тайная Тайных", *ПДПИ* 171, 1909; В. Адрианова. "К истории текста «Аристотелевых врат»", *РФВ* 66, 1911, 3–4 {і асобн. выд.} В, 1911.

К. І. "Крыўскі (беларускі) старадаўны лістоўны стыль", *Крывіч* 1924, 2 (8).

І. Огієнко. *Українська літературна мова XVI-го століття і український Крехівський апостол* 1–2. В, 1930.

K. Jablonskis. "Kiek naujų žinių apie kanauninko Mikalojaus Daukšos… kilimą ir gyvenimą", *TŽ* 7, 1931; *Istorijos archyvas* 1. *XVI amžiaus Lietuvos inventoriai.* Kau, 1934.

Е. Карский. "Западнорусское сказание о Сивилле-пророчице по рукописи XVI в.", *Труды.*

N. Damerau. *Russisches und Westrussisches bei Kurbsky.* B, 1963.

М. Прашковіч. "Беларуская паэзія канца XVI – пачатку XVII ст.", *Весці* 1964, 2.

А. Булыка, А. Жураўскі. "Мова старабеларускіх друкаваных кніг", *Весці* 1967, 3.

XVII стагоддзе

А. Надсан. "Малітаўнік Мамоніча 1601 г.", *Божым шляхам* 1970, 1–2.

[Кніга запісаў Віцебскага земскага суда. Фрагмент (1601)]: У. Анічэнка ды інш. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы* 1. Мн, 1961.

[Лѣкарство на оспалый умысл чоловѣчий (Волгыниа 1607)]: *тамсама.*

[[Тэзес Я. Руцкага (1608)]: І. Саверчанка. *Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока.* Мн, 1998.*]*

[Кніга запісаў Гродзенскага земскага суда. Фрагмент (1612)]: У. Анічэнка ды інш. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы* 1. Мн, 1961.

Л. Карпович. *Казанья.* Евье, 1615.

[[Ананім. Наука (1627)]: І. Саверчанка. *Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока.* Мн, 1998.*]*

Ю. Яворский. "Пропавшая западнорусская книга "Диалог о смерти" 1627 г.", *ИОРЯС* 16, 1911; 17, 1912, 1.

"Материалы для истории р[имско]-католического ксендзовства в Белоруссии", *ВЮЗЗР* 4, 1864–1865 (1634).

[Рэестр Магілёва (1636)]: Е. Романов. "К истории Могилева", *МоС* 3, 1903.

Гисторыя… о житии… Варлаама Иоасафа. Куцеин, 1637.

А. Филипович. "Диариуш (1638–1648)", *РИБ* 4, 1878.

Граматика словьянська І. Ужевича. За ред. І. Білодіда, Є. Кудрицького. К, 1970 (1643); J. Dingley. "The Two Versions of the *Граматыка Словенская* of Ivan Uževič", *JBS* 2, 1972, 4.

[Кніга запісаў Пінскага гродскага суда (1649)]: *Акты* 18, 1891.

П. Берында. *Лексикон.* Куцеин, 1653[2].

[[Дзідаскалія С. Косава (1653)]: І. Саверчанка. *Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока.* Мн, 1998.*]*

A. Brückner. "Ein weissrussischer Codex miscellaneus der Gräflich-Raczynski'schen Bibliothek in Posen", *ASPh* 9, 1886 (1655).

З. Даўгяла. "З беларускага пісьменства XVII ст. (Творы Цыпрыяна Камунякі: "Ліст да Абуховіча" і "Прамова Мялешкі")", *ПБДУ* 16, 1927 {і асобн. выд.} Мн, 1927; П. Крапівін. "Аб кракаўскай копіі "Ліста да Філіпа Абуховіча" – помніка беларускай пісьменнасці XVII стагоддзя", *Весці* 1958, 2.

[Пастанова Трыбунала (1679)]: *Акты* 12, 1883.

Римские деяния 1–2. СПб, 1877–1878 (1688).

"Материалы для истории унии", *ВЗР* 1–2, 1864–1865; 3, 1867, 7 (XVII ст.).

Историко-юридические материалы извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской хранящихся в Центральном архиве в Вильне 1–32. Под ред. В. Сазонова, З. Довгяло. В, 1871–1906. (XVII ст.).

A. Brückner. "Polnisch-russische Intermedien des XVII Jahrhunderts", *ASPh* 13, 1891.

С. Пташицкий. "Западнорусские переводы хроник Бельского и Стрыйковского", *Новый сборник статей по славяноведению, составленный и изданный учениками В. Ламанского.* СПб, 1905.

С. Шамбинаго. "Повести о Мамаевом побоище", *СбОРЯС* 81, 1906.

[Триодь цветная (XVII ст.)]: *ВУИ* 9, 1910.

Александрыя. Пад рэд. В. Баркоўскага. Мн, 1962; У. Анічэнка. "Аб курніцкім спісе «Александрыі»", *Весці* 1960, 1.

[[Катэхізм Я. Кунцэвіча (XVII ст.)]: І. Саверчанка. *Aurea mediocritas: Кніжна-пісьмовая культура Беларусі. Адраджэнне і ранняе барока.* Мн, 1998.*]*

E. Karskij. "Сатырыко-камічные творы беларускай літаратуры", *Sveslavenski zbornik.* Zagreb, 1930; Е. Карский. "К истории белорусского языка в XVII столетии", *Труды.*

А. Крузэ Ван-дер-Коп. "Забытый эпизод из борьбы католицизма против реформации в Западной России", *ИОРЯС* 17, 1912.

С. Некрашэвіч. "Мова кнігі Касьяна Рымляніна Эраміты: «О уставах манастирских»", *Запіскі* 1, 1928, 2.

А. Семяновіч. "Аб вытоках беларускай драматургіі", *Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі* 1. Мн, 1958; Л. Шакун. "Беларуская мова ў інтэрмедыях да драматычных твораў XVII–XVIII стст.", *З даследаванняў па беларускай і рускай мовах.* Мн, 1961.

[The Pontifical Liturgy of Saint John Chrysostom. A manuscript of the 17th Century in the Slavonic text and Latin translation. Lo, 1978.*]*

XVIII стагоддзе – пачатак XIX стагоддзя

[Апошняя воля бурмістра Магілёва (1702)]: У. Анічэнка. "Некаторыя пытанні развіцця беларускай мовы ў XVIII стагоддзі", *Весці* 1961, 4.

[Кніга запісаў Рэчыцкага павета (1746)]: У. Анічэнка. "Некаторыя пытанні развіцця беларускай мовы ў XVIII стагоддзі", *Весці* 1961, 4.

[Школьная камедыя (сярэдзіна XVIII ст., Смаленск)]: В. Перетц. "К истории польского и русского народного театра", *ИОРЯС* 10, 1905; K. Maraszewski. *Komedya* (1787, Полацк): *тамсама*, 16, 1911, 3; *[Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі* 1. Выд. 2. Мн, 1997*]*.

"Čačot's Byelorussian Songs", *JBS* 2, 1969, 1 (1819).

Зборнікі тэкстаў і фрагментаў, якія ахопліваюць больш за адно стагоддзе.

Белорусский архив древних грамот 1. Под ред. И. Григоровича. М, 1824 (XV – пачатак XVII ст.).

Русская Вивлиофика 1. М, 1833, 91–110 (XV–XVI стст.).

Сборник Муханова. М, 1836; 1866[2] (XIV–XVII стст.).

Сборник князя Оболенского 1–12. М, 1838–1859 (1506–1615).

Книга посольская метрика Велик. Кн. Литов., содержащая в себе дипломатические сношения Литвы в государствование короля Сигизмунда-Августа 1–2. М, 1843.

Собрание древних грамот и актов городов Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам 1–2. Под ред. М. Круповича. В, 1843. {Уключае матэрыялы лацініцаю.}

Акты, относящиеся к истории Западной России 1–5. СПб, 1846–1853.

Летопись великих князей литовских. Под ред. А. Попова. СПб, 1854.

Грамоты, касающиеся до сношений Северо-Западной России с Ригою и ганзейскими городами в XII, XIII и XIV веках. Под ред. К. Напьерского. СПб, 1857; *Русско-ливонские акты.* СПб, 1868.

Архив Юго-Западной России 1–8. Под ред. В. Антоновича. К, 1859–1893 (XV–XVIII стст.).

"Документы, служащие материалом для истории белорусской церкви, извлеченные из архивов Полоцкой духовной консистории и Татульского монастыря, за исключением документов №1, 2, 3", *ВЮЗЗР* т. 2, ч. 2, 1862–1863 (XIV–XVII стст.).

"Материалы для истории белорусской церкви", *ВЮЗЗР* 4, 1862–1863 (XVI–XVII стст.).

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России 1. СПб, 1863; Н, 1970[2] (1361–1598).

"Материалы для истории православия в Западной России", *ВЮЗЗР* т. 4, ч. 1, 1862–1863; т. 2, ч. 1, 1863–1864 (1581–1620).

"Документы для истории православия в Юго-западной России", *ВЗР* 3, 1864–1865 (XVI–XVII стст.).

"Документы, относящиеся к истории унии", *ВЗР* т. 1, ч. 1; т. 2, ч. 2, 1864–1865; т. 3, кн. 8, 1867; т. 2, кн. 6, 1868 (XVI–XVII стст.).

"Материалы для истории Западной России", *ВЗР* 3, 1864–1865 (XVI–XVII стст.).

Акты, 1–39. {Лінгвістычныя каментарыі гл. т. 30, с. LXII–LXVII; 36, с. III–IV} (канец XIV – XVIII стст.).

Документы, объясняющие историю Западно-русского края и его отношения России и к Польше. СПб, 1865.

"Материалы для истории православия в Западной России", *ВЗР* т. 2, кн. 5, ч. 1; кн. 6; т. 3, кн. 7–8; т. 4, кн. 9–10, 12, 1865–1866; т. 2, кн. 5–6; т. 3, кн. 9; т. 4, кн. 11–12, 1867 (XVI–XVII стст.).

"Материалы для истории православной церкви в Западной России", *ВЗР* т. 1, кн. 2, ч. 1; кн. 3, 1865–1866; т. 1, кн. 2–4, 1867 (XVI–XVII стст.).

"Материалы для истории унии в Западной России", *ВЗР* т. 4, кн. 9, ч. 1; кн. 10–12, 1865–1866 (XVI–XVII стст.).

"Материалы, касающиеся православной церкви в Западной России", *ВЗР* т. 1, кн. 2, ч. 1, 1865–1866 (канец XVI – пачатак XVII ст.).

Сборник документов, уясняющих отношения латино-польской пропаганды к русской вере и народности 1–2. В, 1865–1866 (XVI–XVIII стст.).

Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси 1–14. В, 1867–1874. (XV–XVIII стст.). {Уключае дакументы лацініцаю.}

"Документы, относящиеся к истории православия в Западной России", *ВЗР* т. 3, кн. 9, ч. 1; т. 4, кн. 10–12, 1867; т. 1, кн. 1–3; т. 2, кн. 5, 1868; т. 1, кн. 2, 1869; т. 1, кн. 2, 1870 (XV–XVII стст.).

Грамоты великих князей литовских с 1390 по 1569 год. Под ред. В. Антоновича, К. Козловского. К, 1868 {і ў} *КУИ* 1868, 4–9.

Памятники русской старины в западных губерниях империи 1–8. Под ред. П. Батюшкова. СПб, 1868–1885 (XIV–XVII стст.).

"Документы, относящиеся к истории Белоруссии", *ВЗР* т. 2, кн. 4, ч. 1, 1868 (XV–XVI стст.).

"Документы, относящиеся к древнему православию в Западной России", *ВЗР* т. 4, кн. 12, ч. 1, 1869; т. 3, кн. 9, ч. 1, 1870 (XVI–XVII стст.).

"Документы, относящиеся к истории православной и униатской церквей в здешнем крае", *ВЗР* т. 3, кн. 7, ч. 1, 1869 (XVI–XVII стст.).

"Документы, относящиеся к истории православных и униатских монастырей в Западной России", *ВЗР* т. 1, кн. 1, ч. 1, 1869 (канец XVI – пачатак XVII ст.).

"Документы, относящиеся к истории Западной России вообще и православия и унии в особенности", *ВЗР* т. 2, кн. 5–6, 1869 (XIV – XVII стст.).

"Документы, касающиеся судьбы православия в Западной России", *ВЗР* т. 4, кн. 11, ч. 1, 1870 (XVI – пачатак XVII ст.).

"Документы, объясняющие взаимные отношения польской шляхты к королю, друг к другу и к другим сословиям", *ВЗР* т. 1, кн. 3, ч. 1; т. 2, кн. 4–6; т. 3, кн. 7, 1870 (канец XVI – пачатак XVII ст.).

"Материалы для истории православной церкви в Минской епархии", *МЕВ* 1870, 23–24; 1871, 2, 5–6, 8–9, 11–12, 15 (XVI–XVII стст.).

"Материалы для истории Слуцкой архимандрии", *МЕВ* 1870, 1–2 (XV–XVI стст.).

И. Мизецкий. "Письмо в редакцию "Епархиальных ведомостей" как предисловие к собранию древних документов, хранящихся в Слуцком монастыре", *МЕВ* 1870, 1 (XV–XVI стст.).

Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Вильне 1–32. Под ред. В. Сазонова, З. Довгяло. В, 1871–1906.

"Материалы для истории церкви Минской епархии", *МЕВ* 1872, 13–18, 22, 29, 37, 39, 45; 1876, 12 (XVI–XVII стст.).

РИБ: Литовская метрика (т. 20, 27, 30, 33), *Памятники полемической литературы в Западной Руси* (т. 4, 7, 19).

Памятники полемической литературы в Западной Руси 1–3. Под ред. П. Гильтебрандта. СПб, 1878–1903 (XVI–XVII стст.).

Сборник палеографических снимок с древних грамот и актов хранящихся в Виленском центральном архиве и Виленской публичной библиотеке 1. В, 1884 (1432–1548).

Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie 1–6. Lv, 1887–1910.

М. Ясинский. *Уставные земские грамоты Литовско-Русского государства.* К, 1889.

Е. Карский. *Западнорусские переводы псалтыри в XV–XVII вв.* Варшава, 1896.

М. Гарэцкі. *Хрэстаматыя беларускай літэратуры: XI век – 1905 год.* В, 1923; *Гісторыя беларускае літаратуры.* Мн, 1926. {Уключае і творы лацініцаю.}

В. Ластоўскі. *Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі.* Коўна, 1926 (XIII–XVIII стст.).

Беларускі архіў 1–3. Мн, 1927–1930 (XV–XVIII стст.).

G. Shevelov, F. Holling. *A Reader in the History of the Eastern Slavic Languages: Russian, Belorussian, Ukrainian.* NY, 1958 (XII–XVII стст.).

Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов 1–3. Мн, 1959–1961 (XV–XVIII стст.).

А. Коршунаў. *Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры.* Мн, 1959 (фрагменты твораў з усіх перыядаў).

У. Анічэнка, П. Вярхоў, А. Жураўскі і Я. Рамановіч. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы* 1. Мн, 1961 (XIII–XVIII стст.).

Л. Шакун. *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.* Мн, 1963 (фрагменты твораў з усіх перыядаў і шматлікія спасылкі на неапублікаваныя тэксты); *[*Мн, 1984[2]*].*

[Полоцкие грамоты XIII – начала XVI вв. 1–4. М, 1977–1982.*]*

*[*Л. Саверчанка. *Старажытная паэзія Беларусі: XVI – першая палова XVII ст.* Мн, 1992.*]*

*[*М. Нікалаеў. *Палата кнігапісная: Рукапісная кніга на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях.* Мн, 1993.*]*

[Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн, 1994 (з розных перыядаў у спісах XVI–XVIII стст.).*]*

Бібліяграфіі і рэцэнзіі

А. Горский, К. Невоструев. *Описание славяно-русских рукописей Московской Синодальной Библиотеки* 1–4. М, 1855–1917; Wies, 1964[2].

П. Владимиров. "Обзор южнорусских и западнорусских памятников письменности от XI до XVII столетия", *Чтения в ист. об-ве Нестора-летописца* 4, 1890.

В. Перетц. "Українські і білоруські стародруки в бібліотеці Ленінградського університету", *Бібліологічні вісти* січень–березень 1924 (спісы тэкстаў з Заблудава, Вільні, Магілёва і Супраслі).

O. v. Büchler. "Die Tätigkeit der Vitebsker Kommission zur Auswahl und Herausgabe alter Urkunden", *Osteuropa* 3, 1927–1928.

Я. Воўк-Левановіч. "Кароткія ўвагі на некаторыя помнікі беларускай мовы ў Ленінградзе", *Запіскі* 2, 1929, 9.

Библиографический указатель литературы по русскому языкознанию с 1825 по 1880 год 7. М, 1958.

В. Малышев. *Древне-русские рукописи Пушкинского Дома (обзор фондов).* М–Л, 1965, {асабліва с. 17, 76, 87}.

*[*У. Анічэнка. "Помнікі беларускай дзелавой мовы XVIII ст. у бібліятэках Польскай Народнай Рэспублікі", *Беларуская мова* 6. Мн, 1977.*]*

[Кніга Беларусі: 1517–1917. Зводны каталог. Мн, 1986.*]*

*[*М. Прыгодзіч. "Берасцяныя граматы", *Роднае слова* 5. Мн, 1993.*]*

[Здабыткі: Дакументальныя помнікі на Беларусі. Мн, 1995.*]*

2.1.1.2. Беларускія матэрыялы некірылічным пісьмом. Частковым развязаннем дылем, абрысаваных у падраздзеле 2.1.1, могуць быць пошукі варыянтаў графічных сістэм, кожны з якіх можа рознымі спосабамі перадаваць гутарковую мову пэўнага перыяду. З тае прычыны, што на тэрыторыі Беларусі ёсць некалькі этнічных меншасцяў, на

шчасце, можна пашырыць графічную аснову беларускае мовы і ўключыць у яе ўсе чатыры сістэмы пісьма: звычайную кірылічную (ва ўсіх яе варыянтах)[1], лацініцу (звычайна ўгрунтаваную на польскіх правапісных нормах), якую ўжывалі з канца XVI ст., цюркска-арабскую, якую, відаць, ужывалі прынамсі з XVII ст. (а, магчыма, і з XVI ст.), і габрайскую (у абодвух варыянтах – іўрыце і ідышы) – пачынаючы з XV ст. Лацініца зрабілася папулярная з узростам польскага і рымска-каталіцкага ўплываў на беларускіх тэрыторыях. Акрамя мясцовых тэкстаў, пісаных лацініцаю, можна адзначыць існаванне беларускіх глосаў у іншамоўных крыніцах, такіх як заходнееўрапейскія картаграфічныя даследаванні і ўспаміны чужаземных падарожнікаў па Беларусі (напр., фон Гэрбэрштайна) і балцкія дакументы[2].

Некірылічныя тэксты, асабліва пісаныя семіцкім пісьмом, могуць зафіксаваць рысы гутарковае мовы, якія непаступова адлюстраваны ў кірылічных тэкстах, што падлягаюць правапісным нормам царкоўнаславянскае мовы, хоць не трэба думаць, што тэксты меншасцяў заўсёды вольныя ад уплываў кірылічных і нават лацінічных правапісных сістэм большасці. З іншага боку, семіцкія сістэмы пісьма не адбіваюць некаторых рысаў, адлюстраваных у кірылічных дакументах, з прычыны няздольнасці гэтых сістэм перадаваць шмат якія галосныя і адрозніваць некаторыя зычныя. Дзеля гэтага інтэрпрэтацыя беларускіх матэрыялаў у тэкстах, пісаных семіцкім пісьмом, – цяжкая задача.

2.1.1.2.1. Беларускія матэрыялы цюркска-арабскім пісьмом. Большую частку беларускіх матэрыялаў, пісаных некірылічным пісьмом, складаюць літаратурныя творы беларускіх татараў, мусульманаў з Крыма, якія асталяваліся ў ВКЛ у XIII або пачатку XIV ст. Асноўнымі паводле ліку жыхароў татарскімі цэнтрамі з XV ст. былі ў парадку памяншэння Троцкі, Наваградскі, Мінскі і Ашмянскі паветы. Для даследчыка гістарычнае фаналогіі беларускае мовы значэнне помнікаў

---

[1] Кірылічныя правапісныя нормы могуць змяняцца ў залежнасці ад літаратурнага жанру і спосабу пісьма. Напр., ужыванне дыякрытычнага значка, вядомага як п а е р ы к , дзеля абазначэння *й* больш тыповае для рукапісных, як для друкаваных кніг.

[2] Важнае абагульненне славянскіх запазычанняў у сярэднявечных літоўскіх тэкстах гл.: P. Skardžius. "Die slavischen Lehnwörter im Altlitauischen", *TŽ* 7, 1931 {і асобн. выд.} Kau, 1931.

беларускіх татараў палягае якраз у моўнай асіміляцыі татараў. Татары, відаць, выракліся свае роднае мовы на карысць мясцовае славянскае гаворкі – беларускае, польскае або ўкраінскае; паводле сучасных крыніц, змена мовы ў татараў скончылася ў канцы XVI ст. (Vakar)[1]. Дзеля ўжывання запазычанняў з усходніх моваў дыялект беларускае мовы, якім гаварылі татары, можна, не разабраўшыся, прыпісаць беларусам нетатарскага паходжання (беларускую мову, якой цяпер гавораць татары, апісаў Кшычыньскі (Krzyczyński 1938). Арабскай працягвалі паслугоўвацца як літургічнай мовай татарскае грамады, а ў некаторых колах ведалі і турэцкую. Татары пераклалі мусульманскія літургічныя творы і фальклор у гутарковую польскую, беларускую і ўкраінскую мовы. Гэтыя матэрыялы напісаныя выключна цюркска-арабскім пісьмом.

Сучасныя навукоўцы датуюць першыя тэксты XVII ст., хоць некаторыя ранейшыя аўтары прапанавалі датаваць іх XVI ст. Пра існаванне беларускіх дакументаў, пісаных цюркска-арабскім пісьмом, было вядома больш за стагоддзе таму, але даследаванне фрагментаў тэкстаў і публікацыя іх у лацінічнай або кірылічнай транслітарацыі пачаліся толькі ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг., хоць яшчэ ў 1890 г. Мурко падкрэсліваў важнасць гэтых тэкстаў для беларускага мовазнаўства. Першы навуковец, што скарыстаў з дакументаў беларускіх татараў, быў Станг (Stang), які абапіраўся на Станкевічаву лацінічную транслітарацыю, надрукаваную ў *Slavia*. У сваіх апошніх даследаваннях Антановіч падае шмат прыкладаў і некалькі звязных тэкстаў у арыгінальным правапісе, але, на жаль, ён не здолеў апублікаваць ніводнага тэксту цалкам. Шмат матэрыялаў, апублікаваных у лацінічнай і кірылічнай транслітарацыі, маюць спрэчную вартасць, бо часта яны недакладныя і адлюстроўваюць староннасць даследчыкаў (напр., Станкевіч 1933). Нават Антановіч не зусім бесстаронны.

Выбраная бібліяграфія

"O rękopisie polskim arabskiemi literami", *Rozmaitości Lwowskie* 1840, 21.

[1] Уласную мову татараў акрэслівалі па-рознаму: як кіпчак-палавецкую (Wł. Zajączkowski), чагатайскую (Szynkiewicz), кіпчак-агузскую (Baskakow) або як кіпчак-куманскую (A. Zajączkowski).

А. Мухлинский. *Исследование о происхождении и состоянии литовских татар.* СПб, 1857; [Muchliński]. "Zdanie sprawy o Tatarach Litewskich", *Teka Wileńska* 4, 1858.

M. Murko. "Zur russischen Literaturgeschichte", *ASPh* 12, 1890.

Л. Кричинский. *Библиографические материалы о татарах Польши, Литвы, Белоруссии и Украины.* СПб, 1917; [Krzyczyński]. *Bibliografie do historii Tatarów polskich.* Zamość, 1935; *Tatarzy litewscy. Próba monografii historiczno-etnograficznej.* W, 1938 (= *RT* 3).

М. Гарэцкі. *Гісторыя беларускае літэратуры.* В, 1921, с. 41. {Фотакопія перадрук. у} М. Гарэцкі. *Хрэстаматыя беларускае літэратуры: XI век – 1905 год.* В, 1923, с. 49.

Е. Карский. "Белорусская речь арабским письмом", *Ученые записки высшей школы г. Одессы* 2, 1922; "Культурные завоевания русского языка в старину на западной окраине его области", *ИОРЯС* 29, 1924. {Перадрук. у} *Трудах.*

И. Крачковский. "Рукопись Корана в Пскове", *Доклады АН СССР, Серия Б.* Л, 1924. {Перадрук. у } *Избранных сочинениях* 1. М–Л, 1955.

Я. Станкевіч, М. Таўэрава. "Адрывак з Ай Кітабу", *Крывіч* 2 (8), 1924.

J. Talko-Hryncewicz. *Muślimowie czyli tak zwani Tatarzy litewscy.* Kr, 1924.

М. Таўэрава, Я. Станкевіч. "Апавяданне з Аль-Кітабу", *Крывіч* 9 (1), 1925.

А. Шлюбскі. "Беларуская мова арабскай транскрыпцыяй", *НК* 6–7, 1926.

В. Вольскі. "Аб асаблівасьцях жывой мовы беларускіх татар і арабскай транскрыпцыі «Аль-Кітабу»", *Узв* 1927, 8–9; "Асноўныя прынцыпы арабскай транскрыпцыі беларускага тэксту ў кітабах", *Узв* 1927, 6; "Наконт нацыянальнай літаратуры беларускіх татар", *Узв* 1927, 4; "Татары на Беларусі", *НК* 1927, 4 (19); "Цюрка-татарскія элементы ў беларускай мове", *Узв* 1929, 6.

"O kitabie", *RT* 1, 1932.

H. Szapszał. "O zatraceniu języka ojczystego przez Tatarów w Polsce", *RT* 1, 1932.

Я. Станкевіч. "Беларускія мусульмане і беларуская літэратура арабскім пісьмом", *ГБНТ*; J. Stankevič. "Příspěvky k dějinám běloruského jazyka na základě rukopisa «Al-Kitab»", *SI* 12, 1933–1934; Я. Станкевіч. "Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг., «аль Кітаб»", *Калосьсе* 1938, 4; 1939, 1–3; [J. Stankievič]. "Mova rukapisu "Al Kitab" kryvickaha muzeju Jvana Łuckieviča ŭ Vilni", *Veda* 1952, 1–3, 5, 8, 11–12; 1953, 1–2, 4–6 {і асобн. выд.} NY, 1952.

C. Stang. *Die westrussische Kanzleisprache des Großfürstentums Litauen.* O, 1935, 125–131.

J. Szynkiewicz. "Literatura religijna tatarów litewskich i jej pochodzenie", *RT* 2, 1935; {Рэц. на публікацыі Станкевіча 1933 і 1933–1934 у} *RT* 2, 1935.

A. Woronowicz. "Kitab Tatarów litewskich i jego zawartość", *RT* 2, 1935; "Szczątki językowe Tatarów litewskich", *RT* 2, 1935; "Język polski w transkrypcji arabskiej", *Życie Tatarskie* 4, 1937, 1.

A. Zajączkowski. "Elementy tureckie na ziemiach polskich", *RT* 2, 1935. {Скарочаная версія з'явілася па-турэцку} "Lehistan Arazisinde Türk Unsurlari", *Türklük* 5–6, 1939; "Tak zwany chamaił tatarski ze zbioru rękopisów w Warszawie", *Spr* 52, 1951, 4.

Wł. Zajączkowski. "Resztki językowe Tatarów litewskich", *Spr* 49, 1948.

T. Lewicki. "Świat słowiański w oczach pisarzy arabskich", *Slavia Antiqua* 2, 1949–1950; *Polska i kraje sąsiednie w świetle "Księgi Rogera" geografa arabskiego z XII w. al-Idrīsī'ego* 2. W, 1954; *Źródła arabskie do dziejów słowiańszczyzny* 1. Wr–Kr, 1956.

N. Vakar. *Belorussia. The Making of a Nation, A Case Study.* Camb, 1956, 44, 240.

N. Baskakow. "Z prac nad słownikiem karaimsko-rosyjsko-polskim", *PO* 1960, 4.

M. Konopacki. "O muzułmanach polskich", *PO* 43, 1962, 3.

T. Muftić. "O arabici i njenom pravopisu", *Prilozi za orijentalnu filologiju* 14–15, 1964–1965 [1969].

А. Антонович. (1968а) *Белорусские тексты, писанные арабским письмом.* В, 1968; (1968б) "Краткий обзор белорусских текстов, писанных арабским письмом", *Полесье.* М, 1968.

А. Жураўскі. {Рэц. на} Антонович 1968а, *Весці* 1969, 4.

G. Meredith-Owens, A. Nadson. "The Byelorussian Tatars and Their Writings", *JBS* 2, 1970, 2.

P. Wexler. {Рэц. на} Антонович 1968а, *General Linguistics* 11, 1971, 1; "Jewish, Tatar and Karaite Communal Dialects and Their Importance for Byelorussian Historical Linguistics", *JBS* 3, 1973, 1; "Explorations in Byelorussian Historical Bilingual Dialectology and Onomastics", *SEER* 52, 1974.

*[*C. Łapicz. *Kitab tatarów litewsko-polskich (Paleografia. Grafika. Język).* Toruń, 1986.*]*

[Турэцка-беларускі размоўнік 1836 году: З збораў Нацыянальнага Музэю Літоўскай Рэспублікі ў Вільні. Прадмова, падрыхт. тэксту, публ. і камэнт. Г. Александровіч-Мішкінене, С. Шупы; аг. рэд. С. Шупы. Нью Ёрк, 1995.*]*

*[*Г. Мишкинене. *Древнейшие рукописи литовских татар (Графика. Транслитерация. Перевод. Структура и содержание текстов).* В, 2001.*]*

*[*В. Несцяровіч. *Старажытныя рукапісы беларускіх татар: Графіка. Транслітарацыя. Агульная характарыстыка мовы. Фразеалогія.* Віцебск, 2003.*]*

2.1.1.2.2. Беларускія матэрыялы габрайскім пісьмом. На думку адразу прыходзіць параўнанне паміж беларускімі матэрыяламі, пісанымі цюркска-арабскім пісьмом, і фрагментамі беларускіх тэкстаў,

якія захаваліся ў іншым семіцкім пісьме – габрайскім (з абодвух тыпаў габрайскіх крыніц, пісаных іўрытам і ідышам, а таксама з караімскіх дакументаў, пісаных іўрытам)[1]. Назваў беларускіх паселішчаў і выпадковых глосаў, пісаных габрайскім пісьмом, далёка менш, як гутарковых беларускіх тэкстаў, пісаных цюркска-арабскім пісьмом. Аднак габрайскія дадзеныя могуць мець пэўную перавагу з прычыны іх больш стыхійнага набліжэння да беларускага гутарковага вымаўлення. Мяркуючы з частага разнабою ў правапісе, у габраяў не было звычаю пісаць па-беларуску габрайскімі літарамі. Калі гэта так, дык значыць не маглі развіцца габрайскія правапісныя нормы для перадачы беларускае мовы (акрамя, магчыма, тапонімаў і ўласных імёнаў). Што да традыцыі татараў пісаць па-беларуску на працягу некалькіх стагоддзяў выключна цюркска-арабскімі літарамі, то заўсёды ёсць небяспека, што арфаграфічныя нормы ўсталююцца, і гэта панізіць іх значэнне як адлюстравання гутарковае мовы. Значная уніфікацыя правапісу ў татарскіх тэкстах пацвярджае гэтае дапушчэнне (сведчанні супраць уніфікацыі гл. на с. 50–51). Правапіс беларускіх тапонімаў у караімскіх і габрайскіх дакументах, здаецца, не адрозніваецца, але гэтае пытанне патрабуе далейшага вывучэння.

Выбраная бібліяграфія

1. Агульная

Е. Карский. "Еврейский элемент в белорусской литературе, особенно в старой", *Утро Белоруссии* 11.IV.1920; Я. Карскі. "Жыдоўскі элемэнт у беларускай мове і літаратуры, асабліва старой", *Беларусь* 5 і 6.VI.1920; Е. Карский. "Культурные взаимоотношения народностей Белоруссии. I. Евреи и их влияние на белорусский язык и литературу, особенно старую", *Утро Белоруссии* 9.VI.1920; "Евреи и их влияние на белорусскую литературу", *Утро Белоруссии* 15.VI.1920; "Культурные завоевания русского языка в старину на западной окраине его области", *ИОРЯС* 29, 1924 {і перадрук. у} *Трудах.*

[1] Пасяленне габраяў-ашкеназі на Беларусі датуюць XIV ст. Караімы – паслядоўнікі юдаістычнае секты, што залажылася ў IX ст. на Сярэднім Усходзе і адкідала аўтарытэт Талмуда. Іх літургічнай мовай быў іўрыт, як і ў саміх габраяў. Цюркскамоўныя прыхільнікі гэтае секты рассяліліся на ўсходніх, паўночналітоўскіх і заходнебеларускіх землях ВКЛ у пачатку XV ст., а мо і раней.

Д. Маггід. "Падзеі 1648–1656 г. на Украіне й Польшчы в еврейскій літаратуры XVII–XIX вв. [Бібліографія й регесты]", *Збірник праць жидівської історично-археографічної комісії* 2. К, 1929, 255.

N. Prilucki. ["Назіранні над некаторымі назвамі тавараў і людзей у бельскім і лукаўскім падатковых спісах"] (ід.), *HŠ* 2, 1937, 205.

N. Baskakow. "Z prac nad słownikiem karaimsko-rosyjsko-polskim", *PO* 1960, 4.

Н. Баскаков, А. Заенчковский, С. Шапшал. *Караимско-русско-польский словарь*. М, 1974.

P. Wexler. "Explorations in Byelorussian Historical Bilingual Dialectology and Onomastics", *SEER* 52, 1974.

*[*П. Векслер. "Забыты беларускі кантэкст сучаснай гебрайскай мовы", *Беларусіка = Albaruthenica* 4. Мн, 1995.*]*

2. Матэрыялы па беларускай тапаніміцы габрайскім пісьмом

A. Neubauer. *Aus der Petersburger Bibliothek*. Beiträge und Dokumente zur Geschichte der Karäerthums und der karäischen Literatur. Lei, 1866.

Š. Dubnov. ["Рада чатырох земляў у Польшчы і генеалогія кагалаў"] (іўр.), *Sefer hayovel* (для Н. Сакалова). W, 1904; *Pinkas hamedina, o pinkas vaad hakehilot harašiot bimdinat lita*. B, 1925. {Упершыню надрукавана з расійскім перакладам як дадатак да} *EC* 1909 {і наст., пад назваю} *Областной Пинкос Ваада главных еврейских общин Литвы*.

S. Asaf. ["З заблудаўскіх сшыткаў"] (іўр.), *Kir* 1, 1925.

Bjuleten funm Yidišn opteyl fun Insitut far vajsruslendišer kultur. Мн, 1926, 2.

I. Nalpern. ["Назвы польскіх мясцовасцяў у габрайскіх крыніцах"] (іўр.), *Leš* 4, 1932; ["Высвячэнні рады чатырох земляў у Польшчы"] (іўр.), *Kir* 11, 1935.

E. Feldman. ["Найдаўнейшыя дакументальныя весткі пра габраяў у польскіх гарадах у XIV–XVI стст."] (ід.), *Bleter far gešixte* 1, 1934.

J. Mann. *Texts and Studies in Jewish History and Literature* 2. *Karaitica*. Philadelphia, 1935, {асабліва с. 553–766; тэксты с. 769–1456}.

Y. Hart. ["Габрайскія назвы мястэчак і гарадоў у Польшчы"] (ід.), *YŠ* 2, 1942, 4.

A. Yaari. ["Габрайскі друк у Шклове"] (іўр.), *Kir* 22, 1945–1946.

F. Beranek. "Jiddische Ortsnamen", *Zeitschrift für Phonetik* 5, 1951, 1.

R. Mahler. ["Габрайскія тапонімы ў старой Польшчы"] (іўр.), *Rešumot NS* 5, 1953.

Y. Levitac. ["Габрайскія таварыствы ў Расіі"] (іўр.), *Heavar* 7, 1960.

M. Vilenski. ["Довады супраць хасідызму ў Мішне"] (іўр.), *Sefer-yovel leyicxak Ber*. J, 1961.

E. Stankiewicz. "Yiddish Place Names in Poland", *FY* 2, 1965.

Y. Ben-Zvi. *Mexkarim umkorot.* J, 1966, {асабліва с. 49–55}.

*[*В. Шур. "Некаторыя асаблівасці анамастычнай лексікі беларускіх яўрэяў", *Беларусіка = Albaruthenica* 4. Мн, 1995.*]*

3. Матэрыялы па беларускіх глосах і тэкстах, пісаных габрайскім пісьмом

B. C. Katz. *Lektorot hayehudim berusia, pojlin velita.* B, 1899.

С. Дубнов. "Разговорный язык и народная литература польско-литовских евреев в XVI и первой половине XVII века", *EC* 1, 1909.

Д. Маггид. "Иноязычные заговоры у русских евреев в XVIII и начале XIX в. (По рукописным материалам)", *EC* 3, 1910.

A. Litvin. ["Славянскія прыказкі беларускіх габраяў"] (ід.), *Lebn un visnšaft* 8–12, 1912.

Š. Anski. ["Замовы літоўска-беларускіх габраяў"] (ід.), *Gezamlte šriftn* 15. *Folklor un etnografye.* V–W–NY, 1925.

Y. Goldberg. ["Габрайская песня ў мяшанай і чужой мове"] (ід.), *Cayts* 2–3, 1928.

I. Rubašov. ["Паказанні габраяў-сведкаў і адказы рабінаў з пачатку XV да канца XVI ст."] (ід.), *HŠ* 1, 1929.

Y. Bruckus. ["Дзве іншамоўныя лічылкі сярод габрайскіх дзяцей у Жамойці"] (ід.), *YB* 26, 1945, 2.

M. Altbauer. ["Транскрыпцыя біблійных імёнаў ва ўсходнеславянскім перакладзе «Кнігі Руф»"] (іўр.), *Leš* 25, 1961.

[The Five Biblical Scrolls in a Sixteenth-Century Jewish Translations into Belorussian (Vilnins Codex 262). Introd. and notes by Moshe Altbauer. Jerusalem, 1992.*]*

*[*П. Вэкслер. "Што могуць ідыш, сучасны іўрыт, эсперанта, а таксама сербалужычане, палешукі і хазары сказаць пра паходжанне габрэяў-ашкеназі", *Arche* 3, 2000.*]*

2.2. Тапонімы

Тапанімічны матэрыял дае каштоўныя дадзеныя для гістарычнае фаналогіі беларускае мовы, але навукоўцы з яго збольшага не карысталі. Яшчэ ў 1952 г. У. Вайнрайх жаліўся, што ён не можа спамянуць "ніводнае спробы знайсці фанетычна падобныя тапонімы як магчымае сведчанне перасялення славянаў". Пасля 1952 г. тапанімічныя даследаванні зрабіліся больш інтэнсіўныя, але найперш для таго, каб вызна-

чыць долю балцкага субстрату на беларускай і суседніх усходнеславянскіх землях. Нам цяжка карыстаць з тапанімікі дзеля адсутнасці хоць якога гістарычнага слоўніка беларускіх тапонімаў.

Акрамя ўласнабеларускіх назваў паселішчаў, можна скарыстаць з (а) іншамоўных назваў паселішчаў на беларускай тэрыторыі (найперш балцкага паходжання), якія можна выявіць у рознай ступені беларусізацыі, (б) транскрыпцыі назваў беларускіх паселішчаў, змешчанай ва ўспамінах чужаземных падарожнікаў па Беларусі, а таксама ў заграничных картаграфічных выданнях, і (в) назвы паселішчаў з гістарычных дакументаў на суседніх мовах.

Паколькі тапонімы могуць быць карысныя ў вызначэнні субстрату, міграцый насельніцтва і адноснай храналогіі гукавых зменаў, мовазнавец мусіць быць уважлівы і не рабіць паспешлівых высноў.

Той, хто даследуе ўплыў субстрату, мае спярша вызначыць, ці існаванне тапонімаў, што паходзяць ад этнонімаў, сапраўды сведчыць пра гістарычную прысутнасць нейкае этнічнае групы: у шмат якіх выпадках назва паселішча можа паходзіць ад прозвішча, якое ў сваю чаргу выводзіцца з этноніма.

Фанетычныя рысы пэўнага паходжання могуць выявіцца на тэрыторыі, дзе гэтая этнічная група ніколі не жыла. Напр., назвы паселішчаў у заходнеславянскай фанетычнай форме сустракаюцца ў беларускіх габраяў, якія гавораць ідышам, далёка на ўсход ад мяжы паміж усходнеславянскімі і заходнеславянскімі ізаглосамі, напр., ід. *grodne* для бел. *Гродна* (з ґ выбухным) і польск. *Grodno* (але ў тэкстах, пісаных іўрытам, сустракаецца *h* (= г фрыкатыўны), як адзначана на с. 31). Гэты факт можа сведчыць толькі пра тое, што людзі, якія гаварылі ідышам, прыйшлі спачатку з Польшчы, дзе яны ўпершыню і пазналі назву гэтага горада, а не пра тое, што яны перанялі назву гэтага горада ад людзей, што гаварылі нейкім заходнеславянскім дыялектам, якія некалі жылі далей на ўсход, чым цяпер. Сталіца Беларусі цяпер афіцыйна называецца *Мінск*, але ў даўнейшых тэкстах знаходзім *Мѣньскъ* або *Мѣнескъ*; і яшчэ ў 1930-х гг. горад называўся *Менскам*. Цяперашнюю форму абвясцілі афіцыйнай у канцы 1930-х, каб як найболей наблізіць яе да расійскай формы *Минск*, якая папраўдзе сама ёсць запазычаннем з украінскае або з польскае мовы; царкоўна-

славянскі *ѣ* перайшоў у *е* ў большасці беларускіх і расійскіх гаворак, а ва ўкраінскіх – у *і* (гл. змену 20)[1].

Заўсёды ёсць небяспека памылковае ідэнтыфікацыі этнічных групаў з боку саміх беларусаў. Напр., караімаў усходняе Літвы суседзі-беларусы часта памылкова лічылі за татараў, што жылі побач, вось жа мястэчкі, у якіх жылі адны караімы, маглі называцца "татарскімі", дарма што яны маглі ніколі не быць татарскімі паселішчамі, напр., (у польскай арфаграфіі) *Tataryszki*, *Tatarski Wał*, *Tatarskie Mogiły* (Szyszman).

У разе працяглых кантактаў, такіх як балцка-беларускія, ёсць таксама небяспека перарывання лексічнае традыцыі ў адной з моваў з пазнейшым "паўторным заражэннем". Калі бел. *Коўна* паходзіць ад літ. *Kaĺnas*, дык суч. літ. *Kaũnas* ёсць зменай першапачатковага балцкага этымона ў адпаведнасці з беларускімі фанетычнымі нормамі (Otrębski), г. зн. балцкі корань зазнаў у беларускай мове фанетычных зменаў, а пасля зноў быў запазычаны літоўскай мовай, дзе замяніў спрадвечны корань.

Трэба таксама браць на ўвагу магчымасць свядомае змены назвы. Прыкладам можа быць горад Прапойск у Магілёўскай вобласці, які ў 1945 г. перайменавалі ў Слаўгарад.

Выбраная бібліяграфія

Н. Барсов. *Материалы для историко-географического словаря России* 1. *Географический словарь русской земли (9–14 ст.)*. В, 1865; Н, 1970.

В. Кордт. "Несколько слов о летописи Абрамека", *Московские ведомости* 238, 1866; ред. *Материалы по истории русской картографии* 1. К, 1899; *Чужоземні подорожі по Східній Европі до 1700 р.* К, 1926.

Н. Оглобин. "Объяснительная записка к карте Полоцкого повета во 2-ой половине XVI-го века", *Сборник археологического института* 3, 1880, 2.

[1] Яшчэ адзін прыклад украінізацыі беларускага тапоніма – *Нясвіж* < *Nesъsvěž*. У канцы XVII ст. у беларускіх тэкстах, пісаных іўрытам, знаходзім напісанне *nʿš/swwyz* (гл. таксама змену 17). Погляд, што беларуская тапаніміка не зазнала ўкраінскага ўплыву, гл. у А. Абрэмбскай-Яблоньскай (A. Obrębska-Jabłońska. "Czy ukraiński wpływ na toponimię białoruską?", *SlOr* 22, 1973, 2) і Р. Максімовіча ("Як беларускі Менск стаўся «Мінскам»", *Запісы* 12, 1974).

И. Спрогис. Географический словарь Жомойтской земли XVI столетия. В, 1888.

Ю. Трусман. *Этимология местных названий Витебской губернии.* Ревель, 1897.

E. Wolter. "Zur altlitauischen Topographie der russischen Städte Wilna und Troki", *Mitteilungen der Litauischen Litterarischen Gesellschaft* 4, 1899.

А. Соболевский. "Названия населенных мест и их значение для русской исторической этнографии", *СбОРЯС* 38, 1910, 3.

K. Būga. "Kann man Keltenspuren auf baltischem Gebiet nachweisen?", *RS* 6, 1913. {Перадрук. у} *RR* 1; "Aistiškosios kilmės Gudijos vietovardžiai", *TŽ* 1, 1923. {Перадрук. у} *RR* 3; "Upių vardų studijos ir aisčių bei slavėnų senovė", *TŽ* 1, 1923. {Перадрук. у} *RR* 3; "Die Vorgeschichte der aistischen (baltischen) Stämme im Lichte der Ortsnamenforschung", *Streitberg Festgabe.* Lei, 1924; "Die litauisch-weißrussischen Beziehungen und ihr Alter", *ZSPh* 1, 1924. {Перадрук. у} *RR* 3.

Я. Тараноўскі. "Да пытання аб паходжанні назваў вёсак, мястэчак, гарадоў Беларусі", *НК* 4–5, 1926.

А. Селищев. {Рэц. на} Н. Дурново, *Очерк истории русского языка.* М–Л, 1924, *ИОРЯС* 32, 1927. {Перадрук. у} *ИТ.*

Е. Карский. "К истории белорусского языка в XVII столетии", *Известия по русскому языку и словесности* 3, 1930, 1. {Перадрук. у} *Трудах.*

R. Ekblom. "Idrīsī und die Ortsnamen der Ostseeländer", *Namn och Bygd. Tidskrift för nordisk Ortnamnsforskning* 19, 1931.

M. Vasmer. "Wikingerspuren in Russland", *Sitzungsberichte der preussischen Akademie der Wissenschaften. Philologisch-historische Klasse* (B) 24, 1931; {рэд.}. *Wörterbuch der russischen Gewässernamen.* B–Wies, 1960 {і наст.}; {рэд.}. *Russisches geographisches Namenbuch.* Wies, 1962 {і наст.}.

A. Brückner. *O nazwach miejscowych.* Kr, 1935.

K. Jablonskis. *Istorijos archyvas* 1. *XVI amžiaus lietuvos inventoriai.* Kau, 1935.

A. Szyszman. "Osadnictwo karaimskie w Trokach za wielkich książąt litewskich", *MK* 11, 1935.

И. Матвеенко. *Семантический и морфологический анализ древней белорусской топонимики.* Мн, 1947 {неапублікаваная дысертацыя}.

U. Weinreich, "*Sábesdiker losn* in Yiddish: A Problem of Linguistic Affinity", *Word* 8, 1952.

L. Ossowski. "Gwarowe białorusko-ukraińskie nazwy miejscowe na *-ičа*", *Onomastica* 1, 1955.

A. Isačenko. "Herbersteiniana", *ZSl* 2, 1957.

М. Грынблат. "Анамастыка як крыніца вывучэння гісторыі і этнаграфіі беларускага народа. (Па матэрыялах беларускіх прозвішчаў)", *ММЗС*;

М. Гринблат. "К вопросу об участии литовцев в этногенезе белорусов", *Вопросы этнической истории народов Прибалтики по данным археологии, этнографии и антропологии. Труды Прибалтийского объединения комплексной экспедиции.* М, 1959; М. Грынблат. "Беларуская анамастыка. (Матэрыялы для бібліяграфіі)", *Працы* 7, 1960; "Эцюды па беларускай анамастыцы", *Весці* 1965, 4; [М. Гринблат]. "Этнонимическая топонимия и антропонимия Белоруссии. (К этнической истории белорусов)", *Тексты докладов и сообщений. Всесоюзная конференция по топонимике СССР. 28 января – 2 февраля.* Л, 1965.

В. Топоров. "О балтийских следах в топонимике русских территорий", *LKK* 2, 1959.

А. Вяржбоўскі. "Балтызмы ў беларускай мове", *Весці* 1959, 2.

J. Otrębski. "O badaniach nad nazwami wodnymi i miejscowymi na obszarze Litwy", *PrO* 5, 1961; "Slawizacja litewskich nazw wodnych i miejscowych", *ZPSS* 1963; "Die Ortsnamen *Kowno, Grodno* und *Olita* in Litauen", *BNF NS* 6, 1971.

В. Жучкевич. *Происхождение географических названий (топонимика) Белоруссии.* Мн, 1961; "Топонимические исследования Белоруссии", *Друга республіканська ономастична нарада.* К, 1962; *Топонимика Белоруссии.* Мн, 1968, {асабліва слоўнік, с. 131–177}.

В. Топоров, О. Трубачев. *Лингвистический анализ гидронимов Верхнего Поднепровья.* М, 1962.

M. Gimbutas. "Ancient Baltic Lands. A rézumé of linguistic and archaeological data", *IJSLP* 6, 1963.

K.-O. Falk. "O metodach slawizacji litewskich nazw osobowych i miejscowych. O genezie i rozpowszechnieniu nazw na *-ańce*", *Språkliga Bidrag* 4 (19), 1964.

В. Гринавецкис. "Две заметки по литовской диалектологии", *ПИЕЯ.*

Л. Гумецька. "Особові назви литовського походзення в українських грамотах XIV–XV вв.", *Дослідження і матеріали з української мови* 6, 1964.

G. Jacobsson. "A Rare Variant of the Name of Smolensk in Old Russian", *ScSl* 10, 1964.

А. Непокупный. *Ареальные аспекты балто-славянских языковых отношений.* К, 1964; А. Непокупний. "Українсько-балтійські студії", *Мов* 1968, 6; *[*А. Непокупный. *Балто-севернославянские языковые связи.* К, 1976*].*

St. Alexandrowicz. "Mapa Wielkiego Księstwa Litewskiego Tomasza Makowskiego z 1613 r. tzw. 'radziwiłłowska', jako źródło do dziejów Litwy i Białorusi", *Studia źródłoznawcze* 10, 1965.

М. Бірыла. *Беларуская антрапаніміка.* Мн, 1966.

М. Бірыла, А. Ванагас. *Літоўскія элементы ў беларускай анамастыцы.* Мн, 1968.

J. Prinz. *Die Slavisierung baltischer und die Baltisierung slavischer Ortsnamen im Gebiet des ehemaligen Gouvernements Suwałki.* Wies, 1968; *Versuch einer orientierenden Bestimmung von Namenräumen im frühostslavischen Bereich.* Heid, 1969 (= *BNF* 5).

Е. Поспелов. "Относительная достоверность названий на старинных картах", *Развитие методов топонимических исследований.* М, 1970.

W. Ostrowski. *The Ancient Names and Early Cartography of Byelorussia.* Lo, 1971.

О. Трубачов. "Этимологічні спостереження над стратиграфією ранньої східнословьянської топонімії", *Мов* 1971, 6.

*[*А. Рогалев. *Этнотопонимия Беларуси (на фоне этнической истории).* Гомель, 1993.*]*

*[*Г. Мезенка. *Беларуская анамастыка.* Мн, 1997.*]*

2.3. Картаграфія гукавых зменаў у беларускай мове

2.3.1. Дыялектная геаграфія беларускае мовы. Досыць цяжка вызначыць першапачатковы геаграфічны абсяг гістарычных гукавых зменаў. Сітуацыя ў цяперашніх беларускіх гаворках можа памагчы лакалізаваць прыблізныя цэнтры пашырэння гістарычных гукавых зменаў і ўстанавіць іх адносную храналогію. Мала таго, сінхранічныя даследаванні сучасных гаворак выяўляюць у жывой мове тыя фаналагічныя рысы, што або мала, або зусім не зафіксаваныя ў пісьмовых помніках. Вывучэнне сучасных дыялектаў важнае ў вытлумачэнні арфаграфічных непаслядоўнасцяў у старых тэкстах. Напр., паколькі ў сучасных беларускіх гаворках няма прыкладаў пераходу *ѣ* > *і*, можна было б тлумачыць усе сведчанні пра такі пераход у гістарычных тэкстах пераважна як прыклады ўплыву ўкраінскай арфаграфіі (ва ўкраінскіх дыялектах *ѣ* перайшоў у *і*), а не як гукавую змену, уласцівую нейкаму беларускаму дыялекту ў мінулым. Пры такім падыходзе, аднак, ёсць небяспека перанясення сінхранічных фактаў на ранейшыя перыяды.

Аднавіць гістарычныя дыялектныя групы цяжка, бо тэксты, якія захаваліся, звычайна адлюстроўваюць тыя гаворкі, якія былі асновай пісьмовае мовы ў пэўны перыяд. У выніку мовазнавец часам спатыкаецца з храналагічнай мешанінай або з мазаікай фрагментаваных дадзеных. У пэўны час мова тэкстаў можа грунтавацца амаль выключна

на гаворках адной геаграфічнай зоны, а ў іншы перыяд – на гаворках зусім іншага абшару. Калі большасць дакументаў XIII ст. складзена на паўночных і ўсходніх тэрыторыях (г. зн. у Смаленску, Полацку і Віцебску), дык тэксты сярэдзіны XIX – пачатку XX ст. грунтаваліся пераважна на гаворках заходняе часткі цэнтральных дыялектаў (Вільня–Мінск), бо выдатнейшыя аўтары і выдаўцы першых беларускіх перыёдыкаў паходзілі з гэтага абшару.

Даследчык гістарычнае дыялекталогіі беларускае мовы знаходзіцца ў досыць добрым становішчы, бо мае шмат апісальных манаграфій і дыялектных атласаў большае часткі Беларусі. Першы дыялектны атлас выдаў Бузук у 1928 г., а больш поўны *ДАБМ* з'явіўся ў 1963 г.[1]. Сінхранічную класіфікацыю беларускіх гаворак даюць Гапановіч (Гапанович), Мацкевіч (Мацкевич), Мурашка (Мурашко) і Арашонкава (Орешонкова). Беларускія ізаглосы на польскай тэрыторыі прааналізаваў Курашкевіч (Kuraszkewicz).

Апроч дыялектаў, акрэсленых геаграфічна, амаль што кожная моўная супольнасць складаецца з гаворак, акрэсленых сацыяльна. Але ад спецыяліста ў гісторыі мовы гэта часта скрыта. Аднак часта адхіленні ад правапісных нормаў выяўляюць розніцу паміж узорамі высокае і нізкае мовы; часам асаблівасці ўзору нізкае мовы свядома ўвыдатняюцца і высмейваюцца, як, напр., "мазурэнне" (mazurzenie) у гаворцы бедных габраяў у так званых "інтэрлюдыях" XVII–XVIII стст. (*кажаш* > *казас*, *чорны* > *цорны*, *аж* > *аз*).

З моваў, пашыраных на той самай тэрыторыі, што і беларуская, толькі ідыш дэталёва дакументаваны: гл. Вэйнгер (Veynger), Віленкін (Vilenkin), Гэрцаг (Herzog). Выданне лінгвістычнага і культурнага атласа ашкеназійскіх габраяў, якое распачаў У. Вайнрайх і якое працягваюць ягоныя калегі пад кіраўніцтвам М. Гэрцага ў Калумбійскім універсітэце, абяцае даць дадатковы матэрыял пра тэрыторыю Беларусі. Што да суседніх моваў, то шмат дыялекталагічных матэрыялаў яшчэ мае быць апублікавана. Два тамы ўкраінскага атласа пад рэдакцыяй

---

[1] *ДАБМ* уключае некалькі дыялектаў суседніх моваў, такіх як паўночна-заходнія палескія дыялекты ўкраінскае мовы, якімі гавораць на Брэстчыне. З іншага боку, у атласе не паказаныя беларускія дыялекты Літвы, Польшчы, Украіны і РСФСР. Як трапна заўважыў адзін аглядальнік, назву атласа трэба змяніць з "Дыялекталагічнага атласа беларускае мовы" на "Дыялекталагічны атлас БССР" (Дзендзелівський).

Ф. Жылкі ўжо падрыхтаваныя да друку, але яшчэ не выданы. З імі можна пазнаёміцца ў Інстытуце мовазнаўства Украінскае Акадэміі навук у Кіеве[1]. Літоўскі атлас цяпер рыхтуецца[2]. Што да Польшчы, то можна паглядзець *Mały atlas gwar polskich* у 13 тамах (Wr–Kr, 1957–1970), выдадзены К. Нічам і М. Карасем[3]. Матэрыялы пра сумежныя расійскія тэрыторыі яшчэ не апублікаваныя[4].

Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. "Программа для собирания особенностей говоров белорусского наречия", *ИОРЯС* 2, 1897; "Культурные завоевания русского языка в старину на западной окраине его области", *ИОРЯС* 29, 1924. {Перадрук. у} *Трудах.*

П. Бузук. "З лінгвістичних розкопин на Білорусі", *ЗІФВ* 9, 1926; *Спроба лінгвістычнай геаграфіі Беларусі* 1. Мн, 1928.

В. Ластоўскі. *Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі.* Коўна, 1926.

П. Расторгуев. *Говоры восточных уездов Гомельской губернии в их* современном *состоянии.* Мн, 1927; *Северско-белорусский говор. Исследование в области диалектологии и истории белорусских говоров.* Л, 1927; [П. Растаргуеў]. "Да характарыстыкі беларускіх гаворак", *Запіскі* 1, 1928; П. Расторгуев. *Говоры на территории Смоленщины.* М, 1960.

L. Tesnière. {Рэц. на} Бузук 1928, *Slavische Rundschau* 1, 1929.

M. Veynger. *Yidiše dialektologye.* Мн, 1929.

L. Vilenkin. *Yidišer špraxatlas fun Sovetn-farband.* Мн, 1931.

М. Корнеева-Петрулан. "К социальным диалектам Белоруссии XVI в.", *Ученые записки Белорусского государственного университета* 1, 1940.

U. Weinreich. "*Sábesdiker losn* in Yiddish: A Problem of Linguistic Affinity", *Word* 8, 1952.

П. Гапанович, Ю. Мацкевич. "О классификации белорусских диалектов", *ВЯ* 1959, 6; [П. Гапановіч, Ю. Мацкевіч]. "Пытанні класіфікацыі сучасных беларускіх гаворак", *Працы* 6, 1959.

---

[1] З друку выйшаў *Атлас української мови.* Т. 1–2. К, 1984–1988 (заўв. рэд.).

[2] З друку выйшаў *Lietuvių kalbos atlasas.* T. I–III. V, 1977–1991 (заўв. рэд.).

[3] Гл. таксама *Atlas gwar wschodniosłowiańskich Białostocczyzny* 1–3, 5–7. Wr–W etc., 1980–2000 (заўв. рэд.).

[4] Апублікаваны 3 выпускі атласа, прысвечаныя фанетыцы, марфалогіі і лексіцы: *Диалектологический атлас русского языка: Центр Европейской части России.* Вып. 1–3. М, 1986–1996. Гл. таксама *Восточнославянские изоглоссы.* 1–2. М, 1995–1999 (заўв. рэд.).

Л. Калнынь. "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959.

У. Анічэнка. "Некаторыя пытанні развіцця беларускай мовы ў XVIII стагоддзі", *Весці* 1961, 4.

Wł. Kuraszkiewicz. *Zarys dialectologii wschodniosłowiańskiej.* W, 1963; "Tendencje białoruskie i ukraińskie w gwarach okolic Puszczy Białowieskiej", *ABS* 1, 1964; *[Ruthenica: Studia z historycznej i współczesnej dialektologii wschodniosłowiańskiej.* W, 1985*]*.

M. Herzog. *The Yiddish Language in Nothern Poland, Its Geography and History.* Bl, 1965.

А. Мурашко, Г. Орешонкова. "До питання про класифікацію білоруських говорів", *Праці.*

Ю. Мацкевіч. "Про діалектологічний атлас білоруської мови", *Українська лінгвістична географія.* К, 1966.

K. Morkūnas, A. Viduhiris. "Reikšmingas baltarusų kalbininkų leidinys", *Lietuvių kalbos leksikos raida.* V, 1966.

Дзендзелівський. {Рэц. на} *ДАБМ. Мов* 1968, 1.

А. Усціновіч. "Імёны-мянушкі ў гродзенскіх і брэсцкіх актах XIV–XVII стст.", *ЛД* 1968, 150; [А. Устинович]. "Мужские личные имена в гродненских и брестских актах XIV–XVII вв.", *Антропонимика.* Мн, 1970.

Е. Блінава, Е. Мяцельская. *Беларуская дыялекталогія.* Мн, 1969.

ЛГ.

К. Захарова, В. Орлова. *Диалектное членение русского языка.* М, 1970. 34.

P. Wexler. "Jewish, Tatar and Karaite Communal Dialects and their Importance for Byelorussian Historical Linguistics", *JBS* 1973.

[Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: У 5 т. Мн, 1993–1998.*]*

*[*А. Крывіцкі. *Дыялекталогія беларускай мовы.* Мн, 2003.*]*

2.3.2. Дзвюхмоўная дыялекталогія. Гістарычная дыялекталогія тых моваў, якія ўваходзілі ў блізкія зносіны з беларускаю, можа быць крыніцаю важных дадзеных для беларускае гістарычнае фаналогіі. Вывучэнне такой "дзвюхмоўнай дыялекталогіі" важнае з дзвюх прычын: (1) яно паказвае, ці з'яўляецца пэўная гукавая змена ў беларускай мове часткаю шырэйшае арэальнае з'явы, і (2) памагае лакалізаваць і апісаць наступнае пашырэнне гэтае змены ў беларускай мове. Напр., сінхранічныя апісанні выяўляюць змешванне свісцячых з шыпячымі ў некаторых паўночна-заходніх гаворках беларускае мовы; у параўнанні з даўнейшымі перыядамі гэтая асаблівасць, здаецца, знікае

пад ціскам гаворак (і літаратурнае мовы), дзе зубныя і зазубныя гукі адрозніваюцца. Такое змешванне існуе ў суседніх украінскіх, а таксама і ў некаторых балцкіх, паўночнарасійскіх і польскіх гаворках. Таму ніякі аналіз гэтае беларускае дыялектнае рысы нельга лічыць поўным без вывучэння магчымасці ўзаемных уплываў паміж адпаведнымі мовамі, як славянскімі, так і неславянскімі. Мы не чакаем, што знойдзем вонкавыя матывацыі большасці гукавых зменаў у беларускай мове, але вывучэнне дзвюхмоўнае дыялекталогіі дапаможа выявіць гэтыя фактары там, дзе яны дзеяць.

Нам не трэба запыняцца на фанетычным тлумачэнні запазычанняў з праўсходнеславянскіх гаворак у неславянскія мовы і наадварот, бо немагчыма дакладна вызначыць іх паходжанне з прабеларускіх гаворак як такіх. Але запазычанні ў прабеларускія гаворкі карысныя для ўстанаўлення адноснае храналогіі гукавых зменаў і першых дыялектных групаў унутры ўсходнеславянскае мовы. У гістарычныя часы людзі, якія гаварылі беларускаю моваю, уваходзілі ў зносіны з рознымі індаеўрапейскімі і алтайскімі мовамі: напр., балцкімі мовамі, кіпчацка-цюркскім, ідышаўскім, нямецкімі дыялектамі, цыганскаю, славянскімі мовамі, а таксама з некаторымі мовамі, функцыі якіх былі найперш літургічныя і/або навуковыя – лацінаю, царкоўнаславянскаю, іўрытам і арабскаю.

Шырокі ўплыў на беларускую мову суседніх і пашыраных на адной з ёю тэрыторыі моваў яшчэ больш ускладняе работу моўазнаўцаў – напр., у праўдападобнасці хутчэй рэгулярных гукавых замен, як фанетычных дапасаванняў у запазычаных словах. Напр., польск. *ж* (графічна *rz*) < сярэд.-польск. *ř* < *r'* у беларускай мове рэгулярна замяняецца на *р*: польск. *trzymać* > бел. *трымáць*; польск. *pacierz* > бел. *пáцер(ы)*. І ўсё ж такі не трэба думаць, што беларуская мова запазычыла гэтыя словы яшчэ да змены *r'* > *ř*> *rz* у польскай мове[1].

З усіх славянскіх моваў толькі беларуская і ўкраінская мелі працяглыя зносіны з дзвюма іншымі групамі славянскіх гаворак: заходнеславянскай (найперш, польскаю) і паўднёваславянскаю (царкоўнаславянскаю). Напр., беларуская мова ў розны час паказвала ўсе тры магчымыя

---

[1] У цюркска-арабскім напісанні польск. *ž* < *r'* і ў польскамоўных тэкстах, і ў польскіх словах у беларускіх тэкстах перадаецца арабскаю *r*; толькі ў XIX ст. знайшлі графемы *ż*, *ś* для польск. *ž* < *r'* (Антонович).

рэфлексы праславянскіх спалучэнняў *tj* і *dj* – спрадвечныя ўсходнеславянскія *ч* і *ж* (і пазней *ѕ*) адпаведна, заходнеславянскія *ц*, *ѕ*, паўднёваславянскія (балг.) *шт* (перадаецца як *шч*), *жд*: напр., *уродзай* у XVI ст. з польскае (параўн. з суч. бел. *ураджáй*); *надежда* з ц.-сл., *надежи* – Р.скл. адз. – пачатак XVI ст. (суч. бел. *надзéя*); суч. бел. *моц* з польскае (параўн. рас. *мочь*); суч. бел. *мóшчы* ад ц.-сл. *мощи*. Сучасныя беларускія гаворкі часта захоўваюць дублеты ўсходне- і заходнеславянскага паходжання: старабел. *тóўсты* (ад прасл. **tъlstъ*) і *тлýсты* (ад польск. *tłusty*); старабел. *спрáжка* побач з паўдн.-зах. дыял. *спрóншка* ад польск. *sprzążka* (прасл. **pręgǫ*). У некаторых выпадках дублеты могуць узнікнуць пры спробе адаптацыі запазычанняў, напр., *вантрабя́нка* (польск. *wątrobianka*) і паўдн.-зах. дыял. *вантрабля́нка*, у адпаведнасці з патрабаваннямі да спалучэнняў з губным ва ўсходнеславянскіх мовах (*b* + *j* > *bl'*) (спрадвечнабеларуская форма слова-асновы, калі яна існавала, мела быць $^{+}$*вутрóба* (параўн. з рас. *утрóба*).

Разнастайныя моўныя і культурныя зносіны беларускае мовы з суседнімі і пашыранымі на адной з ёю тэрыторыі мовамі, вельмі розняцца паводле працягласці, інтэнсіўнасці і скіраванасці ўплываў, а таксама паводле ступені геаграфічнага супадзення тых моваў з беларускаю моваю – ад меншых зносін з цыганскаю і латышскаю (у прыватнасці, з латгальскім дыялектам, якім гаварылі на ўсходзе Латвіі) да досыць працяглых уплываў усіх суседніх усходне- і заходнеславянскіх моваў і ўсходнелітоўскіх гаворак. У выніку для даследчыка гістарычнае фаналогіі беларускае мовы гэтыя кантакты розняцца паводле іх важнасці. На жаль, не ўсе гістарычныя фаналогіі суседніх з беларускаю і пашыраных на адной з ёю тэрыторыі моваў аднолькава добра вывучаныя. Напр., мы не маем падрабязных гістарычных фаналогій ідышу або караімскае мовы. Мала таго, найдаўнейшыя тэксты ўсіх суседніх з беларускаю і пашыраных на адной з ёю тэрыторыі моваў, апроч расійскае і ўкраінскае, пазнейшыя за першыя беларускія дакументы, вось жа, гісторыя гэтых моваў у значнай меры абапіраецца на рэканструкцыю. Напр., балцкія кантакты з прабеларускаю моваю датуюць другой паловай I тыс. н. э., але першыя балцкія тэксты з'явіліся толькі ў XVI ст. Кантакты беларускае мовы з цыганскаю, нямецкаю і караімскаю мовамі дагэтуль здаваліся нам амаль няважнымі, але прычынай гэтага можа быць тое, што яны вельмі мала вывучаныя. Болей даследаваны зносіны

беларускае мовы з ідышам, і яны даюць каштоўныя дадзеныя. Ідыш – унікальная мова, бо яна найшырэй распаўсюджаная з усіх моваў, якія існавалі на адной тэрыторыі з беларускаю. З іншага боку, у параўнанні з балцкімі кантактамі, суіснаванне беларускае мовы з ідышам на адной тэрыторыі адносна непрацяглае, бо яго пачатак датуюць XV ст. Яшчэ адною хібаю ідышу ёсць тое, што падзел ягоных дыялектаў на Беларусі сягае, мабыць, не далей за сярэдзіну XVIII ст. (Weinreich).

Адна з галоўных навук беларуска-габрайскае дыялекталогіі палягае ў тым, што вытлумачэнне дадзеных можа быць досыць складанае, дзеля гэтага з агульных рысаў у дзвюх суседніх або існых на адной тэрыторыі мовах нельга карыстацца аўтаматычна. Розныя этнічныя і/або моўныя групы на Беларусі імкнуліся развіваць уласныя культурныя і гандлёвыя цэнтры, вось жа геаграфія агульных рысаў у існых на адной тэрыторыі мовах дапускае вельмі розную канфігурацыю ізаглосаў.

Напр., граніца паміж паўночна-ўсходнім варыянтам ідышу (якім гавораць на Беларусі, у Літве і Латвіі) і цэнтральным варыянтам (якім гавораць у Польшчы) не адпавядае граніцам паміж усходне- і заходнеславянскімі мовамі. Тое, што беларускі ідыш (поруч з іншымі гаворкамі ідышу) мае запазычанае з славянскіх моваў слова *pléjce* ‘плячо’, не трэба лічыць знакам таго, што ў беларускай мове, нават у некаторых яе дыялектах, калі-небудзь адбываўся пераход праславянскага спалучэння *tj* > *c*, як у заходнеславянскіх мовах (польск., чэшск. *plece*, в.-луж. *pleco*, але бел. *плячо́*, рас. *плечо́*). Гэтае слова ў ідышы – проста славянскае запазычанне, упершыню зробленае на польскай тэрыторыі недзе перад XVI ст. і пазней прынесенае на ўсход.

Граніца паміж паўночна-ўсходнім і паўднёва-ўсходнім варыянтамі ідышу (якім гавораць на Украіне, Букавіне, у Малдове і Румыніі), здаецца, адпавядае больш палітычнай, як моўнай граніцы, г. зн. старой граніцы паміж Польшчаю і ВКЛ перад Люблінскай уніяй 1569 г., якая аб’яднала дзве краіны пад уладай Кароны Польскай. Калі граніца паміж беларускаю і ўкраінскаю мовамі ў некаторых мясцовасцях няпэўная, то паміж паўночна-ўсходняй і паўднёва-заходняй гаворкамі ідышу яна досыць выразная.

Не зважаючы на праблемы, уласцівыя даследаванню, дадзеныя з ідышу ў шмат якіх выпадках можна беспасярэдне ўжываць у гістарычнай фаналогіі беларускае мовы. Напр., ва ўсіх гаворках беларускага ідышу ёсць слова *ózere* ‘возера’, запазычанае з беларускае мовы, а ў беларускіх гаворках ёсць варыянты *го́зера*, *во́зера* і *о́зера*, тым часам літаратурная мова ў адзіночным ліку мае *во́зера*, а ў множным – *азёры*. Форма *о́зера*, без прыстаўнога зычнага, адзначана адно на паўднё-

вым захадзе Беларусі (*ДАБМ*, карта 47). З геаграфіі беларускае мовы можна дапусціць, што спачатку ідыш запазычыў гэтае слова з паўднёва-заходніх беларускіх гаворак, а пазней гэты варыянт слова пашырыўся на ўсход, на іншыя дыялекты ідышу (Herzog, Weinreich). Факты ідышу дазваляюць з пэўнасцю сцвярджаць, што ў канцы XV – пачатку XVI ст., у час масавага перасялення габраяў на Беларусь, у яе паўднёва-заходніх раёнах прыстаўных зычных не было (гл. змену 37). Працы з дыялекталогіі ідышу, якія маюць карысныя для даследчыка гістарычнае фаналогіі беларускае мовы дадзеныя, уключаныя ў наступную бібліяграфію.

Выбраная бібліяграфія

T. Gutman. ["Пра развіццё польскіх элементаў у ідышы"] (ід.), *Yidiše filologye* 1, 1924; ["Прыпадабненне зычных у сказе"] (ід.), *Filologiše šriftn fun YIVO* 2, 1928.

М. Шульман. "Аб агульных элементах у беларускай і яўрэйскай мовах", *Полымя* 1926, 8; ["Славянскі ўплыў на фанетыку ідышу"] (ід.), *AŠ* [*серыя 3*] 2, 1938.

М. Вэйнгер. "Геаграфічная наменклатура ў вуснах яўрэяў", *НК* 1926, 1; M. Veynger. *Yidiše dialektologye.* Мн, 1929.

Л. Цьвяткоў. "Некалькі слоў аб беларускім элеменце ў польскай лексыцы", *ПАК.*

N. Štif. ["Дыялекталагічныя працы М. Вэйнгера"] (ід.), *DYŠ* 14–15, 1929; ["Дыялекталагічная экспедыцыя кафедры габрайскае культуры"] (ід.), *DYŠ* 19, 1929.

P. Skardžius. "Die slavischen Lehnwörter im Altlitauischen", *TŽ* 7, 1931 {і асобн. выд.} Kau, 1931.

L. Vilenkin. *Yidišer špraxatlas fun Sovetn-farband.* Мн, 1931.

H. Šklyar. ["Вывучэнне дыялекталогіі ідышу ў Савецкім Саюзе"] (ід.), *Cum 15-n yortag oktyaber-revolyucye: literariš-lingvistišer zamlbux.* Мн, 1932; ["Габрайска-беларускія моўныя паралелі"] (ід.), *LZ* 1, 1933.

Я. Станкевіч. "Жыдоўскія рэлігійныя песьні па беларуску", *ГБНТ.*

M. Gitlits. ["Славянскія запазычанні ў ідышы ў XVI–XVIII стст. паводле пісьмовых крыніц"] (ід.), *LZ* 3, 1936.

В. Жирмунский. "О некоторых вопросах еврейской диалектологии. (По поводу "Еврейского диалектологического атласа" Белорусской Академии Наук)", *Язык и мышление* 9, 1940. {Часткова перакладзена на ідыш у} *YB* 19, 1942.

S. Hrabec. *Elementy kresowe w języku niektórych pisarzy polskich XVI i XVII w.* Toruń, 1949.

U. Weinreich. "*Sábesdiker losn* in Yiddish: A Problem of Linguistic Affinity", *Word* 8, 1952; "Yiddish Blends with a Slavic Element", *Word* 11, 1955; "A Retrograde Sound Shift in the Guise of a Survival. An Aspect of Yiddish Vowel Development", *Estructuralismo y historia. Miscellánea Homenaje a André Martinet* 2. La Laguna, 1958; "Yiddish and Colonial German in Eastern Europe: The Differential Impact of Slavic", *ACICS* 4, 1958; "Multilingual Dialectology and the New Yiddish Atlas", *Anthropological Linguistics* 4, 1962; ["Пра геаграфічны параметр габрайскіх моваў і культуры"] (іўр.), *Leš* 26, 1962; "Four Riddles in Bilingual Dialectology", *ACICS* 5, 1963; "The Geographic Makeup of Belorussian Yiddish", *FY* 3, 1969, 89, 97–98.

Р. Якобсон. "Звуковые особенности, связывающие идиш с его славянским окружением", *SW.* {Гэта скарочаны пераклад шырэйшага артыкула, упершыню апублікаванага на ідышы ў} *YŠ* 12, 1953. {Перадрук. у} *Yude A. Yofe-Bux.* NY, 1958.

В. Крыўчык. "Паланізмы ў слоўнікавым саставе беларускіх перакладных аповесцей XVI стагоддзя", *ДБРМ.*

В. Орлова. "Русско-белорусские языковые отношения по данным диалектологических атласов", *МИРД* 2. М, 1961.

A. Zaręba. "Wpływy polszczyzny na słownictwo innych języków słowiańskich", *Język polski* 41, 1961, 1.

M. Herzog. *The Yiddish Language in Northern Poland, Its Geography and History.* Bl, 1965.

К. Седов. "К происхождению белорусов", *СЭ* 1967, 2; "Еще раз о происхождении белорусов", *СЭ* 1969, 1.

П. Третьяков. "Восточные славяне и балтийский субстрат", *СЭ* 1967, 4.

А. Антонович. *Белорусские тексты, писанные арабским письмом.* В, 1968.

М. Гринблат. "К происхождению белорусской народности", *СЭ* 1968, 5.

H. Leeming. "Polonisms in a 17th-century Ruthenian text", *SEER* 46 (107), 1968.

В. Жучкевич. "К вопросу о балтийском субстрате в этногенезе белорусов", *СЭ* 1968, 1.

E. Green. "On Accentual Variants in the Slavic Component of Yiddish", *FY* 3, 1969.

В. Кіпарскі. {У} *Лексічныя балтызмы ў беларускай мове.* Мн, 1969.

А. Непокупний. "До балто-східнословьянських мовне-етнографічних та етнічних взаємин", *Мов* 1969, 3.

G. Shevelov. "On Migrations of Words", *TA.*

Я. Станкевіч. "Аканьне – балцкая рыса ў мове вялікалітоўскай", *Symbolae in Honorem Georgii Y. Shevelov.* Mu, 1971.

А. Булыка. *Даўнія запазычанні беларускай мовы.* Мн, 1972.

Г. Хабургаев. "Этнический состав Древнерусского государства и образование трех восточнославянских народностей", *СЭ* 1972, 1.

*[*Г. Цыхун, А. Літвіноўская. "Лёс яўрэйскіх запазычанняў у беларускай мове", *Беларусіка = Albaruthenica* 4. Мн, 1995.*]*

3. Мадэлі эвалюцыі ад праславянскае да беларускае мовы

Існуюць розныя погляды на (1) храналогію эвалюцыі праславянскае мовы на яе апошніх стадыях і (2) адносіны паміж беларускаю і астатнімі ўсходнеславянскімі мовамі. Прычына гэтага палягае ў розных рэканструкцыях першых інавацый, што аддзяляюць часткі ўсходнеславянскае моўнае тэрыторыі ад арэалаў іншых славянскіх моваў. Развязанне праблемы фармавання беларускае мовы (разам з шырэйшаю праблемаю фармавання ўсіх усходнеславянскіх моваў) залежыць ад таго, як мы тлумачым апошнія стадыі развіцця позняе праславянскае мовы і разглядаем падзел на дыялекты ў "пераходны" перыяд пасля распаду праславянскага адзінства.

Меркаванні наконт адноснае храналогіі і перыядызацыі гісторыі праславянскае і беларускае моваў разыходзяцца на некалькі стагоддзяў. Выбар канцавое даты існавання праславянскае мовы залежыць, па сутнасці, ад таго, лічыць ці не мовазнавец розныя вынікі агульнае матывацыі "праславянскаю" з'яваю. Некаторыя аўтары (напр., Трубяцкой, Дурнаво) лічаць, што распад праславянскае мовы трэба датаваць апошняй інавацыяй, карані якой можна знайсці ва ўсіх славянскіх мовах, не зважаючы на тое, ці яе актуальныя вынікі і іх храналогія такія самыя ў кожнай гаворцы; кажуць, што апошняй такой інавацыяй мела быць страта рэдукаваных у слабой пазіцыі (у розных славянскіх мовах яна адбылася паміж X і XIII стст.). Іншыя аўтары (напр., Шавялёў, Філін) адкідаюць усякую канцавую дату існавання праславянскае мовы, угрунтаваную на падзенні рэдукаваных у слабой пазіцыі, на той падставе, што гэтая змена ў розных мовах мела розныя вынікі і розную храналогію. Паводле гэтых аўтараў, апошняя інавацыя, што дала аднолькавыя вынікі ва ўсіх славянскіх гаворках, пазначае канцавы пункт гісторыі праславянскае мовы як такой і пачатак постпраславянскіх дыялектаў. Гэтай апошняй супольнай зменай у славянскіх

мовах было другое змякчэнне (палаталізацыя) заднепаднябенных прыблізна ў V–VII стст. н. э.

Яшчэ менш згоды паміж мовазнаўцамі ў разуменні таго, як развіваліся ўсходнеславянскія гаворкі пасля распаду праславянскае мовы. Зразумела, што тры сучасныя ўсходнеславянскія мовы ўзніклі не адразу і не проста пасля распаду праславянскае мовы, а развіліся паступова на працягу стагоддзяў. Спрэчкі традыцыйна канцэнтраваліся вакол таго, ці быў у трох сучасных усходнеславянскіх моваў *нейкі агульны папярэднік*. Прыхільнікі тэорыі паходжання трох усходнеславянскіх моваў з адзінае прамовы змяшчаюць у пераходным перыядзе ад праславянскае мовы да цяперашняга падзелу ўсходнеславянскіх моваў на беларускую, расійскую і ўкраінскую "агульна-", "прота-" або "старажытнарускую" мову (звычайна гэтыя тэрміны ўжываюць на перамену). "Агульнарускую" мову на яе ранейшых стадыях часам таксама называюць "агульнаю (або, не так часта, старою) усходнеславянскаю моваю". Агульная ўсходнеславянская мова характарызуецца рысамі "пляменных дыялектаў", якіх няма ў паўднёва- і заходнеславянскай моўных групах і якія развіліся прыблізна ў VI–IX стст. н. э.

Традыцыйныя мадэлі ў падтрымку пратарускага паходжання беларускае мовы звычайна маюць адну з трох галоўных формаў. Фармулёўка, прапанаваная Шахматавым, усе супольныя для расійскае, украінскае і беларускае моваў рысы прыпісвала пратарускаму перыяду; рысы, агульныя для паўднёварасійскае і беларускае моваў нібыта належалі так званым старажытным усходнярускім дыялектам, а рысы, агульныя для беларускае і ўкраінскае моваў, прыпісвалі старажытным паўднёварускім гаворкам. Казалі, што рысы паўночнарускіх гаворак, якіх не было ў паўднёварускіх дыялектах, паходзілі з старажытнага паўночнарускага дыялектнага адзінства. Усе іншыя рысы лічылі пазнейшымі з'явамі, што ўзніклі пасля фармавання трох сучасных усходнеславянскіх моваў.

Табліца 3. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Шахматава[1]



Дурнаво прапанаваў свой варыянт мадэлі Шахматава, якую ён дапоўніў заходнярускаю прамовай як простым папярэднікам беларускае мовы.

Табліца 4. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Дурнаво



Аўтары трэцяе мадэлі, Лер-Сплавінскі з Трубяцкім, падзялілі пратарускую мову на наўгародскія (паўночнарускія) і ўсе астатнія (паўднёварускія) гаворкі.

[1] Гэтая і наступныя табліцы няўхільна маюць трохі спрошчаны характар.

Табліца 5. Мадэль падзелу ўсходнеславянскіх гаворак паводле Лер-Сплавінскага і Трубяцкога



Погляд, які цяпер пануе ў савецкіх і, да нейкай ступені, заходніх даследаваннях, такі, што беларускую мову разам з расійскаю і ўкраінскаю выводзяць з прата- або агульнарускае (напр., Филин 1962, Birnbaum 1965). Кажуць, што агульнаруская мова ўтварылася ў VIII–IX стст. і была агульнаю моваю для ўсіх усходнеславянскіх тэрыторый. Другую стадыю развіцця звычайна называюць "старажытнаруская мова"[1]. Паводле гэтага погляду, перыяд старажытнарускай мовы супадае ў часе з існаваннем усходнеславянскіх пляменных групаў: напр., наўгародскай, растоўска-суздальскай і г. д. Аднак спробы знайсці значную адпаведнасць паміж усходнеславянскімі пляменнымі (або раннефеадальнымі) граніцамі і цяперашнімі дыялектнымі зонамі былі не надта паспяховыя. Цяперашнія граніцы дыялектаў, здаецца, абдымаюць абшары, большыя за пляменныя саюзы. У XIII–XIV стст. у сувязі з развалам адзінага феадальнага грамадства ў дакументах ужо з'явіліся мясцовыя моўныя асаблівасці (іншыя тэорыі, што тлумачаць развіццё дыялектнае разнастайнасці, гл. на с. 80–81). Старарасійская, старабеларуская і стараўкраінская літаратурныя мовы развіваліся з

[1] Воўк-Левановіч і Бузук (1927) называлі агульнага продка ўсходнеславянскіх моваў "першарускай" і "прарускай" мовамі адпаведна (параўн. з ням. *Urrussisch*). Ва ўкраінскіх даследаваннях агульнарускую мову часта называюць "староруська" або "давньоруська мова". Беларускія савецкія лінгвісты, мабыць, стараючыся быць большымі каталікамі за Папу, здаецца, ужывалі тэрмін "агульнаруская мова" шмат часцей, чым іх расійскія калегі ўжывалі тэрмін "общерусский язык".

мясцовых варыянтаў агульнарускае літаратурнае мовы[1]. Адначасна кажуць, што беларускі народ побач з расійскім і ўкраінскім развіваў сваю асобную ідэнтычнасць з агульнае этнічнае асновы – старажытнарускае "народнасці". Першая ўласна "беларуская" стадыя ў гэтай эвалюцыі – старабеларуская літаратурная мова. Паводле звычайнае перыядызацыі, перыяд старарасійскае, старабеларускае і стараўкраінскае літаратурных моваў скончыўся ў XVIII ст. (у першай палове – для расійскае і ў другой палове – для беларускае і ўкраінскае) – і пасля гэтага з'явіліся сучасныя літаратурныя мовы.

Табліца 6. Ад старажытнарускае да старабеларускае мовы

старажытнаруская (IX–XII стст.) ⟶	мясцовыя гаворкі старажытнарускае мовы (XII–XIV стст.) ⟶	старарасійская, стараўкраінская, старабеларуская (XIV–XVIII стст.)

Альтэрнатыва тэорыі пратарускае стадыі – прасачыць адметныя рысы трох усходнеславянскіх моваў, пачынаючы проста ад праславянскае стадыі. У 1920-х гг. шмат хто з савецкіх беларускіх мовазнаўцаў, а таксама заходнебеларускія навукоўцы, што працавалі ў тагачаснай Польшчы (Бузук 1926, 1927; Некрашэвіч 1927; Воўк-Левановіч 1927; гл. таксама заходнеўкраінскага мовазнаўца С. Смаль-Стоцькага (Смаль-Стоцький 1927, 1934) ды інш.[2]), адкідалі думку пра існаванне

[1] Розныя аўтары амаль на стагоддзе разыходзяцца ў вызначэнні часавых граніц гэтых трох перыядаў.

[2] Станкевіч (1956, 97) у пошуках неагульнарускага паходжання беларускіх плямёнаў і іх мовы развівае тэорыю вялікага балцкага ўкладу ў этнагенез беларусаў. Гл. ранейшыя дыскусіі Станкевіча і Шкялёнка ў віленскіх часопісах *Калосьсе* і *Родная мова* і ў нью-ёркскім *Веда* 2, 1951; гл. таксама Станкевіч 1941. Аргументы беларускіх незалежнікаў разбіраюць: Macůrek 1, 23–25; Vakar 29; Koschmieder 252–253; Wexler. Беларус Станкевіч не першы, хто развіваў такую тэорыю. Гл. П. Голубовский. "История Смоленской земли до начала XV века", *КУИ* 9, 1894, с. 41; А. Кочубинский. "Территория доисторической Литвы", *ЖМНП* 1897, с. 66. Гл. таксама апошні выклад гэтых поглядаў расійскім савецкім археолагам В. Сядовым (*Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* М, 1970) і ў папулярным артыкуле В. Мартынава і А. Міхневіча ("Беларуская этымалогія", *Маладосць* 12, 1969). Гл. таксама артыкулы Сядова, Траццякова, Грынблата, Жучкевіча і Хабургае-

агульнарускае мовы. Адмаўленне агульнарускае стадыі ўласцівае хіба не толькі пурыстам 1920-х гг., элементы гэтага падыходу ёсць у Ягіча і Мэе, а ў 1930-х гг. нават у савецкіх крытыкаў беларускае пурыстычнае школы мовазнаўства. Прыкладам, савецкі расійскі лінгвіст Т. Ломцеў у 1935 г. звязваў тры ўсходнеславянскія мовы з мяшаным пляменным насельніцтвам. З гэтае прычыны ён адкідаў не толькі існаванне праславянскае мовы і агульнаславянскае супольнасці, але і агульнарускае мовы.

На жаль, і мадэлі, што прызнаюць, і мадэлі, што адмаўляюць агульнарускую стадыю, часта не могуць вызначыць змены ў падзеле на дыялекты ўнутры ўсходнеславянскіх моваў да таго, як з'явіліся тры сучасныя мовы. Апошнім часам даследчыкі выказалі некалькі прапаноў. Шавялёў (*PFB*), напр., прапануе ўдакладненне мадэлі Дурнаво аб паходжанні сучасных усходнеславянскіх моваў з чатырох складнікаў. Замест надта шырокіх азначэнняў – старажытная паўднёваруская, старажытная ўсходняруская і г. д. – Шавялёў сцвярджае, што чатыры дыялектныя зоны: наўгародска-суздальская, полацка-разанская, кіеўска-палеская і галіцка-падольская – існавалі ўжо ў X ст. і ў працэсе перагрупавання да XVI ст. сталіся асноваю сучаснага падзелу на тры ўсходнеславянскія мовы. Такі падзел гаворак не трэба лічыць канчатковым, бо ў іншых кантэкстах Шавялёў кажа пра асобную полацкую гаворку або пра полацка-смаленскую дыялектную групу.

Табл. 7 і звязаная з ёю карта паказваюць адносіны прапанаванага Шавялёвым падзелу гаворак, што існаваў да XV–XVI стст., да з'яўлення трох сучасных усходнеславянскіх моваў. XV–XVI стст. прымаюцца за канцавы пункт паступовага працэсу перагрупавання, які шмат у чым пачаўся, бясспрэчна, яшчэ да гэтага перыяду. Напр., моўнае аддзяленне Полацка ад Пскова скончылася, відаць, ужо да XIV ст.

ва ў *СЭ*, пададзеныя ў выбранай бібліяграфіі да падраздзела 2.3.2.

Табліца 7. Перагрупаванне ўсходнеславянскіх гаворак да XV–XVI стст. паводле Шавялёва

познія прабеларускія дыялектныя групы ў іх арэальным кантэксце	сучасныя беларускія дыялектныя групы ў іх адносінах да расійскіх і ўкраінскіх
ПОЎНАЧ	
полацка-разанскія гаворкі	① паўднёва-, цэнтральнарасійскія (пскоўскія, разанскія) і паўднёва-заходнія расійскія гаворкі
кіеўска-палескія гаворкі	③ паўночна-ўсходнія, цэнтральныя, паўднёва-заходнія беларускія гаворкі
ПОЎДЗЕНЬ	② паўночнаўкраінскія гаворкі

Тлумачэнне сімвалаў:

1) Рысы, першапачаткова агульныя для сучасных паўночнабеларускіх гаворак і пскоўскіх ды разанскіх гаворак расійскае мовы.
2) Рысы, спачатку агульныя для сучасных паўднёвабеларускіх і паўночнаўкраінскіх гаворак. Гэтыя рысы былі ўласцівыя старым кіеўска-палескім гаворкам да ўваходжання гэтае тэрыторыі ў ВКЛ.
3) Рысы, агульныя для паўночна- і паўднёвабеларускіх гаворак, якія могуць мець дваякае паходжанне: (а) рысы паўночных гаворак, што пашырыліся на поўдзень, але не сустракаюцца ў паўночнаўкраінскіх гаворках, і (б) рысы паўднёвых гаворак, што пашырыліся на поўнач.

Прыблізныя геаграфічныя граніцы прабеларускіх і суседніх усходнеславянскіх гаворак паказаны на карце.

На працягу чатырох-пяці стагоддзяў беларускай гісторыі ў вузкім сэнсе гэтага слова адбылося не шмат зменаў, якія б рашуча павярнулі дыхатамічны падзел дыялектаў прабеларускага перыяду. Адзінай важнай зменай сталася стварэнне новае пераходнае зоны цэнтральных гаворак паміж паўночна-ўсходнімі (якія ёсць працягам паўднёвага і заходняга раёнаў полацка-разанскае зоны) і паўднёва-заходнімі гаворкамі (якія ёсць працягам паўночнага раёну кіеўска-палескае зоны). Падставы вылучэння новае цэнтральнае зоны вынікаюць пераважна з марфалагічных, сінтаксічных і лексічных інавацый. Фанетычных жа інавацый у новым перагрупаванні гаворак было вельмі мала. З погляду



Геаграфія прабеларускіх гаворак. Перарваныя лініі паказваюць прыблізныя граніцы рэканструяваных дыялектных групаў; неперарваныя лініі – сучасныя палітычныя граніцы.

(1) – полацка-разанская дыялектная група. Частка гэтае групы, заштрыхаваная на карце, уваходзіла ў блізкія зносіны з (2) наўгародска-суздальскімі гаворкамі і дзеля гэтага не магла прымаць удзелу ў фармаванні беларускае мовы. (3) – кіеўска-палеская група. Накіраваная ўніз стрэлка паказвае ўплыў заходняе часткі полацка-разанскай дыялектнае групы на паўночныя раёны кіеўска-палескае зоны. (4) – галіцка-падольская група, якая разам з паўднёваю часткаю кіеўска-палескае зоны (3), заштрыхаванай на карце, тварыла аснову сучаснае ўкраінскае мовы. (5) – сучасныя паўднёварасійскія бранска-арлоўскія гаворкі, асновы якіх былі блізкія да цэнтральных і паўночных беларускіх гаворак. Гэтая тэрыторыя адзін час падпала каланізацыі людзей з прабеларускага полацкага абшару. Пазней паўднёваруская тэрыторыя падпала пад уплыў расійскіх гаворак.

на іх галоўныя фанетычныя рысы, цэнтральныя беларускія гаворкі (якія былі асновай сучаснае літаратурнае мовы) падобныя да паўночна-ўсходніх гаворак, напр., у іх няма розніцы паміж *о* і *а* ў апошніх адкрытых складах пасля цвёрдых зычных (г. зн. маюць поўнае *аканне*); у іх адлюстраванае зліццё **ě* і **е*; губныя замяняюцца спалучэннем губны + *л'* у формах дзеясловаў 3-га класу цяперашняга часу. Рысы, агульныя для цэнтральных і паўднёва-заходніх гаворак, маюць пераважна марфалагічны характар, і дзеля гэтага іх не трэба тут разглядаць.

Гэты, прыняты ў савецкай беларускай дыялекталогіі, сучасны трохчленны падзел беларускіх гаворак на паўночна-ўсходнія, цэнтральныя і паўднёва-заходнія досыць адносны; калі пераходзіць ад паўночна-ўсходняе да паўднёва-заходняе гаворкі ці наадварот, немагчыма паказаць дакладныя лініі падзелу паміж гэтымі дыялектамі. І ўсё ж такі, у захаванні гэтага трохчленнага падзелу, у прынцыпе, няма шкоды. Зразумела, у гэтую класіфікацыю можна было б унесці большую дэталізацыю. Напр., у *ЛГ* беларуская тэрыторыя дзеліцца на сем гістарычных раёнаў: паўночны, паўночна-ўсходні, паўночна-заходні, цэнтральны, паўднёва-ўсходні, паўднёва-заходні і паўднёвы. Кажуць, што паўднёва-заходняя зона ўключае рэгіянальныя анклавы, напр., так званую палескую падгрупу на захадзе і мазырскую падгрупу на ўсходзе. Гэта не зусім апраўдана, бо палескую падгрупу і Брэст (у мазырскай падгрупе) хутчэй трэба разглядаць як украінскія тэрыторыі. У паўночна-ўсходняй зоне (якая гістарычна мела шырокія кантакты са смаленскімі, а ў сваёй паўднёвай частцы з бранскімі гаворкамі расійскае мовы) *ЛГ* вылучае паўночную падгрупу, віцебска-магілёўскую падгрупу на ўсходзе і паўднёвым усходзе (якая мела моўныя і гістарычныя сувязі з пскоўска-наўгародскім раёнам) ды полацкую падгрупу на паўночным захадзе.

Пасля даследавання Шавялёва былі іншыя спробы азначыць галоўныя дыялектныя групы на агульнарускай стадыі (Филин, Шакун, Горшкова ды інш.). Гэта ўдакладненне спрошчаных сцверджанняў, што агульнаруская мова была, па сутнасці, адзіная.

Калі мадэль, паказаную ў табл. 7, мы прымаем як такую або з пэўнымі зменамі, тады ясна, што няма падставы гаварыць пра "беларускую" мову ў перыяд да XIV–XIV стст. Называць мову тэкстаў, створаных да XIV ст., "беларускаю" або казаць пра "беларускую мову" на дагістарычных стадыях – анахранізм, як і ўжыванне агульнага тэрміна "руская мова" для ўсіх усходнеславянскіх моваў у першы перыяд пасля распаду праславянскае мовы.

Цяпер паўстае пытанне, які тэрмін трэба ўжываць, спамінаючы гаворкі, што ўтварыліся пасля раскладання праславянскае мовы і бралі ўдзел у фармаванні беларускае мовы ў XV–XVI стст. Мы ўжо спатыкалі прапанову ўжываць найменні асобных дыялектных зонаў, але ў літаратуры ёсць і іншыя прапазіцыі.

Табліца 8. Назвы для гаворак, што бралі ўдзел у фармаванні беларускае мовы

1. *Тэрытарыяльныя* назвы: напр., "кіеўска-палескія" і "полацка-разанскія" гаворкі (Shevelov);
2. *Геаграфічныя* назвы: напр., "самыя заходнія" гаворкі ўсходнеславянскае мовы або "заходнярускія" гаворкі (Matthews, Борковский, Кузнецов); "паўночна-заходнія рускія" гаворкі (Kiparsky);
3. *Храналагічныя* назвы: напр., "протабеларускія" гаворкі (Entwistle, Morison); "прабеларускія" гаворкі (Weinreich), "старабеларуская" (або "старакрыўская") мова (Ластоўскі)[1].

Ёсць таксама некалькі развязанняў гэтае праблемы *ad hoc*: напр., Мэт'юз называе надпіс на залатым крыжы Ефрасінні Полацкай (каля 1161 г.) прыкладам тэксту XII ст. з "беларускімі асаблівасцямі", а Бідўэл гаворыць пра "ўсходнеславянскія гаворкі, што папярэднічалі беларускай мове".

Называць раннія дыялектныя групы геаграфічнымі тэрмінамі непажадана, бо гэта дапускае, што людзі, якія гавораць нейкаю мовай, мусяць заўсёды быць прывязаныя да пэўнае зямлі. Ёсць яшчэ адна неадпаведнасць, бо на нейкім этапе ў гістарычны перыяд нам давялося б замяніць геаграфічныя тэрміны навейшымі соцыялінгвістычнымі паняццямі, такімі як "беларуская мова". Не зусім удалы і шырока ўжываны тэрмін "протабеларуская мова", бо ён прадугледжвае, што да падзелу на беларускую, расійскую і ўкраінскую існавалі мовы, ад якіх хоць і "не дайшло пісьмовых вестак, але, можна абгрунтавана дапусціць, што яны ўжо мелі характэрную форму" (калі пазычыць азначэнне "прота-" ў Энтўістла і Морысана). Тэрмін "прабеларуская" таксама мае недахоп, бо акрэсленая гэтак

[1] Вельмі рэдка гэтыя тэрміны ўжываюць паслядоўна. Напр., Баркоўскі і Кузняцоў азначаюць мову Псалтыра 1296 г. як "заходнярускую" або як "старабеларускую". Мэт'юз дастасоўваў тэрмін "старазаходняруская мова" да Смаленска і Полацка ў XI ст. Тэрмін "заходняруская мова" таксама ўжываецца дзеля азначэння адміністрацыйнае мовы ВКЛ, пашыранай на беларускіх і ўкраінскіх тэрыторыях (напр., Растаргуеў, Грунскі, Анічэнка). Гумецька ўжывае тэрмін "заходняруская мова",

рыса магла зрабіцца ўласцівасцю і пазнейшых расійскіх і ўкраінскіх гаворак; напр., можна было б называць нейкую рысу цяперашніх беларускіх дыялектаў "прабеларускаю" для перыяду да XV ст., але пры гэтым нам трэба было б азначаць тую самую рысу як "праўкраінскую", разбіраючы ўзнікненне сучасных украінскіх гаворак.

Ніжэй у нашых разважаннях, спамінаючы постпраславянскі перыяд да XV–XIV стст., мы аддаем перавагу тэрмінам "кіеўска-палеская" і "полацка-разанская" гаворкі. Калі няма патрэбы ў дакладным акрэсленні дыялектных зонаў, мы будзем ужываць – не зважаючы на яго спрэчны характар – скарочаны тэрмін "прабеларускія" гаворкі. Прабеларускі перыяд уключае і дапісьмовую стадыю (ад якой тэкстаў да нас не дайшло), і пісьмовую стадыю, пісьмовыя помнікі якой нам даступныя. Бліжэй да XV–XVI стст. мы можам апраўдана казаць пра "беларускі" перыяд, які можна цалкам дакументаваць тэкстамі.

Паколькі для найдаўнейшага дапісьмовага перыяду пытанне, якія рысы трэба лічыць "беларускімі", немагчыма аддзяліць ад пытання, якія рысы адпаведна "расійскія" і "ўкраінскія", вылучэнне "беларускіх" тэкстаў з іншых усходнеславянскіх у так званы "кіеўскі" перыяд становіць галоўную праблему гістарычнага даследавання. У перыяд ВКЛ мы спатыкаемся з праблемаю ідэнтыфікацыі тэкстаў як "беларускіх" або "ўкраінскіх". Задача гэтая звязаная з тым, што значныя часткі беларускага і ўкраінскага грамадстваў ужывалі адну пісьмовую мову. Дзеля гэтага не трэба дзівіцца з таго, што тыя самыя тэксты адначасна абвяшчаюць і беларускімі, і ўкраінскімі. Напр., аўтараў XVI ст., такіх як Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і Андрэй Рымша, уключылі і ў *Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры* пад рэдакцыяй В. Барысенкі, П. Броўкі і М. Лынькова (Мн, 1956), і ў *Історію української літератури* М. Возняка (Лв, 1921).

Праблема вызначэння граніц паміж сучаснымі беларускімі гаворкамі і сумежнымі расійскімі і асабліва ўкраінскімі таксама няпростая. У выпадку з граніцамі паміж расійскімі і беларускімі гаворкамі няпэўнасць павялічваецца дзеля існавання пераходных зонаў, што ўзніклі ў выніку развіцця ізаглосаў. У выпадку ж з беларускімі і ўкраінскімі гаворкамі граніцу правесці нялёгка, бо спярша паўднёвабеларускія і паўночнаўкраінскія дыялекты станавілі адну дыялектную групу. Становішча беларускае мовы сярод усходне-

---

калі рукапіс нельга дакладна класіфікаваць як беларускі ці ўкраінскі.

славянскіх моваў зусім не ўнікальнае; шырокае супаданне рысаў уласцівае шмат якім суседнім мовам – балгарскай і македонскай, чэшскай і славацкай.

Нашы разважанні пра тэорыі фармавання беларускае мовы трэба дапоўніць аглядам галоўных фактараў, прапанаваных, каб вытлумачыць падзел унутры ўсходнеславянскіх моваў. Пануючыя погляды дзеляцца на дзве катэгорыі: (1) тэорыі балцкага субстрату (гл., напр., *PFB*, Шакун 1962, Backus; гл. таксама знос. 2 на с. 74) і (2) вынікі змены дзяржаўных граніц[1]. Што да другое катэгорыі, то часцей за ўсё паступовае ўключэнне беларускіх этнічных земляў у ВКЛ на працягу XIII–XIV стст. лічаць за галоўную прычыну развіцця асобнае беларускае (і, да пэўнае ступені, асобнае ўкраінскае) мовы. Кажуць, што вынікам гэтае палітычнае падзеі сталася ізаляцыя беларускае мовы ад тых навінаў, што пачаліся ў расійскіх дыялектных зонах на ўсходзе, а таксама канчатковае падпаданне беларускае мовы пад уплыў польскае. Адзін з варыянтаў гэтага погляду апавяшчае Люблінскую унію 1569 г. галоўнаю прычынаю, што абумовіла раскол паміж "паўднёварускаю" (украінскаю) і "заходнярускаю" (беларускаю) мовамі. У выніку гэтае падзеі "Заходняя Русь" засталася ў зменшаным ВКЛ, а Украіна апынулася пад юрысдыкцыяй Польскае Кароны (Macůrek). Хоць прыхільнікі такіх поглядаў рэдка вызначаюць фанетычныя (ды іншыя моўныя) змены, беспасярэдне абумоўленыя або звязаныя з гэтымі палітычнымі падзеямі, іх меркаванні з тэарэтычнага боку не зусім беспадстаўныя. Але з практычнага гэтыя сцверджанні мала абгрунтаваныя, бо шмат якія рысы, што зрабіліся асаблівасцямі беларускае мовы, можна прасачыць да перыяду, які папярэднічаў утварэнню ВКЛ. Галоўнаю прычынаю фармавання беларускае мовы было перагрупаванне, што адбывалася ў кіеўска-палескай і полацка-разанскай дыялектных зонах. У XII ст. Кіеў як палітычны і культурны цэнтр пачаў занепадаць, а ў 1240 г. горад зруйнавалі татарскія захопнікі. У выніку цэнтры насельніцтва і культуры перанесліся на іншыя тэрыторыі – на паўднёвы захад (у Галіч, а пасля ў Львоў) і на поўнач (у Наваградак і Вільню).

---

[1] Можна спаткаць таксама іншыя, больш фантастычныя, погляды на праблему фармавання беларускае мовы, напр., што беларуская мова развілася ў XV–XVI стст. у выніку ўласцівага палякам кепскага расійскага вымаўлення (Jakobson 1929, 1938, 1962) або што сваім паходжаннем беларуская мова абавязаная перасяленню кіеўскіх князёў у Смаленск і Полацк (Сахаров).

Выбраная бібліяграфія

И. Сахаров. "Древние русские словари", *Отечественные записки* 4, 1842, 10.

А. Потебня. "К истории звуков русского языка", *Филологические записки* 1876.

А. Шахматов. "К вопросу об образовании русских наречий", *РФВ* 32, 1894 {і асобн. выд.} Варшава, 1894; *Введение в курс истории русского языка* 1. *Исторический процесс образования русских племен и наречий.* СПб, 1916; Н, 1967; *Древнейшие судьбы русских племен.* СПб, 1919.

V. Jagić. {Рэц. на} Соболевский, *Опыт русской диалектологии* 1. СПб, 1897 {у} *ASPh* 20, 1898; {Рэц. на} Шахматов, *Очерк древнейшего периода истории русского языка.* СПб, 1915, *ASPh* 37, 1920.

А. Будилович. "К вопросу о литературном языке юго-западной Руси", *Сборник учено-литературного общества при имп. Юрьевском университете* 4, 1901 {і асобн. выд.} Юрьев, 1900.

Е. Карский. "К вопросу об этнографической карте белорусского племени", *ИОРЯС* 7, 1902; "К вопросу о разграничении русских наречий", *Труды XII Археологического съезда в Харькове 1902* 2. М, 1905; "К вопросу о границе белорусских говоров", *РФВ* 53, 1905. {Перадрук. у} *Трудах.*

А. Соболевский. "О русских говорах вообще и о белорусских в частности", *ИОРЯС* 9, 1904.

А. Кримський. "Деякі непевні критерії для діялектологічної клясифікації староруських рукописів", *Науковий збірник присвячений проф. М. Грушевському.* Лв, 1906.

П. Бузук. "Взгляды академика Шахматова на доисторические судьбы словянства", *ИОРЯС* 23, 1918; "Взаємовідносини між українською та білоруською мовами", *ЗІФВ* 7–8, 1926; "Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моваў", *ПАК.*

П. Расторгуев. "Белорусская речь в её современном и прошлом состоянии", *Курс белоруссоведения.* М, 1918–1920.

T. Lehr-Spławiński. "Stosunki pokrewieństwa języków ruskich", *RS* 9, 1921; "Kilka uwag o wspólności językowej praruskiej", *Сборник статей в честь акад. Алексея Ивановича Соболевского.* Л, 1928. {Абодва артыкулы перадрук. у} T. Lehr-Spławiński. *Studia i szkitce wybrane z językoznawstwa słowiańskiego.* W, 1957.

A. Meillet. "Les vues de Šachmatov sur la constitution de la nation russe et des dialectes russes", *RÉS* 1, 1921.

K. Būga. "Die litauisch-weißrussischen Beziehungen und ihr Alter", *ZSPh* 1, 1924. {Перадрук. у} *RR* 3.

Н. Дурново. *Очерк истории русского языка.* М–Л, 1924; Н, 1962.

N. Trubetzkoy. "Einiges über die russische Lautentwicklung und die Auflösung der gemeinrussischen Spracheinheit", *ZSPh* 1, 1924.

В. Воўк-Левановіч. "Гістарычнае вывучэньне беларускай мовы ў славянскай філёлёгіі", *ПБДУ* 6–7, 1925; "Камэнтары", *ПАК.*

В. Ластоўскі. *Гісторыя беларускай (крыўскай) кн.* Коўна, 1926.

Г. Омельченко. "Котрі памьятки належать українцям і котрі білорусам?", *ЗІФВ* 9, 1926; {Рэц. на} Ластоўскі, *Сл* 6, 1928.

С. Некрашэвіч. "Акадэмічная Конфэрэнцыя па рэформе правапісу і графікі і вынікі яе працы", *НК* 1927, 1, 4.

С. Смаль-Стоцький. *Розвиток поглядів про семю словьянських мов і їх взаємне споріднення.* Пр, 1927; "Питання про східнословьянську прамову", *II mędzynarodowy zjazd slawistów. Księga referatów. Sekcja 1 – Językoznawstwo.* W, 1934.

M. Vasmer. {Заўвагі ў} *ПАК* 103.

А. Селищев. "Критические замечания о реконструкции древнейшей судьбы русских диалектов", *Сл* 7, 1928. {Перадрук. у} *ИТ.*

R. Jakobson. "Remarques sur l'évolution phonologique du russe comparée à celle des autres langues slaves", *TCLP* 2, 1929; "Sur la théorie des affinités phonologiques entre les langues", *Actes du 4ème Congrès International de Linguistes.* Co, 1938. {Абодва матэрыялы перадрук. у} *SW*; "Comparative Slavic Phonology", *SW.*

М. Грунський. "Білоруська мова в її минулому та сучасному вивченні", *ЗКІНО* 4, 1930.

N. van Wijk. "Les voyelles *uo*, *ie* en letto-lituanien et en russe", *SB* 4, 1934–1935; (1937а) "Les langues slaves de l'Est", *MS* 14, 1937; (1937б) *Les langues slaves. De l'unité à la pluralité.* P, 1937.

Т. Ломцеў. *Беларуская граматыка: фанетыка і правапіс.* Мн, 1935; [Ломтев]. *Белорусский язык.* M, 1951.

І. Огієнко. *Розмежування памьяток українських від білоруських.* Записки Чына Св. Василия Великого 6, Жовква, 1935.

L. Ossowski. *Zagadnienie językowe Polesia.* W, 1936.

A. Martel. *La langue polonaise dans les pays ruthènes. Ukraine et la Russie Blanche 1569–1667.* Lille, 1938.

Z. Stieber. *Sposoby powstawania słowiańskich gwar przejściowych.* Kr, 1938 (= *Polska Akademja Umiejętności, Prace Komisji językowej* 27); "O słownictwie pogranicznych dialektów języków słowiańskich", *SP* 4, 1962. {Абедзве працы перадрук. у} Z. Stieber. *Świat językowy Słowian.* W, 1974.

B. Unbegaun. {Рэц. на} Martel, *Bulletin de la Société de Linguistique de Paris* 40, 1939.

И. Леков. *Характеристика на общите черти в български и източнославянски.* С, 1941.

Я. Станкевіч. "Крыўя – Беларусь у мінуласьці", *Менская газета.* Мн, 12.XI.1941, 31.I.1942 {і асобн. выд.} Мн, 1942; *Савецкае хвальшаваньне гісторыі Беларусі.* Мюнхен, 1956.

J. Macůrek. *Dějiny východních Slovanů* 1. Pr, 1947.

І. Сидорук. *Проблема українсько-білоруської мовної межі.* Augsburg, 1948.

W. Entwistle, W. Morison. *Russian and the Slavonic Languages.* Lo, 1949.

B. Calleman. *Zu den Haupttendenzen der urslavischen und altrussischen Lautentwicklung.* U, 1950.

Р. Аванесов, П. Кузнецов. {Прадмова да рас. перакладу} A. Meillet. *Le slave commun.* M, 1951.

J. Šerech [G. Shevelov]. "Zur Frage der ukrainisch-weißruthenischen Sprachgrenze", *Orbis* 1, 1953; *PFB*; *PoS.*

Ф. Жилко. "Перехідні говірки від української до білоруської мови в північно-західних районах Чернігівщини", *Діалектологічний бюлетень* 4, 1953.

P. Kovaliv. "The Problem of the Typology of the Slavonic Languages", *SEER* 33, 1954–1955; *Слов'яньскі фонеми.* NY, 1965.

А. Козаченко. "Древнерусская народность – общая этническая база русского, украинского и белорусского народов", *СЭ* 1954, 2.

Ю. Мацкевіч. "Важнейшыя пытанні беларускай дыялекталогіі", *Працы* 2, 1954.

Р. Аванесов. "Проблемы образования языка русской (великорусской) народности", *ВЯ* 1955, 5.

A. Stender-Petersen. *Russian Studies.* Co, 1956.

N. Vakar. *Belorussia, The Making of a Nation; A Case Study.* Camb, 1956.

Л. Гумецька. "Якій з трьох назв західноукраїнської літературної мови XV–XVII ст. – 'західноруська', 'староукраїнська' і 'старобілоруська' – слід віддати перевагу або як ці назви диференціювати у вживанні?", *Філологічний збірник.* К, 1958; "Уваги до українсько-білоруських мовних звязків періоду XIV–XVII ст.", *ДУРМ*; [Гумецкая]. "Вопросы украинско-белорусских языковых связей древнего периода", *ВЯ* 1965, 2.

E. Koschmieder. "Die Palatalitätskorrelation im Slavischen", *ZSPh* 27, 1959.

W. Matthews. *Russian Historical Grammar.* Lo, 1960.

У. Анічэнка, рэд. *Хрэстаматыя па гісторыі беларускай мовы.* Мн, 1961; {Прадмова да} *Александрыя.* Пад рэд. В. Баркоўскага. Мн, 1962; "Да пытання аб беларуска-ўкраінскіх моўных узаемадзеяннях старажытнай пары", *Сл* 32, 1963; [Аниченко]. "Вопросы разграничения белорусских и украинских памятников", *СоСл* 1965, 6; [Аніченко]. "Проблеми вивчення українсько-білоруських мовних контактів давнього періоду в мовознавстві", *Підсумки і проблеми наукового вивчення української мови в пожовтневий період.* К, 1967.

П. Юргелевіч. *Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі.* Мн, 1961.

Ф. Филин. *Образование языка восточных славян.* М–Л, 1962; "О фонетических ареалах древнерусского языка", *Известия на Института за български език* 18, 1969; "Древнерусские диалектные зоны и происхож-

дение восточнославянских языков", *ВЯ* 1970, 5; *Происхождение русского, украинского и белорусского языков.* Л, 1972.

Л. Шакун. "Образование белорусского национального литературного языка", *ВОВСНЯ* 118; *Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.* Мн, 1963; *[*1984[2]*]*.

В. Борковский, П. Кузнецов. *Историческая грамматика русского языка.* М, 1963.

К. Горшкова. "Соотношение вокализма и консонантизма в истории древнерусского языка", *СФ* 5, 1963.

А. Исаченко. "К вопросу о периодизации истории русского языка", *ВТИЯ.*

V. Kiparsky. *Russische historische Grammatik* 1. Heid, 1963.

Т. Назарова. "Білорусько-українські ізоглоси нижньої Припяті", *Славістичний збірник.* К, 1963; "Проблема перехідних говірок між українською і білоруською мовами", *Праці.*

М. Чубати. *Княжа Русь-Україна та виникнення трьох східньословянських націй.* NY–P, 1964, раздзел 15.

P. Ivić. "Phonologische Bemerkungen zur historischen Sprachgeographie (Mit Beispielen aus dem slavischen Sprachgebiet)", *WSJb* 11, 1964.

Словник староукраїнської мови XIV–XV в. К, 1964.

J. Bělić. "Zur Problematik der Grenzen zw. verwandten Sprachen dargestellt am Material slavischer Sprachen", *Wissenschaftliche Zeitschrift Karl-Marx-Universität* Lei. *Gesells.-und Sprachwissenschaftliche Reihe* 14, 1965.

P. Davis. *A Phonology of Proto East Slavic.* Карнэльскі універсітэт {неапублікаваная дысертацыя}.

G. Fairbanks. *Historical Phonology of Russian.* Poona, 1965.

M. Weinreich. "On the Dynamics of Yiddish Dialect Formation", *FY* 3, 1965.

H. Birnbaum. "The Dialects of Common Slavic", H. Birnbaum, J. Puhvel, eds. *Ancient Indo-European Dialects.* Berkeley–Los Angeles 1966. {Гэта пашыраная версія ягонага артыкула} "On Some Problems of Common Slavic Dialectology", *IJSLP* 9, 1965.

H. Jablonski. *Westrußland zwischen Wilna und Moskau.* Leiden, 1966.

P. Pauls. "Geographical Names of West-Polissye (BSSR)", *Proceeding of the 8th International Congress of Onomastic Sciences.* Amsterdam, 1966.

V. Rūķe-Draviņa. "Isoglossen und Sprachgrenzen", *ABS* 3, 1966.

Словарь древнерусского языка XI–XIV вв. Под ред. Аванесова. М, 1966.

А. Жураўскі. "Некаторыя пытанні беларуска-ўкраінскіх моўных сувязей старажытнага перыяду", *Весці* 1966, 2.

C. Bidwell. "Phonemic Vowel Length in Eastern Slavic?", *Зборник за филологию и лингвистику* 10, 1967.

O. Backus III. {Рэц. на} Л. Алексеев. *Полоцкая земля.* М, 1966, *JGOE NS* 16, 1968.

Р. Охріменко. "Літературні звьязки українського та білоруського народів", *УМЛШ* 1968, 2.

Р. Краўчук. "Новае даследаванне ў галіне беларуска-ўкраінскіх моўных сувязей", *Весці* 1969, 6.

ЛГ

Ф. Непийвода. "Українсько-білоруські міжмовні контакти (XVII – поч. XVIII ст.)", *13 Республіканська діалектологічна нарада.* К, 1969.

М. Петер. *Историческая грамматика русского языка* 1. *Введение и фонетика.* Будапешт, 1969.

J. Prinz. *Versuch einer orientierenden Bestimmung von Namenräumen im frühostslavischen Bereich.* Heid, 1969 (*BNF* 5).

П. Третьяков. *У истоков древнерусской народности.* Л, 1970.

P. Wexler. *Purism and Language. A Case Study in Modern Ukrainian and Belorussian Nationalism (1840–1967).* Bl, 1974.

*[*Т. Назарова. *Лінгвістичний атлас ніжньої Прип'яті.* К, 1985.*]*

*[*Л. Леванцэвіч. *Атлас гаворак Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці* 1–3. Брэст, 1993–2001.*]*

*[*М. Никончук. *Лексичний атлас правобережного Полісся.* К–Житомир, 1994.*]*

Частка II

4. Гістарычныя гукавыя змены

Гістарычную фаналогію беларускае мовы – "гістарычную" і "беларускую" ў агульнапрынятым сэнсе – ад яе з'яўлення з праславянскае і да нашых дзён можна ўмоўна падзяліць на тры перыяды. (1) Першы ахоплівае змены, што адбыліся прыблізна ад VI да XII ст. н. э. (змены 1–34). Якраз у гэты час з'яўляюцца першыя знакі таго, што агульна можна акрэсліць як кіеўска-палескую і полацка-разанскую дыялектныя групы, і знакі паступовага фармавання гэтых дыялектных групаў. Першы перыяд уключае гукавыя змены ў гэтых дыялектных групах аж да з'яўлення ў XIII ст. пісьмовых дакументаў. Гэты час называецца прабеларускім дапісьмовым перыядам. Некаторыя гукавыя змены, што адбыліся на працягу гэтага часу, былі агульныя для ўсіх славянскіх гаворак, іншыя ж мелі лакальны характар або мясцовыя асаблівасці. Першыя будуць толькі пералічаныя, а другія – разабраныя падрабязна. (2) Пісьмовы перыяд прабеларускіх гаворак звязаны са зменамі, што адбыліся з XIII да прыблізна XV або сярэдзіны XVI ст. (змены 35–39). У канцы гэтага перыяду паўночная частка кіеўска-палескае і паўднёва-заходняя частка полацка-разанскае дыялектных групаў зліліся і ўтварылі беларускую мову. З гэтага пачынаецца (3) трэці і апошні этап – пісьмовы перыяд беларускае мовы, які працягваецца з сярэдзіны XVI ст. да нашых дзён (змены 40–51).

Наша перыядызацыя схематычна паказана ў табл. 9.

Табліца 9. Перыядызацыя гукавых зменаў

	дапісьмовыя перыяды		пісьмовыя перыяды	
	2000 г. да н. э.	VI–VII стст. н. э.	XIII ст.	XV–XVI стст.
0 [праславянская]				
перыяд 1		[дапісьмовая прабеларуская]		
перыяд 2			[пісьмовая прабеларуская]	
перыяд 3				[пісьмовая беларуская]

Мы падзялілі наш прадмет на два вялікія перыяды: час, ад якога не засталося пісьмовых дакументаў (дапісьмовая стадыя), і час, ад якога яны да нас дайшлі (пісьмовая стадыя). У прапанаванага намі дыхатамічнага падзелу на дапісьмовы (дагістарычны) і пісьмовы (гістарычны) перыяды ёсць дзве перавагі. Па-першае, наша перыядызацыя паказвае на тое, на што не заўсёды зважаюць даследчыкі славянскіх моваў – а гэта на тое, што беларуская мова не мела дапісьмовага мінулага (пад тэрмінам "беларуская мова" разумеецца ўсходнеславянская мова з цалкам дакументаванай гісторыяй), бо заканчэнне працэсу, у выніку якога часткі кіеўска-палескае і полацка-разанскае гаворак зліліся і ўтварылі сучасную беларускую мову (іншыя ж часткі гэтых дыялектаў прынялі ўдзел у фармаванні адпаведна ўкраінскае і расійскае моваў), адбылося ў перыяд, ад якога да нас дайшло досыць шмат пісьмовых вестак. Толькі час існавання кіеўска-палескага і полацка-разанскага дыялектаў (прабеларускае мовы) – свайго роду "пераходная" стадыя паміж дзвюма канцавымі пунктамі праславянскае і сучасных усходнеславянскіх моваў – належыць і пісьмоваму, і дапісьмоваму перыядам.

Другая перавага нашае дыхатаміі палягае ў тым, што так лягчэй меркаваць пра ступень, да якой можна рэканструяваць фаналагічныя сістэмы беларускае мовы ранейшых перыядаў са шматлікіх графічных сістэм, што ўжывалі ў Беларусі.

Гукавыя змены, апрача тых нешмалікіх, што толькі пералічаныя, даследуюцца на фоне цэлае гукавое сістэмы таго часу. Такі падыход дазваляе ператварыць наша даследаванне з простага пералічэння гукавых зменаў у апісанне фанетычнае сістэмы да і пасля кожнае змены: апісанні ўяўляюць чараду сінхранічных зрэзаў пасля кожнае важнейшае змены ў сістэме. Каб палегчыць параўнанне паслядоўных зрэзаў, мы пранумаравалі рэканструяваныя галосныя і зычныя на кожным зрэзе. Гэты спосаб дазваляе чытачу паслядоўна сачыць этымалагічныя сувязі паміж гэтымі зрэзамі – напр., прасачыць паходжанне і наступную эвалюцыю кожнага сегмента адносна кожнага папярэдняга або наступнага зрэзу. Калі, напр., у першым дапісьмовым перыядзе прабеларускае мовы *ě* (і.-е. *ē, ai, oi*) мае лічбавае абазначэнне e_8, а ў пазнейшыя перыяды мы знаходзім, што гэтай самай лічбай пазначаны два сегменты, скажам, e_8 і $\widehat{ie}_8$, гэта значыць, што гэтыя два пазнейшыя сег-

менты ёсць гістарычным працягам фанемы $\check{e}_8$ даўнейшае сістэмы. Інакш кажучы, прабеларускі $\check{e}_8$ распаўся на *е* і $\widehat{ie}$. Сегмент з некалькімі лічбамі, скажам, $e_{3,\,8}$, азначае, што e_3 і $\check{e}_8$ даўнейшага перыяду зліліся ў *е*.

Параўнанне ўсходнеславянскіх моваў з суседнімі балцкімі трэба рабіць для ўсіх перыядаў, але вынікі параўнання паказаныя адно тады, калі яны сапраўды маюць значэнне для гісторыі прабеларускае або беларускае мовы. Польскія (або, сцісла кажучы, прапольскія) дадзеныя не важныя для нас аж да X ст., калі, як мы думаем, продкі палякаў і беларусаў упершыню ўвайшлі ў зносіны. Да гэтага часу дзве славянскамоўныя групы былі, мабыць, аддзеленыя адна ад адной тэрыторыяй балцкіх плямёнаў – якіх звычайна называлі яцвягамі, – чыю мову, відаць, цяжка рэканструяваць. У выніку гэтага досыць позняга кантакту граніца паміж беларускімі і польскімі гаворкамі, па сутнасці, вельмі выразная, з невялікай колькасцю пераходных гаворак, зусім не так, як на беларуска-ўкраінскай і беларуска-расійскай моўных граніцах. Параўноўваць беларускую мову з ідышам нам не трэба да XIV ст., калі паміж габраямі, што гаварылі ідышам, і беларусамі ўсталяваліся шырокія зносіны.

Далей гукавыя змены пазначаюцца нумарамі, каб на іх лягчэй было спасылацца. Прыклады з беларускае мовы, калі не агаворана іншае, узятыя з сучаснае літаратурнае мовы і падаюцца ў адпаведнасці з нормамі цяперашняга беларускага савецкага правапісу. Гэтыя прыклады, што грунтуюцца на нормах, зацверджаных у 1933 г., абазначаюцца як беларускія (бел.), літаратурныя беларускія (літар. бел.) або сучасныя беларускія (суч. бел.). Часам варта падаваць прыклады з беларускае літаратурнае мовы, якой яна была да савецкае рэформы 1933 г.; гэтых нормаў і цяпер трымаюцца беларусы на эміграцыі. Прыклады з літаратурнае мовы да 1933 г. пазначаюцца як дарэформавыя беларускія (дарэф. бел.) (гл. таксама с. 13–14). Прыклады, узятыя з беларускіх гаворак, звычайна падаюцца ў прастакутных дужках у зразумелай фанетычнай транскрыпцыі, але таксама могуць быць запісаныя ў адпаведнасці з правапіснымі нормамі беларускае літаратурнае мовы. Словы, што не маюць пры сабе тлумачэнняў, запісаныя ў той жа форме, што і папярэдні прыклад. Агульныя бібліяграфічныя спасылкі, пададзеныя ў выбранай бібліяграфіі да раздзела 2.1.1 і яго падраздзелаў, звычайна прапануюць чытачу пэўны разбор абрысаваных ніжэй зменаў і, як

правіла, у спасылках да часткі 2 другі раз не спамінаюцца. Далей мы падаем толькі спасылкі, звязаныя з пэўнымі тэмамі, якіх мы не згадвалі раней.

4.1. Сістэма фанем позняе праславянскае мовы. На час першага падзелу на дыялекты, які можна выявіць у праславянскай мове, прабеларускую сістэму галосных гукаў можна рэканструяваць наступным чынам:

i	u_1	u_2[1]
$_e a$	$_o a$	

Кожны з гэтых галосных мог быць доўгі або кароткі. Доўгім галосным быў уласцівы тон, які мог і падвышацца, і паніжацца. Гэта значыць, што ў мове было 15 галосных фанем.

Сістэму зычных гукаў можна рэканструяваць наступным чынам:

p		*b*	*t*		*d*	*č*		*k*	*g*
	(*w*)		*s*		*z*	*š*	*ž*	*x*	
	m			*n*					
				l			(*j*)		
				r					

Два зычныя гукі, а менавіта *w* і *j*, падаюцца ў дужках, бо яны былі алафонамі адпаведна галосных *u* і *i*. Залежна ад таго, лічым мы іх ці не, зычных было 15 або 13.

Якраз з гэтых сістэм галосных і зычных гукаў пачалася гісторыя прабеларускае мовы (а таксама ўсіх іншых славянскіх моваў).

5. Дапісьмовы перыяд прабеларускіх гаворак: кіеўска-палеская і полацка-разанская дыялектныя групы з VI да XII ст. Змены 1–34

Змена 1. Другая рэгрэсіўная палаталізацыя (змякчэнне) заднепаднябенных (праславянская мова [VI–VII стст.], гл. *PoS*, раздзел 21).

---

[1] Два галосныя гукі, абазначаныя літарай *u*, мелі рознае паходжанне; u_1 паходзіў ад індаеўрапейскага і даўнейшага праславянскага *u*; u_2 – ад індаеўрапейскіх і ранніх праславянскіх дыфтонгаў *ou*, *au*, *eu*. Гл. змену 6.

На працягу прыблізна сямі стагоддзяў, пачынаючы з VI–VII стст., можна выявіць абрысы ізаглосаў, што перасякалі ўсходнеславянскую тэрыторыю і характарызавалі прабеларускія гаворкі кіеўска-палескае і полацка-разанскае зонаў. Найранейшы такі падзел дыялектаў стаўся вынікам другога рэгрэсіўнага змякчэння заднепаднябенных у мяккія зубныя, якое, відаць, адбылося ў VI або VII ст. Гэта была першая вядомая змена ў праславянскай мове, што дала розныя вынікі ў славянскіх мовах, дзеля гэтага некаторыя аўтары лічаць гэтую змену вяшчункаю пачатку распаду праславянскае мовы (гл. раздзел 3). Замена заднепаднябенных фрыкатыўнымі зубнымі асабліва відавочная для беларускіх назоўнікаў у форме меснага склону (а для назоўнікаў жаночага роду і ў давальным склоне) адзіночнага ліку. Да VII ст. гэта таксама закранула назоўнікі мужчынскага роду множнага ліку ў назоўным склоне. Агульнае правіла другога змякчэння заднепаднябенных можна сфармуляваць наступным чынам:

k		*c'* (пазней > *c*)
g	перад *ě* (г. зн. *ѣ* < *ai*) і *i* (< *ai*) >	*ʒ'* (пазней > *z'*)
x	(і *ť* ў запазычаных словах таго перыяду)	*s'*

напр., перад *ě*:

k: бел. *цэ́лы* – готск. *hails*, старапрус. *kailūstiskan* 'здароўе'
g (пазней *h*): бел. *нага́* (рас. *нога́*) || *назе́* (Д.скл. адз.)
x: бел. *му́ха* || *му́се* (М.скл. адз.)

перад *i*:

k: бел. *царква́* < гоцк. **kirikô* (прабел. *цьркъвь*)
g (пазней *h*): прабел. *порогъ* || *порози* (Н.скл. мн.) – суч. бел. *парóг*, *парóгі*
x : старабел. *рух* || *руси* (Н.скл. мн.) – суч. бел. *рух*, *ру́хі*

Прабеларускія чаргаванні *k*||*c* і *g*||*z* у дзеясловах загаднага ладу (*пеци*, *помози*) з VI ст. замяніліся на чаргаванні *k*||*č* і *g*||*ž* (суч. бел. *пячы́*, *памажы́*).

Прабеларускія гаворкі часткова розняцца ў перадачы заднепаднябенных у дзвюх пазіцыях: (1) пасля свісцячых або шыпячых і (2) перад *vě*.

1. *sk*, *zg* перад *ě*, *i*:

к.-п.: *sk* > *sc*’ 

п.-р.: *sk* > *sc*’ ва ўсіх пазіцыях

Прыклады:

у пачатку слова:

бел. *скéпка* ‘трэска’ < прасл. **sk*$_{o}$*aip-* – параўн. балг. *цéпя* ‘раскол, трэска’;

бел. дыял. *шкéрыць* ‘усміхацца, шчэрыць зубы’ < прасл. **sk*$_{o}$*air-* – макед. *цери се* ‘касавурыцца, пазіраць скоса’[1]

на канцы асновы: бел. *дóшка* || *дóшцы* (Д. і М.скл. адз.) < прасл. **dŭsk-*

2. У пазіцыі перад *vě* пераход заднепаднябенных ізноў не аднастайны. У большасці ўсходнеславянскіх гаворак другое змякчэнне заднепаднябенных, здаецца, ахоплівала заднепаднябенныя, за якімі ідзе спалучэнне *vě*, але таксама ёсць прыклады заднепаднябенных, што ў гэтай пазіцыі захоўваліся нязменныя. Палаталізацыю заднепаднябенных перад *vě* традыцыйна лічаць адметнаю рысаю ўсходнеславянскіх моваў. Выключную, паводле агульнае думкі, прысутнасць спалучэнняў *kv*, *gv*, *xv* у беларускіх гаворках можна вытлумачыць адным з пяці спосабаў: (1) пазнейшым польскім уплывам; (2) аналогіяй (узаемадзеяннем *cv-* перад *ě* і *kv-* перад *ĭ*); (3) гукаперайманнем; (4) архаізмамі; (5) агульнымі ляхіцка-заходнярускімі лексічнымі ізаглосамі. Дапушчэнне пра польскі ўплыў можа вытлумачыць некаторыя беларускія формы (гл. ніжэй). Але польскі ўплыў хіба не тлумачыць усіх выпадкаў, бо формы з заднепаднябеннымі перад *vě* зафіксаваныя і ў тых усходнеславянскіх гаворках, што ляжаць далёка ад сферы ўплыву польскае мовы. Найбольш праўдападобным тлумачэннем можа быць тое, што некаторыя прабеларускія дыялекты, як і прапольская ды іншыя заходнеславянскія мовы, не зазналі другога рэгрэсіўнага змякчэння заднепаднябенных у гэтай фанетычнай пазіцыі. Чаргаванне заднепаднябенных перад *vě* з шыпячымі пачалося, мабыць, у паўднёваславянскай зоне, а тады пашырылася на ўсходнеславянскія дыялекты. Аднак гэтая інавацыя не ахапіла ўсходнеславянскае тэрыторыі цал-

[1] Параўн., напр., *скепають* (XVI ст.), якое адпавядае суч. бел. *шч-*. Пра пару *шчэрыць* ~ *скерыць* гл. *PoS* 299, 4.

кам, і ў выніку большая частка кіеўска-палескае зоны, г. зн. гаворкі, што былі асновою сучаснае паўднёвабеларускае, паўночнаўкраінскае і часткова паўднёварасійскае моваў, не бралі ўдзелу ў гэтай змене, а полацка-разанская група далучылася ў гэтай змене да іншых усходнеславянскіх і паўднёваславянскіх гаворак (гл. *PoS* 301–302)[1]. Прыклады захавання заднепаднябенных перад *vě* ў кіеўска-палескіх гаворках:

kv-: *квéтка* (параўн. укр. *квíтка*, але рас. *цветóк*); *расквéціць*[2]. Форма *цвет* або запазычанне з царкоўнаславянскае, або паходзіць з полацка-разанскае дыялектнае групы. Параўн. таксама *расцвітáць*.

gv-: бранскае дыял. *агвяздзíць* 'ударыць'. Форма *звяздá* (параўн. літ. *žvaigždė̃*) – запазычанне з царкоўнаславянскае; *гвязда*, *гвяздачка* – магчыма, запазычанні з польскае[3]. Спрадвечнабеларускае слова – *зарá*, *зóрка*.

У выніку другога рэгрэсіўнага змякчэння заднепаднябенных сістэму зычных гукаў прабеларускае мовы ўзбагацілі тры новыя элементы. Сістэма да і пасля гэтае змены паказаная ў табл. 10. Пачынаючы з гэтае табліцы, мы пазначаем лічбамі кожны сегмент зрэзу (гл. п. 4); нумарацыя сістэмы галосных гукаў даецца ў змене 6. Хоць гэтая нумарацыя наагул зусім умоўная, але адно выключэнне зроблена ў нумарацыі палаталізаваных спалучэнняў. Гэтыя сегменты пазначаныя тымі ж самымі лічбамі, што і заднепаднябенныя, з якіх яны развіліся за стагоддзе або два перад наступнай першай рэгрэсіўнай палаталізацыяй заднепаднябенных (гл. *PoS*, раздзел 17; *TA* 309 і наст.): *k*, *g*, *x* перад усімі пярэднімі галоснымі (*i*, *ě̃* і дыфтонгамі з першым складнікам

---

[1] Пра магчымасць таго, што спалучэнні *kv* шырэй захаваліся на ўсходнеславянскай тэрыторыі, а не толькі ў кіеўска-палескім дыялекце, гл. *TA* 313.

[2] Але дыял. [кв'ат], [кв'атк'і] з'яўляюцца пазнейшымі запазычаннямі з польскае мовы (польск. *kwiat*, *kwiatek*). У XVI–XVII стст. у Псалтырах спатыкаюцца абодва спалучэнні *kv-* і *cv-* у каранях са значэннем 'кветка' і 'цвісці': напр., *квѣтье*, *кветноуть*, *процвекнет* (XVI ст.); *розквитнуся*, *квѣты*, *зацвитуть* (XVII ст.) (Карский). Ёсць некалькі прыкладаў *ѣ v* з *kv* (параўн. *тъвет* у некаторых беларускіх і расійскіх гаворках). Прыклады, пачынаючы з XV ст. і да цяперашняга часу падае Карскі. Што да расійскіх прыкладаў *tv* на месцы *kv*, то гл., напр., Сахарава (Сахаров).

[3] Германовіч лічыць слова *гвязда*, якое ўжывалі і пасля 1917 г., але цяпер яно ўжо выйшла з ужытку, паланізмам (параўн. польск. *gwiazda*). Гэты корань з выбухным *г* можна таксама сустрэць у старабеларускіх тэкстах, напр., *кгвязда* (XVI ст.); несумненна, гэта паланізм.

ęã: *ęai*, *ęaN*, *ęau*) > прабел. *č*, *ǯ*, *š* (пазней *č*, *ž*, *š*). Змякчэнне будзе пазначацца і калі гэта непатрэбна (як у выпадку з c'_{13}, $ǯ'_{14}$, $š'_{15}$, $ž'_{14}$, $č'_{13}$, $ǯ'_{14}$), і калі гэта важна з фанетычнага погляду (як у выпадку з парамі n_9–n'_9, l_{10}–l'_{10}, r_{11}–r'_{11}, s_7–s'_7). Такім спосабам, мы здолеем у табліцы прасачыць зацвярдзенне палаталізаваных сегментаў на працягу развіцця фаналагічнае сістэмы прабеларускае і беларускае мовы.

Табліца 10. Зрэз 1С. Сістэма зычных гукаў прабеларускае мовы да і пасля другое палаталізацыі заднепаднябенных

перад зменай 1 (і пасля першага праславянскага змякчэння заднепаднябенных)				пасля змены 1				
p_1	t_5		k_{13}	p_1	t_5			k_{13}
b_2	d_6		g_{14}	b_2	d_6			g_{14}
	s_7	$š'_{15}$	x_{15}		s_7	s'_{15}	$š'_{15}$	x_{15}
	z_8	$ž'_{14}$			z_8		$ž'_{14}$	
		$č'_{13}$				c'_{13}	$č'_{13}$	
		$ǯ'_{14}$				$ǯ'_{14}$	$ǯ'_{14}$	
m_3	n_9			m_3	n_9			
	l_{10}				l_{10}			
	r_{11}				r_{11}			
w_4		j_{12}		w_4			j_{12}	

(На гэтым і ўсіх наступных зрэзах мы ўжываем наступныя ўмоўныя абазначэнні: пасля нумара зрэзу – С = сістэма зычных гукаў (кансанантызм) і V = сістэма галосных гукаў (вакалізм); новыя элементы ў сістэме фанем узятыя ў рамку.)

Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. *Западнорусские переводы Псалтыри в XV–XVII вв.* Варшава, 1896, 200–201; *Белорусы* 1, 1955, 375.

V. Jagić. {Рэц. на} Карский 1896, *ASPh* 19, 1897, 292.

А. Сахаров. "Язык крестьян Ильинской волости Болховского уезда Орловской губ.", *СбОРЯС* 68, 1900.

N. Durnovo. "Le traitement de **sk* dans les langues slaves", *RÉS* 6, 1926.

О. Волк-Левонович. "Еще к вопросу о "ляшских" чертах в белорусской фонетике", *SlI* 9, 1930.

H. Birnbaum. "Zu urslav. *kv-*", *ScSl* 2, 1956.

В. Мареш. "Палатализация славянских велярных и альвеолярных согласных в сочетаниях с *u~v*", *Cercetări de lingvistică* 3, 1958.

А. Мельничук. "Роль аналогии в переходном смягчении общеславянских *г, к, х* в *дз, ц, с*", *ПСМ* 5, 1958.

И. Леков. *Насоки в развоя на фонологичните системи на славянските езици.* С, 1960.

A. Vaillant. "Slave *kvíěti, kvělití*", *RÉS* 37, 1960.

І. Германовіч. "З гісторыі нармалізацыі беларускай літаратурнай лексікі", *Весці* 1961, 3, 96.

Ф. Филин. *Образование языка восточных славян.* М–Л, 1962, 179–181; "Древнерусские диалектные зоны и происхождение восточнославянских языков", *ВЯ* 1970, 5.

M. Jurkowski. "Losy prasłowiańskich grup **kv-*, **gv-*, **xv-*", *ZPSS*, 1963.

C. Bidwell. "A Note on the Reflexes of Borrowed Velar Plus Front Vowel in Early Post-Common Slavic", *Studies in Philology* 63, 1966.

Змена 2. Развіццё насавых галосных (праславянская мова [VII ст.], гл. *PoS*, раздзел 22).

Змена 3. Страта спалучэнняў з *j*, I (праславянская мова [VII–VIII ст.][1], гл. *PoS*, раздзел 14). Элемент *j* у пазіцыі пасля зычных меў далекасяжны ўплыў на сістэму зычных гукаў позняе праславянскае мовы. Палаталізаваныя сегменты ўвайшлі ў сістэму – замест спалучэнняў з *j* – упершыню пасля страты мяккіх заднепаднябенных у ранняй праславянскай мове, калі частасць палаталізаваных шыпячых і свісцячых значна павялічылася. Часткова вынікі страты сегмента *j* аднолькавыя з вынікамі першага рэгрэсіўнага змякчэння заднепаднябенных.

(1) звонкія зубныя зычныя перад *j*:

rj > *r'* (пазней > *r* у большасці прабеларускіх гаворак): бел. *бу́ра* – рас. *бу́ря*

lj > *l'*: бел. *во́ля* – ц.-сл. *воля*, літ. *valià*

nj > *n'*: бел. *конь* < прасл. **ko(b)n-j-os*

(2) губныя перад *j*:

pj > *pl'*: бел. *цярплю́* || *цярпе́ць*; бел. *Лепль* (назва возера ў Віцебскай вобласці). Да XVI ст. сустракалася ў форме *Ліпль* – стар.-рус. **Лѣпль* < проталатыш. **Lēpja*; параўн. латыш. *lēpa* 'лілея', магчыма ад эст. *lepa* 'вольха'

[1] Параўн. выпраўленую храналогію Шавялёва ў *ТА* 309 і наст.

bj > *bl'*: бел. *люблю́* || *любо́ў*
mj > *ml'*: бел. *ламлю́* || *лами́ць*
wj > *wl'*: бел. *лаўлю́* || *лавіць*

Расійская і ўкраінская мовы развіваліся гэтаксама. Польская мова рана аднавіла формы без *l'* у большасці выпадкаў, апрача пазіцыі ў пачатку слова. З суседніх і пашыраных на той самай тэрыторыі, што і беларуская, неславянскіх моваў толькі ўсходнелатышская мела спалучэнне губны + *j* – асабліва *pj* (Otrębski).

Часам пасля таго, як гукавая змена адбылася, l'_{10} і j_{12} у беларускай мове пачыналі ўжываць на перамену пасля губных нават у некаторых марфемах, што гістарычна не мелі чаргаванняў губнога з губным + *l'* у корані. Замена j_{12} на l'_{10} не на першапачатковых фанетычных пазіцыях была абумоўленая марфалагічна і адлюстроўвалася толькі дзенідзе. Гл., напр., прабел. *Гомей*, *Гомъи* М.скл. адз. (1480), бел. лац. – *z Homia* (1533), бел. габр. – *homjw* (сярэдзіна XVII ст.)[1], што адпавядае суч. бел. *Го́мель*. Ужыванне на перамену *l'* і *j* магло прывесці да існавання дублетаў *аль кіта́б* ~ *ай кіта́б* 'тэксты беларускіх татараў' < араб. *ʾalkitāb* 'кніга'. Усходнеславянскія мовы не заўсёды аднолькава адносіліся да марфалагічна абумоўленае замены *j*. Напр., беларуская мова захавала прасл. **šč̑avъ* у форме *шча́ўе* (параўн. таксама ўкр. *шча́ва́* або паўдн.-зах. бел. дыял. [шчав'э́й], якое можна знайсці і ў некаторых расійскіх гаворках, напр., кастрамскіх), тым часам у літаратурнай расійскай мове – *щаве́ль*[2]. Некаторыя словы ў беларускай мове маюць варыянты: напр., *жураве́ль*, *жураўля́*, але *жо́раў*, *жо́рава* і магілёўскае дыял. [жо́рув][3]. У тапонімах часта адсутнічае спадзяваны *l'*: напр., *Радимье*, калі гэта прыналежны прыметнік ад *Радимъ* (Мінская вобласць, Барысаў). У шмат якіх выпадках адсутнасць *l* у стара-

---

[1] Беларуска-габрайская форма ўзятая з: Д. Магід. "Падії 1648–1656 р. на Україні й Польшчі в єврейській літературі XVII–XIX вв. (Бібліографія й регести)", *Збірник праць жидівської історично-археографічної комісії*. К, 1929, 266 – пададзеная ў ягонай транслітарацыі.

[2] Параўн. таксама ід. *šč̑av(e)* ад польск. *szczaw* або бел. *шча́ўе*.

[3] Апошнюю форму падае Растаргуеў. Апошнія дзве белалускія формы могуць, вядома, быць вынікам уплыву польск. *żóraw*. Параўн. таксама рас., чэшск., славацк. *žeravъ* – серб.-харв. *žȅrâv* – літ. *gérvė* – латыш. *dzẽrve* < і.-е. **gerōu̯os*.

беларускіх тэкстах ёсць адлюстраваннем польскага ўплыву: напр., *збавени* (XVI ст.; = суч. бел. *збаўлены*).

У выніку страты спалучэнняў губны + *j* прабеларуская мова развіла ў дзеяслоўных асновах морфафанемнае чаргаванне губнога + *л* у формах 1 ас. адз. (а таксама ў пасіўных дзеепрыметніках і дзеясловах незакончанага трывання) з губным (урэшце палаталізаваным) ва ўсіх іншых асобах дзеясловаў 4-га класу і губнога + *л* у асновах цяперашняга часу з губным у асновах інфінітыва дзеясловаў 3-га класу. У тых нешматлікіх беларускіх гаворках (а таксама ў літаратурнай мове), якія прынялі *ф* у запазычаных словах (мабыць, не раней за XV ст., гл. змену 42), чаргаванне губны || губны + мяккі бакавы таксама прыдатнае: *фj* > *фл*: бел. *графлю́* || *графі́ць*. Чаргаванне губны || губны + *л* пашыраецца на *ф* затым, што яно зрабілася рэгулярным у марфалогіі беларускіх дзеясловаў *[...]*.

Вынікам выраўноўвання ўнутры парадыгмы сталася з'яўленне злучэння губны + *л* у гістарычна неапраўданых пазіцыях, гэтаксама як і знікненне гістарычнага *л*. У паўночна-ўсходняй частцы Беларусі дзеясловы 3-га класу тыпу *драмаць* перайшлі ў 4-ы клас, у выніку *л* з'яўляецца толькі ў формах 1 ас. адз. *драмлю́* – *дрэ́мішь*, хоць старая парадыгма дзеясловаў 3-га класу (*драмлю́* – *дрэ́млеш*) яшчэ і цяпер спаборнічае з ёю. Іначай кажучы, *л* было страчана ў гэтых дзеясловах толькі ў некаторых паасобных мясцовасцях на паўднёвым захадзе ўздоўж граніцы з Украінаю і на паўночным захадзе ўздоўж дзяржаўнае граніцы з Літвой і Латвіяй. Што да дзеясловаў 4-га класу, то тут знаходзім зусім іншую карціну. Тут шырока захаваліся варыянты. У некаторых вёсках у паўднёвай частцы краіны людзі пераносяць *л* і ў формы 3 ас. мн. (*лоўлю* – *лоўляць*), гэта ўкраінская рыса, але ў той самай мясцовасці могуць існаваць розныя формы: напр., некаторыя людзі гавораць, не ўжываючы *л* у формах 1 ас. адз.

(3) зубныя свісцячыя і выбухныя, заднепаднябенныя перад *j*:



Прыклады:

z: бел. *нож* < прасл. **n*$_{o}$*azjos* – ц.-сл. *вънъзѫ* ‘праколваю’ 1 ас. адз.

d: бел. *мяжá* – лац. *medius* ‘сярэдні’

g: бел. дыял. *старóжа* || *сцерагý*

s: бел. *прашý* || *прасíць*

x: бел. *душá* < **duxj*$_{o}$*ā* || параўн. бел. *дух*

k: бел. *плáчу* < прасл. **pl*$_{o}$*ākjǫ* || бел. *плáкаць*

t: бел. *свéчка* < прасл. **svētj*$_{o}$*ā* (з няясным суфіксам) || бел. *свéтла* – санскр. *çvētyás* ‘белы, светлы’

kt: бел. *ноч* – літ. *naktis*, лац. *noctis* Р.скл. мн.

gt: бел. *магчы* (з *г* фрыкатыўным, які развіўся пазней) < прасл. **m*$_{o}$*agtī* – латыш. *mêgt* ‘магчы, быць здольным’

Афрыката *ʒ́* захавалася, відаць, да X ст., калі яна злілася з *ź*, акрамя пазіцыі пасля *ź*, дзе яна не зазнала спрашчэння. У сучаснай беларускай мове ў дзеяслоўных асновах на месцы гістарычнага *dj* стаіць *ʒ́*: напр., *вадзíць* (рас. *водúть*) || *ваджý* (рас. *вожý*). Паколькі гэтае чаргаванне абмяжоўваецца марфалогіяй дзеясловаў, мы тлумачым *ʒ́*, што чаргуецца з *ʒ*’(< *d*’)[2], як пазнейшую з’яву, абумоўленую марфалогіяй, а не як захаванне першапачатковага *ʒ́* або рэтрагрэсіўную гукавую змену: *dj* > *ʒ́* > *ź*, замененае на *ʒ́*. Шырэй пра гэта гл. у зменах 14 і 44.

---

[1] Параўн. з паслядоўнасцю чаргаванняў, прапанаванаю Андэрсэнам (Andersen).

[2] Пра афрыкацыю *t*’ > *c*’ і *d*’ > *ʒ*’ гл. змену 43.

Зубныя шыпячыя, якія ўтварыліся ад спалучэнняў *tj*, *kj*, *dj* і *gj*, зрабіліся адпаведна *š* і *ž*: *stj* і *skj* > *š' č'* (пазней *šč*); *zdj* і *zgj* > *ž' ǯ'* (пазней *žǯ*):

st: бел. *пушчу́* < прасл. **pustiją* || бел. *пусці́ць*, рас. *пусти́ть*
sk: бел. *плюшч* – латыш. *plauskas* 'перхаць, налёт'
zd: бел. *е́ждж у* || *е́здзіць*, рас. *е́здить*
zg: бел. *дрожджы* < прасл. **drozg-* < * *drogsk-* – стараліт. *dragės*

Аб прысутнасці паўднёва- і заходнеславянскіх рэфлексаў першапачатковых спалучэнняў з *j* у беларускай лексіцы гл. падраздзел 2.3.2.

Выбраная бібліяграфія

А. Шахматов. "К вопросу о польском влиянии на древнерусские говоры", *РФВ* 69, 1903.

П. Растаргуеў. "Да характарыстыкі беларускіх гаворак", *Запіскі* 1, 1928.

J. Otrębski. *Gramatyka języka litewskiego* 1. W, 1958, 340.

H. Andersen. "Lenition in Common Slavic", *La* 45, 1969.

J. Prinz. *Versuch einer orientierenden Bestimmung von Namenräumen im frühostslavischen Bereich.* Heid, 1969, 42 {і наст.}, 67.

Змена 4. Трэцяя (прагрэсіўная) палаталізацыя заднепаднябенных (VII – сярэдзіна IX ст., гл. *PoS*, раздзел 23).

k_{13}, g_{14}, x_{15} } пасля $\check{r}$ і $ę$ < $\check{r}$ + насавы зычны < c'_{13} (пазней c_{13}), $ʒ'_{14}$ (пазней z'_{14}), s'_{15}

пры ўмове, што пасля заднепаднябенных не было зычнага гуку або галоснага тыпу *u* (*u*, *ū*):

k_{13}: бел. *за́яц* < прасл. **zajęk-* – польск. *zając*, літ. *zuīkis*
g_{14}: бел. *князь*, *князя* < протагерм. **kuniŋgaz* 'кароль'
x_{15}: бел. *увёсь* < прасл. **vьx-*

У беларускай мове ёсць некалькі адхіленняў ад гэтага правіла: напр., *гляк* (< прасл. **gъlькъ* – параўн. рас. дыял. [гл'ок], [голóк], укр. *глек*), а не *+*глец*; *не́льга* (параўн. рас. *нельзя́*). Відаць, гэта затым, што інавацыя пачалася на паўднёвым захадзе славянскіх земляў і дасягнула паўночнага ўсходу славянскае тэрыторыі запозна, каб зрабіць сістэматычны ўплыў на лексічны склад мовы (гл. *PoS* 345–346). У кантэкс-

це ўсходнеславянскіх моваў беларуская і ўкраінская мовы блізкія адна адной і проціпастаўленыя расійскай літаратурнай мове, якая мела менш адхіленняў з прычыны шырэйшага ўплыву на яе царкоўнаславянскае мовы ў пазнейшы перыяд. Вельмі часта беларуская, украінская і расійская мовы маюць падобныя формы аднаго і таго ж кораня: напр., бел. *во́льха* (рас. *ольха́*, укр. *ві́льха*), у процілегласць некаторым заходне- і паўднёваславянскім мовам, дзе на гэты корань зрабіла ўплыў трэцяя палаталізацыя (напр., чэшск. *olše*). Іншым прыкладам згоднасці ўсходнеславянскіх моваў у адпоры ўздзеянню трэцяе палаталізацыі можа служыць бел. *ягá* 'ведзьма' (рас. *ягá*, укр. *ягá* побач з укр. *я́зя*). У адным выпадку беларуская мова, адзіная з усіх усходнеславянскіх, процістаяла ўздзеянню трэцяе палаталізацыі: *я́йка* (побач з *яйцó*; параўн. рас. *яйцó*, укр. *яйцé*). У гэтым выпадку беларуская мова найбліжэйшая да польскае, якае мае *jajko* (хоць у старапольскай мове зафіксавана слова *jajce*). Што да прабеларускага перыяду, то можна дапусціць слабейшае адлюстраванне трэцяе палаталізацыі на паўночным усходзе (полацка-разанскія гаворкі), чым на паўднёвым захадзе (кіеўска-палескія гаворкі), але факты сучасных украінскіх і беларускіх гаворак, у той ступені, у якой яны даступныя, не надта высвятляюць гэтае пытанне.

Трэцяя палаталізацыя не ўнесла ніякіх новых элементаў у прабеларускую сістэму зычных гукаў, бо яе вынікі былі такія самыя, як і вынікі другое палаталізацыі. Трэцяя палаталізацыя павялічыла частасць ужывання трох альвеолапалатальных свісцячых, але колькасць функцыянальна рэлевантных апазіцый зубных і зазубных засталася нізкая. У выніку новыя $ʒ'_{14}$ і s'_{15} недастаткова інтэграваліся ў сістэму. Прычыны некаторых наступных працэсаў у сістэме зычных гукаў прабеларускае мовы можна наўпрост вывесці са слабой інтэграванасці $ʒ'_{14}$ і s'_{15} у сістэму пасля трэцяе прагрэсіўнае палаталізацыі заднепаднябенных. Калі прычыны гэтых працэсаў у прынцыпе лёгка зразумець, то адносную храналогію зменаў вызначыць цяжка. Тры наступныя змены ўключалі (1) спірантызацыю g_{14} (гл. змену 13); (2) спрашчэнне афрыкат $ʒ'_{14} > z'_{14}$, $ʒ'_{14} > ž'_{14}$ (гл. змену 14) і (3) змешванне зазубных і зубных (гл. змену 17). Гэтыя змены не былі абмежаваныя толькі прабеларускаю моваю; іх трэба вывучаць у шырэйшых параўнальных рамках.

Змена 5. Спрашчэнне спалучэнняў *tl, dl* не ў пачатку слова; замена ў дыялектах *tl, dl* на *kl, gl* (VIII – сярэдзіна IX ст.[1], гл. *PoS*, раздзел 25).

Ва ўсходне- і паўднёваславянскіх мовах спалучэнні *tl* і *dl* ва ўсіх пазіцыях, акрамя пазіцыі на пачатку слова, спрасціліся ў *l*:

tl: бел. *пляла́* < прасл. **pletla* || параўн. *плятý* (рас. *плетý*)
dl: бел. *го́рла* < прасл. **gъrdlo* – параўн. польск. *gardło*, літ. *gurklỹs* 'валлё'

Вынікі спрашчэння можна ўбачыць, параўнаўшы беларускую мову з польскаю, якая збольшага захавала разгляданыя спалучэнні, а таксама даследуючы марфалогію беларускіх дзеясловаў. У дзеяслоўнай парадыгме зубныя выбухныя зычныя захаваліся ў цяперашнім часе, але страчаныя ў формах прошлага часу перад паказальнікам часу *-l*: напр., *падý* 1 ас. адз. || *паў* м.р. прош.ч.[2], *пáла* ж.р. прош.ч. – польск. *padł* м.р. прош.ч. Прыклады спалучэнняў *tl* і *dl* у сучаснай літаратурнай беларускай мове і/або гаворках маюць больш позняе паходжанне: (1) пазнейшыя запазычанні з польскае, напр., бел. *быдла* < польск. *bydło* (геаграфічную пашыранасць гэтага слова гл. у *ДАБМ*, карта 293) або (2) новыя спалучэнні, якія развіліся пасля страты рэдукаваных (гл. змену 25): бел. *сядло́* < прасл. **sedьlo* ~ *sedъlo*; бел. *све́тлы* < прасл. **světьl-*. У выніку запазычанняў з польскае слоўнік беларускае мовы набыў пэўную колькасць дублетаў: *мы́ла* ~ *мы́дла* (польск. *mydło*)[3], *цапаві́ла* ~ *цапаві́дла* (гл. *ДАБМ*, карта 257 – польск. *widły* 'вілы').

У беларускай мове таксама ў некаторых выпадках спалучэнні *kl* і *gl* сустракаюцца ў каранях на месцы *tl* і *dl* у славянскіх гаворках, дзе не адбылося спрашчэння гэтых спалучэнняў, а таксама на месцы аднаго *l* у гаворках, дзе спрашчэнне мела месца. Змена *tl* і *dl* адпаведна ў *kl* і *gl* была ўласцівая балцкім, паўночнапольскім, эстонскім і пскоўскім дыялектам[4]. Змена ў першых кампанентах спалучэння, якая, відавочна, адбылася перад тым, як пачало дзеяць правіла спрашчэння, закра-

---

[1] Пра магчымасць выпраўленай храналогіі гл. *TA* 314.
[2] Пра вакалізацыю канцавога *l* > *w* гл. змену 41.
[3] Усходнеславянская форма перайшла ў літоўскую мову ў форме *mūĩlas* без зубнога выбухнога зычнага.
[4] Спамянутым вышэй бел. *го́рла* і літ. *gurklỹs* адпавядае пскоўскае дыял. (з рознай ступенню чаргавання галосных) *жерогло́* 'морда'. Параўн. таксама бел. *жарало́* 'рот, адтуліна, морда'.

нула беларускую мову толькі бокам. Возьмем як прыклад бел. *сустракáць* незак.тр., але *(су)стрэ́ць* зак.тр. – параўн. з рас. *встре́тить*, укр. *зустрíти* || *зустрíла* ж.р. прош.ч. Беларускія формы з *k*, якія з'явіліся найперш у выніку змены ў чаргаванні зычных (*t*//*č* на *č*//*k*), маглі быць падтрыманыя кантактамі з суседняй пскоўскай гаворкай расійскае мовы, з яе формаю *сустрѣ́кли* м.р. прош.ч., або з балцкімі мовамі.

Беларуская мова мае таксама некалькі дублетаў, якія можна вытлумачыць пазнейшымі запазычаннямі з польскае, дзе формы з заднепаднябеннымі выбухнымі зычнымі з'яўляюцца рэшткамі старых балцка-паўночнаславянскіх ізаглосаў. У выпадку з дублетам *вянглíна* ~ *вяндлíна* маем адзіную польскую мадэль *wędliny*, але фанетычная форма дублетаў (напр., захаванне насавога) паказвае на польскае паходжанне гэтага слова. Калі слова **węgliny* цяпер невядомае ў польскіх гаворках, дык беларуская мова сведчыць, што яго маглі калісь ужываць у польскай мове. У беларускай мове ёсць дыялектныя дублеты [с'в'атл'іца] ~ [с'в'акл'іца]. Першая форма спрадвечнабеларуская (параўн. рас. *светли́ца*, польск. *świetlica*), але другі варыянт можа быць вынікам балцкага ўплыву. Паводле Атрэмбскага, бел. [с'в'атл'іца] у літоўскай мове набыло форму *svetlyčià*, дзе яно змянілася на *sveklyčià*, а пасля было зноў запазычанае беларускаю моваю ў форме [с'в'акл'іца]. Варыянты *tl*~*kl* сустракаем на пачатку слоў *тлýсты*, *тлýстасць* і дыял. *клýсты*, *клýстасць*, што ад польск. *tłusty*, *tłustość* (паралельных сваім *тóўсты*, *тóўстасць* < прасл. **тъlstъ*). Беларускае спалучэнне *kl* магло ўтварыцца на беларускай тэрыторыі ад *tl* у выніку распадабнення (Сцяцко), але існаванне польскіх дублетаў *tłusty* ~ *kłusty* і фанетычных формаў гэтага кораня ў беларускай мове (*łu* < *ъl*) робіць больш праўдападобным тлумачэнне шматлікімі запазычаннямі з польскае мовы.

Выбраная бібліяграфія

L. Tesnière. "Les diaphones *tl*, *dl* en slave: essai de géographie linguistique", *RÉS* 13, 1933.

L. Ossowski. *Studia nad wpływami języka polskiego na białoruski. Przyrostki -i s k o oraz -d ł o w gwarach białoruskich.* Lv, 1937 (= *Sprawozdania T-wa naukowego we Lwowie* 17, 1).

J. Kalima. "Classifying Slavonic Languages", *SEER* 25, 1946–47, 488.

W. Taszycki. "O gwarowych formach *mgleć, mgły, moglić się, moglitwa* itp.", *Studia z filologii polskiej i słowiańskiej* 2. W, 1957. {Перадрук. у} W. Taszycki. *Rozprawy i studia polonistyczne* 2. Wr–W–Kr, 1961.

J. Otrębski. *Gramatyka języka litewsiego* 1. W, 1958, 357.

А. Арашонкава. "Аб так званых паланізмах у беларускай мове. (Суфіксы *-dl-* і *-isk-*)", *Весці* 1963, 2.

E. Smułkowa. "O białoruskim *g'ega* 'krzemień'", *ZPSS*, 1963.

C. Stang. *Vergleichende Grammatik der baltischen Sprachen.* O, 1966, 107.

Ф. Филин. "Еще раз о происхождении сочетаний *kl, gl'*", *Известия АН ОЛЯ* 27, 1968.

П. Сцяцко. *Народная лексіка.* Мн, 1970, 61.

Змена 6. Дэлабіялізацыя агубленых галосных, I: $\bar{u}_1 > \bar{y}$ (VIII–IX стст., гл. *PoS*, раздзел 26).

бел. *быць* – літ. *būti*

бел. *Дрыса* (тапонім) < балц. **Drūsā* – параўн. літ. *Druso* (назва ракі)

бел. *Мыша* (назва ракі) < літ. **Mūs-ija* або *Mūša*; латыш. *Mūsa*

Выніковы $\bar{y}$, як і $\bar{u}_1$, ніколі не мог стаяць на пачатку слова, бо перад пачатковым $\bar{u}_1$ з XV ст. развіваецца прыстаўны зычны: бел. *вы-* < прасл. **ū-* – гоцк. *ūt.* Сістэма манафтонгаў у рэканструяваных прабеларускіх гаворках да і пасля гэтае змены паказаная ў табл. 11. Тут мы прысвойваем нумары ўсім галосным сегментам (акрамя дыфтангічных спалучэнняў з *r* і *l*); $\bar{u}_1$ і $\bar{u}_2$ былі пранумараваныя ў *PoS*, раздзел 19, тут гэтая нумарацыя захоўваецца. Асобная нумарацыя патрэбная для агубленых галосных верхняга ўздыму задняга раду, бо $\bar{u}$, які стаўся вынікам манафтангізацыі дыфтонгаў з *u* ў VI–VII стст. (пазначаны як $\bar{u}_2$) не прымаў удзелу ў развіцці праславянскага $\bar{u}$ (індаеўрапейскага паходжання), які ўжо існаваў у сістэме (пазначаны як $\bar{u}_1$). Можна дапусціць, што ў азначаны перыяд вымаўленне гуку $\bar{u}_1$ магло быць адносна менш заднім і менш агубленым, чым $\bar{u}_2$. Гл. падраздзел 4.1. Шырэй пра гэта гл. *PoS*, раздзел 16, 18–19. Нумарацыя галосных не прымае пад увагу розніцы тону, якая існавала ў той перыяд; даўжыня пазначаецца нават тады, калі яна лішняя для адрознення фанемы. Пасля змены $\bar{u}_1 > \bar{y}_1$ апазіцыя доўгіх і кароткіх галосных была часткова парушаная, бо $\bar{y}_1$ быў доўгім галосным, у якога не было апазіцыі паводле колькасці. Усе іншыя галосныя ў сістэме маглі быць як доўгія, так і кароткія.

Табліца 11. Зрэз 2V. Да і пасля дэлабіялізацыі *$\bar{u}_1$

Перад дэлабіялізацыяй $\bar{u}_1$:

кароткія галосныя			доўгія галосныя		насавыя галосныя	
i_3	u_4	$\bar{\imath}_7$	$\bar{u}_1$	$\bar{u}_2$	ϱ_{10}	ϱ_{11}
$_{e}a_5$	$_{o}a_6$	$_{e}\bar{a}_8$		$_{o}\bar{a}_9$		

Пасля дэлабіялізацыі $\bar{u}_1$:

i_3	u_4	$\bar{\imath}_7$	$\boxed{\bar{y}_1}$	$\bar{u}_2$	ϱ_{10}	ϱ_{11}
$_{e}a_5$	$_{o}a_6$	$_{e}\bar{a}_8$		$_{o}\bar{a}_9$		

Дэлабіялізацыя $\bar{u}_1$ часткова зацямняла чаргаванне $\bar{u}$-радоў.

Перад манафтангізацыяй		Пасля манафтангізацыі	
$_{o}au$	>	$\bar{u}_2$	бел. *сухі́*
u	>	u	**sux-* > бел. *со́хнуць*[1]
$\bar{u}_1$	>	$\bar{y}_1$	**sūx-* > бел. *(за)сыха́ць*

Выбраная бібліяграфія

K. Būga. "Upių vardų studijos ir aisčių bei slavėnų senovė", *TŽ* 1, 1923, 7; "Aistiškosios kilmės Gudijos vietovardžiai", *TŽ* 31. {Перадрук. у} *RR* 3.

А. Вяржбоўскі. "Балтызмы ў беларускай мове", *Весці* 1959, 2.

Змена 7. Дэлабіялізацыя (і палярызацыя) агубленых галосных, II: $_{o}\bar{a}$ (сярэдзіна IX ст., гл. *PoS*, раздзел 26). Гэтая змена закранула агубленыя галосныя сярэдняга ўздыму $_{o}a$ і $_{o}\bar{a}$. Вынікі гэтае дэлабіялізацыі, мабыць, розніліся залежна ад дыялекту, што і паказана ў табліцы ніжэй. У выніку гэтае змены апазіцыя паводле колькасці была парушаная. Замест сістэмы парных кароткіх і доўгіх гукаў, што існавала да VIII ст., цяпер мы бачым сістэму галосных гукаў з дзвюх групаў апазіцый або з дзвюх падсістэм: падсістэмы кароткіх галосных і падсістэмы (пераважна няпарных) доўгіх галосных.

[1] *о* ў корані развівалася з *ъ* у моцнай пазіцыі, які паходзіць ад кароткага *и*, напр., у дзеясловах м.р. адз. прош.ч. Болей пра гэта гл. у зменах 9, 21.

Табліца 12. Рэфлексы $_{o}\breve{a}$ ў прабеларускіх гаворках

полацка-разанскі дыялект (аснова паўночна- і цэнтральнабеларускіх і паўднёва- і цэнтральнарасійскіх гаворак)	кіеўска-палескі дыялект (аснова паўднёвабеларускіх і паўночнаўкраінскіх гаворак)
$_{o}a_6 > o_6$ пад націскам	$_{o}a_6$ незалежна ад націску $> o_6$
$_{o}a_6$ (ненаціскны), $_{o}\bar{a}_9 > a_6, \bar{a}_9$	$_{o}\bar{a}_9$ незалежна ад націску $> \bar{a}_9$
прасл. $*m_{o}\bar{a}sl_{o}a >$ літар. бел. *мáсла* – літар. рас. *мáсло* [мáсла]	прасл. $*m_{o}\bar{a}sl_{o}a >$ літар. укр. *мáсло*

У табл. 13 паказана агульная сістэма галосных гукаў дзвюх прабеларускіх гаворак.

Табліца 13. Зрэз 3V. Прабеларуская сістэма галосных гукаў у сярэдзіне IX ст.

	полацка-разанскі дыялект			кіеўска-палескі дыялект		
кароткія	i_3		u_4	i_3		u_4
	$_{e}a_5$		$\boxed{o_6, a_6}$	$_{e}a_5$		$\boxed{o_6}$
доўгія	$\bar{\imath}_7$	$\bar{y}_1$	$\bar{u}_2$	$\bar{\imath}_7$	$\bar{y}_1$	$\bar{u}_2$
	$_{e}\bar{a}_8$		$\boxed{\bar{a}_9}$	$_{e}\bar{a}_8$		$\boxed{\bar{a}_9}$
насавыя	ϱ_{10}		ϱ_{11}	ϱ_{10}		ϱ_{11}
дыфтангічн. спалучэнні	$_{e}ar$		$_{o}ar$	$_{e}ar$		$_{o}ar$
	$_{e}al$		$_{o}al$	$_{e}al$		$_{o}al$

Дэлабіялізацыя ненаціскнога $_{o}a$ (што дала пачатак з'яве, якую традыцыйна называюць "аканне") цяпер уласцівая пераважнай большасці беларускіх гаворак, як і шмат якім расійскім дыялектам, а таксама і дзвюм літаратурным мовам (пашырэнне тыпаў гл. ніжэй). Тыя сучасныя сістэмы галосных гукаў ва ўсходнеславянскіх гаворках, дзе не страчаны ненаціскны *о*, называюць сістэмамі з "оканнем"[1]. У выніку акання *о* захоўваецца толькі ў пазіцыі пад націскам. Але ў сучасных беларускіх дыялектах на месцы $_{o}a$ ў ненаціскных складах можна

[1] Тэрмін "аканне" ўжываюць таксама ў шырэйшым сэнсе, калі ён уключае так званае "яканне". Гл. ніжэй.

знайсці не толькі *а*. Сёння ў беларускіх гаворках ёсць два галоўныя тыпы зліцця ненаціскных галосных у пераднаціскным складзе:



Тып А: моцнае аканне



Тып Б: дысіміляцыйнае аканне

У тыпе А *о* не пад націскам замяняецца на *а* незалежна ад таго, які галосны стаіць у наступным націскным складзе. У тыпе Б якасць галоснага ў пераднаціскным складзе залежыць ад галоснага, які стаіць пад націскам. Калі націскны галосны – *а*, тады ў пераднаціскным складзе будзе стаяць галосны *ы* тыпу (/*ɨ*/), у іншым выпадку будзе стаяць *а*.

Тып А: прасл. * $v_o ad_o \acute{a}$ > бел. *вада́*; * $v_o ad\acute{y}$ > *вады́* Р.скл. адз.
Тып Б: прасл. * $v_o ad_o \acute{a}$ > бел. *выда́*, але * $v_o ad\acute{y}$ > *вады́*

Агулам кажучы, на паўночным усходзе цяпер пашырана дысіміляцыйнае аканне, а моцнае аканне (якое яшчэ называюць "поўным") уласцівае пераважна цэнтральным раёнам (хоць яго можна таксама знайсці і ў іншых мясцовасцях). Адначасна ёсць сведчанні дысіміляцыйнага акання і ў цэнтральных раёнах. На поўдні знаходзім, галоўным чынам, мернае або няпоўнае аканне, якое паступова робіцца спарадычным пры набліжэнні да тэрыторыі, дзе гавораць украінскаю моваю (і, па сутнасці, нават пашыраецца на гэтую тэрыторыю)[1].

Вызначэнне храналогіі акання, мабыць, болей як якое іншае з'явы ў беларускай (і, шырэй, усходнеславянскай) гістарычнай фаналогіі, застаецца вельмі спрэчнай тэмай. Калі Шахматаў у ранніх працах, а таксама некаторыя пазнейшыя даследчыкі (напр., Руделев) прапанавалі VIII–IX стст., то большасць аўтараў (у т. л. сам Шахматаў пасля 1915 г.) датавалі развіццё акання па-рознаму, паміж XII і XVI стст., такім парадкам, разглядаючы яго як інавацыю гістарычнага часу[2].

---

[1] Пра пашырэнне акання з паўднёвабеларускіх на паўночнаўкраінскія гаворкі асабліва ва Усходнім Палессі паміж Дняпром і Дзясной, гл. Жылко (Жилко).

[2] Трубяцкой лічыць, што гэта адбывалася ў XII–XIII стст., але ван Вэйк і Лекаў аддаюць перавагу XIII–XIV стст. XV–XVI стст. прапанаваў сярод іншых Аванесаў. Не так даўно Філін (Филин, 1970) прапанаваў най-

Наша рашэнне тлумачыць дэлабіялізацыю праславянскага *„a* як дыялектную з'яву позняга праславянскага перыяду вынікае з меркаванняў такіх мовазнаўцаў, як Ваян, Шавялёў, Філін і Геаргіеў, усе яны дайшлі да сваіх высноў незалежна адзін ад аднаго. Прапановы гэтых навукоўцаў вызначаюцца рашучым адыходам ад большасці фармулёвак, якія, па сутнасці, у той ці іншай форме ёсць мадыфікацыямі дапушчэнняў Шахматава ў яго пазнейшых даследаваннях. Шахматаў быў змушаны прыпісаць аканне перыяду пасля падзення рэдукаваных, бо прыняў рэдукцыю галосных за аснову акання. Іначай кажучы, згодна з ягонымі разважаннямі, новыя рэдукаваныя галосныя мусілі зліцца з раней рэдукаванымі галоснымі, напр., *ь, ъ* < *ĭ, ŭ*, і паводзіць сябе, як апошнія.

Погляд, паводле якога аканне – позняя дыялектная з'ява ва ўсходнеславянскіх мовах, відавочна пацвярджаецца тым, што аканне не адлюстраванае (або проста, або ўскосна, у форме гіперкарэктнага напісання) ва ўсходнеславянскіх тэкстах да XIV–XV стст. Прыклады з ранейшых крыніц досыць рэдкія і дзеля гэтага не могуць быць пэўнымі знакамі акання. Але познюю фіксацыю акання ў тэкстах нельга лічыць вызначальным довадам яго постпраславянскага паходжання (гл. падраздзел 2.1.1). Напр., у XVII ст. колькасць выпадкаў адлюстравання акання на пісьме ў беларускіх тэкстах сапраўды змяншаецца, магчыма, праз уплыў выдадзеных граматык царкоўнаславянскае мовы – мовы, у якой не было акання. Прычын лічыць аканне пазнейшаю з'яваю шмат: (1) тэксты (або пісары) маглі паходзіць з тых мясцовасцяў, дзе акання спачатку не было (паступовае пашырэнне акання ў перыяд існавання беларускае мовы можна дакументальна пацвердзіць і сучаснымі, і гістарычнымі дадзенымі); (2) правапісныя нормы ўсходнеславянскіх моваў грунтуюцца на царкоўнаславянскай традыцыі (вось жа аканне больш паступова адлюстравана ў жанрах, найбольш незалежных ад уплыву царкоўнаславянскае мовы, а іх было вельмі мала ў прабеларускі час); (3) на пісьмовую мову ў розныя часы моцны ўплыў рабіла таксама мова такіх культурных цэнтраў, як Кіеў і Ноўгарад – тэрыторый, дзе ніколі не было акання. На гэтым культурным фоне зусім магчыма, што аканне лічылі нелітаратурным, недапушчальным у пісьмовай мове.

ранейшую дату – VII–VIII стст. Гл. таксама Кузняцова (Кузнецов) і Філіна (Филин 1965).

Вылучаную Шавялёвым ды іншымі навукоўцамі прапанову датаваць развіццё акання познім праславянскім перыядам можна пацвердзіць з розных бакоў. Паміж рэдукцыяй галосных і аканнем няма сувязі. Аканне найлягчэй вывесці з адсутнасці ў праславянскай мове розніцы паміж пазнейшымі *o* і *a*, рэпрэзентаванымі як $_{o}\bar{a}$, пры ўмове, што сітуацыя ў дыялектах з аканнем змянялася толькі пад націскам. Менш вырашальныя, хоць дагэтуль непакінутыя, спробы грунтаваць адносную храналогію акання на аснове развіцця прыстаўных зычных. У перыяд існавання беларускае мовы націскныя агубленыя галосныя *ó* і *ú* (але звычайна не *a* < $_{o}\bar{a}$) набылі прыстаўныя зычныя ў большасці гаворак, гэтую падзею мы датуем XV або XVI ст. (гл. змену 37). Можна было б дапусціць, што аканне папярэднічала развіццю другасных пратэзаў, і сапраўды, ёсць таксама прыклады ўжывання *v* перад *a-* < $_{o}a$, але іх пераважна можна вытлумачыць як развіццё паводле аналогіі з формамі гэтых самых слоў з *o*.

У шмат якіх беларускіх гаворках ненацískны $_{e}a$ зліваўся з *a* пасля мяккіх зычных; у іншых гаворках $_{e}a$ і *a* пасля мяккіх зычных зліваліся ў *e*. Першае зліццё называецца яканне, другое – еканне. З погляду на іх развіццё зона з еканнем адступае пад націкам якання. Яканне і аканне звязаныя паміж сабою ў выніках, але іх храналогіі трэба разглядаць паасобку з прычыны іх рознае геаграфічнае пашыранасці: аканне, несумненна, папярэднічала яканню. Напр., абшар, на якім пашырана недысіміляцыйнае аканне, большы за тэрыторыю, на якой пашырана недысіміляцыйнае яканне (параўн. *ДАБМ*, карты 1, 4). Пераходных тыпаў вакалізму акання/окання ў параўнанні з пераходнымі тыпамі вакалізму екання/якання няшмат. Пераходныя тыпы акання/окання, відаць, зафіксаваныя толькі ў пераходных украінска-беларускіх гаворках, дзе яны, бясспрэчна, з'явіліся пазней. З іншага боку, шмат тыпаў якання знаходзім у гаворках з праўдзівым аканнем/яканнем. Папраўдзе, мы спатыкаемся з рознымі тыпамі дысіміляцыйнага і недысіміляцыйнага якання ў залежнасці ад статусу апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці ў дыялекце. Ваян прыпісаў яканне балцка-славянскаму адкрытаму вымаўленню $_{e}a$, якое гучала прыблізна як *'a*; сучаснае літоўскае вымаўленне можа паслужыць ілюстрацыяй для гэтага сцверджання. Пра ўжыванне запазычаных слоў са славянскіх моваў і ў славянскія мовы як дадатковае сведчанне гл. *PFB* 45. Адкрытае вы-

маўленне *а* пад націскам назіраецца толькі ў беларускамоўных, якія жывуць у суседстве з літоўскамоўнай супольнасцю[1]. Мы аддаем перавагу тлумачэнню якання як прабеларускае з'явы, што ўзнікла пасля развіцця акання (шырэй пра гэта гл. змену 31).

Спрэчкі таксама звязаныя і з пытаннямі, дзе паўстала аканне і які быў яго першапачатковы тып. Развязанне гэтых пытанняў таксама мае вялікае значэнне для праблемы храналогіі. Мовазнаўцы, якія звязваюць аканне з рэдукцыяй усіх адкрытых ненаціскных галосных – вынікам моцнага дынамічнага націску, – якая адбылася пасля страты рэдукаваных у слабой пазіцыі, кажуць, што найдаўнейшым тыпам мела быць дысіміляцыйнае аканне. Прыхільнікі процілеглага погляду адкідаюць гэтае сцверджанне на той падставе, што ў сапраўднасці рэдукцыя не магла быць звязаная з аканнем у цэнтральных беларускіх гаворках (і ў літаратурнай мове), і дзеля гэтага аканне як такое нельга выводзіць з дынамічнага націску; яно проста крыху зменены працяг, у ненаціскных складах, сітуацыі ў балцка-славянскай сістэме галосных гукаў. Гэтае разважанне можна пацвердзіць тым, што ўсе ўсходнеславянскія гаворкі маюць экспіраторны (выдыхальны) націск, але не ўсе маюць аканне. Што да дысіміляцыйнага акання (і якання), то яно павінна быць пазнейшае за моцнае аканне з трох прычын: (1) у паўночна-ўсходнім дыялекце, якому ўласцівае найперш дысіміляцыйнае аканне, мы спатыкаем таксама анклавы недысіміляцыйнага (моцнага) акання; (2) у беларускім дысіміляцыйным аканні/яканні няма знакаў, што e_8 і e_5 адрозніваліся, вось жа можна дапусціць, што дысіміляцыйныя тыпы акання развіліся пасля зліцця *е* і *е*; (3) і, урэшце, паколькі рэдукаваныя ў слабой пазіцыі ў беларускім дысіміляцыйным аканні не гралі ніякае ролі, можна думаць, што дысіміляцыйны тып развіўся, калі рэдукаваных у прабеларускай сістэме галосных гукаў ужо не было. Дысіміляцыйнае аканне і яканне разглядаюцца як змена 31.

Розныя погляды на развіццё розных тыпаў акання і якання можна падзяліць на тры асноўныя групы:

---

[1] Некаторыя мовазнаўцы абмяркоўвалі магчымасць уплыву іншамоўнага субстрату на тэрыторыях з аканнем; Ваян і Шавялёў кажуць пра балцкі субстрат; Кузняцоў гаворыць пра магчымасць балцкага або фінска-вугорскага субстрату; Лыткін дапушчае інтэрферэнцыю старамардоўскае мовы.

1) дысіміляцыйнае аканне – найдаўнейшы тып (Шахматаў, Васільеў, Дурнаво, Аванесаў, Рудзялёў ды інш.). Паводле Аванесава, напр., дысіміляцыйнае яканне дало пачатак мернаму дысіміляцыйнаму тыпу, які, у сваю чаргу, зрабіўся асіміляцыйна-дысіміляцыйным і нарэшце моцным;
2) асіміляцыйна-дысіміляцыйныя тыпы акання і якання могуць быць такія ж старыя, як і дысіміляцыйныя тыпы (напр., Хабургаеў);
3) усе тыпы акання можна выводзіць з моцнага акання; дысіміляцыйнае аканне – вынік рэдукцыі ненаціскных галосных у дачыненні да гаворак, якія ўжо мелі аканне; мернае і асіміляцыйнае аканне (рэпрэзентаванае ў расійскіх гаворках) не мае нічога супольнага з рэдукцыяй галосных. Гэты погляд бароняць, напр., ван Вэйк, Курыла і Шавялёў[1].

Самі тэксты мала што памагаюць у вызначэнні храналогіі або розных тыпаў акання. Напр., тэксты XV–XVI стст. даюць прыклады і недысіміляцыйнага, і дысіміляцыйнага тыпаў акання, якое выяўляецца як проста, так і ўскосна, але, зазвычай, заўсёды непаслядоўна. У адным і тым самым тэксце сустракаюцца правапісныя дублеты з ненаціскнымі *о* і *а* (напр., *Ганчара* [1690] побач з *Гончар*), выпадкі гіперкарэктнага напісання ненаціскнога *а* як *о* (напр., *пропости* Р.скл. адз. [XVI ст.] – параўн. рас. *про́пасть* (гэтае слова не ўжываецца ў сучаснай беларускай мове); *Мардухаевичу* Д.скл. адз. [1583] – параўн. ід. *mórdxe*) і г. д.

Прыняты намі погляд грунтуецца на такой адноснай храналогіі:

1) моцнае аканне;
2) развіццё мацнейшага дынамічнага націску (гл. змену 11);
3) *ĕ* > *е* (змена 20);
4) страта рэдукаваных (змена 21);
5) дысіміляцыйнае аканне і яканне (змена 31).

Выкладзеныя вышэй погляды звязаныя з тым, які абшар лічаць цэнтрам пашырэння акання. Папулярны погляд, якога трымаецца Шах-

[1] Прадстаўнікі гэтае "групы" могуць, аднак, быць нязгодныя ў дэталях; напр., ван Вэйк і Шавялёў лічаць першапачатковым моцнае аканне, але сур'езна разыходзяцца ў поглядах на храналогію. Ван Вэйк прапанаваў адносна познюю дату, а Шавялёў настойвае на праславянскім генезісе моцнага акання.

матаў, палягае ў тым, што аканне не было адразу ўласцівае беларускай мове, а пашырылася на беларускую тэрыторыю з суседніх паўднёварасійскіх гаворак (дзе існуе шмат болей тыпаў дысіміляцыйнага акання). Аднак няма сур'ёзных падстаў выводзіць беларускае аканне з усходу. У сапраўднасці, пра ўплыў расійскае мовы на беларускую наагул нельга казаць аж да захопу часткі беларускае тэрыторыі Масквою ў пачатку XVI ст. Дзеля гэтага традыцыйнаму погляду прапанавалі альтэрнатыву, што аканне – спрадвечнабеларуская з'ява. Геаграфія розных тыпаў акання ў сучаснай Беларусі памагае высветліць пашырэнне акання і окання ў прабеларускі перыяд, хоць яго дэталі немагчыма рэканструяваць зусім дакладна. У самой Беларусі аканне, мабыць, пашыралася з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад – іначай кажучы, яно нарадзілася ў заходняй частцы полацка-разанскае зоны і пашырылася на кіеўска-палескую (і разанскую) зону; прысутнасць акання ў паўднёварасійскіх гаворках можна вытлумачыць яго паходжаннем з полацка-разанскае зоны. І сінхранічныя, і дыяхранічныя факты паказваюць, што аканне распаўсюджваецца, выціскаючы оканне. У паўднёва-заходняй Беларусі аканне – досыць позняя з'ява. Некаторыя паўднёва-заходнія гаворкі да гэтага часу не маюць акання ў паслянаціскных канцавых адкрытых складах, у якіх захоўваецца прынцып окання: параўн. паўдн.-зах. дыял. [малады́], [старана́], але [л'э́то] (пра еканне ў паслянаціскных складах гл. змену 20). Яшчэ адзін довад аб паўночным паходжанні беларускага акання – адсутнасць акання ў большасці паўночнаўкраінскіх гаворак (паўднёвая частка кіеўска-палескае дыялектнае зоны), акрамя тых раёнаў, што мяжуюць з беларускаю тэрыторыяй і перанялі гэтую рысу ад апошняе (гл. знос. 1 на с. 106). Рэканструкцыю першапачатковага геаграфічнага пашырэння акання і окання ўскладняе тая адносная лёгкасць, з якою аканне можа выціснуць оканне. Толькі тэрыторыі з оканнем, відаць, можна лічыць першаснымі. Цяжка сабе ўявіць паступовае пашырэнне окання на тэрыторыі з аканнем, бо чалавеку, які акае, было б цяжка дазнацца, калі ненаціскны *а* замяніць на *о*.

Калі мы сцвярджаем, што аканне больш прабеларуская, як беларуская з'ява, дык трэба пагадзіцца, што аканне і оканне аднолькава старыя і маюць адзіны выходны пункт. Дзеля гэтага дэлабіялізацыя прасл. *ѫ* ў бел. *вадá*, *акнó* і *ацéц* супадае ў часе з лабіялізацыяй прасл. *ѫ* ў стараўкр. *водá*, *окнó* (суч. укр. *вікнó*) і *отьць* (суч. укр. *отéць*).

Вынікам акання сталася з'яўленне абумоўленых націскам чаргаванняў *а*||*о* ў прабеларускай марфалогіі; параўн. бел. прыклады *вы́наcіць* зак.тр. || *вынóсіць* незак.тр.; *вадá* || *вóды* Н.скл. мн.; гэтаксама *а* чаргуецца з *é* пасля мяккіх зычных: напр., *сцяна́* || *сцéны* Н.скл. мн.

Выбраная бібліяграфія

А. Шахматов. "Русское и словенское аканье", *РФВ* 48, 1902; *Очерк древнейшего периода истории русского языка.* СПб, 1915; *Введение в курс истории русского языка* 1. *Исторический процесс образования русских племен и наречий.* СПб, 1916.

Л. Васильев. "Гласные в слоге под ударением в момент возникновения аканья в обоянском говоре", *ИОРЯС* 9, 1904; "К характеристике сильноакающих говоров", *РФВ* 58, 1907. {Перадрук. у} Л. Васильев. *Труды по истории русского и украинского языков.* Мюнхен, 1972.

И. Голанов. "О диссимилятивном аканье", *РФВ* 71, 1914; "Несколько новых данных к вопросу о географическом распространении диссимилятивного аканья", *СбОРЯС* 101, 1928.

И. Тимчинова. "К хронологии явлений, предшествующих аканью", *Ученые записки Высшей школы города Одессы.* Одесса, 1922.

N. Trubetzkoy. "Einiges über die russische Lautentwicklung und die Auflösung der gemeinrussischen Spracheinheit", *ZSPh* 1, 1924.

О. Курило. "До питання про умови розвитку дисимілятивного акання", *ЗІФВ* 16, 1928.

L. Ossowski. "Przyczynki do białoruskiej dialektologii", *Милетич.*

N. van Wijk. "Zur Entwicklungsgeschichte der Akanje und Jakanje", *SI* 13, 1934–1935.

A. Vaillant. *Grammaire comparée des langues slaves* I. P, 1950.

PFB.

І. Свянціцький. "Мова памьяток письменства XII віку із різних говіркових територій Русі", *ПСМ* 3, 1953.

Н. Вайтовіч. "Аб тыпах акання ў першым складзе перад націскам пасля цвёрдых зычных у беларускіх гаворках", *Працы* 5, 1958; "Аб рэалізацыі ненаціскнога гука *ы* ў беларускіх гаворках", *Працы* 7, 1960; [Войтович]. "Окающе-акающий вокализм в белорусских говорах", *ВДВЯ*; Н. Вайтовіч. "Аб развіцці недысімілятыўнага акання ў беларускіх гаворках", *SLOr* 17, 1968; *Ненаціскны вакалізм народных гаворак Беларусі.* Мн, 1968; [Войтович]. "О структурном параллелизме типов безударного вокализма и нарушениях его в белорусских говорах", *ВЯ* 1971, 2; "К вопросу о путях развития аканья в восточнославянских языках", *Общеславянский лингвистический атлас 1970.* М, 1972.

В. Лыткин. “К вопросу о происхождении аканья в русском языке”, *Научная конференция 1957–1958 уч. г., Рязанск. гос. пед. институт* 1959; “Еще к вопросу о происхождении русского аканья”, *ВЯ* 1965, 4.

В. Георгиев. “Русское аканье и его отношение к системе фонем праславянского языка”, *ВЯ* 1963, 2; *Вокалната система в развоя на славянските езици.* С, 1964, {асабліва раздзел 4}; “Аканье и иканье в истории русского языка”, *Проблемы современной филологии.* М, 1965; {і} В. Журавлев, Ф. Филин, С. Стойков. *Общеславянское значение проблемы аканья.* С, 1968.

В. Руделев. “К фонологической интерпретации русского аканья”, *ВЯ* 1963, 2.

Ф. Жилко. *Фонологічні особливості української мови в порівнянні з іншими словьянськими.* К, 1963, 23.

В. Колесов. “О некоторых особенностях фонологической модели, развивающей аканье”, *ВЯ* 1964, 4.

П. Кузнецов. “К вопросу о происхождении аканья”, *ВЯ* 1964, 1.

Я. Риглер. “К проблеме аканья”, *ВЯ* 1964, 5; “Общеславянское значение проблемы аканья”, *ВЯ* 1969, 3.

Ф. Филин. “К хронологии русского аканья”, *Lingua viget. Commentationes slavicae in Honorem V. Kiparsky.* Helsinki, 1965; “Древнерусские диалектные зоны и происхождение восточнославянских языков”, *ВЯ* 1970, 5.

Г. Хабургаев. “О фонологических условиях развития русского аканья”, *ВЯ* 1965, 6.

П. Ивич [Ivić]. “О древности аканья в славянских языках”, *ВЯ* 1969, 3.

H. Schelesniker. {Рэц. на} В. Георгиев {ды інш.}, 1968, *Anzeiger für slavische Philologie* 4, 1970.

Я. Станкевіч. “Аканьне – балцкая рыса ў мове вялікалітоўскай”, *Symbolae in honorem Georgii Y. Shevelov.* Mu, 1971.

А. Манаенкова. “Вопрос о южно-великорусско-белорусской общности в лингвистической науке”, Беларускі дзяржаўны універсітэт, *Веснік* IV, 1, 1972.

/В. Навапакроўская. “Пра апазіцыю *о* : *а* ў бранскіх гаворках XVII–XVIII стст.”, *Беларуская лінгвістыка* 11, 1977./

/В. Чемонас [В. Чекман]. “Территория зарождения и этапы развития восточнославянского аканья в свете данных лингвогеографии”, *Russian Linguistics* 11, 1987./

/Я. Воўк-Левановіч. “Беларускае аканне”, *Беларуская лінгвістыка* 40, 1993./

Змена 8. Метатэза ў OSC-групах і поўнагалоссе ў COSC-групах (VIII – сярэдзіна IX ст., гл. *PoS*, раздзел 27). Як паказана ў табл. 13, праславянскія рэфлексы індаеўрапейскіх дыфтангічных спалучэнняў – *ₒar*, *ₑar*, *ₒal*, *ₑal* – у VIII ст. захоўваліся ў прабеларускіх гаворках. Да-

лейшы лёс гэтых дыфтонгаў залежаў ад іх пазіцыі ў слове. На пачатку слова перад зычным у прабеларускіх дыфтонгах адбылася метатэза пры паніжэнні тону і метатэза з падаўжэннем пры падвышэнні тону (прыблізна ў VIII – сярэдзіне IX ст.). У сярэдзіне слова перад зычным у дыфтонгах развіліся галосныя гукі перад і пасля сананта (сярэдзіна IX ст.). Гэтую другую з'яву традыцыйна называюць поўнагалоссем. У *PoS* (412) абагульняюцца вынікі гэтага працэсу ў так званых COSC-групах і ўстанаўляецца наступны парадак зменаў: (1) дэдыфтангізацыя COS|C > CO|SC; (2) устаўка анаптыктычнага галоснага: CO|SC > CO|S°C; (3) прыпадабненне гэтага галоснага да папярэдняга галоснага: CO|S°C > COSOC [$C_{o}ar_{o}aC$, $C_{e}ar_{e}aC$]. У гэтых формулах C можа быць любым зычным гукам, на месцы паўгалоснага S можа быць паўгалосны *r* ці *l*, а на месцы O – $_{o}a_{6}$ (які ў прабеларускіх гаворках перайшоў у *ó* і/або *a*) і $_{e}a_{5}$ (які адпаведна замяніўся на *é* і/або *'a*)[1]. Невялікая розніца ў храналогіі развіцця паміж групамі OSC і COSC выкліканая геаграфіяй гэтых дзвюх зменаў. Лёс групы OSC у беларускай мове такі самы, як і ва ўсіх астатніх славянскіх мовах (апрача паўднёваславянскіх моваў і сярэднеславацкіх гаворак), але поўнагалоссе ўласцівае толькі ўсходнеславянскім мовам. У рэфлексах OSC- і COSC-групаў месца націску ў беларускай мове ёсць простае адлюстраванне праславянскіх узораў.

I. Метатэза ў OSC-групах:

(а) OSC-дыфтонгі з узбежным тонам ($_{o}a$ŚC-):
бел. *рáла*: *араць* – літ. *árklas* 'драўляны плуг'

(б) OSC-дыфтонгі са збежным тонам ($_{o}a$SC-)
бел. *рост* – лац. *orior* 'уздым'

II. Поўнагалоссе ў COSC-групах:

Каб праілюстраваць працэсы ў COSC-групах у прабеларускіх (а таксама ў прарасійскіх) гаворках полацка-разанскае зоны, ніжэй падаюцца прыклады з сучаснае беларускае літаратурнае мовы, сістэме вакалізму якое ўласцівае аканне. Сучасная ўкраінская літаратурная мова служыць прыкладам развіцця формаў у прабеларускіх (і праўкраінскіх) дыялектах кіеўска-палескае зоны. Выбар украінскае мовы

[1] Традыцыйна пасьлядоўнасць гукаў у гэтых групах пазначаецца формуламі *ort-*, *olt-*, *ert-*, *elt-*; *tort*, *tolt*, *tert*, *telt*, дзе *t* перадае любы зычны (заўв. рэд.).

дзеля ілюстрацыі кіеўска-палескіх формаў абумоўлены мэтазгоднасцю і ўсе прыклады трэба абіраць бесстаронна, бо не ўсе ўкраінскія формы ідэнтычныя або аўтаматычна вынікаюць з кіеўска-палескіх гаворак. Ужыванне паўднёвабеларускіх дыялектных формаў дзеля ілюстрацыі кіеўска-палескіх формаў было б менш рызыкоўнае, але дадзеныя не заўсёды проста адшукаць.

(а) задні галосны *r*-дыфтонгаў з узбежным тонам:

$C_{o}arC > C_{o}ar_{o}\acute{a}C$ — п.-р. C*aró*C: бел. *карóва*; к.-п. C*oró*C: укр. *корóва*

Нечаканай формай з'яўляецца бел. *смуро́дны*, якое адпавядае рас. дыял. [смороднный], укр. *смо́рід*, ц.-сл. *смрадъ*; параўн. таксама бел. *смо́рад*. Найбольш праўдападобна, што гэта мешаніна кораня *смур-*, як у рас. *па́смурный*, і суч. бел. *хму́рны*, на які, магчыма, рабіла ўплыў польск. *smród*. Фанетычная змена *o* > *u* (дзе *o* < *o*, *e*), якая спатыкаецца ў некаторых дыялектах (гл. змену 45), не можа быць тлумачэннем, бо ў час гэтае змены корань мусіў гучаць як **smaródny*.

(б) задні галосны *r*-дыфтонгаў са збежным тонам:

$C_{o}\hat{a}rC > C_{o}\hat{a}r_{o}\acute{a}C$ — п.-р. C*óra*C: бел. *го́рад*; к.-п. C*óro*C: укр. дыял. *го́род*

п.-р. C*ará*C: бел. *барана́*; к.-п. C*oro*C: укр. *борона́*

(в) пярэдні галосны *r*-дыфтонгаў з узбежным тонам:

$C_{e}arC > C_{e}ar_{e}\acute{a}C$ — п.-р. C'*ar*'*é*C: бел. *бярóза*[1]; к.-п. C*eré*C: укр. *берéза*

п.-р. C'*ar*'*é*C: бел. *бярэ́мя*, *бярэ́ма*; к.-п. C*eré*C: рас. дыял. [б'эр'э́м'а]

(г) пярэдні галосны *r*-дыфтонгаў са збежным тонам:

---

[1] Змена націскнога *e* > *o* перад цвёрдым зычным, больш уласцівая полацка-разанскай, як кіеўска-палескай дыялектнай групе, разбіраецца тут як змена 18. Змена *r* > *r*' у беларускай мове ёсць далейшым развіццём (гл. змену 33).

$C_{e}\hat{a}rC > C_{e}\hat{a}r_{e}aC$ <

- п.-р. C'*ér'a*C: бел. *чэ́рап*
- к.-п. C*ére*C: укр. *чéреп*

<

- п.-р. C'*ar'a*C: бел. *серада́* [с'а-]
- к.-п. C*ere*C: укр. *середá*

(д) задні галосны *l*-дыфтонгаў са збежным тонам:

$C_{o}\hat{a}lC > C_{o}\hat{a}l_{o}aC$ <

- п.-р. C*óla*C: бел. *зóлата*
- к.-п. C*ólo*C: укр. *зóлото*

<

- п.-р. C*ala*C: бел. *галавá*
- к.-р. C*olo*C: укр. *головá*

(е) задні галосны *l*-дыфтонгаў з узбежным тонам:

$C_{o}alC > C_{o}al_{o}áC$ <

- п.-р. C*aló*C: бел. *балóта*
- к.-р. C*oló*C: укр. *болóто*

(ж) пярэдні галосны *l*-дыфтонгаў з узбежным тонам. Ва ўсходнеславянскіх мовах гэтыя групы зліліся з $C_{o}alC$-групамі (гл. змену 10).

$C_{e}alC > C_{o}al_{o}áC$ <

- п.-р. C*aló*C: бел. *палóва*
- к.-п. C*oló*C: укр. *полóва*

<

- п.-р. C*ala*C: бел. *малакó*
- к.-п. C*olo*C: укр. *молокó*

(з) пярэдні галосны *l*-дыфтонгаў са збежным тонам:

$C_{e}\hat{a}lC > C_{e}\hat{a}l_{e}aC$ <

- п.-р. C'*el'a*C: бел. *селязёнка* (з расійскай)
- к.-п. C*ele*C: укр. *селезíнка* (не зусім пэўны прыклад)

Калі першы зычны – шыпячы або *j*, а за ім не было пярэдняга галоснага, тады група $C_{e}\hat{a}lC$ злівалася з $C_{o}alC$ пры ўсякай інтанацыі. Часам гэта поўнагалосная група рэпрэзентаваная формулаю ŠeSC або некаторымі яе варыянтамі.

- п.-р. C*óla*C: бел. *жóлаб*
- к.-п. C*ólo*C: укр. *жóлоб*

{ п.-р. C*aló*C: бел. *шалóм* (< ням. **xelmaz*-)
{ к.-п. C*oló*C: укр. *шолóм*

Існаванне дапоўнагалосных формаў у прабеларускай мове найлягчэй выявіць, параўнаўшы раннія прабеларускія запазычанні з арыгінальнымі балцкімі мадэлямі і агульнымі беларуска-балцкімі формамі: напр., бел. *Марóжа* (назва ракі) < прабел. **M*$_{e}$*arža* – параўн. літ. *Margis* (назва возера), *Margė* (тапонім) грунтуецца на літ. *márgas* 'яскравы, маляўнічы'; бел. *скарадá, скарóдзіць* < прасл. **sk*$_{e}$*ard*- – параўн. літ. *skardýti* 'выкопваць'; *Марачанка* (назва ракі), *Мярэч* < прабел. **M*$_{e}$*arčъ* < проталіт. **Merk' i(n)* або *Merť i(n)* – параўн. літ. *Merkys*[1]. Дадатковы довад пра дапоўнагалосны перыяд у прабеларускай мове даюць тапонімы, запазычаныя з усходнеславянскіх дыялектаў у іншыя мовы: напр., старасканд. *Palteskja* < прабел. **Poltьskъ* – параўн. стар.-рус. *Полотьскъ*, бел. *Полацк*, літ. *Paltis* (назва ракі).

З пададзеных вышэй прыкладаў відаць, што першапачатковыя апазіцыі ў рэфлексах OSC-групаў часткова адкінуты сучаснаю беларускаю моваю з прычыны іх пазнейшага зліцця. У наступнай табліцы мы параўноўваем рэфлексы ў прабеларускай мове VIII–IX стст. з сучаснымі беларускімі літаратурнымі формамі.

[1] Пра ўжыванне ў балцкіх мовах *k'* і *ť* на перамену гл. Атрэмбскага (Otrębski).

Табліца 14. Параўнанне рэфлексаў праславянскіх поўнагалосных групаў у прабеларускіх (полацка-разанскіх) дыялектах і сучаснай беларускай літаратурнай мове



Беларускія гаворкі маглі, магчыма, захаваць некаторыя ключы для вызначэння першапачатковага характару анаптыктычнага галоснага[1] ў поўнагалосных формах. Сведчанні абмежаваныя адной або дзвюма марфемамі ў форме C*ólyC*, але дадзеныя можна дапоўніць расійскімі формамі з C*óryC* і C*ólyC*: бел., рас. *по́лымя* < прасл. **p*ₒ*almy* – параўн. ц.-сл. *пламя*[2].

У сучаснай беларускай мове і яе гаворках ёсць некалькі тыпаў выняткаў з правіла поўнагалосся: (1) запазычанні з царкоўнаславянскае, напр., *прах* (адпаведнае ўласнабел. *по́рах*), *храбр-*; (2) запазычанні з польскае, напр., *зло́то*, *хло́пец*, *сро́дак* (< польск. *złoto*, *chłopiec*, *środek*); (3) запазычанні з балцкіх моваў, напр., *торп* або *тарпа́* (< літ.

[1] Анаптыктычны галосны – устаўны галосны паміж зычнымі для абляг-чэння вымаўлення (заўв. рэд.).

[2] Гл. Шахматава (Шахматов). Магчыма, суч. бел. *я́блыня*, дарэф. бел. *я́блына* належаць сюды ж, калі сапраўды паходзяць з даўнейшага **j*ₒ*ābₒaln-* (Соколова). Феномен слова *по́лымя* часам называюць "трэцім поўнагалоссем" (*Белорусы*, Юргелевіч).

tárpas); (4) пазнейшыя змены спрадвечнабеларускіх каранёў дзеля выраўноўвання ўнутры парадыгмы: напр., *памéрці*, *цéрці*, *пéрці* (параўн. рас. *умерéть*, *терéть*, *перéть*); (5) выдаленне галосных: паводле Карскага, у некаторых гаворках ёсць тэндэнцыя да выкасавання ненаціскных, звычайна пераднаціскных, складоў у поўнагалосных формах, напр., *карóль* (запазычанае слова) > *кроль*, *варóны* > *врóны*. Выніковыя формы падобныя да адпаведных няпоўнагалосных формаў у польскай мове: *król* [krul], *wrony* [vrony]. Не трэба выключаць у некаторых такіх выпадках магчымасці польскага ўплыву. Падобны працэс страты ненаціскных галосных можа тлумачыць адсутнасць поўнагалосся ў бел. *гарнастáй*, бел. габр. *hwrnwstyywwyc'* (тапонім; 1600) (= польск. *Hornostajewicze* [?] – параўн. польск. *gronostaj*), але семантычныя фактары тут таксама граюць ролю[1].

Урэшце, ёсць колькі формаў, што выглядаюць як поўнагалосныя, але іх немагчыма вывесці з праславянскіх *COSC-групаў. Такая форма, як бел. *пялёнка* (параўн. рас. *пелена́*), выводзіцца з кораня *пел-* + суфікс *-ен-*, а не з C*e*SC-групы. Беларускае *пялёсканне* таксама мае вытворную псеўдапоўнагалосную форму – параўн. рас. *плеска́ние*. У адным выпадку, псеўдапоўнагалосную форму трэба выводзіць са спалучэння *ь* + *r* + V (пра *ь* гл. змену 9), дзе *ь* прыпадабняецца да *е* ў наступных складзе: напр., бел. *серабро́*, *сярэбро́*, *серебрыны* (1405) – укр. *срі́бло*, польск. дыял. [śrybwo, srebwo] < прасл. **sьrebro*.

Побач са звычайнымі рэфлексамі спалучэнняў CъSC і CьSC, а менавіта C*o*SC і C*e*SC (гл. змену 10), у двух выпадках таксама знаходзім формы з паўторам галоснага ў пазіцыі пасля *r* (*l*). Такая з'ява, якую называюць "другое поўнагалоссе", асабліва ўласцівая паўночнарасійскім гаворкам (*CъrC > C*oro*C, *CьrC > C*ere*C/C*er'o*C, *CъlC > C*olo*C звычайна перад зычным, пасля якога спачатку ішоў слабы рэдукаваны) і датуецца XII–XIII стст. Гэтая з'ява неўласцівая беларускай мове. Беларускія прыклады другога поўнагалосся, якія традыцыйна спамінаюць, непераканаўчыя: бел. *малáнка* (параўн. таксама *молоний* [XV ст.], *маланья* [1580]) і *вярóўка*. Першы прыклад не падыходзіць, бо ў ім адбываецца чаргаванне *a*||*á*, а не *a*||*ó*; другі прыклад – запазычанне з расійскае мовы.

---

[1] Варыянты з фінальным *l* (напр., *gronostal*) вядомыя таксама ў польскай мове і ў архангельскіх дыялектах расійскае мовы (напр., *горносталь*). Дублеты могуць тлумачыцца хутчэй марфемнай заменай, як чаргаваннем *l*||*j*, разабраным у змене 3.

Выбраная бібліяграфія

А. Шахматов. "К истории звуков русского языка", *ИОРЯС* 7, 1902, 352 {і наст.}; *Очерк древнейшего периода истории русского языка.* СПб, 1915, 158 {і наст.}.

Е. Карский. *Белорусская речь. Очерк народного языка с историческим освещением.* СПб, 1918, 26–27; *Белорусы* 1, 253.

L. Ossowski. "O zastępstwie prasłow. grup *tort* i *tert*, *tolt* i *telt* w językach ruskich (Pełnogłos). (Streszczenie)", *Sprawozdania z posiedzeń P.T.N.*, {секцыя} 1, 31, 1938.

Л. Булаховский. "Отражения так называемой новоакутовой интонации древнейшего славянского языка в восточнославянских", *ВЯ* 1958, 2.

J. Otrębski. *Gramatyka języka litewskiego* 1. W, 1958, 354–357.

V. Swoboda. "Infinitives of the Type CS **tertí/tīrtí*", *The Annals of the Ukrainian Academy of Arts and Sciences in the U.S.* 8, 1960.

А. Фидровская. "О полногласных и неполногласных формах в белорусском и украинском языках", *Памяти В. А. Богородицкого. Сборник статей.* Казань, 1961.

П. Юргелевіч. *Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі.* Мн, 1961, 57, 59.

М. Соколова. *Очерки по исторической грамматике русского языка.* М, 1962.

*[*А. Супрун. "Няпоўнагалосная лексіка ў беларускай мове", *Веснік БДУ. Серыя IV.* 1, 1995.*]*

Змена 9. Дэлабіялізацыя агубленых галосных, III і развіццё рэдукаваных (праславянская мова [пачатак IX ст.], гл. *PoS*, раздзел 29). Згодна з традыцыйнай фармулёўкай, кароткі $*u_4$ ў прабеларускіх гаворках падпаў частковай дэлабіялізацыі, стаўшы бліжэйшым да артыкуляцыі *ɔ*-тыпу паводле ўздыму языка і ступені агубленасці. У кірыліцы гэтая галосная перадаецца графемаю *ъ* – так званы *ёр* (у перыяд пасля пашырэння фанемнае палаталізацыі і страты рэдукаваных таксама называецца "цвёрды знак"). З увагі на прыняцце намі дагістарычнага паходжання акання правільней было б гаварыць пра два рэфлексы $*u_4$ ў залежнасці ад націску: напр., пра лабіялізаваны *ёр* пад націскам і пра дэлабіялізаваны *ёр* не пад націскам: *ъ́* = [ɔ̆], *ъ* = [ă]. Адначасна яго пярэдні варыянт, кароткі $*i_3$, таксама зазнаў падобнае змены ў артыкуляцыі – ён утвараўся пры меншым напружанні губ і выраўноўванні языка. Рэфлекс $*i_3$ ў кірыліцы перадавалі графемаю *ь*, якая называлася тут *ер* (або ў пазнейшыя перыяды – "мяккі знак").

Гукі **u*$_4$ і **i*$_3$ не пераходзілі ў рэдукаваныя ў дзвюх пазіцыях: перад і пасля *j*. Развіццё *u* і *i* ў акружэнні *j* належала праславянскаму перыяду, бо было пашыранае на ўсёй славянскай тэрыторыі, акрамя прарасійскай. Пра асаблівасці развіцця *u* і *i* ў акружэнні *r* і *l* гл. змену 40. У пазіцыях перад *j* (дзе іх часам называюць "напружаныя рэдукаваныя") і пасля *j* *u$_4$ і *i$_3$, як і рэдукаваныя, розніліся моцнай і слабой пазіцыяй. У першым выпадку моцны **ij* не зазнаў зменаў, а **ŭj* > *yj*, дзе *y* быў кароткі, у процілегласць **ȳ*$_1$ з **ū*$_1$: прасл. *tŭj* > бел. *мый* 2 ас. заг.л. – параўн. рас. *мой*. Спалучэнні *ъj* і *ьj* не былі прынятыя: параўн., напр., у прыметніках мужчынскага роду адзіночнага ліку – канчатак *-ъ*, а ў займеннікавых формах не **-ъjь*, а *-yjь* (напр., *новъ – новыи*). Вынікі гэтае сітуацыі можна знайсці ў паўночнабеларускіх гаворках, дзе сустракаем змену *ъ* > *y* ў аднаскладовых прыназоўніках перад словамі, што пачынаюцца з *i-*, напр., *kъ* > *ky*.

Асаблівасцю беларускіх гаворак, якую маюць таксама ўкраінскія і расійскія дыялекты, ёсць тое, што калі *y* захоўваецца і ў слабой пазіцыі (як у бел. *мыю* 1 ас. адз.), дык *i* выпадае (напр., бел. *б'ю* 1 ас. адз.). Відавочна, кароткі *i* першы страціў здольнасць несці націск пры тых самых умовах, што і рэдукаваныя, і пазней выпаў. Захаванне *y* на месцы першапачатковага кароткага *u* (упершыню зафіксаванага ў тэкстах у XVI ст.) магло б значыць, што другі захоўваў свой націск, хоць трэба таксама прызнаць магчымасць, што *y* мог быць абагульнены ў цэлую парадыгму, пачынаючы ад інфінітыва і загаднага ладу (напр., *мыць*, *мый*).

У прабеларускіх гаворках, як і ў большасці славянскіх дыялектаў, новыя рэдукаваныя гукі існавалі нядоўга; як такія яны не выжылі ні ў воднай беларускай гаворцы. Так званыя слабыя рэдукаваныя, страчаныя ў прабеларускай мове, з'яўляліся ў трох пазіцыях: (1) у канцы слова; (2) перад складам з галосным, акрамя рэдукаванага; і (3) перад складам з рэдукаваным, які не быў страчаны: напр., бел. *дом* < **domъ*, *імг(л)á* < **mьgla*, *жнец* < **žьnьcь*. Рэдукаваныя ў пазіцыі перад *ъ* і *ь*, што былі пазней страчаныя, называюцца "моцнымі". Звычайна яны перадаваліся як *о* і *е* пад націскам і як *а* не пад націскам.

Рэдукаваныя можна вызначыць, параўнаўшы са старою царкоўнаславянскаю моваю (дзе ў некаторых запісах рэдукаваныя акуратна захоўвалі) і з іншымі індаеўрапейскімі мовамі, а таксама вывучаючы за-

пазычанні, прынятыя прабеларускімі гаворкамі ў час існавання рэдукаваных.

Прыклады *ёра*, *ъ*$_4$:

бел. *Нёман* < прабел. **Nĕmъnъ* < балц. – параўн. літ. *Nẽmunas*
бел. *хто* – ц.-сл. *къто* (пра дысіміляцыю *k* > *x* гл. змену 25)
бел. *Ло́тва* (назва ракі) < прабел. **Lotъva* – літ. *Latuvà*
бел. *Сож* < прабел. **Sъžь* – старапрус. *suge* 'дождж'
бел. *Цна* < прабел. **Tъsna* < балц. **Tusnā*

Прыклады *ера*, *ь*$_3$:

дарэф. бел. *Вялля́* (назва ракі) < прабел. ** Vьlьja* < балц. ** Vilijā* (бел. *Вілія́* – гэта позняе запазычанне з балцкіх моваў, якое з'яўляецца сучаснаю афіцыйнаю савецкаю формаю)
бел. *Лямно́* (тапонім), *Леманка* (назва ракі) < прабел. **Lьmьna* – літ. *Limìnas*
бел. *шавéц* < прабел. **šьvьsь* – літ. *siuvikis*, *siū́ti* 'шыць', латыш. *šūt*[1]
бел. *пчалá* < прасл. **bьčela* – параўн. літ. *bitė*
бел. *Смалéнска* (Р.скл. адз.) < прабел. **Smolьnьska* – параўн. *(S)milinìska* ў грэцкім тэксце сярэдзіны IX ст.
бел. *шкло* – старарас. *стькло*, літ. *stiklas* < гоцк. *stikls* 'кубак'
бел. *асёл* – старарас. *осьлъ*, літ. *âsilas* < гоцк. *asilus*[2]

З развіццём двух рэдукаваных аднастайнасць першапачатковых манафтонгавых радоў галосных *и* разладзілася. Гэты разлад, спярша абумоўлены дэлабіялізацыяй $\bar{u}_1$, скончыўся развіццём *ёра*. Гэтыя працэсы абагульненыя ў табл. 15.

---

[1] Першы *ь* слабы і перадаецца нерэгулярна.

[2] Паколькі лабіялізацыя *ь́* пасля мяккіх (спачатку толькі зазубных) зычных і перад цвёрдымі зычнымі магла адбыцца ў час, калі рэдукаваныя яшчэ існавалі, мы папярэдне ўключаем (*ъ*$_3$) у зрэз на с. 124. Шырэйшыя разважанні гл. у зменах 18, 21. У выніку змены 10, калі *i*$_3$ ў спалучэнні С*i*$_3$К стаўся лабіялізаваны, прабеларускія гаворкі набылі яшчэ адну крыніцу *ъ*$_3$.

Табліца 15. Заднія агубленыя галосныя верхняга ўздыму з VI да IX ст.

VI–VII стст.	VIII–IX стст. (змена 6)	VIII–IX стст. (змена 9)	прыклады (гл. таксама с. 78)
прасл. *ǫ̆u* >	*ū*$_2$	*ū*$_2$	*ū*$_2$ *сухí*
ū$_1$	*ū*$_1$ >	*ȳ*$_1$	*ȳ*$_1$ *засыхáць*
u	*u*$_4$	*u*$_4$ >	ъ$_4$ старабел. *съхнути*

9.1. Абагульненне прабеларускіх зменаў VIII–IX стст.: змены 5–9. У гэты час у прабеларускай сістэме зычных гукаў не адбылося ніякіх зменаў, акрамя нязначнага змяншэння частасці ўжывання *t* і *d* у выніку іх страты ў спалучэннях *tl* і *dl* (змена 5)[1]. Да IX ст. прабеларуская сістэма зычных гукаў захавала той самы набор сегментаў, які быў ёй уласцівы і ў VII ст. (параўн. табл. 10). Да VIII ст. прабеларуская сістэма галосных гукаў карыстала з апазіцыі паводле даўжыні–кароткасці для ўсіх гукаў. Да IX ст., з прычыны першае і другое дэлабіялізацыі агубленых галосных (змены 6–7) і развіцця рэдукаваных з кароткіх *i* і *u* (змена 9), гэтая апазіцыя, па сутнасці, знікла, застаючыся падставай адрознення толькі **ę̆*$_5$ і *ǫ̆*$_8$. Цяпер з'явіліся ўмовы для поўнае ліквідацыі фанемнае даўжыні, нават не зважаючы на тое, што новая нефанемная (пазіцыйна абумоўленая) апазіцыя паміж доўгім і кароткім *y* ў гэты перыяд захоўвалася.

Да VIII ст. перад развіццём рэдукаваных прабеларуская сістэма галосных гукаў мела наступныя сегменты:

i$_3$	*u*$_4$	*ī*$_7$	*ū*$_1$	*ū*$_2$	*ę*$_{10}$	*ǫ*$_{11}$
ę̆$_5$	*ǫ̆*$_6$	*ǭ*$_8$		*ǫ̆*$_{(6),\,9}$		

Пасля развіцця рэдукаваных прыблізна ў IX ст. сістэма прабеларускіх гаворак мела той самы набор элементаў, але адрознівалася паводле іх размеркавання і развіцця сегментаў у ненаціскной пазіцыі; кароткі *y* < *u*$_4$, гэтаксама як і *i*$_3$, які не перайшоў у ь$_3$, быў, мабыць, не фанемны, і дзеля гэтага не ўключаны ў табліцу.

[1] У гэты перыяд адбылося таксама нязначнае ўзрастанне ўжывання *j* у пазіцыі на пачатку слова ў выніку з'яўлення ў праславянскай мове прыстаўнога *j* недзе ў VIII або IX ст., напр., *ę̆a* > *j ę̆a*: бел. *я́вар* < стара-в.-ням. *ahorn*. Шырэй пра гэта гл. *PoS*, раздзел 16.

Табліца 16. Зрэз 4V. Прабеларуская сістэма галосных к IX ст., пасля развіцця рэдукаваных

полацка-разанскі дыялект					кіеўска-палескі дыялект				
ѣ$_3$	ъ$_{(3),\,4}$	ѣ$_7$	ы$_1$	у$_2$	ѣ$_3$	ъ$_{(3),\,4}$	ѣ$_7$	ы$_1$	у$_2$
а$_5$	о$_6$	а$_8$		а$_{6,\,9}$	а$_5$	о$_6$	а$_8$		а$_9$
	е$_{10}$	е$_{11}$				е$_{10}$	е$_{11}$		

Выбраная бібліяграфія

K. Būga. "Upių vardų studijos ir aisčių bei slavėnų senovė", *TŽ* 1, 1923, 4, 15; "Aistiškosios kilmės Gudijos vietovardžiai", *TŽ* 43, 49. {Перадрук. у} *RR* 3.

Н. Пшеничнова. "К истории редуцированных *ы*, *и* в восточнославянских языках", *ФН* 1960, 3; "Гласные на месте редуцированного *и* в говорах восточнославянских языков", *ВДВЯ*.

Змена 10. Развіццё групаў С*ъі*С, С*ъї*С, С*ьі*С; С*іїС* > С*ъїС* > С*ówС*/С*awС* (пачатак IX або X ст., гл. *PoS*, раздзел 30[1]). Як і ў іншых пазіцыях, у пазіцыі перад санантам (*r*, *l*), за якім ідзе зычны, кароткія $*i_3$ і $*u_4$ развіліся ў рэдукаваныя гукі. Тое, што ва ўсіх усходнеславянскіх гаворках галосны ў спалучэнні *С*іїС* не браў удзелу ў агульнай змене *і* ў пярэдні рэдукаваны, не патрабуе спецыяльнага каментару. Замест гэтага галосны зрабіўся агублены, а спалучэнне *С*іїС* зліваласа з *С*uїС*: напр., бел. *доўг* < прасл. **dъlg-*, а бел. *дóўгі* < прасл. **dьlg-* – параўн. адпаведна ўкр. *довг* і *дóвгий*. Правіла лабіялізацыі дзеяла не толькі ў прабеларускай, але і ў расійскай, палабскай і часткова ў верхнялужыцкай мовах, але, як паказваюць нашыя прыклады, у гаворках, што ляжаць у аснове беларускай і ўкраінскай моваў, пайшло яшчэ далей (гл. змену 25) і ахапіла бакавыя гукі, вось жа ў гэтых гаворках *ul* > *ow*[2]. У XII ст., калі ў прабеларускай мове былі страчаны

[1] У *PoS* 634 ён памылкова пазначаны як раздзел 29.

[2] Лабіялізацыя бакавых гукаў таксама мела месца ў сербска-харвацкай мове, але *пасля* страты рэдукаваных, і гэтая змена ўплывала на *l* перад слабым *ь*: напр., *сельск-* > серб.-харв. *sëoski*; **былъ* м.р. адз. прош.ч. > *bio*. Пасля **и* няма і знаку бакавога гуку: напр., *bugarski* 'балгарскі' (беларускія адпаведнікі: *сéльскі*, *быў*, *балгáрскі*, дарэф. бел. *баўгáрскі*). Пераход *l'* > *l* у беларускай мове – пазнейшая з'ява (гл. змены 41, 48).

слабыя рэдукаваныя, а моцныя рэдукаваныя гукі пад націскам перайшлі адпаведна ў *é*$_3$ і *ó*$_4$, рэдукаваныя ў гэтых спалучэннях развіваліся як рэгулярныя моцныя рэдукаваныя, робячыся (пад націскам) C*e*SC і C*o*SC (гл. змену 21).

C*i*$_3$*r*C > C*ь*$_3$*r*C > п.-р. C'*é*$_3$*r*C/C'*a*$_3$*r*C: бел. *вéрбніца*, *вярбá*
> к.-п. C'*ẽ*$_3$*r*C: укр. *вербá*, *вéрбний* прым.

C*u*$_4$*r*C > C*ъ*$_4$*r*C > п.-р. C*ó*$_4$*r*C/C*a*$_4$*r*C: бел. *горб*, *гарбá* Р.скл. адз.
> к.-п. C*õ*$_4$*r*C: укр. *горб*, *горбá* Р.скл. адз.

C*i*$_3$*l*C > C*ъ*$_3$*l*C > п.-р. C*ó*$_3$*и*C/C*a*$_3$*и*C: бел. *воўк*, *ваўчыха*
> к.-п. C*õ*$_3$*и*C: укр. *вовк*, *вовчúха*

C*u*$_4$*l*C > C*ъ*$_4$*l*C > п.-р. C*ó*$_4$*и*C/C*a*$_4$*и*C: бел. *доўг*, бел. цюрк. *dūwhū* Р.скл. адз. (XVII ст.; = суч. бел. *дóўгу*); *даўбня́*
> к.-п. C*õ*$_4$*и*C: укр. *дóвбня*, *довбня́к* 'дурань'

У пазіцыі перад *v* гук *l* пасля *u*$_4$ быў страчаны, мабыць, пасля стадыі *-wv-*: напр., бел. *мóва* – стар.-рус. *мълва* (полацк. *молыт* 'гаворыць' 3 ас. адз. [1464] < старабел. *молвить* – магчыма, гіперкарэктнае напісанне).

Пераход *l* < [w] не прынёс ніякае новае фанемы. Тое, што традыцыйна перадавалі літараю *в*, было гукам [w]. Раннія запазычанні ў беларускую мову прымалі ўдзел у працэсе агублення: напр., старасканд. *silki* > бел. *шоўк* – параўн. стар.-рус. *шьлкъ*, рас. *шелк*, літ. *šilkas*; бел. *Бóўчаса* (назва ракі) – параўн. рас. *Волчеса*, літ. *Vilkesà*. Лабіялізацыя спалучэння *ъl* (з *ьl* і *ъl*) мусіла адбыцца раней за страту слабых рэдукаваных (у XII ст.), бо лабіялізацыя не адбывалася, калі пасля сананта (*r*, *l*) стаяў рэдукаваны (які пазней быў страчаны або зменены): напр., бел. *пáлка* – стар.-рус. *палъка*; бел. *гляк*, рас. дыял. *глек* < прасл. **gъlькъ*.

Два словы, відаць, не бралі ўдзелу ў змене *l* > *w*: *полк* (таксама і ва ўкраінскай мове), праславянскае запазычанне са старанямецкае, і *толк* < прасл. **tъlkъ* – рас. *толк*, укр. *толк* або *товк*, запазычанае з усходнеславянскіх моваў у літоўскую як *tùlkas*, у латышскую як *tuĺks*, у эстонскую як *tulk* 'тлумач'. Паколькі абодва словы былі добра вядомыя беларускаму лексікону ў той час, калі адбылася вакалізацыя *l*, трэба хіба дапусціць, што *l* быў адноўлены пазней (магчыма, у XVIII або XIX ст.) на ўзор рас. *полк*, *толк*[1].

[1] Форма [поўк] у разанскім дыялекце расійскае мовы ўзнікла, дзякуючы

У некаторых людзей, якія гавораць па-беларуску, часам сустракаем *ў* на месцы спадзяванага *л* перад (старабел.) рэдукаваным, таксама пасля ўсіх галосных, акрамя *ъ*: напр., *гарэўка* (параўн. таксама зах.-укр. дыял. [горіўка]), *гóўка* < прасл. **jьgъlьka* побач са спадзяваным у сучаснай літаратурнай беларускай мове *(і)гóлка*. Гэта мясцовыя змены пазнейшае пары.

Апошняя катэгорыя слоў, дзе *l* перайшоў у *и*, – дзеясловы прошлага часу мужчынскага роду адзіночнага ліку, але гэтая нефанетычная з'ява датуецца ўжо часам пасля страты рэдукаваных і будзе разгледжаная як змена 41.

Выбраная бібліяграфія

В. Петрусь. "К вопросу о происхождении фонетической формы лексем *połk* и *mowa* в польском языке", *Известия АН ОЛЯ* 6, 1947.

А. Мельничук. "Развитие предикативного употребления причастий на *-(v)ъ, -(v)ъš-* в восточнославянских языках", *Слов'янське мовознавство* 1, 1958.

Л. Гумецкая. "Литовские имена с компонентом *-tovtъ/-toltъ* в украинских грамотах XIV–XV вв", *ВТИЯ*.

Змена 11. Скарачэнне галосных (пачатак IX або X ст., гл. *PoS*, раздзелы 32, 33). Пасля развіцця *у*, рэдукаваных, $o_6 < {}_{\circ}a_6$ і $\bar{a}_{(6),\ 9} < {}_{\circ}\bar{a}_9$ сістэма галосных гукаў прабеларускае мовы ўключала пад націскам (акрамя ${}_{\circ}\check{a}$) або толькі кароткія, або толькі доўгія галосныя; такім парадкам, акрамя ${}_{\circ}\check{a}$, больш не існавала ніякае апазіцыі паводле колькасці, якая б не была звязаная з апазіцыяй паводле якасці[1]. Апроч таго, у прабеларускай мове, гэтаксама як і на ўсім усходнеславянскім абшары, даўжыня галосных, якая перад тым была фанемнай, сталася рысаю, звязанаю з націскам. У прабеларускіх гаворках аднастайна скараціліся ўсе ненаціскныя доўгія галосныя і падоўжыліся ўсе націскныя кароткія галосныя гукі. У выніку прасадычная сістэма прабеларускіх гаворак захавала апазіцыю націскных–ненаціскных галосных,

---

паўторнаму гіперкарэктнаму выраўноўванню (*PFB*). Напісанне слова *пулковника* Р.скл. адз. у тэксце 1646 г. перадае польскае вымаўленне (польск. *półkownik*); усе ўсходнеславянскія мовы запазычылі гэтае слова з польскае мовы.

[1] Ужыванне *ў* і *ĭ* абмяжоўвалася пазіцыяй перад *j*, гл. змену 9; у полацка-разанскіх гаворках быў таксама кароткі *ă* (< ${}_{\circ}a_6$, гл. змену 7), але яго з'яўленне было абумоўленае адсутнасцю націску. Дзеля гэтага ва ўсіх

але страціла ўсе апазіцыі паводле вышыні і колькасці гуку: познім дыял. прасл. **mǫ́ka* 'боль' і **mǭ́ká* 'мука', рэпрэзентаваным, напр., у прапольскай мове, у прабеларускай адпавядаюць *му́ка* і *мука́*, у якіх даўжыня мае нефанемны характар, а з'яўляецца толькі пад націскам. Параўн. суч. бел. *му́зыка* і *музы́ка*, *лю́дскі* і *людскі́*.

У беларускай, як і ў іншых усходнеславянскіх мовах, у поўнагалосных формах таксама розніца паводле інтанацыі замянілася на розніцу паводле націску: падвышэнне тону адлюстроўвалася націскам на другім складзе, а паніжэнне тону – націскам на першым складзе (гл. змену 8), напр., *го́рад*, *бе́раг*, *чэ́рап* (раней паніжэнне тону), але *каро́ва*, *гаро́х*, *варо́ты* (раней падвышэнне тону).

Ускосныя сведчанні адсутнасці колькаснае характарыстыкі галосных у старабеларускай мове ў XIV ст. даюць пашыраныя на той самай тэрыторыі, што і беларуская мова, дыялекты ідышу. Дыялекты ідышу, якія прыйшлі з Польшчы недзе пасля 1350 г., спярша мелі апазіцыю доўгіх і кароткіх галосных гукаў, але як такая апазіцыя не захавалася ў беларускай мове, мясцовыя гаворкі ідышу ўрэшце страцілі гэтую розніцу. З другога боку, у Польшчы ідышу было шмат лягчэй захаваць фанемную даўжыню галосных гукаў, бо польская мова мела фанемную колькасць да XVI ст. (і, апроч гэтага, яшчэ з прычыны няспыннага прытоку габраяў з Нямеччыны, Багеміі ды Маравіі, што гаварылі ідышам і захоўвалі гэтую розніцу)[1].

Дынамічны націск, які ў полацка-разанскім дыялекце абумовіў падзел *ѧ* на *о* і *а*, граў ролю і ў некалькіх пазнейшых дыялектных зменах: (1) лабіялізацыя *е* > *о* (змена 18); (2) развіццё дыфтонгаў (змены 19, 20); (3) зліццё *ѣ* з *е* (змена 20).

Выбраная бібліяграфія

U. Weinreich. "Four Riddles in Bilingual Dialectology", *ACICS* 5, 1963.

C. Bidwell. "Phonemic Vowel Length in East Slavic?", *Зборник за филологију и лингвистику* 10, 1967.

Змена 12. Развіццё *е* і новага *о* з *ѧ* (сярэдзіна IX ст. – сярэдзіна X ст., гл. *PoS*, раздзел 28). Паміж сярэдзінай IX і сярэдзінай X ст. ад-

---

трох выпадках колькасная прыкмета мела нефанемны характар.

быўся падзел *ѣа* на *о* і *е*. У змене *ѣа* > *о* асноўныя правілы былі такія самыя для ўсіх гаворак. Аднак пашырэнне *о* ў паўночных і паўднёвых гаворках адрозніваласа. У кіеўска-палескай зоне *о* мог стаяць як пад націскам, так і не пад націскам, а ў полацка-разанскай зоне *о* быў магчымы толькі пад націскам. Недзе ў гэты час *ѣа*, які не зрабіўся агубленым, перайшоў у манафтонг *е* (у полацка-разанскіх гаворках *е* мог быць толькі пад націскам, у проціглым выпадку ён пераходзіў у *а*). Змена *ѣа* > *о* адбывалася пры дзвюх умовах: (1) пасля зазубных *š*, *ž*, *č*, *ǯ*, калі ў наступным складзе не было пярэдняга галоснага. Напр., прасл. **šѣastъ* > бел. *шост* – параўн. рас. *шест*, дыял. [шост]; прасл. **šѣastьjь* > бел. *шóсты* (на паўночным усходзе і дзе-нідзе ў іншых мясцовасцях *шасты́*); (2) на пачатку слова пасля *j*, калі ў наступным складзе не было *ера* з далейшаю стратаю *j*-. Напр., прасл. **jѣazѣarьa* > бел. *вóзера*[2] – параўн. рас. *óзеро*, серб.-харв. *jе́зеро* (бел. *Езярышча* (горад у Віцебскай вобласці) мае, магчыма, балцкае паходжанне – параўн. літ. *ẽžeras* 'возера'); грэцк. *eládion* > бел. *алáдка* (параўн. рас. *олáдья*). Калі пярэдні галосны ідзе пасля склада з зазубным гукам або калі *ер* стаіць за складам з пачатковымі *jѣa*-, тады *ѣа* > *е*: напр., прасл. **šѣastь* > бел. *шэсць*; прасл. **jѣavьnja* > бел. *ёўня* – параўн. літ. *jáuja*[3].

Гэтыя працэсы можна рэканструяваць у наступным парадку:

стадыя 1: $ѣa_5 > a > o_5$ як пасля зазубных, так і пасля *j*. Гэтая змена была раўназначная частковай асіміляцыі ўнутры склада, напр., *ѣ*-прыступ быў паглынуты папярэднім мяккім зычным (*š*, *ž*, *č*, *ǯ*, *j*);

стадыя 2: быў страчаны пачатковы *j*- перад *о*. Магчыма, *j* быў страчаны, бо яго разумелі як свайго роду пратэтычны, нетыповы перад o_6;

стадыя 3: новы $o_{5,6} > e$ ў пазіцыі пасля мяккага зычнага і перад складам з пярэднім галосным. Тут можна казаць пра асіміляцыю на граніцы складоў.

---

[1] Weinreich.

[2] Пра вытворны пратэтычны *v* гл. змену 37.

[3] Параўн. варыянты напісання ў беларускіх тэкстах XVI ст.: *явга*, *явя*, *явья*, *іевя*, *іовя*, *евя*, *евья*. Таксама былі зафіксаваныя варыянты *іовина*, *евина* (= суч. бел. *ёўня*). Змена *е* > *о* (з захаваннем *j*) адносіцца да пазнейшага часу (гл. змену 18).

стадыі	1	2	3
прасл. *š̆ č̆ ѧky	> *š̆ č̆ oky	> š̆ č̆ óky	> бел. *шчóкі*, укр. *шчóки*
прасл. *š̆ č̆ ѧka	> *š̆ č̆ aka	> š̆ č̆ aká	> бел. *шчака́*, укр. *шчока́*
прасл. *š̆ ѧsti	> *š̆ osti	> š̆ ostь	> бел. *шэсць*, укр. *шість*
прасл. *jѧsѧni	> *joseni	> ósenь	> бел. *вóсень*[1], укр. *óсінь*

У выніку распаду ѧ ў прабеларускіх дыялектах больш не засталося кароткіх дыфтонгаў; цяпер усе кароткія галосныя былі простымі манафтонгамі:

Перад зменай 12		Пасля змены 12	
$ь_3$	$ъ_{3,4}$	$ь_3$	$ъ_{3,4}$
$ѧ_5$	o_6	e_5	$o_{5,6}$

Распад кароткага $ѧ_5$ на e_5 і o_5 трэба разглядаць на фоне змены 11, з якой ён, мабыць, часткова супадае. Беспасярэднім вынікам змены $ѧ_5$ сталася поўная ізаляцыя $\bar{ѧ}_8$, які заставаўся адзіным галосным гукам складанае артыкуляцыі. Вось жа не дзіўна, што $\bar{ѧ}_8$ зазнаў цэлую чараду зменаў ва ўсіх славянскіх гаворках. Гэтыя змены ў беларускай мове будуць разабраныя як змена 20.

Важна адзначыць, што распад ѧ на *e* і *o* таксама мог прычыніцца да фанемізацыі змякчэння ў зычных (акрамя *l*, *n* і *r*) перад націскным *ó* і ненаціскным *a* ў полацка-разанскай зоне і перад *o* незалежна ад націску ў кіеўска-палескай зоне. Гэтае пытанне будзе пастаўленае ў змене 16. Гл. таксама разважанні пра *e* > *o* ў змене 18.

Выбраная бібліяграфія

А. Соболевский. "Русское начальное *о* = ц.слав. *йе*", *РФВ* 8, 1882; "К вопросу о русск. начальном *о* = праслав. *йе*", *РФВ* 13, 1885.

Г. Ильинский. "К вопросу о чередовании гласных ряда *о*, *е* в начале слов в славянских языках", *SI* 2, 1923.

Н. Дурново. "Спорные вопросы о. сл. фонетики", *SI* 3, 1924.

R. Ekblom. "Der Wechsel *(j)e-* > *o-* im Slavischen", *Skrifter utgivna av K. Humanistiska Vetenskaps-Samfundet i Uppsala* 22:4, 1925.

[1] Пра вытворны пратэтычны *v* гл. змену 37.

В. Георгиев. "Праславянски *je* > *o* или *a* > *ja* > *je*?", *Славистични студии.* Сборник по случай V международен славистичен конгрес в София. С, 1963.

М. Бірыла. "Вынікі пераходу *е* (< *е*, *ь*) у *о* і з'явы, звязаныя з ім, у беларускай мове", *PF* 18, 2, 1964.

G. Shevelov. "*e* > '*o* ou '*o* > *e* dans les langues slaves de l'Est?", *RÉS* 40, 1964. {Перадрук. у} *TA*.

R. Aitzetmüller. "Die Relation '*e*: '*o* bzw. *o* in den ostslavischen Sprachen", *WSl* 10, 1965.

Змена 13. Спірантызацыя *g* (IX ст. [?], гл. *PoS*, раздзел 21). Вызначыць храналогію спірантызацыі прабеларускага g_{14} нялёгка. Першыя пісьмовыя дакументы прабеларускае мовы з'явіліся досыць позна; значыць, нашу храналогію трэба грунтаваць на фанемным аналізе і часткова на пашыранасці гэтае змены на тэрыторыі славянскіх моваў. Па сутнасці, на геаграфічны бок гэтае змены ёсць два погляды. Некаторыя мовазнаўцы (напр., Трубяцкой) звязваюць прабеларускае развіццё з амаль суцэльнаю тэрыторыяй спірантызацыі *g*, якая апроч беларускіх гаворак ахоплівае чэшскія, славацкія, верхнялужыцкія, украінскія і паўднёварасійскія. Іншыя (напр., van Wijk) звяртаюць увагу на відавочную розніцу ў храналогіі спірантызацыі ў вышэйпамянёных славянскіх мовах і выводзяць, што гэтую агульную змену трэба разглядаць як незалежную ў кожнай славянскай мове[1]. На гэтым фоне для змены ў прабеларускай мове прапануюць некалькі храналогій. Мэт'юз (Matthews) і Андэрсэн (Andersen) прапануюць X ст.; Кіпарскі (Kiparsky) называе прыблізна 1050 г., а Лекаў (Леков) думае, што яна адбылася ў XIII–XIV стст. Што да прычын гэтае гукавое змены, то даследчыкі вылучылі як унутраныя, так і вонкавыя фактары.

На нашую думку, спірантызацыю прабеларускага g_{14} трэба разглядаць на фоне фаналагічных з'яваў, што былі вынікам трэцяе прагрэсіўнае палаталізацыі заднепаднябенных (гл. змену 4). Тых з'яваў дзве: (1) паколькі $ʒ'_{14}$ прыблізна ў гэты час спрасціўся ў $ź'_{14}$ (гл. змену 14), g_{14} мог чаргавацца толькі з двума спірантамі – $ź'_{14}$ і $ź'_{14}$. Такім парадкам, морфафанемныя паводзіны g_{14} спрыялі яго спірантызацыі. (2) Мала таго, x_{15} быў замала ўключаны ў сістэму, бо яму бракавала звонкае па-

[1] Кароткі агляд гэтых двух поглядаў дае Трубяцкой (Trubetzkoy). У верхнялужыцкай мове гэтую змену датуюць вельмі шырока, паміж XIII і XVI стст.; у чэшскай – другой паловай XII – XIII ст.

ры. Спірантызацыя *g* > *γ* (які ўмоўна абазначаюць як *h*) магла запоўніць гэты прагал. Вонкавы ўплыў шукалі ў (1) кантактах на ўсходзе з іранскімі мовамі, дзе *g* таксама спірантызаваны (Абаев), або (2) кантактах на захадзе з германцамі, адкуль спірантызацыя нібыта пашырылася праз суседнія славянскія тэрыторыі на ўсходнеславянскія гаворкі (Novák). Пошукі вонкавых прычын у суседніх мовах могуць мець пэўныя падставы, але ў найлепшым выпадку гэта можа быць другарадным меркаваннем; прабеларуская сістэма была "гатовая" да такое змены.

Ад агульнага сцверджання, што спірантызацыя *g* адбылася пасля трэцяе палаталізацыі заднепаднябенных, можна перайсці да больш прадметных разважанняў. З кантактаў з нямецкаю моваю, здаецца, вынікае, што гэтая змена не магла б пачацца шмат раней за сярэдзіну IX ст.: гл. стара-в.-ням. *ahorn* 'клён' > бел. *я́вар*. Калі *v* замяняе нямецкі *h*, гэта можна лічыць знакам, што *g* у славянскіх мовах яшчэ меў выбухны характар; іначай, славянскі *h* перадаваў бы нямецкі *h*. Гэтае слова было, відаць, запазычана пасля распаду *ₒa* на *o* і *a*, які датавалі сярэдзінай IX ст. (гл. змену 7). Аднак пераканаўчасць гэтага прыкладу паслабляе тое, што гэтае запазычанне можна знайсці ва ўсіх славянскіх мовах; яно мела прыйсці ў прабеларускую мову не проста з нямецкае, а з іншае славянскае мовы, і замену *h* > *v* трэба прыпісаць толькі той мове.

Спробы звязаць гэтую змену са стратай рэдукаваных таксама не зусім пераканаўчыя. Развіццё праслав. **lьgъko* 'лёгкае, лёгка' у беларускай мове – адзін з прыкладаў гэтага. Калі рэдукаваныя былі страчаныя першымі, можна было б спадзявацца прыпадабнення *-gък-* да *-kk-*; такая форма сапраўды зафіксаваная ў польск. *lekki*. Калі асібіляцыя *g* папярэднічала страце рэдукаваных (Andersen), можна было б спадзявацца ўзору *lьgъko* > **lьhъko* > **lьhko*. Можа здацца, што бел. *лёгкі* пацвярджае гэтае развіццё – параўн. таксама бел. габр. *lyoᵊxqīm* (канец XVIII ст. і з вакалізацыяй тэксту). Аднак гэтае сведчанне не выглядае пераканаўчым, бо спалучэнне *-kk-* у выніку распадабнення магло таксама пераходзіць у *-xk-* пасля падзення рэдукаваных (параўн. рас. *легкий* = [л'о́хк']*ий*). Праўда, у іншым выпадку беларуская мова захоўвае падвойныя *-kk-*: *мя́ккі* – параўн. рас. *мя́гкий* ([м'а́хк']*ий*). Аднак у тэкстах XVI ст. можна знайсці *мяхка*, дзеля гэтага ўзнікае падазрэнне, ці не з'яўляецца суч. бел. *мя́ккі* вынікам уплыву польск. *miękki*.

Яшчэ адно назіранне зводзіцца да таго, што спірантызацыя *g* магла папярэднічаць скарачэнню доўгіх галосных (змена 11), бо і спірантызацыя, і даўжыня галосных адлюстраваныя ў балцкіх запазычаннях з прабеларускае мовы (Būga). Такім парадкам, можна думаць, што спірантызацыя *g* прыпадае на IX–X стст. На жаль, да XIV ст. у кірылічных тэкстах няма беспасярэдніх пацвярджэнняў гэтае змены. Пачынаючы з XV ст., мы таксама маем багата пацвярджэнняў гэтае змены з беларускіх глосаў, пісаных трыма сістэмамі некірылічнага пісьма. Прычыны такое позняе фіксацыі змены ў кірылічных тэкстах палягаюць у (1) ціску правапісных нормаў царкоўнаславянскае мовы і ў (2) адсутнасці пільнае патрэбы выдумляць новую графему для перадачы *h* або *γ*, бо правіла спірантызацыі вельмі мала змяніла ў фаналагічнай сістэме; старую графему *Г* маглі проста захаваць для абазначэння фрыкатыўнага гуку. Праблема абазначэння заднепаднябенных або фарынгальных фрыкатыўных гукаў магла паўстаць адно тады, калі пісары хацелі адрозніць свой заднепаднябенны або фарынгальны фрыкатыўны ад чужога заднепаднябеннага выбухнога гуку (а гэтага не было да XIV ст., гл. змену 39). Напісанне графем вар'юецца:

1. У некаторых спрадвечнабеларускіх і запазычаных словах *g* > *h* было страчанае або замененае на *j*: напр., *анъела* Р.скл. адз. (XV ст.; параўн. старарас. *анъгелъ*), калі яно сфармавалася не пад уплывам польск. *anioł* – параўн. суч. бел. *анёл*, *орыйнал* (1595; але суч. бел. *арыгінáл*); *друю* В.скл. адз. ж.р. (1489; суч. бел. *другýю*); *сподарь* (1489) – старарас. *господарь*[1]; *зязюля*, дыял. [з'аўз'ýл'а], *Зязюля*, *Зезюлі* (прозвішча; 1746) < прасл. **žegъza*; *Друцк* < **Drъguti*, **Drъgutьsk*. Патомкі прабеларускіх полацка-разанскіх гаворак маюць дублеты, дзе *g* перадаецца і *h*, і нуль-фанемай: параўн. смаленскае дыял. [кам'áга, кам'á] – старабел. *комягъ* Р.скл. мн. (1587; параўн. рас. *комя́га*, *камя́га*, пскоўскае дыял. [кóм'эй]), магчыма, запазычанае з нямецкае; бел. лац. *czetwer* (XVI ст.; суч. бел. *чацвéр*) < прасл. **četvьrgъ*, але Р.скл. адз. *чацвяргá*; *бласловлѣньe* (прыблізна 1300; суч. бел. *бласлаўлéнне*). Выпадзенне **h* у спалучэннях зычных можа мець досыць позняе паходжанне. Напр., параўн. *згрѣб'е* (канец XVI ст.) з суч. бел. *зрэб'е*, але дыял. (Зэльва) *згрэб'е*. Асаблівы выпадак – слова *дзе*, якое паходзіць

[1] *ДАБМ*, карта 334, падае пашырэнне слоў *гаспадáр* ~ *аспадáр*. Форма без пачатковага *г*- сустракаецца пераважна ў заходне-цэнтральнай зоне.

ад *къde* > *kde* > *gde*. Тут *h* мог з'явіцца адно пасля страты рэдукаваных. Гэты прыклад можна скарыстаць як довад, што пасля страты рэдукаваных змена *g* > *h* яшчэ не скончылася.

2. Дыграф *кг* ужывалі з XIV да XVIII ст. для перадачы *g* у запазычаннях[1]. Гэта пэўны знак, што кірылічную графему *Г* сталі ўжываць дзеля абазначэння фрыкатыўнага гуку. Пісары відавочна адчувалі патрэбу ў асобнай графеме, пачынаючы ад XIV ст., у сувязі з урастаннем колькасці запазычанняў з *g*. Параўн., напр., *кгдыж* (1533; < польск. *kdyż*), *Жикгмонт* (XVI ст.). Гэты дыграф часам таксама сустракаецца ў напісанні слова *кгде*, хоць у гутарковай мове гэты корань меў *г* або нуль гуку перад *д*. Аднаўленне *g* у гэтым корані мела адбыцца пад уплывам польскае мовы (пра *дзе* гл. вышэй). У XVII ст. для перадачы гуку *g* у запазычаных і часам у спрадвечнабеларускіх словах ужывалі і новую графему *Ґ*. Дыграф маглі спрашчаць да *к*, які рэпрэзентуе, відаць, няпоўную перадачу гуку *g*: напр., *Олькерта* (імя) Р.скл. адз., але напісанне *к* у спрадвечнабеларускім *четверкъ* (XV ст.) хутчэй марфалагічная адаптацыя слоў з суфіксам *-k-*.

3. У беларускай мове кірылічную графему *г* ужывалі для перадачы *h* у запазычаннях: напр., *израгелевыхъ* Р.скл. мн. (XVI ст.) < старачэшск. *Izrahelskjch*; *Гелелъ* (імя; 1583) < іўр. *Hillel*; *Гелена* (імя) < польск. *Helena*. Гэтая практыка была непаслядоўная, бо ў беларускай мове чужое *h* можа зусім апускацца: напр., *уфъ* 'войска, калона' (XVI ст.) < польск. *huf* (< ням. *Haufe*), але такія выпадкі тыповыя для пазіцыі на пачатку слова, і іх трэба звязваць з агульным развіццём прыстаўных (гл. змену 37). Замены ў запазычаннях *h* на *х*, якія часам здараліся ў беларускай мове, адлюстроўваюць польскае вымаўленне *h*: напр., *хисторий* (XV ст.).

4. Запазычанні з беларускае ў іншыя мовы і напісанне беларускіх слоў у некірылічных тэкстах даюць дадатковыя сведчанні фрыкатыўнага рэфлексу *g* у беларускіх (калі не ў прабеларускіх) тэкстах. Запазычанні ў літоўскую мову з беларускае ў гэтым сэнсе нетыповыя. Зда-

---

[1] Такі самы працэс меў месца ў правапісе сучаснае грэцкае мовы, дзе першапачатковы перадвакальны *g* сталі вымаўляць як фрыкатыўны, вось жа новы *g* цяпер трэба перадаваць дыграфам *gk* – г. зн. тут усё адбылося ў адваротным парадку ў параўнанні з беларускай практыкай: напр., *gkremós* 'лагчына', *gkázi* 'паскаральнік, акселератар'.

ецца, што ў іх беларускі *γ* замяняецца на *g* (напр., літ. *blõgas* ‘благі, слабы’ < бел. *благі*) (Būga, Ossowski). Страта ў літоўскай мове пачатковага *h* (напр., літ. *adynà* < бел. *гадзіна*) больш паказальная, але яна можа адлюстроўваць працэс перараскладання, калі каранёвы *h-* робіцца прыстаўным *h-*. У цюркскіх мовах гл. караім. *γnoj* < бел. *гной*. Пра спірантызацыю *g* > *h* у небеларускіх імёнах, якія ўжывалі беларускія татары, гл. Мухліньскага (Muchliński). Беларускі інтэрвакальны *γ* у ідышы перадаецца як *h* або *j* ці апускаецца: напр., бел. *смага* > ід. *smáhe*, *smáje*; бел. *крыга* > ід. *kríe*; бел. *Магілёў* > ід. *mólev*. Часам праславянскі *g* у беларускім ідышы перадаецца як *g*, але гэта адлюстраванне польскага ўплыву на ідыш, а не сітуацыі ў беларускай мове: напр., бел. ід. *padlóge* < польск. *podłoga*, а не ад бел. *падлога*, дарма што ў беларускім ідышы гэты корань набыў такую беларускую рысу, як аканне.

5. Беларускія глосы, пісаныя лацініцаю, даюць дадатковыя сведчанні, гл. бел. лац. *Hrehore*, *Drahaczyn* (суч. бел. *Драгічын*, але даўнейшае *Дорогичинъ*) у нямецкім тэксце 1432 г.; *z Homia* (1538). Дадатковыя прыклады гл. у тэкстах, надрукаваных у *Беларускім архіве* 2 (Мн, 1928)[1].

6. Беларускія глосы ў габрайскіх тэкстах: бел. габр. *bwh* (суч. бел. *Буг*); *nʾwwyhwrwdk* (XVI ст.), *nʾwwʾrdʾk* (сярэдзіна XVI ст.; дарэф. бел. *Навáградак*, суч. бел. *Навагрýдак*); *dʾhylnʾwwʾ* (каля 1600; дарэф. бел. *Даўгíнаў*, суч. бел. *Далгíнава* – Мінская вобласць, з метатэзай *lh* > *hl*); *yʿhʾ* (пачатак XVII ст.; суч. бел. *ягó*); *mʾhlʾww* (1639; дарэф. бел. *Магілéў*, суч. бел. *Магілёў*)[2].

7. Беларускія глосы ў цюркска-арабскіх тэкстах. Бел. цюрк. *būh* (XVII ст.; суч. бел. *бог*); *hraḥ* (XVII ст.; суч. бел. *грэх*); *yahū* (XVII ст.; суч. бел. *ягó*).

Як зазначана вышэй, у беларускіх гаворках праславянскаму гуку g_{14} адпавядае *γ*, *h* сустракаецца толькі ў паасобных мясцовасцях у паўднёва-заходнім трыкутніку, абмежаваным прыблізна гарадамі Брэст,

---

[1] І нямецкі дыпламат XVI ст. барон фон Гэрбэрштайн, і харвацкі падарожнік XVII ст. Ю. Крыжаніч адзначалі, што праславянскі *g* вымаўляецца як фрыкатыўны.

[2] Пра адзін габрайскі тэкст XVI ст., у якім чытачам радзілі замяняць *g* на *h* у “рускай” (г. зн. беларускай) мове, гл. B.-C. Katz. *Lekorot hayehudim berusia, pojlin, velita*. B, 1899, 32.

Пінск, Пружаны і ўкраінскай граніцай, г. зн. з мовазнаўчага погляду паза ўласнабеларускаю тэрыторыяй. Гл. каментары да картаў 74, 106, 319 у *ДАБМ*. Можна дапусціць, што рэфлекс *γ* быў уласцівы і кіеўска-палескай, і полацка-разанскай зонам, а *h* пашыраўся з поўдня і паўднёвага захаду. Дакладныя граніцы ў мінулым акрэсліць немагчыма дзеля іх зменлівасці (рэфлекс *h* праславянскага *g* мог лёгка пашырацца, бо гэта не патрабавала ніякае фанемнае перабудовы[1]) і амаль поўнае непрыдатнасці пісьмовых дакументаў. Людзі, якія пісалі іўрытам, не мелі графічнага спосабу адрозніць [h] ад [γ], бо ў іўрыце ёсць толькі адна графема для перадачы *h*; для гэтага напісанне беларускіх слоў у габрайскіх тэкстах не можа даць уяўлення пра асаблівасці артыкуляцыі фрыкатыўнага гуку. Больш карыснымі могуць быць беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом, бо ў цюркска-арабскім пісьме ёсць асобныя графемы для *h* і *γ*. Графема *h* перадае беларускі фрыкатыўны рэфлекс праславянскага *g* пры вельмі нязначнай колькасці выпадкаў ужывання графемы *γ* у напісанні спрадвечнабеларускіх слоў, што немагчыма прыпісаць польскаму ўплыву. Беларуска-цюркскія тэксты складаліся пераважна людзьмі з заходнебеларускіх тэрыторый, якія сёння маюць *γ* на месцы *g*. Калі дапусціць, што ўжыванне графемы *h* у татарскіх дакументах сапраўды адлюстроўвае фанетычны [h], тады ў нас будзе пацвярджэнне, што тэрыторыя, дзе пашыраны [h], у апошнія тры-чатыры стагоддзі адступала на поўдзень. Аднак больш праўдападобна, што паколькі графема *γ* прызначалася дзеля перадачы чужога, найперш польскага, *g*, у аўтараў беларуска-цюркскіх тэкстаў не было іншага выбару, як ужываць графему *h* для ўсіх фрыкатыўных рэфлексаў *g*.

Беларуская мова захоўвае гук *g* у спрадвечнабеларускім спалучэнні *-zg-* пры ўмове, што яно не знаходзіцца на граніцы марфем: напр., *мазгі́*, *мязга́*, *по́зга*[2]. Калі ж спалучэнне стаіць на сутыку марфем,

---

[1] Паводле некаторых даследчыкаў (напр., Аванесава), *h*-навацыя, падняўшыся з поўдня, захапіла паўднёвабеларускія дыялекты. Пасля XV ст. паўночныя рысы маглі пашырацца на поўдзень, адсоўваючы такім парадкам тэрыторыю з рэфлексам *h* назад, у паўднёва-заходні кут краіны. Існаванне розных рэфлексаў у сучасных беларускіх і ўкраінскіх гаворках паказвае, што тэмп і інтэнсіўнасць спірантызацыі *g* у гэтых двух рэгіёнах былі розныя і дзеля гэтага маглі не супадаць храналагічна.

[2] У некаторых выпадках адбылася замена спалучэння *-zg-* на *-zk-* ~ *-sk-* пад уплывам суфікса *-k-*: напр., *розка* (1489).

тады гук *g* у спалучэнні *zg* рэпрэзентаваны як *h*: напр., *згі́нуць* зак.тр. – *гі́нуць* незак.тр. Свой *g* таксама захоўваецца пасля *ž* і *ǯ*: напр., *жгут*, *джгнуць*. У паўднёва-заходнім дыялекце спалучэнне *rk* можа таксама пераходзіць у *rg*: параўн. [пам'аргóўны] і літар. бел. *памяркóўны*. Як і ў папярэднія перыяды, *g* можа захоўвацца ў запазычаннях. У выніку беларуская мова мае вельмі мала параў, напр., *гуз* (*г* фрыкатыўны) 'ніжняя частка снапа' < прасл. **gǫzъ* і *гуз* 'гузак' < польск. *guz*[1]. Амаль усе запазычанні ў беларускай мове з новым *g* (польскага паходжання або тыя, што трапілі ў беларускую пры пасярэдніцтве польскае мовы) вядомыя і ўкраінскай мове. Гэты факт паказвае, што запазычанні з новым *g* рабіліся ў XIV–XVII стст., калі гэтыя тэрыторыі ўпершыню падпалі пад польскі ўплыў (гл. змену 39).

Беларуская мова набывае нефанемны гук *g* паўторна ў выніку прыпадабнення *k* да звонкага зычнага: напр., *к бра́ту* [г бра́ту]. Параўн. таксама *вялі́кдзень* [в'алíǧ'эн'], паўдн.-зах. дыял. [грамý́шка], якое, магчыма, паходзіць ад *kr-* (параўн. літар. бел. *крэ́мень*).

У двух словах інтэрвакальны беларускі *h* паходзіць не ад g_{14}, а, відаць, ад $ž_{14}$: *ужэ́* > *уте́* (паўн.-бел. дыял. [ужó] > [угó]) і *ка́жэ* > *ка́ге*. Аднак у гэтых выпадках у сапраўднасці ёсць тэндэнцыя да страты *ž*, і *h* быў уведзены пазней, каб запоўніць прагал. Параўн. ужыванне *j* замест *ž* у слове *кае* 'кажа' або *Лагойск* (*Логойскъ* [1387] < *Логожьскъ*).

Выбраная бібліяграфія

A. Muchliński. "Zdanie sprawy o Tatarach litewskich", *Teka Wileńska* 5, 1858, 170.

K. Būga. "Die litauisch-weißrussischen Beziehungen und ihr Alter", *ZSPh* 1, 1924, 55. {Перадрук. у} *RR* 3, 1961, 496–497.

E. Karskij. "Deux points de phonétique blanc-russe", *RÉS* 7, 1927.

П. Бузук. "Новыя працы па беларускай дыялектолёгіі", *Запіскі* 1, 1928, 374; *Спроба лінгвістычнае геаграфіі Беларусі* 1. Мн, 1928.

Е. Раманаў. "Гаворкі Магілёўскае губэрні", *Запіскі* 1, 1928, 2, 133, 137.

N. van Wijk. "De moderne phonologie en de omlijning van taalkategorieën", *De Nieuwe Taalgids* 26, 1932.

E. Fraenkel. {Рэц. на} J. Otrębski. *Wschodniolitewskie narzecze twereckie* 3. *Zapożyczenia słowiańskie* {у} *Balticoslavica* 1, 1933.

[1] Часам польскі *g* можа замяняцца на *h*: напр., *гвалт*, *га́нак* (гл. таксама прыклады ў змене 39).

L. Ossowski. "Przyczynki do białoruskiej dialektologji", *Милетич*; "Z fonetyki białoruskiej", *LS* 4, 1934.

N. Trubetzkoy. "Zur Entwicklung der Gutturale in den slavischen Sprachen", *Милетич* 268 {і наст.}.

Ľ. Novák. "Neznáme nemecké vplyvy na západnoslovanský, východoslovanský a madarský konsonantizmus", *LSc* 1–2, 1939–1940.

Г. Шыло. "Явишче протези в словьянських мовах", *ПСМ* 2, 1949.

Р. Аванесов. "Лингвистическая география и история русского языка", *ВЯ* 1952, 6.

E. Diels. "Velarer Reibelaut und Kehlkopfreibelaut", *WSl* 1, 1956.

E. Decaux. "Le passage de *g* à *h* et le groupe *zg*", *RÉS* 34, 1957.

A. Isačenko. "Herbersteiniana", *ZSl* 2, 1957, 342–345.

V. Kiparsky. "Ims. *h* – äänteen vastineet venäjässä", *Virittäjä* 62, 1958; "Foreign *h* in Russian", *SEER* 38, 1959; *Russische historische Grammatik.* Heid, 1963, 153.

И. Леков. *Насоки в развоя на фонологичните системи на славянските езици.* С, 1960, 98.

W. Matthews. *Russian Historical Grammar.* Lo, 1960, 170.

Z. Stieber. "O niektórych paralelach w rozwoju dialektów słowiańskich", *Slavia Occidentalis* 20, 1960. {Перадрук. у} Z. Stieber. *Świat językowy Słowian.* W, 1974; *Zarys porównawczej gramatyki słowiańskiej* 1. W, 1969.

P. Garde. "Réflexions sur les différences phonétiques entre les langues slaves", *Word* 17, 1961.

В. Абаев. "О происхождении фонемы *γ* (*h*) в славянском", *ПИЕЯ.*

J. Otrębski. "Aksl. *kъńiga*, poln. *księga*", *WSl* 12, 1967.

В. Мартынов. *Славянская и индоевропейская аккомодация.* Мн, 1968, 93–94.

H. Andersen. "Lenition in Common Slavic", *La* 45, 1969.

U. Weinreich. "The Geographic Makeup of Belorussian Yiddish", *FY* 3, 1969, 95–96.

Змена 14. Леніцыя (аслабленне) *ʒ́ > ź́* і *ʒ́ > ź́* (да X ст. [?], гл. *PoS*, раздзел 21). Пераход праславянскага g_{14} у $ʒ́_{14}$ перад пярэднімі галоснымі (пра *ʒ́* < *dj* гл. змену 3) не зафіксаваны ні ў водным гістарычным славянскім тэксце, ні ў воднай гаворцы. Значыць, можна дапусціць, што аслабленне *ʒ́ > ź́* (напр., у суч. бел. *магу́* || *мо́жа*) адбылося да X ст., яшчэ перад тым, як з'явіліся першыя пісьмовыя дакументы. Дакладна вызначыць храналогію гэтае змены няма як, хоць прычыны гэтага спрашчэння лёгка зразумець. Страту $ʒ́_{14}$ трэба разглядаць на фоне вынікаў першае рэгрэсіўнае палаталізацыі задне-

паднябенных[1]. Праз гэтую змену сістэма зычных гукаў была перагружаная сегментамі; мала таго, страта *ʒ'* мела, праўдападобна, вынікам нязначныя зрухі ў камунікацыі (гл. *PoS* 256–257). Трэба зазначыць, што скарачэння колькасці фанем не адбылося, бо *ʒ'* (з *g* і *dj*) пасля $ž'_{14}$ захоўваўся: напр., бел. *дро́жджы*, *дождж*, *дажджу́* < прасл. **dъždžь*. У прабеларускіх і старабеларускіх тэкстах афрыкату пасля *ž* пісалі рознымі спосабамі: параўн. *дъжчѣвнымъ* (1296), *дожчю* (1489); у XVII ст. у беларуска-цюркскіх тэкстах гэтае спалучэнне незалежна ад яго паходжання пісалі як *ǯ*, *žǯ*, *žč* і проста *ž*: напр., *dūžč* 'дождж', *žǯat* (= суч. бел. *жджэ*). У смаленска-полацкай зоне знаходзім напісанне *дожгъ*, а ў ковенскіх дакументах сярэдзіны XVI ст. корань 'дождж' часам пісалі з *дч* (Антонович).

Можна дапусціць, што прыблізна ў той самы час $ʒ'_{14}$, які з'явіўся ў выніку другое і трэцяе палаталізацыі заднепаднябенных, таксама спрасціўся да z'[2]. Гэтая пазнейшая з'ява ўласцівая ўсім славянскім мовам, акрамя прапольскае, палабскае і часткова царкоўнаславянскае. У выніку спрашчэння *ʒ'* гук *z* у прабеларускай мове набыў пару паводле мяккасці – z'_{14}. Гл. разважанні ў змене 4.

Выбраная бібліяграфія

Р. Якобсон. "Спорный вопрос древнерусского правописания (*дъжгъ*, *дъжчь*)", *Белићев зборник*. Београд, 1937. {Перадрук. у} *SW*.

А. Антонович. "Графика и орфография судебной (актовой) книги каунасского земского суда 1566–1567 гг.", *Kalbotyra* 1961, 212.

Z. Stieber. *Zarys porównawczej gramatyki słowiańskiej* 1. W, 1969, 79.

Змена 15. Страта насавых галосных (відаць, да X ст., гл. *PoS*, раздзел 22). У прабеларускіх гаворках, як і на ўсім астатнім славянскім абшары, каля VII ст. развіліся два насавыя гукі (гл. змену 2). У сучаснай беларускай мове гук *ę* звычайна рэпрэзентаваны гукам *(')а*, *ǫ* – гукам *у*. Апроч некалькіх морфафанемных апазіцый на ўзор *пача́ць* || *пачну́*, у беларускай мове няма выразных слядоў насавых галосных, таму іх першапачатковую прысутнасць у марфеме можна

[1] Пра магчымасць алтайскага ўплыву на гэтую змену гл. *PoS* 622.

[2] Штыбэр (Stieber) прапануе XVII ст.

толькі рэканструяваць, параўнаўшы беларускую мову з іншымі індаеўрапейскімі мовамі, з царкоўнаславянскаю, дзе насавыя галосныя захаваліся некранутымі, або з польскаю, дзе насавыя гукі захаваліся ў зменены дыстрыбуцыі. Напр., прабел. *ę* > *'a*: *трáсца* – ц.-сл. *трасж* 'трасу', грэцк. *trémō* 'дрыжу'; прабел. *ǫ* > *u*: *пруг* 'край тканіны' – польск. *pręga* 'паласа, рыса', літ. *sprangùs* 'душны'.

Пацвярджэнні існавання насавых галосных у прабеларускай мове таксама вынікаюць з параўнання беларускіх запазычанняў з іх адпаведнікамі як у мовах-крыніцах, так і ў мовах-пазычальніках. Напр., бел. *пуд* < старасканд. *pund*. На тое, што і прабеларуская форма мела быць **pǫ d-*, паказвае таксама запазычанне ў літоўскую мову з усходнеславянскіх – *pundùs*, *pùndas*. Бел. *вяцічы*, назву ўсходнеславянскага племені, таксама трэба выводзіць з прабеларускага этымона з насавым галосным, як відаць з семіцкіх дакументаў. Назва гэтага племені з'явілася ў арабскіх тэкстах у канцы IX ст., а ў габрайскіх – у X ст. у формах: араб. *wāntīt*, іўр. *wnntyt* (габрайская форма – памылка ў напісанні ад **wwntyt* і ў сваю чаргу паходзіць ад арабскае мадэлі)[1].

Два насавыя галосныя гукі захоўваліся ў сістэме прабеларускіх дыялектаў прыблізна тры стагоддзі, а пасля зліліся з існымі ротавымі галоснымі. На ўсёй прасторы прабеларускае мовы $ǫ_{11}$ зліўся з u_2 незалежна ад націску; гэты працэс адбываўся таксама ў расійскай, украінскай, лужыцкіх, чэшскай, славацкай і сербска-харвацкай мовах. Вынікі дэназалізацыі $ę_{10}$ адрозніваюцца ў залежнасці ад гаворак. У полацка-разанскай зоне (цяперашнія паўночнабеларускія гаворкі) $ę_{10}$ зліўся з $a_{6,9}$. Што да кіеўска-палескае зоны, то паўднёвабеларускія і паўночнаўкраінскія гаворкі выяўляюць дваякае развіццё ў залежнасці ад месца націску: націскны $ę_{10}$ > *'á*, як у паўночнабеларускіх гаворках, і ненаціскны $ę_{10}$ > *е* – у пераважнай большасці паўднёвабеларускіх гаворак таксама са змякчэннем папярэдняга зычнага. Дэталі геаграфічнае пашыранасці гэтых з'яваў можна вывучыць па картах 7 і 19 *ДАБМ*.

[1] Прыклад узяты з Лявіцкага (Lewicki). Тут мы трымаемся ягонае сістэмы транслітарацыі. Лявіцкі дапушчае, што фанетычнае значэнне семіцкіх глосаў было [va/entīt].

Полацка-разанская група

$ǫ́_{11}$ > *ú*: бел. *губá* 'грыб' (< **hūba* – параўн. укр. *гýба*, серб.-харв. *güba* 'праказа') < прасл. **gǫba*

$ǫ_{11}$ > *u*: бел. *прутко́вы* < прасл. **prǫtъ-*

$ę́_{10}$ > *á*: бел. *жаць* < прасл. **žęti*

$ę_{10}$ > *a*: бел. *па́мяць* < прасл. **pamętь*

У гаворках з еканнем ненаціскны *а*, у т. л. і той, што паходзіць з *ę*, пасля мяккага зычнага зліўся з e_5. Сёння еканне можна знайсці пераважна ў паўднёвых гаворках; досыць шматлікія напісанні з *е* ў гістарычных тэкстах могуць адлюстроўваць паўднёвабеларускую фанетычную рэчаіснасць або гіперкарэктнае напісанне, каб не пазначаць акання.

Кіеўска-палеская група

$ǫ́_{11}$ > *ú*: укр. *гýба*, як вышэй

$ǫ_{11}$ > *u*: укр. *прутня́стий* 'разгалінаваны'

$ę́_{10}$ > *á*: укр. *жáти* 'жаць'; *пять* < прасл. **pęťь*

$ę_{10}$ > *e*: паўн.-укр. [па́мэт'] (= літар. бел. *па́мяць*) – параўн. *пометають* (1489); паўн.-укр. [дэсэт'] (= літар. бел. *дзе́сяць*) < прасл. **desęťь*; паўн.-укр. [пэтí]; паўдн.-бел. [гл'э$\breve{з}$'э́ц'] < прасл. **ględěti* (літар. бел. *глядзе́ць*)[1]

Звычайна сучасная літаратурная беларуская мова прытрымліваецца полацка-разанскага развіцця, але мае і некаторыя формы з *é* < $ę́_{10}$: *запрэ́гчы*, *трэ́сці*, *дрэнь* (параўн. рас. *запря́чь*, *трясти́*, *дрянь*). Ёсць некалькі тлумачэнняў гэтых формаў: (1) гэта паўднёвабеларускія формы з наступным пераносам націску на каранёвы склад; (2) аналагічнае выраўноўванне мела месца паводле мадэлі *нясу́* || *не́сці*, *трасу́* || *трэ́сці*; (3) пад паўночнарасійскім уплывам адбываўся наступны пераход '*á* > *é* паміж мяккімі зычнымі. Апошнюю змену таксама можна знайсці ў некаторых паўднёвабеларускіх гаворках (з еканнем), але звычайна ў ненаціскной пазіцыі.

У некаторых выпадках у сучаснай беларускай мове *а* пасля мяккага зычнага з'яўляецца вынікам гукавой замены ў запазычаннях з польскае мовы: напр., бел. *дзя́каваць* ад польск. *dziękować*. Але часам беларуская мова запазычала польскія словы з насавымі гукамі без іх дастасавання да гукавых узораў беларускае мовы: напр., мсціслаўскае дыял. [мэнчыц'] < польск. *męczyć* побач з літар. бел. *му́чыць* < прасл. **mǫčitь*[2].

---

[1] Параўн. таксама *прогледзяла*, *гледзячи* (1489).

[2] Гл. *PFB* 19. Меркаванне, што пераход $ę_{10}$ > *e* адбываўся пад польскім уплывам, гл. у Карскага (Карский 1890).

Страта пярэдняга насавога галоснага мела вялікі ўплыў на фармаванне фанемнае палаталізацыі ў прабеларускіх гаворках. Зычныя перад *ę* зрабіліся мяккімі да зліцця *ę* з *a*, а змякчэнне папярэдняга зычнага гуку захавалася перад *a* нават пасля гэтага зліцця[1], вось жа зычны, які стаяў перад *a*, мог цяпер быць як мяккі, так і цвёрды[2]. Разгледзім наступныя мінімальныя і амаль што мінімальныя пары: прабел. *rad* < **radъ* – прабел. *rjad* (суч. бел. *рад*) < прасл. **rędъ*; бел. *сваты́* (ад *сват*) – *святы́* < прасл. **svętъjь*; старабел. *Заславъ* (1489) < *Изаславль* (параўн. бел. *Заслáўе* і ўкр. *Заславль*) – *засълалъ* (суч. бел. *заслáў*); бел. *сабóр* < ц.-сл. *съборъ* – мсціслаўскае дыял. [с'аб'óр] < **sębrъ* (параўн. літар. бел. *ся́бар*); *знаць* < прасл. **znati* – *зняць* < прасл. **sъn* + *jęti*.

У выніку зменаў у сістэме галосных гукаў прабеларускіх гаворак IX–X стст. (агубленне спалучэнняў *ьl* і *ъl* (гл. змену 10), страта фанемнае даўжыні (змена 11), развіццё e_5 і новага o_5 < $_e a_5$ (змена 12) і страта насавых галосных) прабеларуская сістэма галосных набывала новыя крыніцы развіцця чатырох ужо існых галосных.

У параўнанні з папярэднім зрэзам сістэмы зычных гукаў у VII–X стст. да яе дадалося колькі новых элементаў. Страта спалучэнняў з *j* давяла да развіцця *r'*, *l'*, *n'* і была новаю крыніцаю ўзнікнення *ž'*, *š'*, *č'*. Трэцяя (прагрэсіўная) палаталізацыя заднепаднябенных была крыніцаю новых *c'*, *ʒ'*, *s'*. Да X ст. *ʒ'* > *z'* і *ʒ'* у большасці пазіцый зліліся з *ž'*. Частасць ужывання *w* павялічылася ў выніку вакалізацыі *l*. Леніцыя (аслабленне) *g* да *γ* (і, магчыма, да *h* у частцы кіеўска-палескае зоны) павялічыла колькасць фрыкатыўных гукаў. У выніку страты насавых гукаў былі ўведзеныя таксама новыя палаталізаваныя элементы: напр., p'_{16}, b'_{17}, m'_{18}, w'_{19}, t'_{20}, d'_{21}. Сістэма зычных гукаў была аднолькавая ў абодвух дыялектах. Змены ў сістэмах галосных і зычных гукаў паказаныя ў табл. 17.

---

[1] Пра тэорыю, паводле якой гук $ę_{10}$ прайшоў праз сярэднюю стадыю ніжняга пярэдняга *ä* (што нібыта графічна перадаваўся ў некаторых расійскіх тэкстах XII ст.) перад зліццём з *a*, гл. *PoS* 498–499.

[2] Адзначалі, што ізаглоса $ę_{10}$ > *e* ў славянскіх мовах часткова супадала з ізаглосамі непалаталізаваных зычных перад *e* і *i* (*PoS* 499). Параўн. таксама сувязь паміж агубленнем *e* > *o* і развіццём палаталізацыі перад *i* і *e*, разабранымі адпаведна ў зменах 18 і 46.

Табліца 17. Зрэз 5V-С. Прабеларуская сістэма зычных і галосных гукаў к X ст.



Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. "К истории звуков и форм белорусской речи", *РФВ* 23, 1890, 2, 224; *Белорусы* 1, 104–111.

K. Būga. "Kann man Keltenspuren auf balitschem Gebiet nachweisen?", *RS* 6, 1913, 34 {і наст.}.

Л. Васильев. "С каким звуком могла ассоциироваться буква 'нейотированный юс малый' (ѧ) в сознании писцов некоторых древнейших русских памятников?", *РФВ* 69, 1913. {Перадрук. у} Л. Васильев. *Труды по истории русского и украинского языков.* Мюнхен, 1972. (Параўн. с. XXV–XXIX ва ўступным артыкуле Ю. Шавялёва.)

П. Бузук. "Да пытання аб лёсе прадгістарычнага (праславянскага) ę", *Запіскі* 2, 1929.

W. Matthews. "The Phonemes of Tenth-Century Slavonic in the Light of Byzantine Evidence", *Slavistčna revija* 10, 1957.

T. Lewicki. "Dwie fińskie nazwy plemienne we wczesnośredniowiecznym dokumencie hebrajskim", *Onomastica* 4, 1958, 2, 316.

[1] Спрадвечны *g* захаваўся толькі ў пазіцыі пасьля *z* і *ž*.

[2] Прыстунасць гуку *h* у беларускай мове няпэўная, таму ён не будзе ўключаны ў наступныя зрэзы.

[3] Толькі ў пазіцыі пасля *ž'*14.

М. Лекомцева, С. Толстая. "Фонологический комментарий к полесским диалектам", *Полесье*. М, 1968.

А. Залеський. "Континуанти праслов'янських *ę* та *a* (після м'яких приголосних) у говорах української мови", *Мов* 1970, 3.

М. Преображенская. "Об одной диалектной черте говоров Белоруссии (К вопросу о рефлексах **ę* (*'a, я*) в восточнославянских языках)", *Проблемы истории и диалектологии славянских языков*. М, 1971.

Змена 16. Статус мяккіх зычных у прабеларускіх дыялектах X ст.,

I. Пададзеная вышэй табл. 17 паказвае, што ў X ст. прабеларускія гаворкі мелі 15 ці 16 мяккіх зычных: p'_{16}, b'_{17}, m'_{18}, w'_{19}, t'_{20}, d'_{21}, s'_{15}, z'_{14}, c'_{13}, n'_{9}, l'_{10}, r'_{11}, $ś'_{15}$, $ź'_{14}$, ($ʒ'_{14}$), $ć'_{13}$. Паколькі першае змякчэнне зычных адбылося ўжо ў V–VI стст., можна цяпер меркаваць пра змены ў статусе гэтых палаталізаваных зычных, што адбываліся на працягу чатырох або пяці стагоддзяў да X ст. У прабеларускіх гаворках мяккія зычныя ўпершыню з'явіліся ў сувязі з першай палаталізацыяй заднепаднябенных (V–VI стст.), а тады са стратай спалучэнняў з *j* (VII–VIII стст.). У выніку з розных крыніц развілося некалькі мяккіх зычных: *ś* < *x*, *xj* і *sj*; *ź* < *zj*, гэтаксама як і з *ʒ́* (прадукт першае палаталізацыі *g* і зменаў спалучэнняў *dj* і *gj*); *ć* < *k*, *kj* і *tj* (апошні таксама са спалучэнняў *kt* і *gt*). Аднак на гэтай стадыі фанемны характар мела толькі змякчэнне *l'*, *n'* і *r'*. Гэтыя тры гукі процістаўляліся *l*, *n* і *r* у пазіцыі перад галоснымі пярэдняга і непярэдніх радоў толькі паводле адзінае рысы – цвёрдасці–мяккасці. Развіццё *l'*, *n'* і *r'*, якое адбылося ў выніку спрашчэння спалучэнняў з *j* у VII–VIII стст., было характэрнае для ўсіх славянскіх гаворак. Змякчэнне астатніх зычных было выключна фанетычнае, бо *ś'*, *ź'*, *ć'*, (*ʒ'*) не мелі цвёрдых параў. Як паказана ў наступных зменах 34, 36, 38, гэтыя сегменты ніколі не набылі цвёрдае пары і, як вынік, урэшце страцілі лішнюю рысу мяккасці.

Наступнай крыніцаю палаталізаваных сегментаў было другое і трэцяе змякчэнне заднепаднябенных, якія далі *ś'*, *ź'* (<*ʒ'*), *ć'*. Цяпер упершыню зычныя маглі быць характарызаваныя з пункту гледжання апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці і звонкасці–глухасці: *s*–*s'* і *z*–*z'*. Новы *ć'* з нефанемным змякчэннем, як і зазубныя гукі, пасля страціў сваю мяккасць (змены 34, 38).

Важна адзначыць, што іншыя прабеларускія зычныя гукі, акрамя заднепаднябенных, маглі стаць і, відаць, сталі пазіцыйна палаталізава-

нымі перад галоснымі пярэдняга раду; у літаратуры іх часам называюць "паўмяккімі" (half-palatalized) зычнымі. Толькі заднепаднябенным k_{13}, g_{14}, x_{15} бракавала пазіцыйных "паўмяккіх" алафонаў. Такім парадкам, у X ст. у прабеларускай мове пашырылася ўсеагульная нефанемная палаталізацыя ў пазіцыі перад галоснымі пярэдняга раду. Гэтая з'ява, відаць, ахапіла ўсе іншыя тагачасныя славянскія гаворкі, апроч тых, з якіх развіліся славенская, сербска-харвацкая і, магчыма, македонская мовы (пра *ę* > *'a* гл. змену 15).

У IX–X стст. статус палаталізацыі грунтоўна змяніўся ў выніку змены $ę_{10}$ ў *'a* на ўсёй беларускай тэрыторыі.

Абагульняючы, можна сказаць, што ў V–X стст. мяккія зычныя зазналі 4 працэсы: (1) першую палаталізацыю заднепаднябенных (гл. *PoS*, раздзел 17), (2) другую і трэцюю палаталізацыю заднепаднябенных (змены 1, 4), (3) страту спалучэнняў з *j* (змена 3) і (4) пераход *ę* > *'a* (змена 15)[1].

У XI–XII стст. важную ролю ў пашырэнні фанемнае палаталізацыі на іншыя пазіцыі адыгрывалі яшчэ тры працэсы ў прабеларускай сістэме галосных гукаў: (1) лабіялізацыя *e* > *o* (змена 18), (2) страта рэдукаваных (змена 21), (3) страта /*ȳ*/ (змена 22). Пазней, у беларускі перыяд, на статус палаталізацыі таксама зрабілі ўплыў некалькі рэгіянальных зменаў. Апазіцыя паводле цвёрдасці–мяккасці пачала выяўляцца (1) перад *u̯o* пасля агублення і дыфтангізацыі *e* ў паўднёва-заходніх гаворках (змены 19, 47), (2) перад *e* пасля дэлабіялізацыі *u̯o* ў частцы паўднёва-заходніх гаворак (змены 19, 47), (3) перад рэфлексам $ě_8$ дзеля марфалагічнага выраўноўвання ў паўднёва-заходніх гаворках (змены 20, 47), (4) перад *o* пасля агублення *a* > *o* ў паўднёва-заходніх гаворках (змена 49), (5) перад *u* (< *o*) у частцы паўднёва-заходніх гаворак (змена 45).

---

[1] Распад *ѣa* на *e* і *o* ў кіеўска-палескіх і на *e* і *o*/*a* (у залежнасці ад націску) у полацка-разанскіх гаворках (змена 12) таксама стаў звяном у развіцці палаталізацыі праз развіццё мяккіх зычных у пазіцыі перад *o* (і адпаведна перад *o*/*a*). Але як гэтыя зычныя былі зазубныя і *j*, а яны не мелі фанемнае апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці, то гэты працэс быў нефанемны.

Выбраная бібліяграфія

G. Gerovský. "Zur Herkunft der Konsonantenerweichung vor *e*- und *i*-Lauten im Russischen", *WSJb* 7, 1959.

Л. Калнынь. "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959; *Развитие корреляции твердых и мягких согласных фонем в славянских языках*. М, 1961.

E. Koschmieder. "Die Palatalitätskorrelation im Slavischen", *ZSPh* 27, 1959.

К. Горшкова. "Соотношение вокализма и консонантизма в истории древнерусского языка", *СФ* 5, 1963.

Wł. Kuraszkiewicz. "Ukraińska dyspalatalizacja w gwarach podlaskich", *ZPSS* 1963.

В. Иванов. "К вопросу о функциональной нагрузке согласных в древнерусском языке X – начала XI в. (Противопоставленность согласных перед гласными)", *ВМУ* [*серия VII*] 1964, 5.

H. Birnbaum. "Lautwandel und Phonologisierung", *ZSPh* 32, 1965.

А. Булыка. "Надрадковыя знакі ў старабеларускай пісьменнасці", *ЛД* 30.

В. Чэкман. *Гісторыя проціластаўленняў па цвёрдасці–мяккасці ў беларускай мове*. Мн, 1970.

Змена 17. Змешванне ў гаворках свісцячых з шыпячымі (не раней за XI ст. [?], гл. *PoS*, раздзелы 23 [с. 354–355], 34 [с. 590–592], 35 [с. 624]).

Вынікам трэцяй палаталізацыі заднепаднябенных (змена 4) быў рост частасці ўжывання (і функцыянальнае нагрузкі) *c'*, *ʒ'*, *s'*. І ўсё ж такі колькасць апазіцый, што ўключаюць зубныя і зазубныя зычныя, заставалася нізкая, і *ʒ'* ды *c'* былі слаба інтэграваныя ў сістэму фанем прабеларускае мовы. Адным з вынікаў слабой інтэграцыі *ʒ'* было зліццё $ʒ'_{14}$ і z'_{14} (гл. змену 14). У Себежскім і Невельскім раёнах і ў некаторых мясцовасцях на ўсходзе Віцебскай і поўначы Смаленскай абласцей, г. зн. на перыферыі беларускае тэрыторыі, знаходзім дадатковую рэакцыю на гэтую сітуацыю ў форме частковага разбурэння апазіцыі зазубных і зубных зычных, а менавіта *č*–*c* (гэтую з'яву называюць "цоканне")[1]. Асобныя прыклады

[1] У беларускай мовазнаўчай літаратуры шмат назваў для розных аспектаў змешвання свісцячых з шыпячымі. Для носьбітаў гаворак з цоканнем ёсць назва "цікуны". Калі *ц* мяшаецца з *ч*, гл. тэрмін "чоканне". Зліццё *ш* і *ж* з *с* і *з* адпаведна называюць "соканнем", а зліццё *с* з *ш* – "шоканнем". Карту цокання ў беларускай, а таксама ў суседніх і пашыраных на адной з ёю тэрыторыі, гл. у Вайнрайха (Weinreich 1952). Гл. таксама Карскага (Карский) і Зорына (Зорин).

змешванне свісцячых з шыпячымі не абмяжоўваюцца толькі *č–c*, што сустракаецца па ўсёй Беларусі, нават на яе паўднёвым захадзе, і магло пашырыцца праз уплыў паўночных гаворак або дзякуючы некаторым апісаным ніжэй асаблівым фактарам.

Цоканне, здаецца, было пашырана болей у прабеларускі, як у пазнейшыя перыяды. Яго, напр., можна знайсці ў полацкіх тэкстах XIII–XIV стст., але яно не сустракаецца ні ў тэкстах XV ст. з тае самае тэрыторыі, ні ў сучасных полацкіх гаворках. Сціранне цокання можа быць вынікам уплыву паўднёвых гаворак, у якіх ніколі не было змешвання свісцячых з шыпячымі (Расторгуев, Stang). Знікненне цокання на поўначы Беларусі яшчэ патрабуе сістэматычнага вывучэння. Аднаўленне апазіцыі свісцячых–шыпячых у гаворках, дзе яны змешваліся, адбывалася, відаць, паасобку ў кожнай марфеме, і яго нельга лічыць фанетычным развіццём.

Прыклады змешвання свісцячых з шыпячымі ў прабеларускіх і старабеларускіх дакументах досыць спарадычныя і, бясспрэчна, абумоўленыя рознымі фактарамі, напр., *доконцан* (1300) часта ўжываецца ў паўночнарускіх юрыдычных тэкстах (= суч. бел. *дакóнчан*); *лишии* (1300; параўн. *лисья* – канец XV ст.; рас. *лúсий*, суч. бел. *лісíны*) можа грунтавацца на архаічнай форме *лишка* (старапольск. *liszka*, славацк., чэшск., с.-луж. *liška*); *в Витебьшче* (1399; але правільна *у Полотъсце* 1405) мае чаргаванне, тыповае для старапольскае мовы (*Polska* || *Polszcze* Д.скл. адз. і г. д.); бел. лац. *znasou* і *az* з "Камедыі" (1787) палачаніна Марашэўскага могуць быць проста вынікам недакладнае перадачы беларускае мовы лацініцаю або стылізацыяй мовы габраяў[1]. Суч. бел. *цýрка* (запазычанае ў гэтай форме ва ўкраінскую мову), якое адпавядае рас. *чýрка* (латыш. *caũrs* і літ. *kiáuras* 'дзірка, адтуліна, шчыліна'), можа ў сапраўднасці адлюстроўваць змешванне свісцячых з шыпячымі; але бел. *збан* (зафіксаванае яшчэ ў тэкстах XVI ст.), *збанóк* (і *жбанóк*) – рас. *жбан* (< **čьbanъ*), якія можна знайсці па ўсёй Беларусі (і асабліва ў кірунку літоўскае мяжы), апроч паўднёва-ўсходняе тэрыторыі (гл. *ДАБМ*, карта 250), найбольш праўдападобна, утварыліся на ўзор польскіх *zban* ~ *dzban*, што ўжываюцца па ўсёй Польшчы, апроч пагранічных з Чэхіяй раёнаў. Зах.-укр. дыял. *збан* (літар. укр. *дзбан*), відаць, таксама зазнала польскі ўплыў, як, магчыма, і формы літоўскага запазычання – *izbõnas*, *uzbõnas*. Непераканаўчым ёсць погляд, што *z* у бел. *збан* абумоўлена прыпадабненнем *ž* да *n* (Воўк-Левановіч 1927).

Распазнаць зліццё свісцячых з шыпячымі, якое мае фанетычны характар, цяжка з прычыны ўзаемадзеяння формаў марфем, змешвання гукаў і праяўлення народнае этымалогіі. Напр., паўдн.-зах. дыял. [ц'ал'áчына],

---

[1] Беларуска-цюркскія тэксты XVII ст. таксама маюць колькі прыкладаў ужывання графемы *č* на месцы спадзяванага *c'* (< *t'*) і *c* (< *c'*) (Zajączkowski, Антонович).

якое адпавядае літар. бел. *цяля́ціна* (рас. *теля́тина*), можа мець *ч* у сувязі з выраўноўваннем паводле мадэлі прыметніка *цяля́чы* (рас. *теля́чий*); бел. *апча́с* побач з *апца́с*, *апса́ц* < польск. *obcas* (ад ням. *Absatz*; параўн. таксама ўкр. дыял. [о́бчас], літар. укр. *о́бцас*) вынікае, магчыма, з мяшання са словам *час*. Гл. таксама дыял. [кало́ʒ'эц], што адпавядае літар. бел. *кало́дзеж* і *кало́дзезь*, якое, мабыць, змянілася пад уплывам мадэлі з беларускім суфіксам *-ец*. Геаграфічнае пашырэнне апошняга слова гл. у *ДАБМ*, карта 241.

У прасторы сутэрытарыяльных і суседніх з беларускаю моваў змешванне свісцячых і шыпячых гукаў уласцівае расійскім дыялектам Пскоўшчыны, польскім гаворкам Мазовіі, дзе яно вядомае як "мазурэнне" (*mazurzenie*), часткова латышскай мове і ідышу. Аднак польскае "мазурэнне" трэба разглядаць асобна, з прычыны яго пазнейшага паходжання (Taszycki, Stieber). Арэал парушэння розніцы паміж свісцячымі і шыпячымі ў ідышы не заўсёды адпавядае славянскім арэалам змешвання свісцячых і шыпячых і хутчэй не мае дачынення да праблемы цакання ў беларускай мове. Найбольш праўдападобна, што ідыш упершыню зазнаў змешвання пры кантактах з сутэрытарыяльнымі польскімі гаворкамі, а пасля XIV ст. факты змешвання ў ідышы былі перанесеныя далей на ўсход, у Беларусь (Weinreich). Толькі пазнейшае скарачэнне арэалу адсутнасці ў ідышы адрознення паміж свісцячымі і шыпячымі можна звязаць з кантактамі ідышу з беларускаю моваю, але гэта не выясняе ранніх працэсаў у беларускай мове, што маюць дачыненне да цакання[1].

У большасці прабеларускіх гаворак, у процілегласць паўночнарасійскім, гук *c͡ʒ* змог захавацца як фанема. Характэрна, што ў прабеларускай мове гук *ʒ́* – звонкі парны для *c͡ʒ* – таксама захаваўся, прынамсі ў пазіцыі пасля *ź*. Пазней, у XV або XVI ст., статус *ʒ́* быў памоцнены дзякуючы яго пашырэнню з марфалагічных прычын на інтэрвакальную пазіцыю, найперш, у дзеяслоўных асновах, замест *ź* – гл. змену 44.

Табл. 18 абагульняе змены ў прабеларускай сістэме зычных гукаў XI ст.

---

[1] Пра аднаўленне *c–č* і *s–š* гл. карту дыялектнага атласа ідышу Віленкіна, перадрук. у Вайнрайха (Weinreich 1969).

Табліца 18. Зрэз 6С. Прабеларуская сістэма зычных у канцы XI ст.

p_1	p'_{16}	t_5	t'_{20}		k_{13}
b_2	b'_{17}	d_6	d'_{21}		g_{14}
		s_7	s'_{15}	$š_{15}$	x_{15}
		z_8	z'_{14}	$ž_{14}$	γ_{14}
			c'_{13}	$č_{13}$	
				$(ǯ)_{14}$	
m_3	m'_{18}	n_9	n'_9		
		l_{10}	l'_{10}		
		r_{11}	r'_{11}		
$w_{4,10}$	w'_{19}			j_{12}	

Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. *Белорусская речь.* СПб, 1918, 36.

П. Расторгуев. "К вопросу о ляшских чертах в белорусской фонетике", *ТПКДРЯ* 1927, 44–48.

Я. Воўк-Левановіч. *Мова выданьняў Францішка Скарыны.* Мн, 1927, 17–18; "Важнейшыя рысы гаворкі вёскі Татаркавічы і гаворак ваколічных вёсак", *Запіскі* 1, 1929, 2, 154; Волк-Леонович. "Еще к вопросу о "ляшских" чертах в белорусской фонетике", *SI* 9, 1930, 3.

Н. Зорин. "Вопрос об этнографическом составе населения Невельского уезда в связи с диалектическими особенностями местного говора, с данными истории местного края и экономическими центрами его тяготения", *Сборник Псковского Общ. Краеведения. Познай свой край* 3, 1927.

Е. Раманаў. "Гаворкі Магілёўскае губэрні", *Запіскі* 1, 1928, 2, 138.

N. Štif. ["Дыялекталагічная экспедыцыя кафедры габрайскае культуры"] (ід.), *YŠ* 19, 1929, 24 {і наст.}.

А. Селищев. "Соканье и шоканье в славянских языках", *SI* 10, 1931. {Перадрук. у} *ИТ.*

M. Vasmer. "Beiträge zur historischen Völkerkunde Osteuropas", *Sitzungsberichte der Preußischen Akademie der Wissenschaften* 18, 1934, 355.

M. Šul'man. ["Славянскі ўплыў на фанетыку ідышу"] (ід.), *AŠ* [*серыя 3*] 2, 1938, 168.

C. Stang. *Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk.* O, 1939, 10, 28 {і наст.}, 93.

W. Taszycki. *Dawność tzw. mazurzenia w języku polskim.* W, 1948. {Перадрук. у} W. Taszycki. *Rozprawy i studia polonistyczne* 2. Kr, 1961.

Wł. Zajączkowski. "Resztki językowe Tatarów litewskich", *Spr* 49, 1948, 8, 399.

U. Weinreich. "*Sábesdiker losn* in Yiddish: A Problem of Linguistic Affinity", *Word* 8, 1952, 363; "The Geographic Makeup of Belorussian Yiddish", *FY* 3, 1969, 92.

PFB 63; *TA* 313.

J. Otrębski. *Gramatyka języka litewskiego* 1. W, 1958, 24, 352–354; "O badaniach nad nazwami wodnymi i miejscowymi na obszarze Litwy", *PrO* 5, 1961, 57; "Die Assibilation im Polnischen und Ostlitauischen", *WSl* 13, 1968.

В. Иванов. "К проблемам исторической фонологии русского языка", *ФН* 1966, 3.

А. Антонович. *Белорусские тексты, писанные арабским письмом.* В, 1968, 262.

Змена 18. Лабіялізацыя (агубленне) *е, ь* > *о*, II і статус палаталізацыі, II (да XI ст. пасля зазубных *š, ž,* (*ʒ́*), *č* і *j*; у XI ст. пасля ўсіх іншых мяккіх зычных, гл. *PoS*, раздзел 28). У большасці гаворак прабеларускае мовы, апроч тых, што ляжаць на поўдзень ад лініі Баранавічы–Слуцк–Гомель, $e_{5,6}$ (*е* незалежна ад паходжання) і $ь_3$ у моцнай пазіцыі агубляліся і змяняліся ў *о* (*ъ*), калі адначасна выконваліся дзве ўмовы: (а) *е, ь* стаялі пад націскам[1] і (б) пасля іх стаяў цвёрды зычны. Гэтую змену часам называюць "ёканнем". Большасць аўтараў называе працэс *е* > *о* "агубленнем" (акрамя Штыбэра, які называе яго "ацвярдзеннем"), але наконт магчымых стадый змены галоснага згоды няма. Калі Героўскі (Gerovský) кажа аб прамежкавай дыфтангізацыі галосных пярэдняга раду сярэдняга ўздыму (*е* > e^{o} > $e\hat{o}$ > $_{\hat{e}}o$ > '*о*), то большасць аўтараў сцвярджае, што лабіялізацыя неагубленых галосных пярэдняга раду сярэдняга ўздыму адбывалася раней за іх змену ў галосныя задняга раду (*е* > *ö* > *о*) (напр., Шахматаў, Карскі, Курашкевіч). Мы згодныя з Героўскім у дапушчэнні, што *е* стаў агубленым пад уплывам наступнага цвёрдага зычнага і развіў агубленую ўстаўку (глайд). Першапачатковы сярэдне-пярэдні складнік зрабіўся нескладовым палаталізацыйным элементам; вось жа змена галоснага не мела ўплыву на мяккасць папярэдняга зычнага: *зялёны* (паўдн.-бел. дыял. [з'ал'о́ны]), *мёд* (паўдн.-бел. дыял. [м'эд] ~ [мэд]).

---

[1] У паўднёвых беларускіх гаворках пазіцыя націску не звязаная з оканнем (як ва ўкраінскай мове), напр., ненаціскны *е* > *о* ў паўдн.-бел. дыял. *чоло́*, параўн. з літар. бел. *чало́*.

У прабеларускай мове агубленне адбывалася пасля ўсіх гукаў, якія маглі стаяць перад *е*; даўнейшы пласт ад часу распаду *ѣ* (гл. змену 12) рэпрэзентаваны пасля зазубных зычных; лабіялізацыя пасля ўсіх іншых мяккіх зычных паказвае, што гэтыя зычныя тым часам змякчыліся перад *е* (гл. змену 16). Агубленне $е_{5,6} > о_{5,6}$ не абмяжоўваецца толькі прабеларускаю моваю; яно таксама сустракаецца на шырокай тэрыторыі, што ахоплівае некаторыя ўсходне- і заходнеславянскія абшары (расійскай, украінскай, польскай, палабскай і, у пэўнай ступені, лужыцкіх моваў), але ўмовы змены і яе храналогія ў названых мовах розныя. У паўднёварасійскіх гаворках умовы, пры якіх адбывалася агубленне, былі, па сутнасці, тыя самыя, што і ў беларускіх гаворках; ва ўкраінскай мове рэпрэзентавалася толькі даўнейшая стадыя, г. зн. *о* можна знайсці толькі пасля зазубных зычных незалежна ад націску. Змена *е* > *о* ва (усходне)украінскіх гаворках пасля іншых мяккіх зычных была вельмі абмежаваная і пазнейшая ў часе (каля XVII ст.): напр., *льо́ду* 'лёду', але *легки́й* 'лёгкі'; *сьо́мий* 'сёмы' (зах.-укр. *ле́ду*, *се́мий*). У беларускай мове гэтую змену цяпер паслядоўна фіксуюць у паўночна-ўсходніх гаворках; у паўднёва-заходніх гаворках, што маюць шматлікія выняткі, іх колькасць узрастае з набліжэннем да ўкраінскае граніцы. На аснове сінхранічнае геаграфіі мы дапушчаем, што гэтая змена пачалася ў паўночна-ўсходніх, полацка-разанскіх, гаворках і пашырылася на паўднёва-заходнія, кіеўска-палескія (карты гл. у Бірылы і ў *ДАБМ*, карты 29–33). На жаль, паступовае пашырэнне *е* > *о* ў паўднёва-заходніх гаворках цяжка прасачыць з прычыны традыцыйнасці правапісных нормаў у тэкстах. Важнай крыніцаю прыкладаў з гэтае тэрыторыі тэарэтычна маглі б быць беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом, але яны паходзяць пераважна з тых паўднёва-заходніх абшараў, якія і дагэтуль захоўваюць неагублены *е*. Прыклады накшталт *змерзлы* (у транслітарацыі Станкевіча) у беларуска-цюркскіх тэкстах XVII ст. даюць гістарычную перспектыву сінхранічным картам, але не дапамагаюць паказаць пашыранасці гэтае змены.

У змешчанай ніжэй табліцы падаюцца прыклады з сучаснае беларускае літаратурнае мовы, калі іншае не пазначана.

Табліца 19. Стадыі агублення *е, ь* > *о*

першая стадыя агублення (гл. змену 12)	прабел. *č'*	*чо́рны*
	ž'	*жо́нка*
	ǯ'	*даждж о́м*
	š'	[шост]
	c'[1]	дарэф. бел. *купцо́м* Д.скл. мн. (у суч. літар. бел. мове агульным правілам стаў канчатак *-ам*)
	j	*ёлка*
другая стадыя агублення	*l'*	*лёгкі*
	n'	*нёс*
	r'	*бяро́за* (і дыял. [б'ар'о́за])
	s'	*сёлы*
	z'	*азёры*
	t'	*цёмны* (< * *тёмны*)
	d'	*дзёгаць* (< * *дёгать*)
	m'	*мёрзлы*
	v'	*цвёрды*
	p'	*спёка*
	b'	*бёдры*

У некаторых выпадках відавочна існавалі ўмовы для агублення, аднак *е* так і не зазнаў гэтае змены. Гэтыя словы дзеляцца на некалькі катэгорый:

1. Словы, якія ўвайшлі ў мову пасля таго, як перастала дзеяць правіла лабіялізацыі: напр., *член*, *не́ба* (але *нябёсы*) з царкоўнаславянскае; *каралёва* з украінскае; *прадме́т* з польскае; *газе́та* з польскае або з расійскае; *вучэ́бны* (запазычанне з расійскае *[...]*).

2. Спрадвечнабеларускія словы, у якіх умовы для агублення *е* з'явіліся толькі пасля таго, як перастала дзеяць правіла лабіялізацыі: напр., *царэ́ўна* < прабел. **-vьn-*, *пе́ршы* < прабел. **pьrvьš-*.

3. Словы з адмоўнай прыстаўкай *не-*: напр., *не́навісць*[2], *не́хаця*.

---

[1] Рэпрэзентаваны толькі ў канчатках і дзеля гэтага няпэўны.

[2] Суч. літар. *нянавісць* (заўв. рэд.).

4. Словы, у якіх націск пазней перамясціўся на *е*: напр., слова *не́сла* спачатку, у час гэтае змены, мела націск на другім складзе (параўн. рас., укр. *несла́*). *ДАБМ*, карта 203, паказвае, што формы з каранёвым націскам (напр., *не́сла*) тыповыя для цэнтральнае зоны, што цягнецца ад Вільні на паўночным захадзе праз Мінск на паўднёвы ўсход (Мазыр і Гомель). У астатняй частцы краіны націск – амаль выключна на канчатку (*нясла́*). Такое геаграфічнае пашырэнне пацвярджае думку, што *не́сла* – досыць позняя форма[1].

5. Колькі слоў, што паходзілі з першапачатковых С*ь*SC-групаў, у паасобных мясцовасцях Беларусі, але найперш у паўднёва-заходніх гаворках, хоць некаторыя карані таксама сустракаюцца цяпер у паўднёва-заходніх гаворках з гукам *о*, напр., *верх* < прабел. *vьrхъ*; *серп* < *sьrpъ*; *чэ́рствы* (побач з *чо́рствы*) < прасл. **čьrstvъ* (гл. апісанне ізаглосаў у Бірылы 322 і наст.); *ме́рзлы* < прасл. **mьrz-* (побач з *мёрзлы*). Асобна стаяць *памёрла*, *запёрла*, *уцёрла*. Гэтыя формы можна вытлумачыць паўторным скарачэннем націску, як у *нёс* || *не́сла*, параўн. рас. *умерла́*, *заперла́* і бел. *памёр*, *запёр*, *уцёр*. Што да іншых формаў, то для некаторых прыкладаў з *е* досыць прывабным здаецца тлумачэнне *ad hoc*; паўдн.-зах. дыял. [чэ́рствы] можна было б вытлумачыць пераходам націску з апошняга склада ў выніку дзеяння правіла лабіялізацыі (параўн. укр. *черстви́й*). Захаванне *е* ў слове *серп* можна вытлумачыць ціскам ускосных склонаў, дзе націск падае на канчатак, напр., *сярпа́* (Р.скл. адз.). Аднак цяжка знайсці прымальнае тлумачэнне кожнаму вынятку з правіла лабіялізацыі. Наадварот, існаванне супольнага кантэксту, г. зн. *е* < *ь* у С*ь*С-групах, змушае нас шукаць адзінага тлумачэння для ўсіх гэтых выключэнняў як групы, а менавіта, што націскны *ь* у групе С*ь*С мог даць іншыя рэфлексы, чым націскныя *е*, *ь* перад цвёрдымі зычнымі ў іншых пазіцыях.

У некаторых марфемах *о* < *е* (нават *е*, што паходзіць з *ѣ*) сустракаецца пры адсутнасці вызначальнага фанетычнага фактару. (1) У назоўнікавай парадыгме *о* пашыраецца з формаў назоўнага склону адзіночнага ліку (ды іншых склонаў) на формы давальнага і меснага склонаў

[1] Пераход націску з'яўляецца марфалагічнай праблемай, бо ён змяняецца ў залежнасці і ад кораня; у некаторых мясцовасцях сустракаюцца абодва ўзоры націску: напр., некаторыя пункты на карце 203 *ДАБМ* маюць *ве́зла*, але *нясла́*, а іншыя маюць *вязла́* поруч з *не́сла*.

адзіночнага ліку, не зважаючы на мяккасць наступнага зычнага ў формах гэтых склонаў: напр., *бярóза – бярóзе*. У дзеяслоўных парадыгмах, наадварот, першапачатковая дыстрыбуцыя захоўваецца: *нясéш*, але *нясём*[1]. (2) *о* з'яўляецца на месцы **ě*$_8$ ў формах назоўнага склону множнага ліку: *гнёзды, вёдры, звёзды* (параўн. ц.-сл. *гнѣздо, вѣдро, звѣзда*). Найбольш праўдападобна, што гэта аналагічнае развіццё на ўзор каранёў слоў, дзе *-а-* ў адзіночным ліку чаргуецца з *-ё-* ў множным, як, напр., у формах *сялó* || *сёлы, вясна́* || *вёсны* (гл. таксама на с. 177). Дыялектныя формы прошлага часу [паб'óг], [пас'óк] утвараюцца на ўзор формаў прошлага часу тыпу *нёс, пёк*. Паўдн.-зах. дыял. [б'ас'óда], [хл'оў] (літар. бел. *бясéда, хлеў* < *бесѣда, хлѣвъ*) – магчыма, гіперкарэктныя формы, што паўсталі, калі *о* < *е* пашырыўся на гэты абшар з поўначы. У дыял. [ц'эрп'óны] (параўн. ц.-сл. *трьпѣти*) можна канстатаваць уплыў польскае мовы, дзе *о* ўжываецца ў пасіўных дзеепрыметніках. (3) Змена фіналі *-é* > *-ó* ў назоўніках ніякага роду адбылася пад уплывам назоўнікаў ніякага роду, што канчаюцца на *-ó*. У выніку палаталізаваныя асновы ніякага роду былі страчаныя як асобны склонавы тып: напр., *жыццё* паводле мадэлі *акно́*. (4) У словах праклітычнага або паўпраклітычнага характару ўстанаўленне *-е* ці *-о* да пэўнай ступені выпадковае (напр., *ужó*, але *яшчэ́*: першапачаткова формы на *-о* і на *-е* мелі ўжывацца ў залежнасці ад таго, з якога – мяккага або цвёрдага – зычнага пачыналася наступнае слова). (5) У бел. *ёсць* (< прасл. **estь*) *о* фанетычна неапраўданае. Пашырэнне формаў [јос'(ц')] і [јэс'(ц')] падае *ДАБМ*, карта 163.

Агубленне *е* абумовіла павелічэнне колькасці пазіцыяў, у якіх магло адбывацца змякчэнне. Спачатку апазіцыя паводле цвёрдасці–мяккасці пашырылася на пазіцыю перад заднімі агубленымі галоснымі: *нос* (< *носъ*) – *нёс* (< *неслъ*). Цяжка лічыць супадзеннем тое, што славянскія мовы, у якіх *е* зрабілася агубленым, мелі таксама добра развітую апазіцыю паводле цвёрдасці–мяккасці. Агубленне *е* не давяло да сур'ёзнага разладу ў сістэме галосных. Па сутнасці, да таго, як у канцы XII – пачатку XIII ст. адбылося ацвярдзенне зазубных, *о* < *е* можна было адрозніць ад *о* < *о*, *ъ*, бо перад першым з гэтых *о* стаяў мяккі зычны. Частотнасць націскнога *е* скарацілася, бо ў сярэдзіне слова ён мог захавацца толькі ў пазіцыі перад мяккім зычным. У вы-

[1] Розным гаворкам уласцівая свая марфалагічная уніфікацыя.

ніку агублення *е* ўтварыліся новыя морфафанемныя чаргаванні. Націскны *о́* стаў чаргавацца з націскным *е́* перад мяккім зычным і з ненаціскным *а*: напр., *чо́рны* || *чэрнь* || *чарне́ць* (пасля пазнейшага ацвярдзення *č'* у прабеларускай мове); *се́стры* || *сястра́*.

Тэксты вельмі няпоўна адлюстроўваюць працэс агублення, бо пісары пісалі *е* на месцы [о] яшчэ доўга пасля таго, як адбылася гэтая змена. Гэтую досыць спарадычную графічную перадачу [о] традыцыйна тлумачаць тым, што ў кірыліцы не было простых сродкаў адначасна паказаць змякчэнне папярэдняга зычнага і агубленне галоснага гуку. Толькі з канца XVI – пачатку XVII ст. пачынаюць сустракацца, магчыма, пад уплывам польскае арфаграфіі, дыграфы *ио* або *ьо*, напр., *тиотка* (1589), і толькі з канца XVIII ст. з'яўляецца ва ўжытку літара *ё*, што паходзіць з расійскае мовы[1]. Адлюстраванне на пісьме *о* < *е* (*ь*) здаралася ў тэкстах найперш у пазіцыі пасля зазубных зычных, бо ў гэтым выпадку змякчэння не трэба было паказваць наступным галосным сімвалам, таму як названыя зычныя не мелі апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці. Прыклады *о* < *е* пасля зазубных зычных можна знайсці ў прабеларускіх тэкстах XIII ст., першыя прыклады агублення пасля незазубных зычных датуюць XIV–XV стст.

пасля зазубнога	у іншых пазіцыях
вышолъ (XV ст.)	*ковор* 'дыван' (параўн. рас. *ковёр*)
жоны (1536)	*Могиловского* (пачатак XVI ст.) – суч. бел. *Магілёўскага*, дарэф. бел. *Магілёўскага*
на Лучосѣ (1597)	*меноным* 'званым' < польск. *mieniony* (пачатак XVI ст.; але *мененыхъ* 1599)
бел. цюрк. *čūmu* 'чаму' (XVII ст.)	бел. лац. *Mohylowskiego* (XVI ст.)[2]
	бел. цюрк. *dūhūt* 'дзёгаць' (XVII ст.)
	бел. цюрк. *priūl* 'прывёў' (XVII ст.)

[1] У беларуска-цюркскіх дакументах XIX ст. часам перад [о] на месцы кірылічнага *ё* пісалі *у*, каб паказаць мяккасць папярэдняга зычнага: напр., *ʾānyawl* 'анёл', *nabyawṣā* 'нябёсы'.

[2] У творах Гэрбэрштайна знаходзім напісанне *Mogilew* (1549).

Калі *r'* зацвярдзеў, пісары маглі свабодна пісаць *о*: *Орол* (1577) < **Orelъ*; *впередъ* (1601; суч. бел. *упе́рад*, параўн. з іншым націскам рас. *вперёд*).

Храналогію агублення *е* можна вызначыць адносна некаторых іншых працэсаў, што адбываліся ў прабеларускіх гаворках. Згодна з традыцыйным поглядам, працэс *е* > *о* адбываўся пасля страты рэдукаваных (гл. змену 21). Аднак выключэнні з правіла лабіялізацыі, паказаныя вышэй пад пунктам 5, наводзяць на думку, што ў часе другой стадыі агублення *ь* і *е* маглі даць розныя рэфлексы; калі гэта так, можна вывесці, што рэдукаваныя ў моцнай пазіцыі яшчэ не зліліся з *е* і *о*.

На першай стадыі лабіялізацыі – *е* (*ѣ*) і *ь* > *о* пасля зазубных зычных – было, відаць, няважна, калі галосны стаяў перад *r*. Гэтая стадыя закранула ўсю ўсходнеславянскую тэрыторыю і, калі меркаваць з пісьмовых дакументаў, магла пачацца на поўдні, г. зн. у праўкраінскай мове: напр., *ь* > *о*: бел. *сцяжо́к* < **stežьkъ*; *е* > *о*: бел. *шо́лудзі*, рас. *ше́луди*, укр. *шо́луді* < **šel-*; *ьr* > *or*: бел. *чо́рны*, рас. *чёрный*, укр. *чо́рний* < **čьr-*. Другая стадыя, калі *е*, *ь* пасля іншых, новапалаталізаваных зычных таксама зліваліся з *о*, была агульная для прабеларускіх і прарасійскіх дыялектаў, але не датычыла ўкраінскіх. Карты *ДАБМ* паказваюць паўночна-ўсходнюю Беларусь цэнтрам пашырэння другое стадыі ў прабеларускай мове: напр., бел. *нёс* < **neslъ*; бел. *спёка* < **sъpek-* і г. д. Мяркуючы з фактаў сучаснае беларускае мовы, агубленне не абмежаванае месцам утварэння наступнага зычнага гуку. Калі, аднак, першапачаткова былі такія абмежаванні на пэўнае акружэнне зычных гукаў – напр., толькі перад цвёрдымі зубнымі – гэта не можа не ўлічвацца.

Нядзіўна, што другая стадыя агублення таксама закранула спалучэнне *ьr* перад цвёрдымі зубнымі, напр., *цвёрды*, *дзёран*, *мёрзлы*, *чацвёрты*, але існаванне шматлікіх дублетаў (напр., дарэф. бел. *чацьвёрты*, паўдн.-зах. дыял. *мёрзлы* і г. д.), асабліва ў паўднёва-заходніх і цэнтральных гаворках, можа сведчыць пра яшчэ пазнейшую храналогію агублення групы *ьr* – напр., к трэцяй стадыі лабіялізацыі. У кожным разе, калі *е* > *о* перад цвёрдымі зычнымі (прыклады гл. вышэй), *ьr* > *or* магчымы толькі перад цвёрдымі зубнымі і блакуецца перад заднепаднябеннымі і губнымі, напр., *верх*, *серп*, *чацвёр* < *-rh* (параўн. *чацвярга́*). Дапушчэнне, што храналогіі *er* > *or* і *ьr* > *or* могуць не су-

падаць, пацвярджаюць і карты 30–31 *ДАБМ*, якія паказваюць, што рэфлекс *о*С < *е*С (дзе С – любы цвёрды зубны зычны, напр., *мёд* < **medъ*) пашырыўся з паўночна-ўсходніх гаворак у паўднёва-заходнія далей, як *от*С < *ьт*С (напр., *бёрда* < **bьrda*). Калі наша тлумачэнне слушнае, тады лабіялізацыя *е* > *о* не толькі не ішла за стратаю рэдукаваных, як традыцыйна сцвярджаюць, але і не адбывалася адначасна са стратаю рэдукаваных, як сцвярджаў Ісачэнка ды іншыя, а магла ў сапраўднасці адбыцца перад стратаю рэдукаваных. Адносную храналогію страты рэдукаваных і лабіялізацыі *е*, *ь* можна, папярэдне, перафармуляваць наступным чынам:



	Тлумачэнне стадый
стадыя I:	*е*, *ь* пасля шыпячых > *о*
стадыя II:	*е*, *ь* пасля іншых мяккіх зычных > *о*
стадыя III:	зліццё рэдукаваных у моцнай пазіцыі з *е*, *о*; *ьр́* > *ór* перад цвёрдымі зубнымі зычнымі, *ьр* > *ер* у іншых выпадках

У адваротным выпадку пераход *ьр* > *ор* перад цвёрдымі зубнымі зычнымі мог мець месца на стадыі II, тады страту рэдукаваных можна таксама адсунуць на яшчэ даўнейшы час і яна храналагічна супадзе з дзеяннем правіла лабіялізацыі. Прапанову некаторых аўтараў (Горшкова, Мельничук), што змену *е* > *о* належыць датаваць XIV–XV стст., трэба адкінуць, бо яна не бярэ пад увагу важных фактаў з паўднёва-заходніх і цэнтральных гаворак, а таксама існавання дзвюх (калі не трох) хваляў лабіялізацыі: першай – пасля зазубных і *с* (зафіксаванай у ранніх тэкстах), а пазней – пасля іншых мяккіх гукаў. Мы б не выключалі магчымасці, што *ь́* > *ъ́* са змякчэннем папярэдняга зычнага захоўваўся да зліцця з *о* (гл. змены 9, 21).

Колькі іншых зменаў, найперш у сістэме зычных гукаў, могуць быць датаваныя перыядам пасля агублення *е*. Напр., агублення не адбылося ў большасці гаворак беларускае мовы перад зазубнымі зычнымі і *р'*, бо ў час гэтае змены названыя гукі яшчэ заставаліся мяккія (гл. змены 33, 34); у гаворках не адбылося лабіялізацыі і перад *с'*$_{13}$. Возьмем пад увагу, напр., словы *це́шча* (але ўсх.-бел. дыял. [ц'о́шча]), *адзе́жа* (але віцебскае, магілёўскае і ўсходнягомельскае [аʒ'о́жа]), *ацёц* < *otьcъ*, *дзе́рава*, *цяпе́р*, *пе́рад*. Аднак у некаторых гаворках (тых, дзе

фіксуецца [аʒ'óжа] і г. д.) зазубныя зычныя відавочна зацвярдзелі ў час, калі адбывалася агубленне *е*. Адносіны паміж развіццём у паўднёвабеларускіх гаворках дыфтонгаў у націскных складах, што зрабіліся закрытыя пасля страты рэдукаваных, і агубленнем *е* няясныя; і старое *о*, і *о* < *е* ў такіх складах далі дыфтонг *ͫо* (гл. змену 19)[1]. Гэта неабавязкова знак, што развіццё дыфтонгаў папярэднічала лабіялізацыі, але пакуль што мы змяшчаем развіццё дыфтонгаў у гаворках пасля першае стадыі агублення, хоць яно магло адбыцца і раней. Зліццё $ě_8$ з $e_{5,6}$ магло адбыцца і перад, і пасля страты рэдукаваных. Адно, пра што можна казаць з пэўнасцю: зліццё $ě_8$ з $e_{5,6}$ мела адбыцца пасля агублення *е*, бо $ě_8$ не даў *о* (апроч рэдкіх выпадкаў, якія не былі фанетычна апраўданыя), напр., прасл. **lěto* > бел. *лéта*, а не *+*лёта*. Храналогію гэтых дзвюх стадый агублення ў адносінах да іншых вышэйпамянёных прабеларускіх зменаў можна абагульніць наступным спосабам:

1) развіццё *е* і новага *о* < *ѣа* (змена 12) = першая стадыя агублення галосных пярэдняга раду сярэдняга ўздыму, у т. л. *ь*, пасля зазубных зычных;
2) развіццё дыфтонгаў (змена 19);
3) другая стадыя агублення галосных пярэдняга раду сярэдняга ўздыму *е*, *ь* пасля іншых мяккіх зычных;
4) зліццё *ě* з *ѣа* (змена 20) – або ідзе следам за пунктам 5;
5) страта рэдукаваных (змена 21); *ьр́* > *ór* (трэцяя стадыя лабіялізацыі); гэтыя працэсы маглі таксама адбывацца адначасна з другою стадыяй агублення – параўн. пункт 3;
6) ацвярдзенне губных зычных (змена 29);
7) ацвярдзенне r'_{11} і $r̄'_{32}$ у большасці гаворак (змена 33);
8) ацвярдзенне s'_{15}, $s̄'_{33}$, z'_{14}, $z̄'_{34}$, ($ʒ'_{14}$, $ʒ̄'_{34}$), c'_{13}, $c̄'_{35}$, $ć'_{13}$, $ć̄'_{29}$ ва ўсіх гаворках (змены 34, 36, 38);
9) ацвярдзенне l'_{10} у паўднёвых і цэнтральных беларускіх гаворках (змена 48).

---

[1] Абапіраючыся на довад, што агубленне *е* папярэднічала развіццю старабеларускіх дыфтонгаў, можна змясціць першую змену сама пазней у канец XI ст. Аднак можна таксама дапусціць, што другая стадыя агублення *е* адбылася папраўдзе пазней, напр., пасля XII ст., калі мы прымем, што *е* перад складам з *ёрам* у слабой пазіцыі спачатку даў *ͫе*, які пазней перайшоў у *ͫо* ў пачатку агульнае лабіялізацыі *е*. Яшчэ ніводзін тэкст не даў ніякіх сведчанняў пра "новы *ě*" ў гэтай пазіцыі.

Выбраная бібліяграфія

Л. Цьвяткоў. "Некаторыя рысы іншаславянскай фонэтыкі ў беларускім лексычным матар'яле", *Запіскі* 1, 1928, 79–80.

L. Ossowski. "Białoruskie gwarowe formy 1. pl. typu *id'óm, b'udam*", *LS* 2, 1931.

Я. Станкевіч. "Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг., «Аль Кітаб»", *Калосьсе* 1939, 1, 45.

C. Stang. "Weißrussisch *ёсць*", *Vasmer Festschrift.* B, 1956.

А. Бірала, М. Булахаў, М. Жыдовіч {ды інш.}, рэд. *Нарысы па гісторыі беларускай мовы.* Мн, 1957, 55 {і наст.}.

М. Бірыла. "Рэфлексы агульнаславянскіх *о, ъ, ѣ, е, ь* у беларускіх гаворках", *Працы* 6, 1959.

G. Gerovský. "Zur Herkunft der Konsonantenerweichung vor *e*- und *i*-Lauten im Russischen". *WSJb* 7, 1959.

Л. Калнынь. "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959, 85.

Р. Юргелевіч. *Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі.* Мн, 1961, 53.

М. Соколова. *Очерки по исторической грамматике русского языка.* М, 1962, 62.

К. Горшкова. "Соотношение вокализма и консонантизма в истории древнерусского языка", *СФ* 5, 1963.

Wł. Kuraszkiewicz. *Zarys dialektologii wschodniosłowiańskiej z wyborem tekstów gwarowych.* W, 1963, 18–19.

J. Pauls. "Change of *e* > '*o* in the Dialect of Northwest Polissye, BSSR", *Actes du Xème Congrès International des Linguistes* 2. Bu, 1967.

A. Isačenko. "East Slavic Morphophonemics and the Treatment of the Jers in Russian: A Revision of Havlík's Law", *IJSLP* 13, 1970.

Гл. таксама бібліяграфію да змены 12.

Змена 19. Утварэнне ў дыялектах дыфтонгаў у новазакрытых складах (XII–XIII стст. [?]). У некаторых паўднёвабеларускіх гаворках (гл. *ДАБМ*, карты 34–35 і каментары да картаў 8, 14, 30) існавала тэндэнцыя дыфтангізацыі ("поліфтангізацыі") націскных *о* і *е* ў канцавых або сярэдніх новых закрытых складах, што, відаць, было вынікам страты слабых рэдукаваных у наступным складзе. Наагул, у новых закрытых складах з першапачатковымі *е* і *о* знаходзім дыфтонгі *i͡e* (з *е*, пасля якіх першапачаткова ішоў склад са слабым *ь*) і *u͡o* (з *о* і з *е*, пасля якога першапачаткова ішоў склад са слабым *ъ*), але фанетычнае

выяўленне абодвух тыпаў дыфтонгаў залежыць ад дыялекту. Сёння вымаўленне дыфтонгаў у нейкай ступені неабавязковае, яны могуць суіснаваць у той самай мясцовасці з манафтонгамі (*ЛП*) і развівацца з *о* рознага паходжання, напр., < *о*, *ъ*, *е* і *ь*, хоць першапачаткова развіваліся толькі з *о* < *ѡа*, *ѣа*. Дыфтонгі могуць з'яўляцца і пасля мяккіх, і пасля цвёрдых зычных (гл. змену 16): напр., паўдн.-зах. дыял. [нуо̯ч] 'ноч' з *ио* < *о* < *ѡа*; паўдн.-зах. дыял. [м'уо̯д] 'мёд' з *ио* < *ѣа*.

Дыфтонгі ў новазакрытых складах таксама развіліся, відаць, у сувязі са стратаю рэдукаваных у паўночнаўкраінскіх гаворках, і дзеля гэтага іх можна лічыць кіеўска-палескаю рысаю. Утварэнне дыфтонгаў у кіеўска-палескай дыялектнай зоне і адсутнасць іх у полацка-разанскай зоне часта звязваюць з розніцаю ў колькаснай характарыстыцы галосных гукаў. Згодна з гэтым поглядам, дыфтонгі развіліся ў кіеўска-палескай зоне, бо калі ў гэтых гаворках былі страчаныя рэдукаваныя, там яшчэ захоўвалася розніца паміж галоснымі гукамі паводле даўжыні. У полацка-разанскай зоне, якая сталася асновою паўночнабеларускіх гаворак, розніца ў даўжыні галосных ужо была страчаная да падзення рэдукаваных. Іначай кажучы, у паўднёвабеларускіх (і паўночнаўкраінскіх) гаворках страта рэдукаваных мела адбыцца раней за страту розніцы ў даўжыні галосных гукаў, а ў паўночнабеларускіх (і паўднёварасійскіх) гаворках, наадварот, страта розніцы ў даўжыні галосных гукаў папярэднічала страце рэдукаваных.

Аднак паралельна з традыцыйным поглядам, паводле якога пачаткам развіцця дыфтонгаў было падаўжэнне *о* і *е*, што адбылося, каб кампенсаваць страту слабых рэдукаваных у наступным складзе, ёсць і процілеглае дапушчэнне, што ў кіеўска-палескай зоне *о* і *е* часткова прыпадобніліся да *ŭ* (> *ъ*) і *ĭ* (> *ь*) наступных складоў. Калі ўсё так, дык гэтая змена мусіла пачацца да рэдукцыі слабых *ераў* або нават да развіцця *ераў* (Курило ды інш.). Немагчыма дакладна вызначыць час развіцця дыфтонгаў як канчатковага выніку тых асіміляцыйных зменаў, бо выявіць іх у тэкстах цяжка. Мы ўмоўна змяшчаем развіццё (або пачатак развіцця) дыфтонгаў перад стратаю рэдукаваных.

У паўночнай частцы кіеўска-палескіх дыялектаў – напр., у цяперашніх паўднёва-заходніх беларускіх гаворках – націскны $\check{e}_8$, як і e_5, у новых закрытых складах, за якімі першапачаткова ішоў *ь*, даў дыфтонг *іе̯* (шырэй

пра гэта гл. змену 20), гэтая з'ява была таксама ўласцівая дыялектам, з якіх развіліся паўночнаўкраінскія гаворкі.

Сёння, як адзначана вышэй, у некаторых паўднёва-заходніх беларускіх гаворках дзе-нідзе знаходзім развіццё складанага вымаўлення *о* не толькі ў новых закрытых складах, што ўтварыліся ў выніку страты рэдукаваных. Гэта асабліва характэрна для адкрытых складоў пасля губных зычных і можа тлумачыцца як тэндэнцыя да агублення галосных пасля губных зычных гукаў – адметная рыса паўднёва-заходніх гаворак беларускае мовы (гл. змены 45, 47). Гл. дадатковыя пацвярджэнні гэтае тэндэнцыі ў паўднёва-заходніх гаворках у зменах *у*> *u* і *aw*> *ow*, апісаных адпаведна як змены 29 і 49. Праўдападобна, што з пазіцыі ў новых закрытых складах і пасля губных зычных складанае вымаўленне *о* пашырылася і на іншыя пазіцыі, дзе яго прысутнасць была фанетычна неапраўданая. Паколькі гэтая з'ява, відавочна, не мела месца ў суседніх паўночнаўкраінскіх гаворках, яе трэба датаваць часам пасля распаду кіеўска-палескага дыялектнага адзінства, гэта значыць, пасля XV ст. (гл. змену 50).

Выбраная бібліяграфія

J. Rozwadowski. "Uwagi o dyftongach *ie*, *uo* u południowozachodnim narzeczu białoruskiem", *Materjały i prace Komisji językowej Akad. Umiejętn. w Krakowie* 1, 1904.

В. Ганцов. "Характеристика поліських дифтонгів і шляхи їх фонетичного розвитку", *ЗІФВ* 2–3, 1923.

О. Курило. "До характеристики і процесу монофтонгізації чернігівських дифтонгічних звуків", *Україна* 1925, 5; Kyrylo. "Les voyelles *o* et *e* en ukrainien et leur transformation dans les syllabes fermées nouvelles", *RÉS* 12, 1932.

M. Dolobko. "Der sekundäre *v*-Vorschlag im Russischen", *ZSPh* 3, 1926.

С. Смаль-Стоцький. "Поліські мішані говори і поліські дифтонги", *Sl* 6, 1927.

А. Томсон. "О дифтонгизации *е*, *о* в украинском языке", *СбОРЯС* 101, 1928.

H. Koneczna. "Wzdłużenie zastępcze", II międzynarodowy zjazd slawistów, *Księga referatów* 2. W, 1934.

N. van Wijk. "Les voyelles *uo*, *ie* en letto-lituanien et en russe", *SB* 4, 1934–1935, 147–148.

L. Ossowski. "O zastępstwie prasłow. grup *tort* i *tert*, *tolt* i *telt* w językach ruskich (Pełnogłos). (Streszczenie)", *Sprawozdania z posiedzeń Tow. nauk. Warszawskiego*, wydz. 1, 31, 1938, 1–3.

І. Яшкін. "Вакалізм паўночна-ўсходняй групы гаворак Слаўгарадчыны. Націскныя галосныя фанемы", *Весці* 1967, 1.

Ф. Филин. "К истории исконных *о* и *е* в новых закрытых слогах", *Ученые записки Московского государственного педагогического института им. Ленина* 341, 1969.

Змена 20. Развіццё *ě* (XII ст.). У прабеларускіх гаворках $\check{e}_8$ ($_{e}\bar{a}_8$) утварылася з праславянскіх $\bar{e}$ і $_{o}ai$. З фанетычнага погляду прабеларускі $\check{e}_8$ быў, праўдападобна, дыфтонгам, калі меркаваць з усходнеславянскіх запазычанняў, зафіксаваных у балцкіх мовах: напр., літ. *griẽkas* < бел. *грэх* (< *grěxъ*), літ. *susiẽdas* < бел. *сусе́д* (< прасл. **sǫsěd-*)[1]. У большасці прабеларускіх гаворак $\check{e}_8$ зазнаў артыкуляцыйную змену, вынікам якой звычайна было яго зліццё з ужо існымі элементамі сістэмы. Няўстойлівасць *ě* вынікала з таго, што ён быў адзіным дыфтонгам у сістэме ў час пасля зменаў $_{o}\bar{a}$ ў *о* ды *а* і $_{e}\bar{a}$ ў *е* і *о*. У кіеўска-палескай і полацка-разанскай дыялектных зонах дэталі гэтага зліцця трохі розніліся. У полацка-разанскіх гаворках $\check{e}_8$ зліўся з рэфлексамі $_{e}a$, што было абумоўлена пазіцыяй націску. У кіеўска-палескай групе гаворак ненаціскны $\check{e}_8$ зліўся з рэфлексамі $_{e}a$, а націскны $\check{e}_8$ збольшага захаваў свой складаны характар; рэфлекс [i̯e] дагэтуль можна знайсці ў сучасных паўднёва-заходніх гаворках пад націскам. Рэфлекс *е* пад націскам (ён можа змякчаць папярэдні зычны, а можа і не змякчаць яго) пашырыўся на тыя абшары досыць нядаўна, мабыць, у XVIII–XIX стст., і працягвае выціскаць дыфтонг; толькі ў некаторых гаворках уздоўж мяжы з украінскай моваю $\check{e}_8$ даў *і*[2].

Варта адзначыць, што зоны зліцця ў прабеларускай мове $\check{e}_8$ з *е* падобныя сваімі абрысамі да тэрыторыі, на якой адбылося зліццё φ_{10}. Там, дзе φ_{10} зусім зліўся з *'а*, а гэта ў паўночна-ўсходніх гаворках, $\check{e}_8$ і e_5 супалі ва ўсіх пазіцыях; там, дзе ненаціскны φ_{10} зліўся з e_5, як у большасці паўднёва-заходніх гаворак, толькі ненаціскны $\check{e}_8$ таксама зліўся з e_5. Развіццё $\check{e}_8$ таксама, відаць, можна звязаць з развіццём дыфтонгаў у новазакрытых складах, абумоўленым стратаю рэдукаваных. У полацка-разанскай зоне, якая ніколі не зазнала гэтае з'явы, націскны $\check{e}_8$ ў даўнія часы зліўся з *е*. У кіеўска-палескай зоне існаванне дыфтонгаў, магчыма, паспрыяла захаванню $\check{e}_8$ як i̯e пад націскам.

---

[1] На с. 182 гл. іншую форму **sǫsěd-* у літоўскай мове.

[2] Пашыранасць рэфлексаў $\check{e}_8$ даецца ў *ДАБМ*, карта 34.

Табліца 20 паказвае рэфлексы $ě_8$ ў дзвюх прабеларускіх дыялектных групах адносна рэфлексаў e_5 і $ę_{10}$. Прыклады ўзятыя з літаратурнае беларускае мовы, апрача дыялектных формаў, што падаюцца ў дужках. Калі змены ў кіеўска-палескіх гаворках такія самыя, як і ў полацка-разанскай зоне, яны ілюструюцца адным прыкладам, які падаецца ў слупку полацка-разанскіх гаворак. Мы не стараліся паказаць усіх крыніц развіцця *о* ці *е*, вось жа пры ілюстраванні агублення *е* > *о* прыклады даюцца адно для пазіцыі перад рэдукаваным. Як паказана ў змене 18, агубленне *е* (< *е*, *ь*) развілося ў паўночна-ўсходніх гаворках, а тады пашырылася на поўдзень; адсюль большая колькасць выпадкаў у паўднёвых гаворках (г. зн. у кіеўска-палескай зоне), калі *е* захоўваецца перад цвёрдым зычным. У табл. 20 гэтыя дэталі не бяруцца пад увагу. Літары (а), (б) і (в) тлумачацца ніжэй, пад табліцаю.

полацка-разанская зона (паўночна-ўсходні дыялект беларускае мовы)	кіеўска-палеская зона (паўднёва-заходні дыялект беларускае мовы)

націскныя галосныя





Прыклады

1.	* $m_o ar_e a$ > *мо́ра*	1.	* $m_o ar_e a$ > *мо́ра*
		1а.	* $b_e arz_e ā$ > [б'эро́за]
		1б.	* $n_o ači$ > [ну͡о́ч]
1а.	* $l_e adu$ > *лёд*	1в.	* $l_e adu$ > [л'у͡о́д]
		2.	* $l_e ab_e adi$ > *ле́бедзь*
2.	* $s_e ami$ > *сем*	3.	* $s_e ami$ > [с'і͡э́м]
2а.	* $s_e ān_o a$ > *се́на*	3а.	* $s_e ān_o a$ > [с'і͡э́на]
3.	* *pęti* > *пяць*	4.	* *pęti* > *пяць*

ненаціскныя галосныя



Прыклады

1. **m*$_o$a*r*$_o$ā > *марá*
1а. **s*$_e$a*str*$_o$ā > *сястрá*
1б. **v*$_e$ānuku > *вянóк*
1в. **svętyji* > *святы́*
2. **m*$_o$ās*l*$_o$a > паўдн.-бел. [мáсло]
3. **p*$_o$a*męti* > паўдн.-бел. [пáм'эц']

Табліца 20. Паглынанне *ě*$_8$ ў прабеларускіх гаворках

(а) гл. змену 18
(б) гл. змену 7
(в) гл. змену 15

Страту *ě*$_8$ як фанемы ў прабеларускіх гаворках адлюстроўвае частае змешванне графем *ѣ* і *е* ў найдаўнейшых прабеларускіх тэкстах XIII ст. Гістарычны *ѣ* замянялі на *е*: напр., *хотелъ* (1300; суч. бел. *хацéў* ад **xotělъ*); гістарычны *е* замянялі на *ѣ*: напр., *рѣмѣнь* (1330; суч. бел. *рэмень* ад **remy*, *remene*). Графема *ѣ*, якая абазначала спрадвечны *ě*$_8$, праіснавала шмат даўжэй за сам галосны гук. Літара захавалася аж да XVII ст. (хоць у некаторых тэкстах XIV–XV стст. *ѣ* няма зусім) і нават ізноў, разам з адраджэннем беларускае літаратурнае мовы, ужывалася ад канца XIX ст. і да 1903 г.

Пісары, што пісалі беларуска-цюркскія тэксты XVII і пазнейшых стагоддзяў, перадаюць прабеларускія *e*$_{5, 6}$, *ě*$_8$ і *ę*$_{10}$ адной графемай *а*: *wwačur* (XVII ст.) < *večerъ*; *raḍāc* (XVIII ст.) < *rězati*; *pāmati* (XVII ст.) < *pamęti* (суч. бел. *пáмяці*).

Усходнеславянскія запазычанні ў балцкіх мовах паказваюць, што ў час ранніх кантактаў славянаў з балтамі *ě*$_8$ яшчэ не зліўся з *е*. Напр., латыш. *ē* [æ] адпавядае прабеларускаму *ě*$_8$, а латыш. *е* – прабеларускаму *e*$_5$. Прыкладам, *ě*$_8$: латыш. *grēks* < бел. *грэх* < **grěxъ*; *e*$_5$: латыш.

četri < бел. *чатыры* < **č̣atyr̥a* ~ **č̣atyri*. Гл. таксама пададзеныя на с. 161 прыклады з літоўскае мовы.

Храналогію зліцця *ě*₈ відаць з тэкстаў, якія не павінны быць пазнейшыя за другую палову XIII ст.; з іншага боку, гэта не магло адбыцца шмат раней, бо *ě* не браў удзелу ў змене *е* > *о*, якая мела месца каля XI ст.

Простым вынікам зліцця *ě* і *е* было павелічэнне частасці ўжывання *е*, што, у нейкім сэнсе, часткова кампенсавала памяншэнне частасці ўжывання *е* ў сувязі з папярэдняю лабіялізацыяй *е* > *о* (гл. змену 18). Можа нават быць, што адной з перадумоваў змены *ě* > *е* была лабіялізацыя *е* > *о*. У сапраўднасці тыя гаворкі, у якіх мела месца лабіялізацыя *е* > *о*, таксама зазналі зліццё *ě* > *е* ва ўсіх пазіцыях, але не так было ў іншых гаворках. Схематычна парадак гэтых дзвюх зменаў на дыяграме галосных гукаў мог бы выглядаць вось так:



У выніку гэтага зліцця *е* мог цяпер існуй з'явіцца перад цвёрдым зычным у пазіцыі, што шмат у якіх гаворках стала немагчымая дзеля агублення *е* > *о*.

З морфафанемнага боку вынікам супадзення *ě* і *е* была страта праславянскага чаргавання *е* || *ě*, напр., у трывальных парах тыпу *заме́сці* || *замята́ць* (гэтае чаргаванне дагэтуль захавалася, напр., ва ўкраінскай мове: *замести́* || *замі́та́ти*).

Змена *ě* > *і* перад націскным *і*, якая сустракаецца ў расійскай і ўкраінскай мовах (напр., рас. *сиди́шь*, *мизи́нец*), чужая беларускай мове з яе *сядзі́ш* і *ме́зенцам*. Чаргаванне *е* || *і* ў словах *дзіця́* || *дзе́ці* ідзе, мабыць, ад індаеўрапейскага чаргавання *ei* (звычайна ў дзеясловах) || *oi* (звычайна ў назоўніках).

У сучаснай беларускай літаратурнай мове ў канчатках роднага склону адзіночнага ліку, назоўнага і вінавальнага склонаў множнага ліку ў *ja*-асновах і вінавальнага склону множнага ліку ў *jo*-асновах на месцы *ě* выступае *і*: напр., *зямля́* – *зямлі́* – *зе́млі*; *конь* – *ко́ні*. Гэта марфалагічная з'ява. Пад ціскам адпаведна *а*- і *о*-асноў (якія ў гэтых формах маюць *-ы*) замест *ě* ўводзіўся *-і*, што з'яўляецца алафонам *ы*.

Табл. 21 паказвае сістэму галосных гукаў прабеларускае мовы пасля страты фанемы *ě*.

Табліца 21. Зрэз 7V. Сістэма галосных прабеларускае мовы ў канцы XII ст., пасля паглынання $\check{e}_8$

Полацка-разанскія гаворкі

націскныя: $i_{4,\,7}$ y_1 $u_{2,\,11}$

$ь_3$ $ъ_{3,\,4}$

$\boxed{e_8}_{5,\,6}$ $o_{3,\,5,\,6}$

$a_{6,\,9,\,10}$

ненаціскныя: $i\,(y)_{1,\,4,\,7}$ $u_{2,\,11}$

$ь_3$ $ъ_{3,\,4}$

$\boxed{a_8}_{5,\,6,\,9,\,10}$

Кіеўска-палескія гаворкі (якім яшчэ было невядомае аканне, што пашырылася на поўдзень з полацка-разанскае зоны)

націскныя: $i_{4,\,7}$ y_1 $u_{2,\,11}$

$ь_3$ $ъ_{3,\,4}$

$e_{5,\,6}$ $o_{3,\,5,\,6}$

$a_{9,\,10}$

$\boxed{\widehat{ie_8}}_{5,\,6}$ $\widehat{uo}_{5,\,6}$

ненаціскныя: $i\,(y)_{1,\,4,\,7}$ $u_{2,\,11}$

$ь_3$ $ъ_{3,\,4}$

$e_{5,\,6,\,10}$ $o_{5,\,6}$

$\boxed{a_8}_{9}$

Дадатковая заўвага пра нумарацыю сегментаў.

Трэба памятаць, што наша нумарацыя не адлюстроўвае беспасярэдне рознанакіраваных і/або цыклічных зменаў, якія маглі адбывацца ў сістэме галосных гукаў. Возьмем, напр., выпадкі агублення $e > o$. У змене 12 ёсць некалькі прыкладаў, калі e_5 (*ѣ*) змяніўся ў o_5. Значыць, у большасці гаворак націскны *é* (< *e*, *ь*) у пазіцыі перад цвёрдымі зычнымі быў агублены да *o*: такім парадкам, *é* любога паходжання, у т. л. e_3 (г. зн. $e_{3,\,5,\,6}$) > $o_{3,\,5,\,6}$ (гл. змену 18). Ёсць некалькі выпадкаў, калі o_3 развіўся проста з $ь_3$ (магчыма, праз *ъ*) або кружным шляхам праз e_3, г. зн. $ь_3 > e_3 > o_3$ (пры ўмове змены 18). Усе гэтыя стадыі можна было б пазначыць у табліцах дадатковымі ніжнімі індэксамі, але празмерная падрабязнасць сур'ёзна загрувасціла б

табліцы, не дадаўшы нічога важнага да нашага апісання гістарычных працэсаў. Яшчэ адным ускладненнем нашага апісання было б тое, што зусім мала сегментаў мелі б нязменна адзін і той жа нумар (напр., індэкс $_3$ урэшце мелі б усе галосныя гукі полацка-разанскае дыялектнае групы). Каб даведацца пра паходжанне кожнага з агульных нумароў, чытачу трэба было б звярнуцца да ранейшых зрэзаў. Гл. таксама ўводзіны да нашае сістэмы нумарацыі ў змене 1.

Выбраная бібліяграфія

П. Бузук. *Спроба лінгвістычнае геаграфіі Беларусі* 1. Мн, 1928, 21.

М. Бірыла. "Рэфлексы агульнаславянскіх *о, ъ, ѣ, е, ь* у беларускіх гаворках", *Працы* 6, 1959.

Л. Калнынь. "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959, 89–90, 98; *Развитие корреляции твердых и мягких согласных фонем в славянских языках.* М, 1961.

M. Samilov. *The Phoneme J a t' in Slavic.* H, 1964, 110.

Т. Назарова. "Проблема перехідних говірок між українською і білоруською мовами", *Праці.*

В. Колесов. "Изменение фонемы /ѣ/ в древнерусском языке. (К вопросу о фонологической системе гласных в древнерусском языке старшей поры)", *SI* 35, 1966.

Ф. Филин. "К истории фонемы ѣ ("ять") в восточнославянских языках", Institut de Philologie et d'Histoire Orientales et Slaves, *Annuaire* 18 (FS B. O. Unbegaun). Br, 1968.

Змена 21. Страта рэдукаваных (скончылася да XII ст., гл. *PoS*, раздзел 29). У пачатку IX ст. i_3 і u_4 развіліся адпаведна ў рэдукаваныя *ь* і *ъ* (змена 9). Аднак гэтыя галосныя былі не надта даўгавечныя. Дарогу да страты рэдукаваных у прабеларускай мове праклалі дзве важныя падзеі: (1) паступовы пераход ад "вакальнага" да "кансанантнага" тыпу гукавое сістэмы, што пачаўся ў праславянскі перыяд з палаталізацыі заднепаднябенных зычных (змены 1, 4), і першая страта групаў з *j* (змена 3). Гэтыя змены далі ў выніку павелічэнне колькасці зычных фанем і памнажэнне чаргаванняў зычных, якое зменшыла значэнне галосных у распазнаванні марфем (гл. *PoS* 459 і наст.). (2) Страта розніцы паводле даўжыні ў сістэме галосных (змена 11) азначала канец колькаснае апазіцыі. Дзве гэтыя падзеі выклікалі паслабленне рэдукаваных, якое найперш выявілася ў іх няздольнасці несці націск. Націск

з рэдукаваных перамясціўся на папярэдні або наступны склад, залежна ад месца артыкуляцыі і прыроды галосных у суседніх складах.

Асобны рэдукаваны, стоячы пасля склада з нерэдукаваным галосным не мог утрымаць націску. Першапачатковая прысутнасць такіх націскных рэдукаваных найлепш відаць, напр., у назоўнікавых асновах, якія ва ўскосных склонах захоўваюць націск на канчатку, напр., **kopjь́ > конь*: **konjá > каня́* (Р.скл. адз.). У двухскладовых словах, якія канчаліся на групу рэдукаваных, націск, які падаў на перадапошні склад, захоўваўся, напр., бел. *сон* < **sъ́пъ*. Мала таго, у групе рэдукаваных, якія ішлі пасля склада з іншым галосным ці перад такім складам, першы з двух рэдукаваных мог таксама ўтрымаць націск, напр.: *канёц* < **kopь́cь* < **kopьsь́*. Іначай кажучы, рэдукаваныя ўтрымлівалі націск адно тады, калі ён не мог перамясціцца на суседні галосны або пераскочыць цераз склад.

У кіеўска-палескай дыялектнай зоне рэдукаваныя ў моцнай пазіцыі зліліся з існымі галоснымі сярэдняга ўздыму: *ъ > о*, *ь > е*; у полацка-разанскай зоне, дзе не было ненаціскных галосных сярэдняга ўздыму, *ъ* у моцнай пазіцыі супаў з *о* пад націскам і з *а* не пад націскам, адпаведна *ь* супаў з *е* пад націскам і *а* не пад націскам, пры захаванні мяккасці папярэдняга зычнага.

У самастойных (г. зн. не ў праклітычных прыназоўніках або шматлікіх энклітычных часціцах) аднаскладовых словах, якія канчаліся на рэдукаваны, апошні разумелі як моцны. Напр., *тъ* 'той' (м.р. адз.) ператварыўся ў *то*, якое ў сучаснай літаратурнай беларускай мове мае форму *той*, з *j*, які паходзіць з **jь*, што дадаўся пасля змены *ъ > о*; калі б ён дадаўся да прабеларускага *тъ*, было б *тый* (гл. змены 9, 35), што сапраўды зафіксавана ў мінскіх гаворках і дзе-нідзе яшчэ, але, відаць, узнікла па аналогіі з формамі множнага ліку.

Дакладна вызначыць час страты рэдукаваных цяжка, бо канцавыя стадыі гэтае змены, здаецца, адбываліся адначасна з пачатковымі этапамі агублення *е* ў *о*. Агубленне *е* трэба датаваць другой паловай XI ст. (гл. змену 18). Хоць звычайна лічаць, што спачатку адбылася змена (1) *ь > е*, *ъ > о*, а тады (2) *'é* (< *е*, *ь*) > *'ó*, мы схільныя думаць, што *ь́₃* распаўся на *е* перад мяккімі зычнымі і *о* ў астатніх пазіцыях – іначай кажучы, што *ь* у моцнай пазіцыі пад націскам і перад цвёрдымі

зычнымі не прайшоў праз стадыю *е*[1]. Гэта раўназначна сцверджанню, што *ь* > *ъ* з захаваннем мяккасці папярэдняга зычнага.

Развіццё рэдукаваных у моцнай пазіцыі ў прабеларускіх гаворках трэба дзеля гэтага акрэсліць так, каб уключыць адначасны распад націскнога $ь_3$ на *е́* і *о́*:

ъ:
Полацка-разанская дыялектная група: $ъ_{3,4}$ распаўся на $о́_{3,4}$ пад націскам і $а_{3,4}$ ненацісквы: прасл. **тъхъ* > бел. *мох*; прасл. **ǫgъlъ* > бел. *вуга́л*, дарэф. бел. *вуго́л*[2].
Кіеўска-палеская дыялектная група: $ъ_{3,4}$ > $о_{3,4}$ ва ўсіх выпадках: прасл. **тъхъ* > укр. *мох*; прасл. **ǫgъlъ* > укр. дыял. [вуго́л].

ь:
І ў полацка-разанскім, і ў кіеўска-палескім дыялектах $ь_3$ распаўся на $е_3$ перад мяккімі зычнымі (у т. л. *р'* > *р*) і $о_3$ пад націскам перад цвёрдымі зычнымі: напр., прасл. *рьпь* > бел., укр. *пень*; прасл. **vьr'хъ* > бел. *верх*; прасл. *lьпъ* > бел. *лён*, укр. *льон*.

Паводле традыцыйнае фармулёўкі *lьпъ* нібыта змяніўся перш у **len*, а тады ў бел. *лён*. Сярэднюю форму **len* для полацка-разанскіх гаворак трэба лічыць памылковаю рэканструкцыяй. Формы на ўзор **len* маглі вельмі нядоўга існаваць у кіеўска-палескай зоне, бо страта рэдукаваных пачалася там раней, як на поўначы (у полацка-разанскай зоне), а лабіялізацыя *е* > *о* пачалася на паўночным усходзе і толькі паступова пашыралася на кіеўска-палескі абшар. Яшчэ і сёння на тэрыторыі паўднёва-заходніх гаворак ёсць досыць вялікія раёны, дзе ў асобных каранях лабіялізацыі *е* няма (гл. змену 18). Розныя тэмпы гэтых працэсаў можна абагульніць наступным чынам:

Полацка-разанскія (цяпер паўночнабеларускія) гаворкі: **рь́пь* > *пень*; **lь́пъ* > *лён*; **lьgъká* (ж.р.) – *лягчэ́й* (дадатковы націск у ж.р. *лёгка*)

Кіеўска-палескія (цяпер паўднёвабеларускія) гаворкі: * *рь́пь* > *пень*; **lьпъ* > *лен* (> *лён* у некаторых мясцовасцях); **lьgъká* > укр. *легка́*

Страта слабых і вакалізацыя моцных рэдукаваных адбывалася, мабыць, на розных храналагічных стадыях, залежна ад становішча рэ-

---

[1] Прапанова змяніць традыцыйную фармулёўку пра зліццё рэдукаваных імпліцытна змяшчалася ў *PoS* 453; пазней яе дэталёва выклаў Ісачэнка (Isačenko).

[2] Аб пратэтычным *в* гл. змену 37.

дукаванага ў слове (гл. таксама змену 29)[1], але, на жаль, прабеларускія тэксты не дазваляюць нам беспасярэдне разрозніць храналогію страты рэдукаваных паводле пазіцыі. Прыкладам, у пачатковых складах рэдукаваныя ў слабой пазіцыі ва ўсіх прабеларускіх дыялектах выпадалі: напр., $C_1C_2ь/ъC_3$- > $C_1C_2C_3$. Збегі зычных, што ўтварыліся ў выніку гэтае змены, пазней спрасціліся праз страту C_2 (гл. прыклады ў змене 25). Але даведацца, ці доўга захоўваліся гэтыя збегі зычных пасля страты рэдукаваных, няма як. Спрашчэнне збегаў зычных з'яўляецца ў тэкстах толькі ў пачатку XV ст.

У пазіцыі пасля зычнага і сананта моцныя рэдукаваныя развіваліся, як і ў іншых становішчах, а слабыя рэпрэзентаваныя асаблівымі рэфлексамі (суч. бел. *кроў*, *крывi* < *кръвь*, *кръv(i)*). Гэтае развіццё адбывалася, відаць, на колькі стагоддзяў пазней і будзе апісанае ў змене 40.

Падзенне рэдукаваных прычынілася да некаторых далекасяжных зменаў у складзе і дыстрыбуцыі зычных і, у дыялектах, галосных; у нейкай ступені гэтыя з'явы закранулі і марфалогію. На жаль, малая колькасць пісьмовых дакументаў часта не дае вызначыць адносныя храналогіі гэтых падзей. Паколькі аб прабеларускіх ды іншых усходнеславянскіх дыялектах паасобныя сведчанні ёсць пачынаючы з тэкстаў XIII ст., мы прымем, што пералічаныя ніжэй змены адбыліся спярша, прынамсі на некаторых абшарах, як просты вынік страты рэдукаваных.

Падзеі, выкліканыя падзеннем слабых рэдукаваных, наступныя:

23. Змены ў статусе апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці ў сярэдзіне слова перад зычнымі і на канцы слова;
24. Развіццё і захаванне морфафанемных чаргаванняў V||#;

---

[1] Кіпарскі (Kiparsky) датуе страту рэдукаваных на канцы слова 950 г., страту слабых рэдукаваных у сярэдзіне слова – прыблізна 1050 г., а пераход рэдукаваных у моцнай пазіцыі ў *е* і *о* – прыблізна 1100 г. Паводле традыцыйнага погляду (Шахматов, Trubetzkoy ды інш.), страта рэдукаваных у кіеўскай зоне прыпадае на сярэдзіну XII ст., крыху пазней яна адбылася на беларускай тэрыторыі. У беларускіх тэкстах ужыванне *ъ* і *ь* (як літар) замест *о*, *е* (якія самі часткова паходзілі з *ераў*) сягае XVI стагоддзя, але яно мела графічную, а не фанетычную прычыну. Прыклады *е* на месцы спрадвечнага *ь* у старабеларускіх тэкстах трэба прыпісаць уплыву польскае мовы, бо ў польскай мове абодва рэдукаваныя зліліся ў *е*, напр.: *смоутек* (але суч. бел. *смýтак*), *наде всех* (XV ст.).

25. Развіццё і трансфармацыя новых збегаў зычных; выпадзенне зычнага; устаўка галоснага; прыпадабненне і распадабненне зычных; падваенне цвёрдых і мяккіх зычных;
26. Аглушэнне зычных у дыялектах у сярэдзіне і на канцы слова;
27. Развіццё ў дыялектах прыстаўных галосных.

Выбраная бібліяграфія

N. Trubetzkoy. "Einiges über die russische Lautenwicklung und die Auflösung der gemeinrussischen Sprachenheit", *ZSPh* 1, 1925, 296.

И. Фалев. "О редуцированных гласных в древнерусском языке", *Язык и литература* 2, 1927.

E. Koschmieder. "Schwund und Vokalisation der Halbvokale im Ostslavischen", *WSl* 3, 1958.

V. Kiparsky. *Russische historische Grammatik.* Heid, 1963, 109.

H. Birnbaum. "Lautwandel und Phonologisierung", *ZSPh* 32, 1965, 286.

А. Булыка. "Адлюстраванне вымаўлення ў старабеларускай арфаграфіі", *Весці* 1966, 1, 74.

J. Ferrell. "The Phonology of East Slavic at the Period Preceding the Loss of the Jers", *Studies in Slavic Linguistics and Poetics in Honor of Boris O. Unbegaun.* Edited by R. Magidoff, et al. NY–Lo, 1968.

W. Mańczak. "O zaniku jerów w staroruskim", *SlOr* 18, 1969.

A. Isačenko. "East Slavic Morphophonemics and the Treatment of the Jers in Russian: A Revision of Havlík's Law", *IJSLP* 13, 1970.

Змена 22. Страта фанемнага статусу гуку *у*; палаталізацыя перад пярэднімі галоснымі, III (XII ст., гл. *PoS* раздзел 31). У прабеларускай мове змякчэнне зычных пашырылася на пазіцыю перад усімі пярэднімі галоснымі: *і, ь, е, ѣ, ę* ў беларускай мове звычайна перадаюцца як (адпаведна) *і, е, е, е, а* (гл. змену 16). Пашырэнне палаталізацыі перад галоснымі пярэдняга раду магло быць паступовае і ахоплівала розныя галосныя ў розны час. Мы датавалі змякчэнне зычных перад *ь* перыядам, які папярэднічаў страце слабых рэдукаваных (гл. змены 16, 21). Паколькі зычныя перад *а* ці *е* < $ę_{10}$ змякчаліся, мы прынялі, што палаталізацыя пашырылася на пазіцыю перад *ę*, перш як насавы галосны зліўся з *а* і *е*. Можна нават дапусціць, што пашырэнне палаталізацыі на гэтую пазіцыю было важным фактарам, які вёў да паніжэння *ę* ў *а* ў большасці прабеларускіх гаворак (гл. змену 15).

Страта фанемнага *у*– ускосны довад, што змякчэнне ў прабеларускіх гаворках пашырылася і на гукі ў пазіцыі перад *і*. Найпраўдападобней, палаталізацыя перад *і* развілася да страты слабых рэдукаваных.

У выніку ўзнікнення фанемных процістаўленняў паводле цвёрдасці–мяккасці гук *у* ўрэшце страціў свой фанемны статус, бо розніца паміж *і* і *у* пачала залежаць ад якасці папярэдняга зычнага: тут перад *і* прабеларуская мова мела мяккія зычныя, а перад *у* – цвёрдыя. На пачатку слова дапускаўся толькі *і*; нават да страты свайго фанемнага статусу *у* ніколі не стаяў на пачатку слова ў прабеларускіх гаворках пасля таго, як яго папярэднік, $\bar{u}_1$, набыў у праславянскай мове прыстаўны *v-* (параўн. прыклады, пададзеныя ў змене 6). Дадатковая дыстрыбуцыя *і* і *у* ў прабеларускай мове ўпершыню выразна адбілася ў правапісе ў XIII ст., калі мы знаходзім напісанне *ы* замест *и* пасля прыназоўнікаў ці дзеяслоўных прыставак, якія канчаліся на цвёрды зычны: напр., *как ыванъ*, *подышла* (XIII ст.; прыстаўка *под* + *ишла*); *сынымъ* ‘з іншым’ (напісанае ў адно слова; пачатак XVI ст., Полацк). У сучаснай беларускай мове *і* > [ы] пасля цвёрдых зычных на сутыку слоў, апрача тых выпадкаў, калі папярэдняе слова канчаецца на заднепаднябенны: *ён ішóў* [-ныш-], але *луг і пóле* [-і-]. Гэткая ж дыстрыбуцыя пераважае ў сучасных беларускіх дыялектах, гэтаксама як і ў расійскіх і польскіх, дзе [ы] захоўваецца як алафон /i/. У сучаснай украінскай мове страта *у* зайшла нават яшчэ далей, чым у беларускай, расійскай і польскай, бо там нават фанетычна *у* супаў з *і*.

У позняй прабеларускай мове фанемную раўназначнасць *і* і *у* ўзмацніла таксама іх супольная марфалагічная роля пры скланенні назоўнікаў. Напр., канчаткі назоўнага і вінавальнага склонаў множнага ліку сталі *і* або *ы* залежна ад якасці папярэдняга зычнага: прабел. *земле* > бел. *зéмлі* – *жóны*, параўн. таксама канчаткі роднага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду. Пасля страты фанемнага *у* прабеларускія гаворкі набылі пяцічленную сістэму галосных (у паўднёвабеларускіх гаворках – з сямі элементаў). Сістэма да страты /у/ і рэдукаваных (змена 21) паказаная на зрэзе 7V (змена 20).

Пасля страты рэдукаваных сістэму галосных можна было б перапісаць, як у табл. 22.

Табліца 22. Зрэз 8V. Прабеларуская сістэма галосных пасля страты *у*



Выбраная бібліяграфія

Р. Аванесов. "Из истории русского вокализма. Звуки *и* и *ы*", *ВМУ* 1, 1947, 41–56.

P. Zwoliński. "Stosunek fonemy *y* do *i* w historii języków słowiańskich", *ZPSS* 1958.

Змена 23. Статус апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці ў сярэдзіне слова перад зычнымі і на канцы слова, IV (XII ст.). Можна дапусціць, што да той пары, як слабыя рэдукаваныя пачалі страчвацца, зычныя перад *ь* ужо змякчыліся (гл. пра гэта змену 18). Палаталізацыя гэтых зычных на канцы і ў сярэдзіне слова перад зычнымі набыла фанемны характар сама пазней са стратаю слабых рэдукаваных. Прабел. *lěnь* 'лянота' і *lьnъ* 'лён'; *rьnь* 'пень' і *rěnъ* 'пен(аў)' (Р.скл. мн. ад *пе́на*) пасля страты рэдукаваных (і пераходу *ě* > *е*) зрабіліся мінімальнымі ці амаль мінімальнымі парамі: *лень* (у сучаснай беларускай мове заменена на *лянóта*) – *лён* і *пень* – *пен*. Прыклады іншых новых апазіцый паводле цвёрдасці–мяккасці на канцы і ў сярэдзіне слова: *вóспа* – *прóсьба* [прóз'ба]; *гразь* – *марóз*; прабел. *drobь* (суч. бел. *дроб*) – *гроб* 'труна'. У выніку страты рэдукаваных частасць пяці існых зычных, якія маглі фанемна змякчацца (*s*'$_{15}$, *z*'$_{14}$, *l*'$_{9}$, *n*'$_{10}$, *r*'$_{11}$), павялічылася, і прабеларускія гаворкі набылі шэсць новых фанемна мяккіх зычных на канцы слова: *p*'$_{16}$, *b*'$_{17}$, *m*'$_{18}$, *w*'$_{19}$, *t*'$_{20}$, *d*'$_{21}$ маглі цяпер стаяць на канцы слоў.

Карскі заўважыў, што вынікі страты *ера* для палаталізацыі ў беларускай мове розныя. У канцы слова зычныя перад першапачатковым *ерам* змякчаюцца, але ў сярэдзіне слова мяккасць звычайна страчвалася перад зубнымі *n, s, c*: напр., прасл. **tьtьnъ* > бел. *цёмны*. Калі сла-

бы рэдукаваны стаяў перад незубным зычным, мяккасць папярэдняга зычнага захоўвалася і прабеларуская мова набывала мінімальныя пары на ўзор *редька* (цяпер бел. *рэ́дзька*; параўн. стар.-рус. **rьdьk(a)*) – *рѣдко* (цяпер бел. *рэ́дка* < *рѣдъко*). Пра зацвярдзенне губных на канцы і ў сярэдзіне слова гл. змену 29.

Выбраная бібліяграфія

Белорусы 1, 282.

V. Kiparsky. *Phonetische Motivierung eines altrussischen Lautgesetzes.* Helsinki, 1964. (Societas Scientiarum Fennica, Commentationes Humanarum Litterarum XXXVI, 3.)

Змена 24. Узнікненне і захаванне морфафанемных чаргаванняў V||# (XII ст.). Страта рэдукаваных стварыла морфафанемнае чаргаванне галоснага (які развіўся з моцнага рэдукаванага) з нулём гуку ў каранях назоўнікаў і прыметнікаў, прыстаўках і прыназоўніках і, у меншай ступені, у каранях і суфіксах дзеясловаў. Развіццё і захаванне морфафанемных чаргаванняў залежала ад колькасці рэдукаваных і складоў у корані і ад зычных, што ўдзельнічалі ў гэтым працэсе.

Пасля страты рэдукаваных аднаскладовыя прыназоўнікі і прыстаўкі, якія цяпер складаліся з адзінага зычнага, набылі ўстаўны галосны ў пазіцыі перад словам са збегам зычных, першы сегмент якога быў *s, z, š, ž* або *m*: напр., *з* || *са*, як у спалучэннях *з сябра́мі* || *са звóнам*. Гэтае чаргаванне захавалася без далейшага выраўноўвання.

Двухскладовыя карані назоўнікаў, у якіх спачатку былі два рэдукаваныя ў назоўным склоне адзіночнага ліку ў мужчынскім родзе і ў родным склоне ў ніякім і жаночым родзе, развілі чаргаванне ў парадыгме, бо ў астатніх выпадках у корані быў толькі адзін рэдукаваны, які пазней страціўся: напр., *сънъ* > *сон* || *съну* > *сну*; *дьнь* > *дзень* || *дьня* > *дня*; *съто* > *сто* || *съть* > *(двух)сот*. Аднак у зыходна двухскладовых словах з пачатковым *r, l* ці насавым, за якім стаяў рэдукаваны, збег зычных, што ўтвараўся такім чынам, пазней разбіваўся праз выраўноўванне па аналогіі з мадэллю назоўнага склону адзіночнага ліку, напр., *рот – ро́та* замест спадзяванага *рта* (параўн. рас. *рта*); *лоб* – гутарковае і дарэф. бел. [ло́ба] < *лъба*, калі гэты збег зычных не ратавала дадаванне прыстаўнога галоснага, напр., літар. бел. *(і)лбá* (шырэй пра

гэта гл. у змене 27). Гэтае пашырэнне *е* і *о* на корань ва ўскосных склонах не выяўляецца ў старых тэкстах.

Трохскладовыя назоўнікавыя і прыметнікавыя карані з рэдукаванымі ў двух канцавых складах таксама выяўляюць морфафанемныя чаргаванні ў парадыгме, напр., *коньць* > *конець* (XVI ст.; суч. бел. *канец*) || *коньца* > *канца́*; *бѣдьнъ* > *бе́дзен* || *бѣдьная* > *бе́дная*; *тетъкъ* > *це́так* || *тетъка* > *це́тка*. Тут няма моцнае тэндэнцыі да выраўноўвання, і чаргаванне адлюстроўваецца ў старых тэкстах: напр., *цареставъ* (1489; суч. бел. *ца́рствуй*), *храберъ* ‘храбры’ (XVI ст.). У выпадку першапачатковых трохскладовых каранёў з рэдукаванымі ва ўсіх трох складах чаргаванне V||# абмежавалася апошнімі двума складамі або не выступіла ўвогуле, напр., *шаве́ц* || *шаўца́* замест спадзяванага *швец* < **šьwьcь* || *шаўца́* < **šьwьca*; *жнец* || *жняца́* (а не спадзяванае *женца* ад *жньць* || *жньца* паводле старабел. *женцовъ* [XVI ст.]). Марфалагічная абумоўленасць у сучаснай дыстрыбуцыі відаць з таго факту, што страта чаргавання залежыць ад асновы. Выпадкі вольных варыяцый ёсць і ў сучасных гаворках, і ў гістарычных тэкстах, напр., спадзяванае суч. літар. бел. *любві* побач з *любо́ві*, паводле мадэлі *любоў*.

Калі ў першым складзе трохскладовае дзеяслоўнае формы першапачаткова быў рэдукаваны, морфафанемнае чаргаванне V||# развівалася ў корані, як, напр., *бьрати* > *браць* || *беру* > *бяру́*; параўн. таксама *гънути* > *гнуць* зак.тр., хоць *гіба́ць*, дарэф. бел. *гбаць* незак.тр. У дзеяслоўных асновах тэндэнцыя да выраўноўвання дзеяла толькі ў выключных выпадках перад *r*: напр., дарэф. бел. *зьбе́рці*, суч. бел. *дзе́рці* – *дзяру́*, *жэ́рці* – *жару́*; параўн. ц.-сл. *дьрати* – *держ*, *пожрѣти* – *пожьрж* (але таксама бел. *драць*, *жраць*).

У тапонімах з суфіксам *-ьск-* форма назоўнага склону адзіночнага ліку са спадзяваным *е* (*ё*) (напр., **Smolьnьskъ* > *Смольнеск* ці *Смольнёск*) рана змянілася на базе ўскосных склонаў (асабліва, мабыць, меснага), напр., суч. бел. *Смале́нск*. Гэтаксама суч. бел. *По́лацк* (але дарэф. бел. *По́лацак*) відавочна ўтворана на ўзор ускосных склонаў, як *Полотьска* (Р.скл. адз.). Перыяд зменаў захапіў і XV ст.: параўн. *Полътескъ* (1475), *Полотескъ* (1489) і г. д.

Выбраная бібліяграфія

A. Isačenko. "East Slavic Morphophonemics and the Treatment of the Jers in Russian: A Revision of Havlík's Law", *IJSLP* 13, 1970.

Змена 25. Узнікненне і трансфармацыя новых збегаў зычных: выпадзенне зычнага, устаўка галоснага, прыпадабненне і распадабненне зычных, падвойныя цвёрдыя і мяккія зычныя (пачалося прыблізна ў XII ст. і працягвалася ў XIV–XV стст.). Адным з беспасярэдніх вынікаў страты рэдукаваных для дыстрыбуцыі зычных было ўтварэнне новых збегаў зычных, складнікі якіх раней былі раздзеленыя рэдукаваным. Некаторыя з новых збегаў зычных не прымаліся – як вынік папярэдніх зменаў. Напр., калі даўнейшае правіла спрасціла першапачатковыя прабеларускія збегі зычных *tl* і *dl* у сярэдзіне слова ў *l* (гл. прыклады ў змене 5), то страта рэдукаваных у XII ст. давяла да ўтварэння новых збегаў зычных *tl* і *dl* у сярэдзіне слова. Некаторыя з новых двухчленных і трохчленных збегаў зычных, якія ўзніклі са стратаю рэдукаваных, пазней змяняліся ў выніку прыпадабнення, распадабнення і выпадзення зычнага. Пра гэта сведчаць як сучасныя дыялекты беларускае мовы, так і прабеларускія і раннія беларускія тэксты; першапачатковыя збегі зычных можна рэканструяваць, параўнаўшы іх з іншымі формамі гэтага кораня ў беларускай мове або з іншымі славянскімі мовамі. На жаль, шмат якія з гэтых другасных зменаў няма як датаваць дакладна, бо пісьмовыя сведчанні занадта фрагментарныя. Аднак усе гэтыя інавацыі, апроч аднае, зафіксаваныя ў дакументах XV ст., а на працягу XVI ст. іх колькасць толькі павялічваецца; адна інавацыя пачала з'яўляцца ў тэкстах яшчэ ў XIV ст. Ніжэй падаюцца прыклады спрашчэння новых збегаў трох зычных у сярэдзіне слова: (а) праз выпадзенне сярэдняга выбухнога і (б) праз выпадзенне пачатковага сегмента; (в) выключэнне збегу зычных праз устаўку галоснага; (г) распадабненне новых збегаў зычных; (д) прыпадабненне паводле мяккасці; (е) развіццё падвойных зычных на граніцах марфем, а ў некаторых выпадках па-за імі (праз прыпадабненне паводле звонкасці і/або месца артыкуляцыі).

А. Спрашчэнне новых збегаў зычных на пачатку слова праз выпадзенне выбухнога зычнага ў сярэдзіне слова. (Сярэднія складнікі – заўсёды зубныя.) Гэтае правіла прыводзіць да змены *stn*, *stl*, *stb*, *zdn*,

rdn, *rdc* – новых збегаў зычных, якія ўзніклі на граніцах марфем праз страту рэдукаваных – на *sn*, *sl*, *sb* ([zb]), *zn*, *rn* і *rc*. Напр.: **stьn* > *sn*: *намесника* Р.скл. адз. (каля 1400 г.) – параўн. рас. *намéстник*; *існава́ць* – параўн. *істóта*; **stьl* > *sl*: *шчасливым* (XVII ст.) – параўн. *шча́сце* (з *ц'* < *т'*); **stьb* > *sb*: *пасьба́* – параўн. *пасту́х*; **zdьn* > *зн*: *позно* (XV ст.) – параўн. рас. *опоздáть*; **rdьn* > *рн*: *міласэ́рны* (відаць, ад польск. *miłosierny*) – параўн. рас. *милосéрдный*; **rdьc* > *рс*: *серце* (XVI ст.) – параўн. *сярдзíты*.

Б. Страта пачатковага сегмента ў збегу трох зычных. Гэта адбывалася ў двух выпадках: (ба) калі пачатковы сегмент быў *l* > *w* і (бб) калі зазубныя *š* і *ž* у корані стаялі перад суфіксам, што пачынаўся з *-s*C-. У першым выпадку **wnьc* > *нс*: *со́нца* – параўн. рас. *со́лнце* [со́нцэ]. Калі ў гэтым корані быў *w*, які страціўся, то змена магла адбыцца пазней за спрашчэнне іншых збегаў трох зычных, бо першапачатковы *l* перад зычнымі вакалізаваўся каля XV ст., але тэксты не дазваляюць нам дакладна вызначыць, ці пераход *l* > *w* адбыўся перад узнікненнем правіла спрашчэння збегаў зычных, ці спрашчэнне закранула гук *l* перад яго вакалізацыяй у *w*. У лепельскай гаворцы адзначана *со́ўнца* з *ў*. Што да выпадку (бб), параўн. *Нясві́ж* || *нясві́жскі* [н'ас'в'іск'і], дарэф. бел. *нясьві́скі* (< *жьск*); *тава́рыш* || *тавары́ства* (перад суфіксам *-ств-*).

В. Збегі зычных на канцы слова з зычнага (звычайна выбухнога ці сананта) + сананта разбіваліся ўстаўкаю *е* ці *о́* (асабліва пасля мяккага зычнага і перад цвёрдым зычным), або *а* (у ненаціскной пазіцыі), як у словах *карабе́ль* (< *корабль*), *жураве́ль* (< *жеравль*), але *карабля́*, *жураўля́*, *ру́бе́ль* (< *рубль*), але *ру́бля́*, *ве́цер* (< **větrъ*), але *ве́тру*, *хіцёр* (параўн. *хі́тры*), *дзёран* < прасл. **dьrtъ* (параўн. дарэф. бел. *дзярно́*, рас. *дёрн*), *го́ран* < *гъртъ* (параўн. рас. *горн*), але адпаведна *дзёрну*, *го́рна* (Р.скл. адз.); *аго́нь* < прасл. **ognь*. Той самы галосны з'яўляецца пры словаўтварэнні перад суфіксамі, што пачынаюцца на зычны, напр.: *карабе́льшчык*, *зяме́льны* (< *землн-*). Формы без устаўнога галоснага, напр., *жеравль*, *жеравлевый* (XVI ст.), ёсць нормаю ў старых дакументах.

Важнаю катэгорыяй, дзе развіліся збегі зычных на канцы слова, былі формы роднага склону назоўнікаў жаночага і ніякага роду. Старабеларускія тэксты даюць прыклады гэтых новых збегаў зычных, напр.,

земль (1588), *сестръ* (1588). Часта ў такіх збегах зычных пазней развіваўся ўстаўны галосны; параўн. у сучаснай беларускай літаратурнай мове варыянты *зямéль* і *сясцёр*. Устаўны галосны ў новых збегах зычных – з'ява супольная для ўсіх усходнеславянскіх моваў, але ён не заўсёды здараецца ў адных і тых самых марфемах, напр., *соснъ* > суч. літар. бел. *сóсен* і *сóснаў*. Дадатковыя прыклады гл. ніжэй.

Новыя збегі зычных цяпер разбіваюцца галоснымі *é*, *ó* або *а* ў залежнасці ад фанетычнай пазіцыі, месца націску і тыпу скланення: у назоўніках жаночага роду *é* (пазней часткова > *ó*) або *а*, у залежнасці ад націску, устаўляецца паміж мяккімі зычнымі (напр., *зямéль*); пасля мяккага зычнага і перад цвёрдым зычным устаўляецца [ó] < *é*, напр.: *сясцёр* [-'óр] (параўн. *сястрá*); *лялéк* [-'ак]. Устаўка *ó* (арфаграфічна *ё*) з памякчэннем папярэдняга зычнага магчымая таксама ў скланенні ніякага роду (напр., *вядзёр*) і магла ўзнікнуць тут па аналогіі з чаргаваннем *-а-* (адз.) || *-ё-* (мн.) у асновах назоўнікаў (напр., *сялó* || *сёлы* || *сёл*) (гл. с. 153). І ў назоўніках жаночага, і ў назоўніках ніякага роду *а* ўстаўляецца паміж цвёрдымі зычнымі: напр., *дóшак* поруч з варыянтам *дóшкаў*. Дыстрыбуцыя ўстаўных галосных у прабеларускай і беларускай мовах патрабуе дадатковага вывучэння.

Адкіданне збегаў зычных ускладняе марфалогію, творачы ў аснове шмат якіх назоўнікаў новае морфафанемнае чаргаванне. Аднак у выніку зменаў у дыстрыбуцыі канчаткаў формаў роднага склону множнага ліку шмат якія асновы з новымі спрошчанымі збегамі зычных набылі ў родным склоне множнага ліку і варыянты канчаткаў на *-аў*. Формы з *-аў* даюць магчымасць у большасці выпадкаў аднавіць першапачатковую форму кораня ў цэлай парадыгме пасля страты рэдукаваных, напр. *вядрó* || *вядзёр* ~ *вёдраў*; *акнó* || *(в)акóн* ~ *вóкан* ~ *вóкнаў*; *сястрá* || *сясцёр* ~ *сёстраў*; *зямля́* || *зямéль* ~ *зéмляў*.

Г. Распадабненне ў новых збегах зычных закранае і злучэнні "выбухны (або афрыката) + выбухны (або *п*)". Спрашчэнні групаў з афрыкатамі і выбухнымі зафіксаваныя ўжо ў XIV ст., напр., **čьt* > *št*: *чьто* > *што* (XIV ст.); **kъt* > *xt*: *къто* > *хто* (XIV ст.) – параўн. рас. *кто*; старабел. *ахтовръ* 'кастрычнік' (канец XV ст.) – параўн. суч. бел. тапонім *Акцябр*; бел. цюрк. *vāchtāch* 'час для малітвы' М.скл. мн. (у транслітарацыі Станкевіча і Таўэравай) < араб. *waqt* 'час' (калі толькі поствакальны *-ch-* замест арабскага *-q-* – не ўласна цюркская замена,

зафіксаваная ў шмат якіх цюркскіх мовах, напр., араб. *ʾaḥmaq* ‘дурны’ > саларск. (уйгурск.) *axmax*). Хоць мы не можам быць упэўненыя ў храналогіі ніводнага паасобнага спрашчэння збегу зычных, няма прычыны думаць, што ўсе змены адбываліся адначасна. Напр., у тых самых прабеларускіх і ранніх беларускіх граматах прасл. *čьto* пішацца як *што*, але прасл. *kъto* яшчэ пішацца з заднепаднябенным выбухным.

Змена *čьn* > *šn* магла адбывацца пазней і залежала, здаецца, як ад геаграфічнай, так і ад лексічнай дыстрыбуцыі. Напр., гэтая змена магчымая ў словах *яе́шня* (поруч з *яе́чня*), *сма́чны* [-шн-], дарэф. бел. *смачны́* (з нямецкае мовы праз польскую), *пшані́чны* [-шн-] і *кане́чне* [-шн-], але не ў словах *прато́чны*, *начны́*, дарэф. бел. *но́чны* або *рачны́*, дарэф. бел. *рэ́чны*. Спалучэнне *čn*, здаецца, часцей захоўвалася ў каранях, дзе *č*||*k* (напр., *рака́*) або дзе *č* выступае ў корані самастойна (напр., *ноч*). Дыстрыбуцыя *čn*~*šn* залежыць ад марфемы. Геаграфічна, мяркуючы па *ДАБМ*, *čn* захавалася пераважна на захадзе, а *šn* займае розныя прасторы на ўсходзе (карты 61–62, дзе паказаныя адпаведна словы *мало́ч/шны* і *руч/шні́к*). Існаванне вертыкальнае ізаглосы, якая рассякае краіну прыблізна на ўсходнюю і заходнюю часткі, наводзіць на думкі, што гэтая фанетычная змена і яе лексікалізацыя досыць позняга паходжання. Найранейшая фіксацыя групы *šn*, здаецца, адносіцца да XV ст.: *опришне* ‘асобна’ (суч. бел. *апры́чны*).

Д. Прыпадабненне паводле цвёрдасці–мяккасці. Прыпадабненне паводле мяккасці можа адбывацца ўнутры марфемы (слова) і на марфемным (слоўным) сутыку; гэта не залежыць ад таго, ці стаяў спачатку перад зычнымі рэдукаваны. Пазіцыі, у якіх яно адбываецца, можна абагульніць гэтак (прыклады ўзятыя з сучаснае беларускае мовы):

$$\text{Да. } \left.\begin{matrix} z \\ s \end{matrix}\right\} + \text{C'} \text{ (акрамя мяккіх заднепаднябенных)} > \left\{\begin{matrix} z' \\ s' \end{matrix}\right. + \text{C'}$$

напр., *бя*[з’]*дзе́йнічаць*, *пра*[з’] *зямлю́*, [з’]*лі́ваць*, [з’]*няць*, [с’]*лед*, [с’]*нег*, [с’] *Сібі́ры*, *бе*[с’] *цябе́*, *кары́*[с’]*ць*, [з’]*бі́ць*, [з’]*ме́сці*, [с’]*мята́на*, [с’]*пе́лы*. Перад мяккімі заднепаднябеннымі *z* і *s* не памякчаюцца (прынамсі ў літаратурнай мове): [з]*гі́нуць*, [с]*кі́нуць*. Гэта можа адлюстроўваць тое, што заднепаднябенныя змякчыліся толькі пад канец XI ст. і ў некаторых пазіцыях пазней страцілі мяккасць (гл. змену 30).

Дб. $\left.\begin{matrix} d \\ t \end{matrix}\right\} + v' > \left\{\begin{matrix} d' (> ʒ') \\ t' (> c') \end{matrix}\right.$ але ў граніцах слова,

напр., [ʒ']*ве* ж.р. – параўн. *два* м.р. і н.р. (< *дьвѣ*, *дьва*); таксама *за*-[ц']*вярдзе́лы* < **zatvьrdělъ*- без удзелу рэдукаваных (параўн. змену 43), але *па*[д] *вярбо́й* і пад. У сучаснай літаратурнай беларускай мове прыпадабненне ў групе *-тв-* у канцы кораня не адбываецца, напр., *у Літве́* (хоць *Ліцьве́* – варыянт у дарэформавай беларускай мове), – мабыць, з прычыны ціску парадыгмы, у якой *-tv-* стаіць перад цвёрдымі канчаткамі, як у *Літва́*, або з прычыны ўплыву расійскае мовы.

Гістарычна апісваць прыпадабненне паводле цвёрдасці–мяккасці цяжка дзеля адсутнасці ясных сведчанняў у кірылічных тэкстах. Часам у кірылічных тэкстах, пачынаючы з XVI ст., маглі пазначаць рэгрэсіўную палаталізацыю, напр., *зьбирать*, *чысьлѣ* М.скл. адз. (XVI ст.)[1]. Для ўстанаўлення выпадкаў прыпадабнення паводле мяккасці больш карысныя тэксты беларускіх татараў, бо цюркска-арабская сістэма пісьма мае асобныя літары для параў *s–s'*, *z–z'*, *d–d'* (*ʒ'*), *t–t'* (*c'*), *k–k'*. Напр., там ёсць літара *ṣad* (*ṣ*) для гуку *s*, як у слове *wāṣ* (літар. бел. *вас*), і *sin* (*s*) для гуку *s'*, як у слове *pismw* (літар. бел. *пісьмо́*), і г. д. У выразе *к ве́рху* мусульманскі пісар XVII ст. перадаў выбухны заднепаднябенны графемаю *kāf*, якая можа паказаць памякчанае вымаўленне [k'v'], напр., *kwarḥu* (XVII ст.); аднак *k'* маглі ўжываць і для перадачы гуку *g* у выразе [ґ в'э́рху] – арфаграфічная ўмоўнасць, невядомая кірыліцы. Параўн. таксама развагі ў змене 13. У габрайскіх тэкстах літару *yōd* часам ужывалі, каб пазначаць мяккія славянскія зычныя, напр., *пу*^{c}*тп* (1761), што адпавядае літар. бел. *Нёман*.

Е. Яшчэ адным вынікам страты рэдукаваных стала ўтварэнне падвойных цвёрдых і мяккіх зычных, найчасцей на граніцы марфем, напр., *ві́нны* ('вінаваты'), *гадзі́ннік* (< *-иньникъ*), *паддзе́ць* [паʒ'э́ц'] (< *подъ* + *дѣ-*), рэдка ўнутры марфемы, напр., *ссаць* < *съсати*. Падваенне магчымае таксама на граніцы марфем незалежна ад першапачатковай прысутнасці рэдукаванага, як, напр., у слове *беззага́нны*. У шмат якіх выпадках падваенне ўзнікала ў выніку прыпадабнення глухога зычна-

[1] У новы перыяд беларускае літаратурнае мовы рэгрэсіўную палаталізацыю зычных *с*, *з*, *ц* і *ʒ* пазначалі на пісьме да 1933 г. у Савецкім Саюзе і, як правіла, дагэтуль пазначаюць на эміграцыі: напр., *сьвет*.

га да наступнага звонкага ці наадварот: *отъ*: *отъдати* > бел. *адда́ць, ад ці́ны* [ац'і́ны] (першапачаткова < *т*: *отъ* + *тин-*); *раз* + *сыпати* = *рассы́паць*, або было вынікам прыпадабнення паводле месца артыкуляцыі, напр., *раз*: *разжы́цца* [-ж̄-] (*з* + *ж*); *на ро́чцы* [-ц̄-]; *ма́тцы* [-ц̄-] (*т* + *ц*); *старасве́тчына* [-ч̄-] (*т* + *ч*), або было выклікана абедзвюма гэтымі прычынамі, напр., як у слове *зага́дчык* [-ч̄-] (*д* + *ч*). У формах 3 асобы і інфінітывах дзеясловаў *-ть* на сутыку са зваротнай часціцаю *-ся* замянялася ў [-ц'-] і, са стратаю мяккасці, у [-ц̄-]: напр., *учить* + *-ся* (3 ас. адз.) > *вы́чыцца*, *учать* + *-ся* (3 ас. мн.) > *вы́чацца*, *учит(и)* + *-ся* інф. > *вучы́цца*; дадаванне зваротнае часціцы да формы 2 асобы адзіночнага ліку давала *с̄*, як у слове *вы́чышся* [вы́чыс̄'а]. Пра змены мяккіх зычных перад цвёрдымі гл. змену 23.

Падвойныя цвёрдыя зычныя, незалежна ад іх паходжання, нумаруюцца гэтак: $\bar{p}_1$, $\bar{b}_2$, $\bar{m}_3$, $\bar{n}_9$, $\bar{z}_{14}$, $\bar{c}_{13}$, $\bar{c}_{13}$, $\bar{t}_5$, $\bar{d}_6$, $\bar{z}_8$, $\bar{s}_7$ і, пасля XV ст., $\bar{ʒ}_{42}$. Падвойныя мяккія зычныя, якія развіліся на сутыку слоў, нумаруюцца гэтак: $\bar{p}'_{16}$, $\bar{b}'_{17}$, $\bar{t}'_{20}$ (пазней > $\bar{c}'_{20}$), $\bar{d}'_{21}$ (пазней $\bar{ʒ}'_{21}$), $\bar{s}'_{15}$, $\bar{n}'_{9}$, $\bar{l}'_{10}$, а пасля XV ст. яшчэ, магчыма, $\bar{f}'_{40}$.

Выбраная бібліяграфія

А. Булыка. *Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы.* Мн, 1970.

Змена 26. Дыялектнае аглушэнне зычных у сярэдзіне і на канцы слова (пачалося ў XII ст.?). У выніку страты слабых рэдукаваных развіліся збегі зычных, складнікі якіх маглі адрозніваца паводле звонкасці–глухасці. Ва ўсіх сучасных гаворках глухі зычны, стоячы перад звонкім, набывае ад гэтага наступнага сегмента звонкасць у выніку рэгрэсіўнае асіміляцыі: напр., бел. *касьба́* вымаўляецца [каз'ба́]. Збегі зычных, у якіх першы гук звонкі, а другі – глухі, у розных гаворках паводзяць сябе па-рознаму. У адных мясцовасцях (напр., большая частка паўночна-ўсходніх, цэнтральных гаворак, паўднёва-заходнія гаворкі – і адсюль у сучаснай літаратурнай мове, якая грунтуецца на цэнтральных гаворках) першы звонкі сегмент у выніку рэгрэсіўнае асіміляцыі прымае глухасць другога кампанента: звонкі С + глухі С > глухі С + глухі С. Такім парадкам, і *прывёсці*, і *прывёзці* ў гэтых га-

ворках вымаўляецца як [прыв'э́с'ц'і]. Але ў іншых мясцовасцях, асабліва ў паўднёва-ўсходняй частцы Беларусі аж да Оршы, звонкі зычны перад глухім не аглушаецца: напр., *но́жка* вымаўляецца [но́шка] у літаратурнай мове, але [но́жка] на паўднёвым усходзе (*ДАБМ*, карта 46).

Яшчэ адна другасная з'ява, якая стала магчымая праз страту рэдукаваных, – рэгіянальнае аглушэнне на канцы слова новых звонкіх зычных, у якіх звонкасць становіць адметную рысу (гэтае правіла не датычыць канцавых *м*, *н*, *р*, *л*, *й*). Выразна звонкія зычныя на канцы слова захаваліся як такія толькі на поўдні (улучна з беларускімі гаворкамі каля Бельска ў Польшчы) і паўднёвым усходзе Беларусі (як і ў большасці паўночна-ўкраінскіх гаворак у суседніх з Беларуссю раёнах)[1]. Што да суседніх моваў, то ў расійскіх, польскіх, а таксама ва ўсходнелатышскіх і літоўскіх дыялектах звонкасці ў пазіцыі на канцы слова няма; а ў цэнтральналатышскім і заходнелітоўскім дыялектах звонкасць канцавых зычных ёсць.

Пісьмовыя пацвярджэнні аглушэння ў беларускай мове канцавых зычных зафіксаваныя, пачынаючы ад XIV ст. (у іншых усходнеславянскіх гаворках – ад XIII ст.), а сведчанні аглушэння ў сярэдзіне слова – ад XV ст., але прыкладаў гэтага няшмат. Магчыма, працэс аглушэння на канцы слова адбываўся паступова і закранаў не ўсе зычныя адразу. *ДАБМ*, карта 45, адзначае ў пэўных мясцовасцях аглушэнне некаторых, але не ўсіх, канцавых зычных. Даследаванне Самуйлавай (Самуйлова) тэкстаў XIII ст. з некаторых усходнеславянскіх мясцовасцяў выявіла паслядоўнасць у напісанні *-т* замест *-д*, але няма ясных довадаў, што ў XIII ст. аглушаліся таксама фрыкатыўныя *з* і *ж*. І цяперашнім часам ёсць гаворкі, дзе канцавыя звонкія фрыкатыўныя захоўваюцца, але ўсе выбухныя на канцы слова аглушаюцца (Бузук).

Гістарычныя пацвярджэнні аглушэння (і азванчэння) зычных у сярэдзіне і на канцы слова разнастайныя:

1. Неэтымалагічныя напісанні ў беларускіх тэкстах (часта ў розных формах): напр., *светки* (1450; суч. бел. *све́дкі*, дарэф. бел. *сьвéт-*

[1] Што да захавання канцавых звонкіх зычных, то даўнейшыя кіеўскапалескія гаворкі (як аснова паўднёвабеларускіх і паўночнаўкраінскіх гаворак) падобныя да сербска-харвацкае мовы, а што да захавання звонкіх зычных перад глухімі – г. зн. звонкасці на канцы склада, а не слова – гэтыя гаворкі, відаць, унікальныя сярод славянскіх моваў.

кі); *прозьбу* (1486) – поруч з формай *просьбою* (1584); гіперкарэктнае *свиребка* (1542; суч. бел. *свірэ́па*), але ў тым самым тэксце знаходзім і *свирепъ*, а ў іншым – *свирепекъ* (1589); *четверкъ* (1599); *витепского* (1600); *Кготартъ*, *Кготардъ*, *Кготарту*, *Кготарду* (уласнае імя *Готард*, 1600). Гіперкарэктнае з выгляду напісанне *клейнод* (1528; але таксама *клейнотъ* (1597), *клейнотахъ* (1580) < сярэд.-в.-ням. *kleinot*, запазычанае праз польск. *klejnot*) менш пэўнае, бо ёсць сярэд.-лац. *clenodium* і суч. ням. *Kleinod*; параўн. таксама суч. бел. *кляйноды*.

2. Літоўскія запазычанні з беларускае мовы: напр., *susietka* (1668) – параўн. бел. *сусе́дка*; *vatka*, *votka* (1579) – параўн. бел. *во́дка*.

3. У беларускіх тэкстах цюркска-арабскім пісьмом этымалагічнае *čb* пішацца як *ǯb*; напр., *liǯbi* Р.скл. адз. (XVII ст.; суч. бел. *лі́чбы*); *sb* пішацца як *zb*: напр., *prwzbā* (XVII ст.; суч. бел. *про́сьба*); бел. лац. мае аглушэнне ў *Nograt* (1457–1459), калі гэта азначае Ноўгарад (Северскі).

4. Дадзеныя габрайскіх тэкстаў блытаныя:

а) на канцы слова яны звычайна маюць звонкія зычныя: *nᵉš/swwyz* (1662; суч. бел. *Нясві́ж*; габрайскі алфавіт не мае літары для пазначэння *ž*, і ў тэкстах яго найчасцей перадае літара *z*). Параўн. таксама *wyṭwld* ‘Вітольд’ (1488), але таксама *wyṭwlṭ* (1669) < літ. *Výtautas*. Габрайскае напісанне з *d*, відаць, пераймае кірылічныя і/або лацінічныя правапісныя нормы, якія грунтуюцца на польск. *Witold*, параўн. бел. лац. *Withawt* (1390), але *Withawdus* (1413);

б) аглушэнне добра рэпрэзентаванае ў пазіцыях у сярэдзіне слова: *wwytᵉpsq* (1780; суч. бел. *Ві́цебск*); *kwrwpkᵉ* ‘падатак з продажу’ (1665–1671; суч. бел. *каро́бка*).

Сучасныя гаворкі ідышу, пашыраныя на тых самых тэрыторыях, што і беларускія гаворкі, могуць пэўным чынам памагчы вызначыць храналогію аглушэння зычных на канцы слова ў беларускай мове. У процілегласць беларускім гаворкам, якія, як адзначана вышэй, захоўваюць звонкія зычныя на канцы слова збольшага толькі на Палессі, усе разнавіднасці ідышу, якімі гавораць у Беларусі, маюць звонкія зычныя на канцы слова. Гэтую рысу ідыш набыў у славянскім асяроддзі; нямецкія дыялекты страцілі звонкасць канцавых зычных у XI ст. Адноўлены, а не першапачатковы характар звонкасці ў канцы слова відаць таксама з яе дыстрыбуцыі, якая часта пярэчыць таму,

чаго можна было спадзявацца з этымалагічнага погляду, напр., **brif* ‘ліст’ з этымалагічным *f* замяніўся ў *briv*, а **tif* ‘глыбокі’, таксама з этымалагічным *f*, застаўся нязменным (параўн. літар. ням. *Brief, tief*). Можна думаць, што калі габраі, якія гаварылі ідышам, асталяваліся ў Беларусі (пераважна паміж 1350–1500 гг.), на захадзе краіны яны заспелі яшчэ захаваную звонкасць зычных на канцы слова. Звонкі на канцы слова знаходзім таксама ў прыбалтыйскім ідышы, але не ў польскім (з прычыны масавага перасялення габраяў з Нямеччыны ў Польшчу ў XV–XVI стст.). Але магчыма, што звонкасць магла быць набытая і ў Польшчы; польская мова захоўвала гэтую рысу яшчэ ў XV ст.

Параўнанне дадзеных ідышу з беларускім матэрыялам дае пэўную гістарычную перспектыву сінхранічнай карціне, якую рэпрэзентуюць сучасныя гаворкі; найбольш праўдападобна, нейтралізацыя звонкасці на канцы слова пачалася ў полацка-разанскай зоне і пашырылася на паўднёвы захад і поўдзень. Але рэканструкцыя даўнейшых геаграфічных абшараў праблематычная. Мы не толькі не можам вызначыць, наколькі звузіўся першапачатковы абшар са звонкасцю на канцы слова ў пэўны час, – у нас няма нават пэўнасці, што ўсе сучасныя тэрыторыі, для мовы якіх характэрныя звонкія зычныя на канцы слова, адлюстроўваюць першапачатковую сітуацыю ў прабеларускіх гаворках. Як паказваюць дадзеныя ідышу, страчаную раней сістэму звонкасці на канцы слова магчыма аднавіць на падставе аналогіі ў межах парадыгмы.

Захаванне звонкасці на канцы слова і звонкіх зычных перад глухімі ў сярэдзіне слова ў частцы беларускіх гаворак паказвае, што статус звонкіх зычных быў мацнейшы, чым глухіх. Далейшыя довады на карысць гэтае высновы – пазнейшае дабаўленне цвёрдых *ʒ́* і *ʒ* ды дадатковыя крыніцы *g* да пáры існым прадуктыўным глухім адпаведнікам; акрамя таго, большасць гаворак адкінула чужы *f*, які тэарэтычна мог стаць глухім адпаведнікам існаму *v* (гл. пра гэта ў зменах 39, 42, 44).

Асаблівай праблемай ёсць прыпадабненне паводле звонкасці на граніцы слоў, найперш у прыназоўніках. Пасля страты *ъ* у прыназоўніку *съ* і страты *ь*, а пасля *j-* у прыназоўніку *из* (< **jьz*) стварыліся ўмовы для зліцця гэтых двух прыназоўнікаў: *с* з’яўляецца ў абодвух значэннях перад глухімі зычнымі, *з* – у абодвух значэннях перад звонкімі; пасля перыяду хістання перавагу ў пазіцыі паміж санантамі і га-

лоснымі аддалі *з*; форму *са* дагэтуль ужываюць перад збегамі зычных, якія пачынаюцца са свісцячага, напр., *са звóнам*. Замена *от(ъ)* на *од* адбылася, відаць, праз выраўноўванне паводле такіх прыназоўнікаў, як *подъ*, *надъ* і *передъ*. Цікава, аднак, што ў абодвух выпадках перавагу аддалі звонкаму варыянту. Раннія прыклады – *зъ дѣтьми* (1406), *одъ Олексеева* (1398).

Выбраная бібліяграфія

B.-C. Katz. *Lekorot hayehudim berusia, pojlin velita*. B, 1899, 32.

П. Бузук. "Да характарыстыкі дыялектаў паўднёвабеларускіх і пераходных да ўкраінскіх", *Sveslovenski zbornik*. Zagreb, 1930, 159.

Н. Самуйлова. "О развитии категории глухости–звонкости согласных в русском языке (явления конца слова)", *ВМУ* 1959, 3.

K. Būga. *RR* 3, 1961, 254–255.

Змена 27. Развіццё прыстаўных галосных у дыялектах (XII ст.?). У некаторых словах пасля страты слабых рэдукаваных сананты ў пазіцыі на пачатку слова апынуліся побач з зычнымі, якія да страты слабых рэдукаваных стаялі за гэтымі рэдукаванымі. Такія пачатковыя збегі зычных з санантамі *r*, *l*, *m* як іх першымі складнікамі аказаліся няўстойлівыя і ў большасці прабеларускіх гаворак, і ў тых усходнеславянскіх дыялектах, што сталіся асновaю ўкраінскае мовы ды, у меншай ступені, расійскае. Збегі санантаў на пачатку слова набылі, як правіла, прыстаўны галосны, звычайна *і-* або *а-*: SC- > VSC-. Магчыма, прыстаўны галосны ўзнік у адказ на непрымальныя збегі зычных на сутыку слоў. Адсутнасць прыстаўнога галоснага назіраецца на паўднёвым захадзе, а таксама ў паасобных іншых мясцінах, раскіданых па ўсёй Беларусі (гл. *ДАБМ*, карты 26–27). Прыстаўныя *і-* і *а-* фіксуюць на ўсёй астатняй тэрыторыі краіны, пры гэтым *а-* пануе на паўночным усходзе, а *і-* – на поўдні (і ў суседніх паўночнаўкраінскіх гаворках). Ёсць таксама асобныя выпадкі іншых прыстаўных галосных – *э-*, *о-* (гл. *ДАБМ*, каментар да картаў 270–271, 299).

Прыклады прыстаўнога галоснага: прабел. *ръжанъ* > *ржаны* > бел. *іржаны́*, *аржаны́* – параўн. рас. *ржано́й*, але *ръжь* > рас. *рожь*. (формы *оржаныи* [1526] і *оржаное* [1593] – мабыць, гіперкарэктныя напісанні, якія ўскосна адлюстроўваюць аканне); прабел. *мьгла* > *імг(л)á* (але

ашмянскае дыял. [м'ігла́] – параўн. літ. *miglà* 'туман'); *мъха* (Р.скл. адз.) > **мху* > *імху́*; прабел. *мъхы* (В.скл. адз.) > **мхи* > бел. *імхі́*, але *мъхъ* > *мох*; дыял., дарэф. бел. *Амсці́сла́ў* (суч. бел. *Мсці́сла́ў*) < *Мьстиславъ* – параўн. ід. *amčislev*; прабел. *льняны* > бел. *ільняны́* (параўн. рас. *льняно́й*); прабел. *лъжывы* > бел. *ілжы́вы* – параўн. рас. *лжи́вый*.

І ў літаратурнай беларускай мове, і ў тых гаворках, дзе ёсць прыстаўны галосны, ён мае да пэўнай ступені неабавязковы характар; у некаторых кантэкстах прыстаўны галосны можа апускацца, асабліва калі слова перад ім канчаецца на галосны, напр., у паўднёварасійскай мажайскай гаворцы – з генетычнага боку, гаворцы полацка-разанскае групы – [іржы] 'жыта' (Р.скл. адз.), але [мноүэ ржы] 'шмат жыта' (Broch). Прыстаўныя галосныя могуць таксама апускацца ў паэзіі дзеля рытму. Аднак у большасці беларускіх гаворак прыстаўны галосны стаўся часткаю слова, вось жа яго прысутнасць звычайна не залежыць ад кантэксту.

Збегі "санант + зычны" на пачатку слова маглі касавацца і фактычна касаваліся генералізацыяй формы з рэфлексам моцнага рэдукаванага – з'ява, тыповая для іменных парадыгмаў, напр., **мху* (Р.скл. адз., а таксама іншыя ўскосныя склоны) перамянілася на аснове формы назоўнага склону адзіночнага ліку *мох* (< *мъхъ*) у *мо́ху* (гл. змену 21). Вось жа ў некаторых выпадках узніклі дублеты, як правіла, прынятыя ў літаратурнай беларускай мове: напр., *імху́* ~ *мо́ху*, *імхо́м* ~ *мо́хам* – але *імхі́* захавалася ў літаратурнай беларускай мове без дублета (хоць дарэформавая беларуская мова мае таксама *махі́*).

Там, дзе губны насавы стаіць перад зубным насавым, як у формах *мне*, *мно́ю*, прыстаўны, відаць, не зафіксаваны, дарма што насавыя першапачаткова раздзяляў рэдукаваны: адпаведна *мънѣ*, *мъною*. Магчыма, тут прыстаўнога гуку ўнікаюць дзеля ціску мадэлі формаў роднага-вінавальнага склону *мяне́*. (У словазлучэнні *перада мно́ю* дадатковы галосны гістарычна ёсць часткаю прыназоўніка; параўн. таксама рас. *передо* [мно́й] < *передъ*.) Перад іншымі санантамі пачатковы *м-* не набывае прыстаўнога галоснага, напр.: *мро́і*, *млець*.

Неабавязкова ўжыванага прыстаўнога *і-* не трэба блытаць з неабавязковым *і-* перад *с-*, які паводле паходжання не прыстаўны, а развіўся ў выніку змешвання прыназоўнікаў *съ* і *из* (**jьz*) (гл. у змене 26

разбор зліцця гэтых двух прыназоўнікаў), напр. *(і)спáс* ‘Збаўца’, *(і)стýжка*. Беларускі ідыш мае *izrub* ‘зруб’, дзе ў самой беларускай мове – *(і)/(у)зруб* (параўн. рас. *сруб*) (гл. *ДАБМ*, каментар да картаў 245, 270–271). Асаблівы выпадак – бел. *аўтóрак* (параўн. рас. *втóрник*), які ўзнік, відаць, у выніку перамяшчэння граніц слова ў канструкцыях на ўзор *въ въторъкъ* > *ва вторак* > *в аўтóрак*.

Хоць прычынаю развіцця прыстаўных галосных была ўрэшце страта слабых рэдукаваных, невядома, ці адбылася гэтая змена адразу пасля падзення рэдукаваных, ці праз нейкі час. З таго, што паўночна-ўсходняя і паўднёва-заходняя зоны, агулам кажучы, прапануюць дзве разнавіднасці прыстаўных, можна дапусціць, што развіццё прыстаўных належыць да пары, калі кіеўска-палескія і полацка-разанскія гаворкі былі яшчэ самастойныя – г. зн. да XIV–XV стст. Пісьмовыя дадзеныя супярэчныя; часам знаходзім напісанні на перамену з прыстаўнымі галоснымі і без іх, але першае пэўнае пацвярджэнне існавання прыстаўных галосных датуецца толькі XVI ст.

Выбраная бібліяграфія

O. Broch. “*ar-*, *al-*, *ir-* und ähnl. anstatt. *r-*, *l-* usw. im Russischen”, *ASPh* 36, 1916.
J. Otrębski. *Gramatyka języka litewskiego* 1. W, 1958, 241.

Змена 28. Развіццё перадвакальных *ѵ* і *ѵ’* з гукаў *w* і *w’*; чаргаванні *w*||*u*, *j*||*i* (XII ст.). Звычайна лічаць, што праславянская мова мела *w*, нават калі традыцыйна гэты гук абазначалі літараю *в*. У становішчы перад галоснымі праславянскія $w_{4,10}$ у прабеларускіх гаворках замяняліся ў *ѵ*, а w'_{19} > *ѵ’*. Напр., бел. *Тýраў*, але *Тýрава* – параўн. стар.-рус. *Туровъ*; бел. *кроў* || *крывí*. Фанетычныя паводзіны сучаснага беларускага *ѵ* сведчаць пра яго паходжанне з *w*. З усіх звонкіх зычных толькі *ѵ* не можа асіміляваць папярэдніх глухіх зычных (гл. змену 26): напр., *свет* [с’в’эт], а не *[з’в’эт][1]. Пакольк беларускі *ѵ* дагэтуль абмежаваны пазіцыяй перад галосным, у запазычаных збегах зычных, што пачынаюцца з *ѵ*, людзі, якія гавораць беларускаю моваю, замяняюць яго на [ў], напр., ід. *xavrúse* > бел. *хаўрýс*, ід. *xévre* > бел. *хéўра*.

Параўн. таксама неалагізмы *саўгáс* – запазычанае складанае слова, утворанае на ўзор рас. *совхóз* (*совéтское хозя́йство*), дзе бел. *саў-* – скарачэнне ад бел. *савéт* з рас. *совéт*, а *-гас* – скарачэнне бел. *гаспадáрка*, якім перакладаецца рас. *хозя́йство*.

Білабіяльны характар гуку, які абазначаўся графемаю *в*, выяўляецца ў прабеларускіх тэкстах, пачынаючы ад XIII ст., праз ужыванне на перамену графем *у* і *в* перад зычнымі: напр., *оу Смольнѣскъ* < *въ* (XIII ст.; суч. бел. *у*); *Витовт* (1384) < літ. *Výtautas* (гл. змену 41). У праўкраінскіх дакументах такое чаргаванае ўжыванне адзначаюць ужо ў XI–XII стст. Дадзеныя арабскіх дакументаў двухзначныя: напр., *Тýраў* (стар.-рус. *Туровъ*) з'яўляецца ў напісанні з *b* (**t(u)rū*/*ōbī* або **t(u)rū*/*ōb(i)ja*), якое таксама сустракаецца ў форме *kūyāb(h)* 'Кіеў' у X ст., *ḳābnū* 'Коўна' (польск. *Kowno*) у XII ст. і г. д. Няясна, ці абазначае арабская *b* у гэтых словах славянскі *v* ці *w*; бо для перадачы апошняга гуку арабы маглі б лёгка ўжыць сваю графему *waw*.

Яшчэ адзін довад, што *в* перад зычнымі вымаўляўся як білабіяльны, палягае ў тым, што ў некаторых марфемах гэты гук мог апускацца: напр., *Аксён* (уласнае імя; 1647) < грэцк. *Aúkséntios*. Этымалагічны *у-* перад зычнымі таксама закранулі працэсы, звязаныя з трансфармацыямі *в*: ён можа змяняцца ў гук *ў*. Адносная неабавязковасць *в* ([ў]) і *у* на пачатку слова перад зычнымі характарызуе беларускую тэрыторыю ад прабеларускае пары аж дагэтуль, напр., *не вмѣли* мн. прош.ч. (XV ст.); бел. цюрк. *wžū* (XVII ст.; суч. бел. *ужó*); прасл. **vьdova* > бел. *удавá* пры форме *для ўдавы́*. Ненаціскны *і* паводзіць сябе аналагічна ў чаргаванні з *й*: напр., *во мя* (XVII ст.) поруч з *во ймя* ў тым самым тэксце (суч. бел. *у імя́*).

Тэксты не даюць ніякіх падказак наконт храналогіі пераходу [ў] > [в] перад галоснымі. Можна толькі сцвярджаць, што гэтая змена адбылася пасля страты рэдукаваных.

Пра перараскладанне на пачатку кораня *v* як прыстаўнога элемента гл. змену 37. Паколькі сегменты *w* і *v* у XII ст. можна, мабыць, лічыць алафонамі аднае фанемы, як і ў сучасны перыяд, *v* і *w* у наступных зрэзах будуць разглядацца як адзін сегмент.

---

[1] Словы з пачатковым *зв-* або паходзяць ад першапачатковага (познепраславянскага) спалучэння зычных *zv* (напр., *звер*), або з'яўляюцца бімарфемнымі, дзе *з* развіўся пазней, напр., з прасл. **sъ* (напр., *звéчара*).

У сучаснай беларускай мове захоўваецца сітуацыя, якая адбілася ў старых тэкстах: напр., *у* і *і* абмяжоўваюцца пазіцыямі на пачатку слова і пасля зычных. Аднак дыстрыбуцыя *і* > *j* і *у* > *ў* у сучасны перыяд розніцца, і дзеля гэтага яе трэба разглядаць як не звязаныя між сабою з'явы. Гэта таму, што два гэтыя паўгалосныя розныя паводле паходжання: *у*, які пераходзіць у *ў*, паходзіць пераважна з *въ*, а для *і*, які пераходзіць у *j*, падобнага працэсу няма (пра лёс *jь* гл. змену 35).

Утварэнне дыфтонгаў з *ў* як другім складнікам здаецца аўтаматычным. Пасля галоснага *у* > *ў*: напр., *уласці́вы* || *неўласці́вы*, *у шко́лу* || *зайсці́ ў шко́лу*. Гэтаксама ў кожным спалучэнні трох галосных, дзе сярэдні сегмент *у [...]*: напр. *[...] на кватэ́ры ў* [в]*Але́ся*); *[...] але́ ў* [в]*апо́шні*.

Змена *і* > *j* мае неабавязковы характар і вельмі абмежавана паводле дыстрыбуцыі. Напр., хоць *і* > *j* у *яна́* [й]*дзе́* || *ён ідзе́*, але ў шмат якіх словах, асабліва "інтэрнацыянальных", пачатковы *і* не пераходзіць у *j*, напр.: *(і)на́чай*, *ідэ́я*. Яшчэ адно абмежаванне змены *і* > *j* датычыць спалучэнняў трох галосных, дзе сярэдні сегмент – *і*. У спалучэннях з іншай структурай, чым V + *і* + *и*, *і* можа пераходзіць у *j*: напр., *а* + *і* + *а* > *а* + *j* + *а*: *я* [й] *апра́ўдваю*. Аднак у спалучэннях V + *і* + *и* сярэдні *і* звычайна не рэдукуецца ў *j*, затое *и*, трэці галосны ў гэтым спалучэнні, змяняецца ў *w*: напр., *і* + *і* + *у* > *і* + *і* + *w* (а не $^{+}$*і* + *j* + *и*): *аб шча́сці і ўда́чах*, *над во́дамі і ў сваю́ чаргу́*; *е* + *і* + *у* > *е* + *і* + *w* (а не $^{+}$*е* + *j* + *и*): *у руцэ́ і ўсё*. Гэта не надта строгае правіла; з яго здараюцца выключэнні, матывацыі якіх можна шукаць у свабодзе таго, хто гаворыць, больш ці менш падкрэсліваць розныя часткі выказвання. Напр., *а* + *і* + *и* > *а* + *і* + *w*, калі *і* пад націскам, як у фразе *магчы́ма і ў кале́джы*, але *а* + *і* + *и* > *а* + *j* + *и*, калі *і* не пад націскам, як у фразе *магчы́ма* [й] *учо́ра*. Пасля паўзы, якая ідзе за словам, што канчаецца на галосны, *и* і *і* не абавязкова пераходзяць у *w* і *j*, гэта адлюстроўваецца на пісьме коскаю, напр.: *было́ й дзі́ўна, і ра́дасна*. Гэтыя новыя з'явы, звязаныя з чаргаваннем *и*||*w* і *і*||*j*, трэба аднесці да нядаўняе пары, бо прасачыць іх паходжанне ў тэкстах цяжка (гл. змену 51).

Выбраная бібліяграфія

С. Кульбакин. "Спирант *в* в славянских языках", *Почесть. Сборник статей по славяноведению, посвященных профессору Марину Степановичу Дринову*... Харьков, 1908.

A. Flinta. *Fonetická povaha a historický vývoj souhlásky "v" ve slovanštině.* Pr, 1916 (= Rozpravy České Akademie, Třída III, č. 42).

Змена 29. Ацвярдзенне губных (XII ст.?). Ва ўсіх сучасных беларускіх гаворках процістаўлення мяккіх і цвёрдых губных на канцы слова і перад зычнымі больш няма (шмат у якіх сучасных беларускіх гаворках мяккіх губных перад галоснымі, апрача *і*, проста няма). Ацвярдзенне мяккіх губных – p'_{16}, b'_{17}, m'_{18} і w'_{19} – у канцы слова і склада было паступовым працэсам, які пачаўся хіба тады, як ужо адбывалася лабіялізацыя *е* і *ь* у *о* (гл. змену 18), але, мабыць, на некаторых абшарах ён мог скончыцца пасля заканчэння тае лабіялізацыі. Паміж двума гэтымі працэсамі няма прычыннае сувязі; але ўмовы, пры якіх лабіялізаваліся *е* і *ь*, да нейкай ступені дазваляюць вызначыць якасць губных зычных. Як адзначана ў змене 18, агубленне *е* і *ь* адбывалася перад цвёрдымі зычнымі, але на пачатковых стадыях, магчыма, не перад заднепаднябеннымі і губнымі.

Тое, што змену *е*, *ь* > *о* нельга знайсці перад гістарычна палаталізаванымі канцавымі губнымі, але цяпер яна фіксуецца перад некаторымі гістарычна палаталізаванымі губнымі ў сярэдзіне слова перад зычнымі (*цёмны* < *тьмьн-*), можа схіліць нас да дапушчэння, што ў пару лабіялізацыі *е* і *ь* губныя ў сярэдзіне слова ўжо ацвярдзелі, а губныя на канцы слова, першапачаткова мяккія, заставаліся мяккімі (параўн. *сем* < *семь*). Аднак сучаснае дыстрыбуцыі рэфлексаў *е*/*о* з *е*/*ь* перад губнымі нельга дастасоўваць механічна, каб вызначыць храналогію ацвярдзення губных. Словы на ўзор суч. бел. *цёмны* не могуць быць довадам, што мяккія губныя перад зычнымі ацвярдзелі раней, чым адбылася змена *е*, *ь* > *о*. Гэта патрабавала б дапусціць працэс накшталт **тьтьп-* > **т(ʼ)ьтьп-* > *тʼотп-*, што, відаць, недарэчна. Мала таго, няма прычыны думаць, што спачатку ў складзе *-тьп-* страціўся першы слабы *ь* і ў выніку гэтага *-тʼ-* страціў мяккасць, і толькі тады моцны рэдукаваны ў складзе *тьт-* зліўся з *о*, – бо ёсць шмат довадаў, што губныя перад зычнымі ў сапраўднасці захавалі сваю першапачат-

ковую мяккасць у пару лабіялізацыі *е*, *ь* > *о*, параўн. *царэ́ўна* < **carewьna*, *зе́мскі* < **zemьsk-*, прозвішчы на *-эўскі* < **-evьsk-*, напр., *Баршчэ́ўскі*, *Гарбачэ́ўскі* і г. д. Гэтыя сінхранічныя дадзеныя, поруч з арфаграфічнымі дадзенымі полацкіх тэкстаў XIII–XIV стст., якія ясна паказваюць ацвярдзенне перад зычнымі групы *-ўъ-*, але не *-бь-*, могуць сведчыць пра два спосабы ацвярдзення губных перад зычнымі: або праз губны (напр., *-м'-* > *-м-* раней за *-ў'-* > *-ў-*), або праз збег зычных. Трансфармацыі **t' ьт' ьп-* > **t' em' n-* > **t' emn-* (> суч. бел. *цёмны*) – але *зе́мскі* (<**zemьsk-*), поруч з дублетамі накшталт *Магілёў* ~ *Магілёў* (параўн. рас. *Могилёв*), дзе канцавы губны стаяў перад спрадвечным *ъ*, наводзяць на думку, што пасля ацвярдзення губных па ўсёй Беларусі агубленне *е*, *ь* > *о* магло выбарачна пашырыцца ў некаторых гаворках на пазіцыю перад губнымі (мабыць, спачатку на паўночным усходзе і толькі потым на паўднёвым захадзе). У сучаснай беларускай мове гэты малюнак крыху зацямняецца познімі запазычаннямі з расійскае мовы, дзе лабіялізацыя *е*, *ь* часткова зафіксавана і перад губнымі, напр., *вучэ́бны* (з рас. *учёбный* < *учебьн-*), але *прыёмны*, *наёмны* – мабыць, таксама з расійскае.

Прыклады ацвярдзелых губных можна знайсці ў прарасійскіх тэкстах XII–XIII стст. і ў прабеларускіх тэкстах XIV ст. Як пацвярджэнне для прабеларускае мовы можна падаць ужыванне *ъ* замест гістарычна правільнага *ь* на канцы слова або перад зычнымі: напр., *немъчина* 'немца' (1409), *любовъ* (1427). Дадатковыя довады ацвярдзення даюць паасобныя гіперкарэктныя напісанні.

Пазіцыйнае ацвярдзенне губных паменшыла частасць мяккіх губных: p'_{16} распаўся на p_{16} і p'_{16} і г. д.; але не мела ўплыву на сістэму зычных у прабеларускай мове. Затое яно мела свае наступствы ў іменнай марфалогіі, дзе некаторыя назоўнікі, якія спачатку канчаліся на *-ь* пасля мяккага губнога, змянілі свой тып скланення з мяккай асновы на цвёрдую: напр., **holubь* першапачаткова скланяўся як **gostь*, але ў форме *голуб* ён стаў скланяцца як *дом* (< *домъ*).

Ацвярдзенне губных перад пярэднімі галоснымі *і* і *е* пачалося ў некаторых мясцінах на поўнач ад Ясельды і Прыпяці. Губныя, якія стаялі перад непярэднімі галоснымі, пазбыліся мяккасці ў выніку трансфармацыі ў асобны сегмент *j* на падобным, але шырэйшым абшары (*ДАБМ*, карты 51–53), напр., *м'* > *мj* і г. д., як у [мjа́]*ca* і [мнjа́]*ca* < [м'а́]*ca* (літар. бел. *мя́са*), [мjо]*д* < [м'о]*д* (літар. бел. *мёд*) і г. д. Старым прыкладам можа быць бел.

габр. *mʲdnycʲ* ‘мядніца’ (1617) у караімскім тэксце з Заходняе Беларусі (але бел. *мѣдницъ* Р.скл. мн. (1597)): параўн. укр. *мідни́ця*, суч. літар. бел. *мядні́ца*. Абедзве з’явы пашыраліся з украінскае мовы на поўнач пасля таго, як адбылося ацвярдзенне перад зычнымі. Довадам таго, што ацвярдзенне губных у паўднёва-заходніх гаворках – пазнейшая з’ява, ёсць тое, што ацвярдзенне адбывалася пасля лабіялізацыі *е* > *о* – змены, якая дасягнула паўднёва-заходніх абшараў досыць позна (гл. змену 18).

Тэндэнцыя цвёрдых губных зычных да моцнае лабіявелярызацыі, здаецца, мела ў паўднёва-заходніх беларускіх гаворках яшчэ адзін вынік. У гэтых гаворках пасля губных адбыўся пераход *ы* > *у* незалежна ад месца націску: напр., літар. бел. *мы́ла*, *спыта́ць*, але паўдн.-усх. дыял. [му́ла], [спута́ц’] (гл. *ДАБМ*, карты 22, 24). Змена *ы* > *у* пасля губных паказвае, што *ы* (які пасля страты фанемнага статусу – гл. змену 22 – стаў прыпадабняцца да папярэдняга зычнага) пачалі вымаўляць у гэтых пазіцыях як галосны задняга раду. З прычыны яе абмежаванае тэрыторыі (у суседніх украінскіх і расійскіх гаворках гэтае змены няма) гэтую змену трэба, мабыць, датаваць перыядам пасля сфармавання ўласна беларускае мовы. У кірылічных тэкстах няма і знаку такое змены. У беларускіх тэкстах канца XVI ст., пісаных габрайскім пісьмом, *Бы́хаў* (горад у Магілёўскай вобласці – абшар, на якім сёння рэфлексы *ы* пасля губных зычных мяшаныя, але *у* пераважае) знаходзім у форме *bukhʲv* (з вакалізацыяй першага складa). Калі габрайскае напісанне з *u* (замест *i*) – не памылка (графемы для *ў* [u] і *ы* [i] з выгляду вельмі падобныя, і дзеля гэтага іх можна было зблытаць), мы маглі б паспрабаваць аднесці дыялектную лабіялізацыю *ы* > *у* да сярэдзіны XVI ст., але на гэта трэба болей довадаў. Беларускія тэксты XVII ст. цюркска-арабскім пісьмом даюць багата прыкладаў *ы* > *у*.

Вынікам лабіялізацыі, якая ў абмежаваным маштабе была ў пэўнай ступені працэсам, адваротным праславянскай трансфармацыі $\bar{u}_1 > \bar{y}$ (гл. змену 6), стала з’яўленне ў гаворках яшчэ аднае крыніцы гуку *у*, які цяпер павялічыў сваю частасць (агублены галосны задняга раду верхняга ўздыму мае на гэтай тэрыторыі самае рознае паходжанне: *у*, *о*, *в*, *л* і вось цяпер *ы*). Змена *ы* > *у* ў формах дзеяслова *быць* (*ДАБМ*, карта 23) – [буц’] (інф.), [буў] (м.р. адз. прош.ч.) мае больш марфалагічны, як фаналагічны характар (параўн. *у* ў *будзь* заг.л., *бу́ду* 1 ас. адз. буд.ч.) і тэрытарыяльна пашырана далёка больш, як прыклады *ы* > *у* пасля губных у іншых каранях. Лабіялізацыя *ы* не зрабіла ўплыву на статус апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці.

Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. “К истории звуков и форм белорусской речи”, *РФВ* 29, 1893; “К вопросу о границе белорусских говоров. Звук *у* вместо *ы* в некоторых белорусских говорах”, *РФВ* 53, 1905.

L. Ossowski. "Przejście *y* w *u* po wargowych w niektórych gwarach pd. białoruskich", *LS* 3, 1934.

М. Бірыла. "Этымалагічна мяккія губныя зычныя ў беларускіх народных гаворках", *Працы* 3, 1957.

А. Булыка. *Развіццё арфаграфічнай сістэмы старабеларускай мовы.* Мн, 1970, 115–116.

Змена 30. Развіццё мяккіх заднепаднябенных у пазіцыі перад галоснымі (XII ст.). Да XII ст. заднепаднябенныя ў прабеларускай мове былі абмежаваныя пазіцыяй перад галоснымі задняга раду і перад санантамі (у т. л. *v*). У пазіцыі перад галоснымі заднепаднябенныя, перайшоўшы ў выніку першае і другое палаталізацыі ў праславянскай мове ў зазубныя і зубныя, ніколі не памякчаліся. Перад мяккім зычным заднепаднябенныя маглі памякчацца, але вельмі абмежавана і не фанемна, напр., у спалучэнні *кв-* перад галоснымі пярэдняга раду (прыклады пададзеныя ў змене 1). Кірылічныя прабеларускія тэксты не адрозніваюць у такіх выпадках мяккіх і цвёрдых заднепаднябенных; беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом – пазнейшыя паводле часу – зазвычай, захоўваюць графему *kāf* (у транслітарацыі *k*) для [к'] і графему *qāf* (у транслітарацыі *q*) для [к]. У найдаўнейшых беларускіх рукапісах цюркска-арабскім пісьмом з XVII ст. групы *кв-* перад галоснымі пярэдняга раду перадаюцца (у тым самым рукапісе) і як *kw*, і як *qw*: напр., *kwarḥu* і *qwarḥu* (суч. бел. *к вéрху*) (гл. змену 25).

Каля XII ст. прабеларускія k_{13}, γ_{14}, x_{15} (і g_{14}?), відаць, страцілі сваю лабіявелярнасць і набылі больш пярэднюю артыкуляцыю. Правіла перасоўвання заднепаднябенных наперад закранула большасць усходнеславянскіх гаворак, але не абавязкова ў той самы час: некаторыя карпацкія ўкраінскія дыялекты гэтая змена не закранула зусім. У польскай мове перад *i* памякчыліся толькі заднепаднябенныя змычныя; *x* застаўся некранутым. Для прабеларускае мовы гэты працэс відаць са змены ў напісанні *ы* пасля заднепаднябенных, што паступова замянілася літарай *и*. Тэксты падказваюць, што перасоўванне артыкуляцыі наперад адбывалася ў кіеўска-палескай зоне (будучыя паўднёвабеларускія і паўночнаўкраінскія гаворкі) у XII ст. (напр., *дикихъ* Р.скл. мн.), але не адбывалася ў полацка-разанскай зоне (паўночнабеларускія і паўднёварасійскія гаворкі) і ў паўночнарасійскіх дыялектах аж да XIII ст.: напр., на Смаленшчыне *роускии* (1229), *ризкихъ* 'рыж-

скіх' (1300), *мѣхи* (1562), *погибъ* (XVI ст.), бел. цюрк. *walikiy* (XVII ст.; суч. бел. *вялі́кі*), бел. цюрк. *mā̆ṭki* (XVII ст.; суч. бел. *ма́ткі*).

Фанетычныя паводзіны мяккіх заднепаднябенных у сучаснай беларускай мове розняцца ад паводзінаў іншых зычных сегментаў. Цвёрдыя зубныя спіранты, стоячы перад мяккімі зычнымі, набываюць мяккасць ад папярэдняга зычнага (гл. змену 25), але перад мяккімі заднепаднябеннымі гэтага не адбываецца, напр.: *с* + *л'* > *с'л'*: *слёзы*, *з* + *ʒ'* > *з'ʒ'*: *бяздзе́йнічаць*, але, напр., *з* + *г'* і *с* + *х'* у сучаснай беларускай літаратурнай мове не пераходзяць адпаведна ў $^{+}$*з'г'* і $^{+}$*с'х'*: напр., *згі́нуць*, *схіну́цца* з [зг'-] і [сх'-] *[...]*.

Пазней беларуская мова набыла мяккія заднепаднябенныя перад галоснымі пярэдняга раду яшчэ з дзвюх крыніц: (1) запазычанае лексікі і (2) выраўноўвання ў марфалогіі ўласнабеларускіх назоўнікаў. У першым выпадку заднепаднябенныя, апынаючыся перад галоснымі пярэдняга раду, вымаўляюцца як мяккія: напр., суч. бел. *геро́й* (але дарэф. бел. *гэро́й*), суч. бел. *ке́млівы*, суч. бел. *хе́ўра* (але дарэф. бел. *хэ́ўра*), бел. цюрк. *pakalnūhū*, суч. бел. *пяке́льны* (< польск. *piekielny*). У другім выпадку там, дзе вынікі другое палаталізацыі заднепаднябенных згладзіліся, мяккія заднепаднябенныя прыняліся перад *і* і *е* ў канчатках некаторых склонаў назоўнікаў мужчынскага і жаночага родаў. Гэтыя формы вытворныя. Беларуская літаратурная мова мае іх у формах назоўнага склону множнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду (напр., *берагі*), дзе адбывалася ўзаемадзеянне першапачатковых назоўнага і вінавальнага склонаў у множным ліку. У дыялектах заднепаднябенныя ўводзіліся таксама перад *-е* (< *-ѣ*) у давальным і месным склонах адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду ў паўночна-ўсходніх гаворках і сям-там у іншых мясцовасцях: *на ла́ўке* (літар. бел. *на ла́ўцы*) (гл. *ДАБМ*, карты 65, 66, 73, 74, а таксама каментар да карты 75, с. 500). Паўночна-ўсходняя беларуская дыялектная інавацыя магла сфармаваць ізаглосу з наўгародскім дыялектам расійскае мовы (параўн. рас. *в ла́вке* 'у краме').

Поруч з апісанымі вышэй выпадкамі мяккі *к'* сустракаецца перад *е* ў беларускіх прозвішчах на *-кевіч*, напр., *Тышкевич* (сярэдзіна XV ст.), *Волчкевич* (канец XV ст.) і г. д. Можна думаць, што формы на *-евіч* узніклі на захадзе або ў цэнтры Беларусі не пазней за сярэдзіну XV ст. пасля мяккіх або памякчаных зычных. Гук *к* прыпа-

добніўся да папярэдняга мяккага зычнага, а *о* ў суфіксе *-овіч* замянілася на *е*; перад непярэднімі галоснымі, як у слове *рэ́дзька*, *к*, можна думаць, неўзабаве страціў сваю мяккасць.

Сістэма зычных прабеларускае мовы цяпер узбагацілася праз дабаўленне мяккіх заднепаднябенных змычных (аднаго ці болей) і фрыкатыўных. Прысутнасць g_{14} і g'_{14} у прабеларускай мове XII ст. няпэўная; таму гэтыя сегменты даюцца ў дужках.

Да змены 30	Пасля змены 30	
k_{13}	k_{13}	k'_{13}
(g_{14}) (?)	(g_{14})	(g'_{14}) (?)
x_{15}	x_{15}	x'_{15}
γ_{14}	γ_{14}	γ'_{14}

Выбраная бібліяграфія

М. Пещак. "Розвиток спільно-слов'янських сполук *г*, *к*, *х* з *и* на українському грунті", *Дослідження з української мови.* К, 1958.

J. Ботош. "О появлении звуков *к'*, *г'*, *х'* в русском языке", *Studia Slavica* 12, 1966.

G. Shevelov. "Slavic Family Names in *-kevič* and the Palatalization of Velars in Belorussian", *Symbolae Philologicae in Honorem Vitoldi Taszycki.* Wr, 1968. {Перадрук. у} *ТА*.

М. Бірыла. *Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў.* Мн, 1969.

Змена 31. Развіццё якання і дыялектнага дысіміляцыйнага акання (XII ст.). Характэрная рыса большасці сучасных беларускіх гаворак – змешванне няверхніх галосных у ненаціскных складах пасля мяккага зычнага. Гэтая з'ява – шырока вядомая пад назваю якання, бо змешванне звычайна дае ў выніку *'а*, – зафіксаваная і ў расійскіх гаворках, але невядомая ўкраінскім. Яканне таксама ўласцівае літаратурнай беларускай мове, але не літаратурнай расійскай, дзе ненаціскны *е* зліваецца з *и* – з'ява, вядомая як іканне. У нашым разборы акання ў змене 7 мы выказалі прапанову разглядаць яканне як з'яву пазнейшую за развіццё моцнага акання – часткова таму, што яго пашырэнне не ва

ўсіх пунктах адпавядае геаграфіі акання (напр., ёсць гаворкі з асіміляцыйным аканнем і дысіміляцыйным яканнем).

У сучасных беларускіх гаворках ёсць 4 галоўныя тыпы якання: (1) моцнае (якое яшчэ называюць недысіміляцыйным), (2) мернае, (3) асіміляцыйнае і (4) дысіміляцыйнае, пры гэтым два апошнія тыпы зафіксаваныя ў некалькіх варыянтах.

1. Моцнае яканне, якое патрабуе *а* ва ўсіх ненаціскных складах незалежна ад якасці наступнага зычнага або націскнога галоснага, характэрнае пераважна для цэнтру краіны, але яно сям-там сустракаецца па ўсёй Беларусі, акрамя самае паўднёва-заходняе часткі, большае часткі паўднёвага ўсходу, а таксама паўночна-ўсходняга кутка. Моцнае яканне спаборнічае з еканнем на паўднёвым усходзе і з дысіміляцыйным яканнем на паўднёвым захадзе і паўночным усходзе. На абшарах, дзе адначасна існуюць і еканне, і моцнае яканне, еканню аддаюць перавагу старэйшыя людзі, а моцнае яканне – норма сярод моладзі (гл. *ДАБМ*, каментар да карты 4). Пашырэнне моцнага якання можна вытлумачыць тым, што гэты тып уласцівы і літаратурнай мове. Правапісныя нормы звычайна адлюстроўваюць моцнае яканне ў першым пераднаціскным складзе ў спрадвечнабеларускіх словах, напр., *лес – лясы́*. У іншых ненаціскных складах *е* ў беларускім правапісе перадаецца паводле гістарычнага прынцыпу, напр., *дзяцю́к – дзецюкі́* [ʒ'а-], *во́зера* [во́з'ара].

2. Пры мерным яканні якасць пераднаціскнога галоснага залежыць ад мяккасці або цвёрдасці наступнага зычнага: *а* перад цвёрдым зычным і *і* перад мяккім. Прынцып мернага якання вядомы і расійскім гаворкам, сумежным з першапачатковымі беларускімі тэрыторыямі (напр., на Разаншчыне).

3. Асіміляцыйнае яканне, засведчанае толькі ў некалькіх мясцовасцях на паўднёвым усходзе, каля Гомеля, дае перад націскным складам *а*, калі пад націскам таксама *а*, а ў астатніх пазіцыях – *і* або *е*.

4. Дысіміляцыйнае яканне сустракаецца на паўночным усходзе, часам поруч з астраўкамі моцнага якання. У так званым віцебскім тыпе, абмежаваным паўночным усходам Віцебскае вобласці, пераднаціскны галосны перад *а́*, *е́* – *і*, у астатніх пазіцыях – *а*; у больш пашыраным жыздранскім тыпе пераднаціскным галосным ёсць *і* перад *а́* і *а* ў астатніх пазіцыях. Некаторыя навукоўцы кажуць пра "асімі-

ляцыйна-дысіміляцыйны" тып якання, але такое мяшанае азначэнне можна дастасаваць толькі да такой сістэмы якання, што яшчэ не ўсталявалася. 4 названыя тыпы можна абагульніць наступным чынам:

1. Моцнае яканне	*а*	V́
2. Мернае яканне	*а*	CV́, $\begin{cases} i \\ e \end{cases}$ C'V́
3. Асіміляцыйнае яканне	*а*	*á*, $\begin{cases} i \\ e \end{cases}$ V́ (дзе V́ не *á*)
4. Дысіміляцыйнае яканне		
а. жыздранскі тып	*і*	*á*, *а* V́ (дзе V́ не á)
б. віцебскі тып	*і*	$\begin{cases} á \\ é \end{cases}$ *а* V́ (дзе V́ не *á*, *é*)

Храналогія чатырох тыпаў якання застаецца спрэчным пытаннем, і сёння мы не можам датаваць усе гэтыя тыпы з пэўнасцю. Мяркуючы па суадносінах гэтых тыпаў, моцнае яканне належыць разглядаць як першаўзор, з якога можна вывесці ўсе астатнія тыпы – або як вынікі нармальнага развіцця моцнага якання, або як вынікі яго тэрытарыяльнага пашырэння. Калі дапусціць, што моцнае яканне ўзнікла пасля развіцця мяккіх зычных у прабеларускай мове, тады можна датаваць яго прыблізна XII ст. Мала таго, ні ў водным з тыпаў якання мы не знаходзім і знаку адрознення паміж *$_{e}a_5$ і *$\check{e}_8$ – а іх зліццё датуюць таксама XII ст. З тыпалагічнага погляду дысіміляцыйнае яканне – гэта рэдукцыя ненаціскных галосных, якая адбывалася ў гаворках, у якіх ужо было яканне. Дысіміляцыйнае яканне невядомае ў Беларусі па-за паўночным усходам – колішняй полацка-разанскай зонаю; у расійскіх гаворках дысіміляцыйныя тыпы цяпер можна знайсці ў большасці дыялектаў з аканнем, якія распасціраюцца аж да граніцы пашырэння ўкраінскае мовы. Можна дапусціць, што дысіміляцыйнае яканне першапачаткова ахоплівала тэрыторыю ад Смаленска да Курска, абдымаючы і пскоўскі дыялект расійскае мовы, які спачатку меў моцнае аканне, а таксама цэнтральныя беларускія гаворкі. Тэксты XVI ст. з Вязьмы (на паўночны ўсход ад Смаленска) пацвярджаюць погляд, што ў гэты час на тэрыторыях, якім цяпер уласцівае дысіміляцыйнае яканне, яшчэ пераважала моцнае яканне. Мернае яканне, якое не мае нічога супольнага з рэдукцыяй галосных, развілося, мабыць, на паўночным абшары паўднёварасійскай тэрыторыі. Асіміляцыйнае яканне можна

разглядаць як тэндэнцыю да гармоніі галосных, і як такое яго, напэўна, не трэба таксама звязваць з рэдукцыяй галосных. Тое, што асіміляцыйнае яканне рэдка фіксуюць у чыстай форме, відаць, апраўдвае нашу характарыстыку яго як рысы, якая наклалася на сістэму дысіміляцыйнага якання. Вызначыць храналогію мяшаных "асіміляцыйна-дысіміляцыйных" тыпаў цяжка, бо тэарэтычна яны маглі развіцца з першапачаткова моцнага, асіміляцыйнага або дысіміляцыйнага тыпу якання.

Як і ў выпадку з аканнем, тэксты даюць вельмі мала пацвярджэнняў якання. Гэтую з'яву ўпершыню сустракаем у тэкстах XIV–XV стст., напр., *вясло* (1489).

Пасля XIV–XV стст. стварыліся ўмовы для шырокага распаўсюджвання моцнага акання на поўдзень – на колішнюю паўночную частку кіеўска-палескай зоны. Пашырэнне акання на поўдзень працягваецца аж дагэтуль. Што да дысіміляцыйнага акання, дык яно магло развіцца толькі пасля страты першапачатковых рэдукаваных галосных, г. зн. пасля XII ст. Храналогію замены моцнага акання на дысіміляцыйнае вызначыць цяжка. Можна паспрабаваць дапусціць, што дысіміляцыйнае аканне развілося на Віцебшчыне і Смаленшчыне да XV ст. На іншых абшарах, у паўднёвай Беларусі, змену акання з моцнага на дысіміляцыйнае трэба лічыць зусім нядаўняю. Шырэй пра суадносіны паміж моцным і дысіміляцыйным аканнем гл. у змене 7.

Змена 32. Страта спалучэнняў з *j*, II і развіццё падвойных мяккіх зычных у гаворках (XII ст.?). Падзенне рэдукаваных прывяло да ўтварэння новых спалучэнняў з *j*: *-C'ьj-* > *-C'j-* і *Cъj-* > *-Cj-*. Апошняе з гэтых спалучэнняў не зазнала ніякіх зменаў, напр., *пад'ехд* гучыць як [падjэ́ст], тады як у большасці прабеларускіх гаворак новыя спалучэнні *C'j* аказаліся няўстойлівымі. Іх скасаванне дало іншыя вынікі, чым страта праславянскіх спалучэнняў з *j* (гл. змену 3). Калі першае спрашчэнне праславянскіх спалучэнняў з *j* у VII–VIII стст. стварыла мяккія фрыкатыўныя і афрыкаты, а таксама фанемна памякчаныя n'_9, l'_{10}, r'_{11}, дык другое спрашчэнне не прынесла якаснае змены ў зычных перад j_{12}, але ў большасці гаворак выклікала іх падваенне. І ў дыялектах з адзіночнымі, і ў гаворках з падвойнымі зычнымі элемент *j* у працэсе змякчэння звычайна прыпадабняўся да папярэдняга зычнага; гэта рэдкі ў беларускіх гаворках выпадак прагрэсіўнае асіміляцыі. Мала ў

якіх дыялектах мяккія зычныя перад *j* не паглыналі гэтага *j*[1]. Магчыма, дыялекты з адзіночным мяккім зычным, які паходзіць з групы С'*j*, таксама прайшлі праз падваенне (гл. ніжэй).

Неабходнай умовай падваення было тое, каб перад групай С*ьj* першапачаткова не было зычнага. Дзеля гэтага няма падваення ў такіх формах, як *кóсцю*, *мíласцю*, *шчáсце* < **kostьjǫ*, *milostьjǫ*, *sъčęstьje*. Падваенне, здаецца, выконвае нешта накшталт размежавальнае функцыі, бо яно часта адбываецца на граніцы марфем, найчасцей перад суфіксам *-ьj(e)*, *-ьj(a)* і ў формах творнага склону адзіночнага ліку назоўнікаў жаночага роду, што канчаюцца на зычны, як паказана ў вышэй- і ніжэйпададзеных прыкладах. Але падваенне магчымае і ўнутры кораня: напр., *ліць* || *ллю* (< *lьjǫ*); *ззяць* (параўн. укр. *ся́(я)ти*). Падваенне мяккіх зычных можна знайсці ў суседніх расійскіх і ўкраінскіх гаворках, але не ў польскіх; яно з'яўляецца нормаю і ў літаратурных беларускай і ўкраінскай мовах. У большасці прабеларускіх дыялектаў падваенне закранула зубныя (акрамя *р*) і зазубныя (гэткая ж сітуацыя і ў сучаснай літаратурнай мове). Пададзены ніжэй спіс адлюстроўвае становішча ў сучаснай літаратурнай мове.

л̄: *ллю* (1 ас. адз.); *кóлле* (зборны назоўнік)

н̄: *пыта́нне*; *малання́* 'маланка' (у гаворках таксама з *н̄*, дысіміляваным у *д* [маладн'á])

т̄' (пазней > *ц̄*, акрамя некаторых паўднёва-заходніх гаворак): *пла́ццe* 'адзенне, убор', *пра́ццe* 'мыццё бялізны'

д̄' (пазней > *ӡ̄*, акрамя некаторых паўднёва-заходніх гаворак): *суддзя́*

с̄: *калóссе*

з̄: *палóззе*

ш̄' (пазней > *ш̄*): *мы́шшу* (Т.скл. адз.)

ж̄' (пазней > *ж̄*): *збóжжа*

ч̄ (пазней > *ч̄*): *нóччу* (Т.скл. адз.)

У гаворках, якія захоўваюць апазіцыю *р*–*р*', сустракаецца і падвойны *р*': напр., дыял. [п'э́р'а] 'пер'е', [з'в'ар'о́] 'звяр'ё'. У некаторых дыялектах пазней *р̄*' > *р̄* (гл. с. 200). У гаворках, дзе губныя не

[1] Здараюцца выпадкі паўторнага распадабнення падвойных зычных. Напр., Растаргуеў (Расторгуев) адзначае *-с'т'* < *-сьj*: [калóс'т'] 'колас' у гаворках Смаленшчыны. Такія формы, здаецца, не адзначаныя ні ў якіх гістарычных кірылічных тэкстах.

ацвярдзелі, знаходзім таксама падвойныя мяккія губныя: напр., [с'аа̄'á] 'сям'я', [рыб̄'á] 'рыба', [в'эраб̄'á] 'вераб'я'. Падаўжэнне, хоць і не падваенне, падавалі (Карский) нават для *ў*: прасл. **solovьji* > слонімскае дыял. [салаўв'і] (М.скл. адз.). Параўн. таксама дыялектныя варыянты творнага склону адзіночнага ліку слова *кроў*: *крывв'ю́* (поруч з формамі *крывёй*, *кро́ўю*).

Зразумела, правіла падваення зычных – вынік страты рэдукаваных, але няма спосабу наперад вызначыць, колькі часу прайшло паміж стратай рэдукаваных і развіццём падваення зычных. У расійскай мове, напр., спалучэнні С*j* захаваліся аж дагэтуль. Тэксты не вельмі памагаюць датаваць падваенне; пацвярджэнні яго з'яўляюцца ў XV–XVI стст. (хоць для паўднёварасійскіх дыялектаў тэксты паказваюць падваенне ўжо да XIV–XV стст.): напр., *Иллиничи* (тапонім, 1498) паходзіць ад уласнага імя *Илья*. У тэкстах беларускіх татараў XVII ст. са слуцка-мазырскага рэгіёну няма ніякіх знакаў падваення зычных перад *ьj*, хоць пісары мелі недвухзначны спосаб паказаць падваенне арабскім дыякрытыкам *šadda* (Антонович). Сёння гэта раён з усімі трыма рэфлексамі С'*ьj*: С̄', С', С'*j*.

Насуперак гэтым познім дадзеным, Андрэева выказала погляд, што падвойныя зычныя ўпершыню развіліся на паўночным усходзе (менавіта на Полаччыне) да таго, як гэтая тэрыторыя ўвайшла ў ВКЛ, г. зн. у XII ст. Яе дапушчэнне грунтавалася на факце, што падваенне зычных пашырылася па-за межы Смаленска-Полацкага рэгіёну як на Наўгародчыну (на поўнач), так і на паўднёварасійскія дыялекты (на ўсход), а ў сярэднебеларускіх гаворках яно адсутнічае, як мяркуюць, з тае прычыны, што там пралягла дзяржаўная граніца (параўн. *ДАБМ*, карта 64, часткова 82, 83). Калі полацка-разанская зона трапіла пад уладу ВКЛ, інавацыі з Полаччыны пачалі пашырацца на поўдзень і паўднёвы захад, г. зн. на Палессе (XIV ст.). У сапраўднасці, аднак, пашыранасць падвойных зычных на поўначы і поўдні, тады як цэнтральная Беларусь мае кароткія зычныя, – тыповы малюнак інавацыі, якая нараджаецца ў цэнтры пры захаванні даўнейшых агульных узораў на аддаленых тэрыторыях і мае мала супольнага са старымі палітычнымі граніцамі.

Паколькі *ш̄'*, *ж̄'*, *ч̄'*, як і адпаведныя непадвойныя сегменты, таксама ацвярдзелі, можна дапусціць, што падваенне адбылося перад ацвярдзеннем непадвойных зазубных, вось жа падвойныя зазубныя

ацвярдзелі адначасна са сваімі непадвойнымі парамі ў XII–XIII стст. Сцверджанне, што падваенне папярэднічала ацвярдзенню зазубных прыблізна ў XII ст., набярэ сілы, калі мы вывучым суадносіны ізаглосы падваення з ізаглосаю ацвярдзення *р*' (змена 33). Магчымым пярэчаннем гэтаму даваду можа быць тое, што цяпер падваенне зычных, у процілегласць ацвярдзенню непадвойных зазубных і *ц*', уласцівае не ўсім беларускім гаворкам. Але геаграфічную пашыранасць не трэба лічыць вырашальным контраргументам, асабліва калі прыняць погляд, што сярэднебеларускія гаворкі таксама мелі ў мінулым падваенне – г. зн. падваенне было, па сутнасці, усебеларускаю з'яваю, насуперак адсутнасці падвойных зычных у некаторых сённяшніх сярэднебеларускіх дыялектаў.

Храналагічныя суадносіны паміж падваеннем зычных і арэальным ацвярдзеннем $р'_{11}$ можна звесці да наступных трох храналагічных паслядоўнасцяў, вынікам якіх стала развіццё трох дыялектных тыпаў, якія тут называюцца дыялектамі A, B і C:

Дыялекты A (становішча ў літаратурнай мове)	Дыялекты B (напр., на Віцебшчыне і на ўсход ад Магілёва; паўднёвы захад)	Дыялекты C (напр., на паўднёвы захад ад Віцебска)
1. $р'_{11} > р_{11}$	1. С'*ьj* > С̄' Ацвярдзення *р*' няма: напр., [п'э́р̄'а]	1. С'*ьj* > С̄'
2. С'*ьj* > С̄', але падваення *р*' няма: напр., [п'э́р'а]		2. $р'_{11} > р_{11}$: напр., [п'э́р̄а]

Вось жа ў некаторых гаворках працэс падваення мог папярэднічаць ацвярдзенню $р'_{11}$, а ў іншых, наадварот, адбыцца пасля яго. Гэта можа таксама навесці на думку, што інавацыі падваення зычных і ацвярдзенне $р'_{11}$ маглі паходзіць з розных геаграфічных пунктаў і мець розную хуткасць пашырэння. Тое самае, мабыць, слушна і для ацвярдзення мяккіх губных, якое мусіла адбыцца ў большасці гаворак перад падваеннем. Таму мы пакуль што прымаем дату XII ст., прапанаваную Андрэевай, – але з іншых прычын – як зручнейшую, каб грунтаваць храналогію на пазнейшых пісьмовых дадзеных.

Чыстым вынікам правіла падваення было ўвядзенне ў гукавыя сістэмы большасці беларускіх гаворак большага ліку падвойных мяккіх зычных: $\bar{t}'_{25}$, $\bar{d}'_{26}$, $\bar{s}'_{27}$, $\bar{z}'_{28}$, $\bar{n}'_{30}$, $\bar{l}'_{31}$, $\bar{s}'_{33}$ (>$\bar{s}$), $\bar{z}'_{34}$ (>$\bar{z}$), $\bar{ʒ}'_{34}$ (> $\bar{ʒ}$), $\bar{c}'_{35}$ (> $\bar{c}$), – а ў некаторых гаворках яшчэ $\bar{b}'_{22}$, $\bar{v}_{23}$, $\bar{m}_{24}$, $\bar{r}/\bar{r}'_{32}$ (падвойныя мяккія зычныя на граніцы марфем таксама развіліся да XII ст.; гл. змену 25). Мы не маем дадзеных пра пераход $\bar{p}'$ < *рьj* у хаця якіх дыялектах. Акрамя дыялектаў з цоканнем (якія маюць, напр., *но́ццу* замест літар. бел. *но́ччу*), гук c'_{13} у спрадвечнабеларускіх словах ніколі не стаяў перад *ьj* і дзеля гэтага ніколі не падвойваўся; аднак форма творнага склону адзіночнага ліку запазычання з польскае мовы *моц* (параўн. польск. *moc*), калі б яе наагул ужывалі людзі, што гавораць па-беларуску, было б *мо́ццу* < **moc'c'u*[1]. Фанему $\bar{c}'_{29}$ (пазней $\bar{c}$) мы ўключаем у нашу сістэму як маргінальную.

Выбраная бібліяграфія

П. Расторгуев. *Говоры на территории Смоленщины.* М, 1960, 91.

Л. Андреева. "Новые сочетания согласных с *j* в восточнославянских языках", *МИРД* 3, 1962.

А. Булыка. "Адлюстраванне вымаўлення ў старабеларускай арфаграфіі", *Весці* 1966, 1, 134.

Змена 33. Ацвярдзенне *r'*, $\bar{r}'$ (XII ст.). Прабеларускія гукі r'_{11}, $\bar{r}'_{32}$ у большасці гаворак ацвярдзелі, але пазней у некаторых паўночна-ўсходніх раёнах пад уплывам расійскае мовы апазіцыя *r–r'* аднавілася[2]. Другасны характар аднаўлення *r'* у паўночна-ўсходніх раёнах відаць з прыкладаў гіперкарэктнае замены: напр., паўн.-усх. [р'ат] (< прабел. *радъ*), [р'ак] (< прабел. *ракъ*). Гэтай новай крыніцы *r'* мы даем асобны нумар: r'_{36}. Згодна з *ДАБМ* (карта 36), зацвярдзелы r'_{11}

---

[1] Слова *моц* уключана ў "Беларуска-рускі слоўнік" (пад рэд. К. Крапівы, Мн, 1962). Але айцец А. Надсан, для якога беларуская мова родная, у асабістай гутарцы паведаміў мне, што форму творнага склону адзіночнага ліку ад гэтага слова не ўжываюць. Таму лепш сказаць *з усёй моцы*, чым *усёй моццу*. Наагул, канчатак *-у*/*-ю* выціскаецца канчаткамі *-ой* (*-ою*), *-ай* (*-аю*), *-ёй* (*-ёю*), *-яй* (*-яю*), як у формах *со́ляй*, *гразёй*, *мы́шай*, а не адпаведна *со́ллю*, *гра́ззю*, *мы́шшу*.

[2] Шмат у якіх гаворках праяўляецца тэндэнцыя да скасавання апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці таксама і для гуку *л* (гл. змену 48).

цяпер у паўночна-ўсходніх раёнах (на ўсход ад Магілёва і на Віцебшчыне) сустракаецца толькі дзе-нідзе. Сярод гаворак, пераходных да ўкраінскае мовы, ёсць такія, што маюць частковае ацвярдзенне *r*' (і зазубных зычных) у пазіцыі перад *e* і, у меншай ступені, перад *i* (Назарова 1965). У гаворках нізоўя Прыпяці знаходзім нават *r*', захаванае перад $a < a_9$ і $ę_{10}$: напр., адпаведна [бу́р'а] і [пор'а́док] (Назарова 1964). У рэфлексах групаў С*ьr*С гук *r*' з таго часу ўсюды зацвярдзеў: напр., *верх* (гл. змену 18). Ацвярдзенне r'_{11} сустракаецца таксама ў суседніх польскіх і ўкраінскіх гаворках, як і ў некаторых паўднёварасійскіх дыялектах, але ў польскай мове ацвярдзенне прайшло праз афрыкатызацыю (*r*' > *ŕ*' > *ř* > *ž*), а ва ўкраінскай гэта было часткова простае ацвярдзенне, як у беларускай мове (*r*' > *r*), а часткова "расшчэпленае ацвярдзенне", або распад рысаў (*r*' > *r*'*j* > *rj*), параўн. польск. *burza*, укр. дыял. [бу́ра] і [бу́рја] (літар. укр. [бу́р'а]).

Былі дзве спробы прыпісаць ацвярдзенне r'_{11} іншаземнаму ўплыву. Відаць, першая фармулёўка такога ўплыву належыць Шахматаву, які дапусціў, што *r*' ацвярдзеў у прабеларускай мове ў выніку ўплыву ранняга заходнеславянскага (ляхіцкага) субстрату. Другую фармулёўку прапанаваў Новак (Novák). Паводле яго, бел. *p* < *p*' лічыцца часткаю хвалі, якая пачалася ў чэшскай мове (у выніку кантакту з нямецкай, якая ў спрадвечным лексіконе не мае мяккіх сегментаў) і пашырылася на ўсход, ахапіўшы спачатку сербалужыцкія і польскую, а пад канец XIV ці на пачатку XV ст. беларускую і ўкраінскую тэрыторыі, якія тады былі часткаю ВКЛ. Ніводная з гэтых прапаноў не пераканаўчая. Па-першае, няма довадаў, што ацвярдзенне r'_{11} пачалося на захадзе, а потым пашырылася на ўсход; папраўдзе, першыя прыклады *ř* у чэшскай і польскай мовах з'яўляюцца прыблізна адначасна; па-другое, ляхіцкі субстрат у беларускай мове – фікцыя. Што да паўночнаўкраінскіх гаворак, то нельга выключаць магчымасць супольнага з беларускімі гаворкамі развіцця тут гэтае рысы.

Ацвярдзенне r'_{11} датавалі па-рознаму: ад XII ст. (напр., Нахтыгаль) да XIV ст. (Ковалів, Янкоўскі). Буга (Būga) спрабаваў адсунуць храналогію пераходу *r*' > *r* яшчэ далей у перыяд да XII ст., калі адбываліся кантакты паміж прабеларускімі і балцкімі плямёнамі, на аснове ўсходнеславянскіх запазычанняў у балцкіх мовах. Бугавы дадзеныя ўключаюць латыш. *krusts* 'крыж', латыш. *rutks* і літ. *rudikas* 'радыска',

якія, на яго думку, паходзяць адпаведна з прабел. **krъstъ* і **gъdьk-*. Аднак усе сведчанні, як уласна беларускія, так і параўнальныя, паказваюць, што ў прабеларускай мове ў гэтых словах быў *ь*: *крьстъ* 'крыж' *[...]*; суч. бел. *рэ́дзька* з *э* адлюстроўвае *ь*, а не *ъ*. Літаратурная літоўская мова мае *ridikas*, запазычанае са славянскіх моваў, што таксама пацвярджае прысутнасць *ера*. Латышскае запазычанне *rutks* магло трансфармавацца ў латышскай мове, змяшаўшыся са сваім словам *ruds* 'радыска' (Mühlenbachs–Endzelīns).

Для прабеларускае мовы пісьмовыя сведчанні пачынаюцца ў XII ст. некалькімі прыкладамі, колькасць якіх павялічваецца ў XV і XVI стст.[1]. Графічныя сведчанні бываюць двух тыпаў:

1) *ы, а, о, у, ъ*, якія пісаліся пасля гістарычна апраўданага r'_{11}: напр., *сеньтебра* 'верасня' (1440-я гг.); *Бранськy* (1480; параўн. рас. *Брянск*); *Юрьевичъ* (уласнае імя, 1486); бел. лац. *czetyroch* (1533; суч. бел. *чатыро́х*); *генвара* 'студзеня' (1589), бел. лац. *henwara* (1638); *пи́сара* (1595; параўн. рас. *писаря*); *порадков* (1595) поруч з *порядку*;

2) гіперкарэктныя напісанні *r'* замест цвёрдага r_{11}: напр., магчыма, *Дрьють* (1180; правільна *Друть*, суч. бел. *Друць*, параўн. літ. *drútas* 'моцны'); *Александрю* Д.скл. адз. (XVI ст.; правільна *Александру*); *старихъ* (XV ст., Полацк; правільна *старых*).

Важны ключ да храналогіі пераходу *r'* > *r* (прынамсі для полацка-разанскае зоны, але не абавязкова для кіеўска-палескае, дзе ацвярдзенне *r'* магло быць нават дагістарычным) дае лабіялізацыя *e* > *o*. Як мы зазначылі ў змене 18, у час лабіялізацыі *e*, мяркуючы з формаў на ўзор бел. *упапяро́к* – параўн. рас. *поперёк*, але *цяпе́р* – параўн. рас. *тепе́рь*, фанема r'_{11} яшчэ існавала ў сістэме некаторых прабеларускіх гаворак. Дадатковыя падрабязнасці падаюцца ў змене 18.

Ацвярдзенне давяло да змяншэння колькасці фанемных апазіцый паводле мяккасці–цвёрдасці ў большасці прабеларускіх гаворак.

---

[1] На думку Карнеевай-Петрулан, Смаленская грамата 1229 г. мае нядвухсэнсоўныя прыкметы ацвярдзення r'_{11}. Нават калі гэтая думка апраўданая, гэты дакумент, відаць, напісаў пісар, які гаварыў паўночнарасійскай гаворкай, і дзеля гэтага мае для нас толькі ўскосную цікавасць.

Выбраная бібліяграфія

А. Шахматов. "К вопросу о польском влиянии на древнерусские говоры", *РФВ* 69, 1913.

K. Būga. "Die litauisch-weißrussischen Beziehungen und ihr Alter", *ZSPh* 1, 1924, 17. {Перадрук. у} *RR* 3.

Н. Дурново. *Очерк истории русского языка.* М–Л, 1924; Н, 1962.

W. Porzeziński. "Rzekome pierwiastki lechickie w językach wschodniosłowiańskich", *PF* 10, 1926.

K. Mühlenbachs. *Latviešu valodas vārdnīca* 3. {Пад рэд.} J. Endzelīns, Riga, 1927–1929, 565.

П. Расторгуев. "К вопросу о ляшских чертах в белорусской фонетике", *ТРКДРЯ* 9, 1927, 42–43.

Ľ. Novák. "Neznáme nemecké vplyvy na západoslovanský, východoslovanský a maďarský konsonantismus", *LSc* 1–2, 1939–1940, 109–110.

М. Корнеева-Петрулан. "К истории отдельных фонетических особенностей белорусского языка", *ДБРМ* 130.

Т. Назарова. "Украинско-белорусская языковая граница в районе нижней Припяти", *ВДВЯ* 131; "Проблема перехідних говірок між українською і білоруською мовами. (Говірки нижньої Прип'яти)", *Праці* 98, 103.

П. Ковалів. *Слов'янські фонеми.* NY, 1965, 196 {і наст.}.

Ф. Янкоўскі. *Беларускае літаратурнае вымаўленне.* Мн, 1966, 30.

Змена 34. Ацвярдзенне простых і падвойных зазубных зычных і *с'*, *с̄'* (прыблізна да XIII ст.). Вызначальная рыса практычна ўсіх беларускіх гаворак – ацвярдзенне ўсіх мяккіх фрыкатыўных і афрыкат: *ś'*$_{15}$, *ź'*$_{14}$, (*ʒ́'*), *ć'*$_{13}$, *с'*$_{13}$ і адпаведных падвойных сегментаў[1]. Храналогія ацвярдзення розных зычных розная, але падстава гэтае змены для іх усіх была, відаць, адна і тая ж. Ва ўсіх гэтых сегментах змякчэнне было субфанемным, бо апазіцыі паміж мяккімі і цвёрдымі сегментамі ніколі не існавала; страта мяккасці азначала толькі адмаўленне ад лішняе рысы. Мяккасць магла спачатку страціцца перад галоснымі непярэдняга раду, дзе пазіцыя не падмацоўвала фанетычна мяккасці зычнага, але потым гэтая страта пашырылася і на ўсе іншыя пазіцыі.

Паасобныя прыклады ацвярдзення *ś'* і *ź'* з'яўляюцца ў тэкстах, пачынаючы з XIII ст., але толькі ў XVI ст. яны робяцца больш-менш

[1] Першапачаткова мяккі *с'*$_{13}$ можна знайсці перад *v'*, як у слове *цвет.*

частыя: напр., *слышышь* (1300) < *слышишь*[1]; *будучымъ* (1480). Магчыма, ацвярдзенне зазубных адбывалася з іншай хуткасцю, чым ацвярдзенне *с'*$_{13}$. У княскай канцылярыі ў першай палове XVI ст. пасля *ш*, напр., яшчэ пісалі *и* і фінальны *ь* (хоць ётаваных графем *я* і *ю* больш не ўжывалі); адначасна пасля *ц* стаяць *а* і *у* (а не *я* і *ю*) і зрэдку *и*. З гэтага вынікае, што *ś*'$_{15}$, *ź*'$_{14}$, *ć*'$_{13}$ заставаліся перад *і* мяккімі (да пэўнае ступені) у той самы час, калі *ц* ацвярдзеў і перад *і* (Stang). Аднак у Скарынавых тэкстах XVI ст. знаходзім прыклады ацвярдзелых *ш*, *ж*, *ч* поруч з мяккім *ц* (Воўк-Левановіч). Бессістэмнае ўжыванне *а–я*, *у–ю* і нават *ъ–ь* пасля зазубных як адлюстраванне фанетычнае рэальнасці трэба прымаць з вялікай асцярожнасцю, бо гэтыя хістанні маюць доўгую традыцыю, якая сягае аж старой царкоўнаславянскае мовы. Больш пэўныя толькі напісанні з *ы*.

Ацвярдзенне *ś*'$_{15}$ і *ź*'$_{14}$ тыповае таксама для расійскае мовы і большае часткі тэрыторыі ўкраінскае мовы; ацвярдзенне *ć*'$_{13}$ уласцівае толькі для беларускае і ўкраінскае моваў (праўда, украінская мова захоўвае мяккасць *ś*, *ź* і *ć* перад *і* < *ě*, *е*, *о* і ў падваенні); ацвярдзенне *с'*$_{13}$ уласцівае паўднёварасійскім гаворкам і беларускай мове і толькі ў абмежаванай ступені ўкраінскай. Такія геаграфічна розныя абсягі наводзяць на думку, што ацвярдзенне *ś*'$_{15}$ і *ź*'$_{14}$ пачалося крыху раней за ацвярдзенне *ć*'$_{13}$ і *с'*$_{13}$. Адпаведна, прымаючы пад увагу пісьмовыя дакументы, мы паспрабуем датаваць ацвярдзенне *ś*'$_{15}$ і *ź*'$_{14}$ найпазней да XIII ст., а ацвярдзенне *ć*'$_{13}$ – пачаткам або сярэдзінай XIII ст.[2]. Пра *с'*$_{13}$ гл. ніжэй.

Звязаць ацвярдзенне зазубных з агубленнем *е* > *о* не выпадае. Напісанне *о* пасля *ш*, *ж* і *ч* яшчэ не пацвярджае іх ацвярдзення. Паколькі мяккасць была прыроджанай рысай гэтых зычных незалежна ад галоснага атачэння, то пры іх графемнаю рэпрэзентацыяй пісцы маглі без засцярогаў перадаваць найперш вынікі лабіялізацыі. Лабіялізацыя *е* > *о*, аднак, можа даць некаторыя звесткі пра храналогію ацвярдзення *ś*'$_{15}$ і *ź*'$_{14}$ у прабеларускай мове ў параўнанні з прарасійскай моваю. З параўнання беларускіх формаў на ўзор *грабе́ж*, без

---

[1] Пазначэнне мяккасці канцавога *ш*, мабыць, толькі графемнае. Ранейшая змена *ź* > *j* у, напр., *Логойскъ* (1387) < *Логожьскъ*, *Логожескъ* часам прыпісваецца моцнаму змягчэнню фрыкатыўнага гуку.

[2] Сцверджанне Карскага, што пераход *ź* > *ž* адбыўся спачатку перад *і*, а тады і перад іншымі галоснымі, збівае з панталыку (Карский 1893, 14).

агубленне *е* > *о* (такім парадкам, *ж* яшчэ заставаўся мяккім), з рас. *грабёж* можна вывесці, што *ш* і *ж* ацвярдзелі ў прарасійскай мове раней, як у прабеларускай. Гэтае меркаванне, аднак, было б слушнае толькі тады, калі было б выяўлена, што лабіялізацыя *е* > *о* ў абедзвюх мовах была адначасная.

Час пераходу c'_{13} > *с* цяжка вызначыць дакладна; гэта, аднак, была апошняя ў чарадзе зменаў, скіраваных на скасаванне лішняе (фанетычнае) мяккасці ў фрыкатыўных і афрыкатах. Першыя прыклады *ц* перад заднімі галоснымі ў свецкіх тэкстах датуюць XIV ст., але колькасць прыкладаў заставалася невялікаю аж да XV ст.; па сутнасці, перадача ацвярдзення *ц* зрабілася сталаю рысаю беларускага пісьма толькі ў XVII ст. Тое, што тэксты выяўляюць пэўныя хістанні ў напісанні *ц'–ц* на працягу прыблізна трох стагоддзяў, можна тлумачыць дваяка: (1) працэс ацвярдзення быў паступовы і ахопліваў розныя дыялекты ў розны час; або (2) ацвярдзенне было непрэстыжным і дзеля гэтага пісары, адукаваныя ў царкоўнаславянскай традыцыі, яго свядома ўнікалі; другая магчымасць, аднак, выглядае не вельмі праўдападобнаю, бо правапісная традыцыя царкоўнаславянскае мовы дапускала абодва варыянты напісання. Беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом XVII ст. мала памагаюць, бо ў іх для абазначэння $c' < t'_{20}$ і $c < c'_{13}$ ужывалі адну графему.

Што да адноснае храналогіі, ацвярдзенне c'_{13} можна змясціць паміж агубленнем *е* > *о* (змена 18) і наступнай афрыкатызацыяй t'_{20} і d'_{21} (змена 43). Чытач можа прыпомніць, што падчас лабіялізацыі *е* > *о* гук c'_{13} выступаў як мяккі сегмент; адсюль беларуская мова мае *ацец* < прасл. **otьcь* (а не **ацёц*). Афрыкатызацыя t'_{20} > *с'* мусіла адбыцца следам за ацвярдзеннем c'_{13} > *с*, бо новы c'_{20} ніколі не ацвярджаецца, зліваючыся з c_{13}; вось жа працэс пераходу c'_{13} > *с* мусіў скончыцца да з'яўлення цекання. Лабіялізацыя *е* > *о* адносіцца да XII ст., а афрыкатызацыю t'_{20}, як будзе паказана ніжэй, мабыць, нельга датаваць шмат раней за канец XV ст.

Дадатковыя весткі можна здабыць з вывучэння слова *сэ́рца* (< *сьрдьце*), якое фіксуецца з ацвярдзелым *s-*, пачынаючы з XVI ст. і пазней: *сэрцэмъ* (XVI ст.); параўн. таксама бел. цюрк. *ṣarcaḫ* (М.скл. мн.), з графемаю, якая перадае цвёрды [s] (гэтую форму знаходзім у копіі тэксту пачатку XVII ст., зробленай у 1771 г., мове якога ўласці-

выя дыялектныя рысы паўднёва-заходняй Полаччыны і Гродзенска-Баранавіцкага рэгіёну)[1]. Калі ацвярдзенне *s'*$_{15}$ прыпісваюць польскаму і/ці ўкраінскаму ўплыву (параўн. польск. *serce*, укр. *серце* з цвёрдым *s*), мы спатыкаемся з цяжкасцямі, спрабуючы вытлумачыць, чаму беларуская мова мае ў гэтым слове ацвярдзелы *s'*$_{15}$ на ўсходзе і поўначы краіны – вельмі далёка ад зоны кантактаў з польскаю і ўкраінскаю мовамі (гл. *ДАБМ*, карта 54) і чаму толькі ў гэтым асобным слове. Хоць дыфузія з (паўднёвага) захаду на поўнач і паўночны ўсход добра засведчана пры пашырэнні інавацый у беларускім ідышы, для каналаў дыфузіі ў беларускай мове гэты шлях не характэрны. Ацвярдзенне *s'*$_{15}$ не можа тлумачыцца ўплывам наступнага *r*, як відаць з слова *сярдзíты* (гістарычна звязанага са словам *сэ́рца*), дзе захаваўся мяккі *s'*. Можна толькі, разам з Карскім, прыняць, што змена *s'*$_{15}$ > *s* у гэтым слове вынікла з рэгрэсіўнае асіміляцыі, абумоўленай прысутнасцю ацвярдзелага *c'*$_{13}$[2]. Гэта дае нам дадатковы довад, што да XVI ст. *c'* ужо ацвярдзеў. Здаецца, нішто не замінае дапусціць, што яго ацвярдзенне прыпала на канец XIII або на XIV ст.

---

[1] З іншага боку, у беларускім тэксце 1645 г. з поўдня Беларусі, пісаным арабскім пісьмом, гэтая марфема перадаецца графемаю для мяккага [s']: *θarcūm* (Т.скл. адз.). Мяккі *s'* у гэтым корані дагэтуль захоўваецца ў некаторых раёнах: гл. *ДАБМ*, карта 54. Пра страту *-d-* гл. змену 25.

[2] Ёсць яшчэ некалькі слоў з ацвярдзеннем зубных перад *e*, але яны выглядаюцца на запазычанні з польскае мовы: напр., *(в)уздэ́чка* і *мястэ́чка* (адпаведныя спрадвечным бел. *вуздзе́чка* і *мясце́чка*, зафіксаваным у некаторых раёнах). Цікава, аднак, што паводле *ЛГ* ізаглосы двух гэтых слоў вельмі падобныя да ізаглосы слова *сэ́рца*.

Табліца 23. Зрэз 9С. Прабеларуская сістэма зычных пад канец XII ст.



Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. “К истории звуков и форм белорусской речи”, *РФВ* 30, 1893, 3, 14; “О некоторых особенностях белорусского языка”, *Symbolae grammaticae in Honorem Joannis Rozwadowski* 2. Kr, 1927. {Перадрук. у} *Труды.*

Я. Воўк-Левановіч. *Мова выданьняў Францішка Скарыны.* Мн, 1927, 16.

C. Stang. *Die westrussische Kanzleisprache des Großfürstentums Litauen.* O, 1935; *Die altrussische Urkundensprache der Stadt Polozk.* O, 1939.

ЛГ 168–169, 294–295.

---

[1] Падвойныя мяккія і цвёрдыя сегменты ўваходзілі ў мову дзвюма хваламі: (1) праз новыя спалучэнні зычных, якія ўтвараліся на сутыку слоў пасля страты рэдукаваных (змена 25) і (2) праз страту спалучэнняў з *j* (змена 32). Падвойныя сегменты, што ўзнікалі з першае хвалі, абазначаюцца драбнейшымі лічбамі, адпаведнымі простым сегментам з тым самым ніжнім індэксам у табліцы вышэй (напр., t_{20}~t'_{20}); падвойныя сегменты, што ўвайшлі ў мову з другой хваляй, абазначаюцца іх уласнымі ніжнімі індэксамі з большымі нумарамі (напр., t'_{25}).

6. Пісьмовы перыяд прабеларускіх дыялектаў ад XIII да XV ст. Змены 35–39

Змена 35. Страта поствакальнага *j* (да XIII ст.). Як мы адзначылі ў змене 9, *u_4 і *i_3 не рабіліся ў прабеларускай мове рэдукаванымі ў пазіцыі перад *j*. Замест гэтага адбыўся пераход *uj* > *yj*, а *ij* застаўся некрануты.

Пазней у большасці беларускіх гаворак *j* пасля *y* і *i* ў пазіцыі на канцы слова і перад зычнымі выпаў. Страту *-j* пасля *i*, *y* на месцы першапачатковых *ī*, *ȳ*, якія можна ўскосна звязаць са стратаю рэдукаваных на канцы слова (гл. змены 9, 21), даецца паказаць на прыкладзе канчаткаў прыметнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку ў назоўным склоне і (для *i*) на прыкладзе формы загаднага ладу дзеясловаў: напр., прасл. **-ŭjī* > прабел. *-ыjь* > суч. бел. *-ы*. *стары́* – рас. *ста́рый*, бел. *пі*, *пíце* – рас. *пей*, *пе́йте*. Тэксты адлюстроўваюць выпадзенне *j*, пачынаючы ад XIII ст.: напр., *готьскы* ‘гоцкі’ (1264), *польски* (1349). Формы на *-j* дагэтуль фіксуюць на паўночным усходзе і ў паасобных мясцовасцях на паўднёвым захадзе і паўднёвым усходзе. У некаторых гаворках *j* мае неабавязковы характар, залежна ад кантэксту. Перад назоўнікам прыметнік можа з’явіцца ў даўжэйшай форме, напр., [аржаны́], але [аржаны́j хл’эп] (*ДАБМ*, карты 110, 111).

Пасля ўсіх астатніх галосных *j* на канцы склада захоўваецца: напр., *рай* < прасл. **rajь*, *мой* < прасл. **mojь*, *куй* (2 ас. заг.л.). Цяперашняя прыстаўка найвышэйшае ступені параўнання *най-* у тэкстах, пачынаючы ад XV ст., выступае як *на-*, напр., *налѣпѣй* (1492), *наменний* (XVI ст.), суч. бел. *перш-на́перш*, – але гэта не скарачэнне ад *най-*; па сутнасці, форма *на-* – старэйшая. Наагул, частасць поствакальнага *j* ва ўсіх пазіцыях у слове, акрамя пазіцый пасля *i* і *ы*, вырасла пасля XII ст., калі ў слабой пазіцыі адбыўся пераход ненаціскнога *i* (**jь*) > *j*, напр., *пойсковати* ‘шукаць’ (1616) – параўн. рас. *искать* (гл. далейшы разгляд у зменах 28, 51).

[...] У сярэдзіне слова *-jī-* цяпер рэпрэзентаваная ў моцнай пазіцыі як *je*, але формы з *ji* сустракаюцца ў старабеларускіх дакументах, а сучасныя формы з *je* вынікаюць, відаць, з пазнейшае замены, калі пасля страты слабых рэдукаваных пашырылася чаргаванне *ĕ*||*#* (гл. змену 21), напр., бел. *яе́ц* (Р.скл. мн.), бел. цюрк. *уāуас* (1765) – параўн. рас.

яйц, бел. *узаéмны* – параўн. рас. *взаи́мный*[1]. Бел. *прыéмны* – запазычанне з польск. *przyjemny*.

Выбраная бібліяграфія

Н. Пшеничнова. "К истории редуцированных *ы*, *и* в восточнославянских языках", *ФН* 3, 1960, 1; "Гласные на месте редуцированного *и* в говорах восточнославянских языков", *ВДВЯ*.

Змена 36. Ацвярдзенне *ć'*, *đ́'* (пачатак або сярэдзіна XIII ст.). Гл. разбор у змене 34.

Змена 37. Пашырэнне прыстаўных зычных (XIII ст.). У перыяд праславянскае мовы пачатковыя *u-* і *[...] ₑa-* набылі прыстаўны элемент *v-*: прасл. $\bar{u}_1$- > vu_1- > бел. *вы-* і прасл. *u-* > *vu-* > бел. *во́-*||*ва-*, напр., *вош* < *въшь* < **usi-* – параўн. латыш. *usna* 'чартапалох'. У прабеларускіх гаворках прыстаўны *в-* развіўся нанова пры двух агубленых галосных *у* і *о* незалежна ад іх паходжання (а ў гаворках з дыфтонгамі таксама пры *у͡о*). Можна думаць, што білабіяльны (пазней лабіядэнтальны) прыстаўны развіўся ў адказ на моцную лабіялізацыю агубленых галосных, што выклікала выразнейшае адмежаванне лабіялізаваных галосных ад нелабіялізаваных: напр., vu_{11}- (< *u-* < $ǫ_{11}$-): бел. *вуга́ль*, *вусы*. Гэтую з'яву можна таксама ўбачыць у польскай, палабскай, сербалужыцкіх, славацкай, балгарскай і, факультатыўна, ва ўкраінскай. Для vu_2- (< $\bar{u}_2$- < ₑ*au-*) параўн. бел. *вуха*, *вулей*. Развіццё прыстаўнога гуку перад *о* сустракаецца таксама ў сербалужыцкіх, палабскай, гутарковай чэшскай і, абмежавана і неабавязкова, ва ўкраінскай: параўн. $vó_5$- (< *o-* < *jo-* < $j_ₑa$-): бел. *во́зера*, *во́сень*, *во́льха*, *во́жык*; $vó_6$- (< ₑ*a-*): *во́стры*, *во́чы*. Што да прыкладаў у прабеларускіх і старабеларускіх тэкстах, то параўн. форму *вуж* (XVI ст.; суч. бел. *ужо́*).

У пэўных умовах прыстаўны элемент пашыраўся нават, паводле аналогіі з *о-*, на яго пару ў ненаціскной пазіцыі – *а-*. Напр., літаратурная беларуская мова мае чаргаванне *во́кны* || *акно́*, але ў бранскіх гаворках і ў дарэформавай беларускай мове адзначана і форма *вакно́*

---

[1] Смаленская грамата 1229 г. мае напісанні *заимъ*, *заемъ* 'пазыка', *наемъ*, *наима* 'найманне', што адпавядае суч. бел. *наёмны* (< *наём-*).

(Растаргуеў). У некаторых каранях трэба браць пад увагу магчымасць далейшага перасоўвання націску пасля развіцця прыстаўнога гуку: напр., *вастрыня́* ад *во́стры*, *вако́л* і *во́кал*. Для старабел. *в-* перад *а-* параўн. *Вартема* (1569) поруч з формамі *Артемъ*, *Ортемъ*. Непрыстаўны *в-* часам прымалі за прыстаўны і адкідалі: напр., *озма* (XV ст.; суч. бел. *во́зьме [...]*; параўн. рас. *возьмёт*). Параўн. таксама бел. габр. *ww'lqnyq* (уласнае імя; 1640), *wwylq'nyq* (1691) поруч з *'lqnyq* (1695), *'wlkynyqy* (1751–1753; на аснове літ. *Valkenykai*). Такое марфемнае перараскладанне магчымае з прычыны фанетычнае раўназначнасці карэннага і прыстаўнога *в-*.

Прыстаўны *в-* ужывалі таксама пры асваенні пачатковых націскных агубленых галосных у даўнейшых запазычаннях: напр., *во́рчык* < польск. *orczyk* < ням. *Ortscheit* (параўн. укр. *о́рчик*); але ў пазнейшых запазычаннях гэта праводзілася не заўсёды, напр., *о́рдэн*, *(в)у́нія*; параўн. таксама тэрмін *о́канне*. Няма прыстаўнога тады, калі *у-* паходзіць з *въ-*, ці гэта прыстаўка, напр., *улівáць*, *ураджáй*, ці частка кораня, напр., *уну́к* з *въ(нукъ)*. Форма *увéсь* – кантамінацыя даўнейшага *весь* + *у*, якое зайшло з іншых формаў, такіх, як *усягó* Р.скл. адз. м.р.

Усім беларускім дыялектам уласцівае развіццё інтэрвакальнага *-в-* перад націскным лабіялізаваным галосным, напр., *навýка* (параўн. рас. *нау́ка*); параўн. бел. цюрк. *nāwčūniḥ* (Р.скл. мн.) < польск. *nauczony* 'вучоны', суч. бел. *навýчаны*, у слове *павýк* (< прасл. **paǫkъ*) устаўка зычнага, які разбівае збег галосных, вельмі пашыраная ў славянскіх мовах, але *в*, акрамя беларускае мовы, ужываецца толькі ва ўкраінскай, славацкай, чэшскай і дыялектах расійскае і славенскае моваў.

Як і пачатковы *в-*, інтэрвакальны *-в-* можа таксама пашырацца на пазіцыю перад ненаціскным агубленым галосным: напр., *павучы́ны*, суч. бел. *павуці́на*, дарэф. бел. *павучы́на* (параўн. рас. *паути́на*). Наяўнасць пачатковага прыстаўнога *в-* не абавязкова прадугледжвае прысутнасць у дыялектах інтэрвакальнага *-в-*. Растаргуеў апісвае гродзенскі дыялект з прыстаўным *в-*, але без інтэрвакальнага *-в-*: напр., [во́з'эро], але [па́ук].

Уласцівая беларускай мове тэндэнцыя ўстаўляць інтэрвакальны *-в-* перад агубленымі галоснымі магла распаўсюдзіцца і на пашыраныя з ёю на адной тэрыторыі мовы, параўн. прысутнасць устаўнога *-в-* пасля (!) націскных задніх агубленых галосных верхняга ўздыму ў кара-

імскім вымаўленні слоў з габрайскае мовы: напр., караім. *lúvax* ‘каляндар’ замест іўр. *lw̃ax*. Прыпамінаецца таксама бел. ід. *túves* ‘памылка’ < іўр. *ʈaᵛūt*[1]. Дыялекты літоўскае мовы маюць пратэтычны *v-* перад *uo*, але ў твярэцкім дыялекце, якім гавораць у Беларусі, пачатковы прыстаўны ды інтэрвакальны ўстаўны *в* магчымы і перад *u*, *ū*, і часам перад *o~a*: напр., бел. *наўгáд* > твярэцк. дыял. [nauvãd].

Матэрыялы, сабраныя ў *ДАБМ* (карты 47–49, 133, 278) паказваюць, што ў паўднёва-заходніх раёнах і ў паасобных мясцовасцях на паўночным усходзе прыстаўнога няма зусім (гл. разбор ід. *ózere*, падраздзел 2.3.2), тым часам на паўднёвым захадзе (і, гусцей, у суседніх паўночнаўкраінскіх гаворках) ёсць яшчэ прыстаўны *г-* ([γ-]), асабліва перад *у*, але і перад іншымі галоснымі (перад *о* толькі ў некаторых гаворках, пераходных да ўкраінскае мовы). У выніку ў гэтай частцы Беларусі амаль кожны пачатковы галосны, акрамя прыстаўных (напр., *іржáць* < *ръжати*, але не ⁺*віржаць* або ⁺*гіржаць*), можа прымаць тую ці іншую форму пратэзы: напр., *гýліца* ‘вуліца’, *гíншы* ‘іншы’, *гóзеро* ‘возера’, *Гарэ́са* (прыток Прыпяці) побач з *Арэ́са*; параўн. *гедвабем* ад *едваб* ‘ядваб, шоўк’ (1596; суч. бел. *ядвáб*), хоць магчыма, што *г-* у гэтым слове мог паходзіць з чэшскае формы гэтага слова *hedvábí*, *гуж* (XVI ст.; суч. бел. *ужó*). Наступная схема паказвае, як перакрываюцца прыстаўныя *в-* і *г-*: пункцір – дыстрыбуцыя прыстаўнога *г*, суцэльная лінія – дыстрыбуцыя прыстаўнога *в*.



Развіццё прыстаўнога *г-* прывяло таксама да перараскладання некаторых каранёў з гістарычна апраўданым *g*: напр., *гарóх* < *горохъ*, але знаходзім таксама [(а)рóхв’іны] ‘гарохавая салома’, [арóшына] ‘гарошына’ і г. д. (суч. бел. *гарóхвіны*, *гарóшына*) у паасобных мясцовасцях па ўсёй краіне, без выразнага геаграфічнага контуру. Параўн. развагі ў змене 13. На паводзіны *h* у беларускім ідышы, здаецца, рабілі ўплыў пашыраныя на той самай тэрыторыі гаворкі беларускае мовы, але змены ў дыстрыбуцыі *h* у ідышы вельмі своеасаблівыя. У бе-

[1] Прыклады падае Альтбаўэр (Altbauer).

ларускім ідышы знаходзім страту гістарычнага *h* і рост гістарычна неапраўданага *h*, напр., бел. *іржáць* > ід. *hiržen* ‘тс’. Беларускі ідыш мае таксама *h* у сваіх словах, дзе ён гістарычна неапраўданы: напр., ід. *héjer* ‘яйкі’, адпаведнае літар. ід. *éjer* і ням. *Eier*. Дыялекты літоўскае мовы, што знаходзіліся пад уплывам беларускае мовы, таксама набылі прыстаўны *г* (Гринавецкис).

На абмежаваных абшарах ёсць таксама прыстаўны *j-*: *вагóнь* ~ *ягóнь* (суч. літар. бел. *агóнь*). Але пачатковы *j-* у займенніках *ён*, *янá*, *янó* – не прыстаўны. Ён паходзіць з ускосных склонаў, дзе гістарычна быў часткай кораня, напр., *ягó* – параўн. ц.-сл. *онъ*, *она*, *оно*, але *его* (Р.скл. адз.) і г. д.

Датаваць развіццё прыстаўных *в-* і *г-* цяжка з прычыны рэдкасці сведчанняў у ранніх тэкстах. (Асобная праблема – ідэнтыфікацыя прыстаўнога *г-* у старабеларускіх тэкстах як беларускае інавацыі, бо запазычанні з польскае таксама прымаліся з каранёвым пачатковым *г*.) І ўсё ж такі развіццё прыстаўных можна дастасаваць да іншых зменаў. Паколькі пры каранях, якія пачынаюцца з ненаціскнога *а-* < *о-* не заўсёды ёсць прыстаўны, можна думаць, што гэты прыстаўны развіўся пасля распаду прасл. *o̯ā̆* на *ŏ* і *ā* пад націскам ды *а* не пад націскам; вось жа, *óзера* > *вóзера* (параўн. рас. *óзеро*), але *азёры* (рас. *озёра*) (*вазёры* ў дарэформавай беларускай мове і на некаторых абшарах мае вытворны характар). Відаць, прыстаўны *в* развіўся пасля дэназалізацыі насавых галосных: латыш. *unda* ‘вуда’ < прабел. **o̯da* (суч. бел. *вýда*) паказвае, што гэты славянскі корань быў запазычаны ў той час, калі насавыя галосныя ў прабеларускай мове яшчэ існавалі і не выяўлялі ніякіх слядоў прыстаўных. Можна таксама дапусціць, што развіццё вытворнага *о* < *o̯a* ў IX–X стст. (параўн. змену 12) папярэднічала развіццю прыстаўных ці, прынамсі, што ўстаўны *-в-* тады яшчэ меў жывы характар, бо гэты новы *о* таксама прымае прыстаўны. Магчыма, дзеля датавання можна скарыстаць з таго факту, што прыстаўнога, здаецца, не бывае перад *у-* < *въ* (гл. вышэй). Прыстаўны *h* выглядае пазнейшым за асібіляцыю прасл. *g* (гл. змену 13). Гэтае меркаванне здаецца слушным не толькі з прычыны аднолькавае фанетычнае якасці прыстаўнога і пачатковага каранёвага *h-* < прасл. *g*, але і таму, што *в-* магчымы пры *о-*, які зрабіўся пачатковым праз страту *g*: напр., ігуменскае дыял. [во́рла] ‘горла’ (літар. бел. *го́рла*, рас. *го́рло*),

[восудáр] (літар. бел. *гасудáр* < рас. *государь*)[1]. Факты з ігуменскае дыялектнае зоны наводзяць на думку, што прыстаўны *в-* пашыраўся з паўночнага ўсходу, выціскаючы *г-*.

Пазнейшы, у параўнанні са спірантызацыяй прасл. *g*, час развіцця прыстаўнога *г-* пацвярджае і ўспрыняцце беларускіх слоў на дзвюхмоўных абшарах, дзе гавораць і беларускай, і літоўскай мовамі. Напр., у паўночна-заходніх гаворках Віленшчыны, што мяжуюць з тэрыторыяй літоўскае мовы, этымалагічны *g* на пачатку кораня страціўся, напр., у словах [ус'], [алýп], [арчы́ца] (літар. бел. *гусь*, *го́луб*, *гарчы́ца*), але прыстаўны *г* (*h*) захоўваецца: напр., [гýл'іца] (параўн. рас. *у́лица*).

Вось жа, прыстаўны *в-* і ўстаўны *-в-*, што разбівае збегі галосных, развіліся пасля страты насавых галосных, пасля развіцця акання і з'яўлення другаснага *о* < *ǫ*; прыстаўны *г-* развіўся пасля афрыкатызацыі прасл. *g*. Мяркуючы з гэтага, а таксама з геаграфіі прыстаўных *в-* і *г-* і з аказіянальных прыкладаў у тэкстах XIII–XIV ст., выглядае, што прыстаўны зычны пачаў развівацца ў прабеларускіх гаворках да ўтварэння ВКЛ, г. зн. прыблізна ў XIII ст. Існаванне розных арэальных зонаў наводзіць на думку пра розную храналогію для розных прыстаўных зычных, але цяперашнім часам падаць дэталі немагчыма.

Выбраная бібліяграфія

И. Недешев. "Исторический обзор важнейших звуковых и морфологических особенностей белорусских говоров", *РФВ* 12, 1884, 3–4, 40.

Е. Карский. "К истории звуков и форм белорусской речи", *РФВ* 30, 1893, 3, 22.

M. Dolobko. "Der sekundäre *v*-Vorschlag im Russischen", *ZSPh* 3, 1926.

П. Растаргуеў. "Да характарыстыкі беларускіх гаворак", *Запіскі* 1, 1928.

Г. Шило. "Явище протези в слов'янських мовах", *ПСМ* 2, 1949.

M. Altbauer. ["Пра вымаўленне габрайскіх слоў літоўскімі караімамі і габрайскія складнікі ў іх мове"] (іўр.), *Les* 22, 1958–1959, 264.

[1] У слове *гу́сеніца* (машына) *г-* не этымалагічнае і не пратэтычнае; параўн. бел. *ву́сень*. Гэтае слова – запазычанне з рас. *гу́сеница*, дзе *г-* з'явіўся дзеля змешвання з марфемаю *гусь* на тэрыторыі расійскае мовы (рас. *гусь*, бел. *гусь*) (гл. *PoS* 244).

J. Otrębski. *Gramatyka języka litewskiego* 1. W, 1958, 118, 378 {і наст.}; "Slawizacja litewskich nazw wodnych i miejscowych", *ZPSS* 1963, 278.

G. Shevelov. "Prothetic Consonants in Common Slavic: A Historical Approach", *ACICS* 5, 1963. {Перадрук. у} *TA*.

В. Гринавецкис. "Новое в литовской диалектологии", *ABS* 2, 1965.

В. Журавлев. "Генезис протезов в славянских языках", *ВЯ* 1965, 4.

І. Кавальчук. "Да характарыстыкі гаворак беларуска-літоўскага моўнага пагранічча", *ЛД* 59.

/В. Чекман. "К типологии славянской протезы", *СоСл* 1979, 6./

Змена 38. Ацвярдзенне *c'*, *c̄* (канец XIII ст.). Гл. змену 34.

Змена 39. Развіццё новых *g*, *g'* **праз запазычаныя словы** (прыблізна з XIV ст.). Спрадвечныя беларускія g_{14} і g'_{14}, акрамя пазіцыі пасля *z* і *ž*, зніклі, мабыць, недзе пасля XI ст. (гл. змену 13), але новай крыніцаю звонкіх заднепаднябенных змычных сталі шматлікія запазычанні, пераважна з польскае ды з іншых моваў праз польскую, і іх масавы наплыў у прабеларускія гаворкі пачаўся каля XIV ст. Якраз гэты кантакт з чужымі крыніцамі *g* стварыў патрэбу ў новым дыграфе *кг* для абазначэння звонкага заднепаднябеннага змычнага; новы дыграф пачалі ўжываць у тэкстах ад XIV ст. Новыя g_{37} і g'_{38}, што паходзілі з польскае ды іншых моваў, звычайна захоўваюцца і ў сучасных беларускіх гаворках, напр., [г]*ýзік*, [г]*валт*, *ня*[г'э́г]*лы*, але ёсць і шмат прыкладаў іх замены на *h*; у пазнейшы час замена *g* на *h* асабліва тыповая для запазычанняў, якія прыходзілі з расійскае мовы ці за яе пасярэдніцтвам.

Табліца 24. Зрэз 10С. Прабеларуская сістэма зычных на пачатак XV ст.

$p_{1,16}$	p'_{16}	t_5	t'_{20}		k_{13}	k'_{13}
$b_{2,17}$	b'_{17}	d_6	d'_{21}		(g_{37}) 14	(g'_{38}) 14
		s_7	s'_{15}	$š_{15}$	x_{15}	x'_{15}
$v/w_{4,10,19}$	v'_{19}	z_8	z'_{14}	$ž_{14}$	$γ_{14}$	$γ'_{14}$
		c_{13}		$č_{13}$		
				$(ǯ_{14})$		
$m_{3,18}$	m'_{18}	n_9	n'_9			
		l_{10}	l'_{10}			
		r_{11}	$(r'_{11,36})$			
				j_{12}		
$\bar{p}_1$	$\bar{p}_{16}$	$\bar{t}_5$	$\bar{t}'_{20,25}$			
$\bar{b}_2$	$\bar{b}'_{17,22}$	$\bar{d}_6$	$\bar{d}'_{21,26}$			
		$\bar{s}_7$	$\bar{s}'_{15,27}$	$\bar{š}_{33}$		
	$(\bar{v}_{23})$	$\bar{z}_8$	$\bar{z}_{28}$	$\bar{ž}_{14,34}$		
		$\bar{c}_{13,29}$		$\bar{č}_{13,35}$		
				$\bar{ǯ}_{14,34}$		
$\bar{m}_3$	$(\bar{m}'_{24})$	$\bar{n}_9$	$\bar{n}'_{9,30}$			
			$\bar{l}_{10,31}$			
		$(\bar{r}_{32})$	$(\bar{r}'_{32})$			

Выбраная бібліяграфія

А. Булыка. *Даўнія запазычанні беларускай мовы.* Мн, 1972, {асабліва пра *кг* с. 146–153}.

7. Перыяд беларускае мовы ад XV ст. да сучаснасці. Змены 40–51

Змена 40. Развіццё *ы* і *і* пасля *р, л* паміж зычнымі (да XV ст.). У пазіцыі пасля зычнага і сананта, як і ў іншых пазіцыях, развіліся моцныя рэдукаваныя (гл. змену 21), але замест слабога *ъ* мы ў пазіцыі пасля сананта звычайна знаходзім *ы*, найчасцей ненаціскны: *ръ* > *ры*, *лъ* > *лы*. Прыкладаў *рі* быць не можа, бо на той час *р'* ужо ацвярдзеў (гл. змену 33). Адпаведна на месцы *рь* таксама знаходзім *ры*. Што да

ль > *лі*, то гэты пераход рэпрэзентаваны слаба. Прыклады з беларускае мовы:

а) нармальнае развіццё рэдукаваных (моцная пазіцыя): прабел. *кръвь* > бел. *кроў*, прабел. *глътъка* > бел. *глóтка*;

б) развіццё слабых рэдукаваных пасля сананта: прабел. *кръв(и)* > *крви* > бел. *крывí* (Р.скл. адз.); прабел. *трьвога* > *трвога* > бел. *трывóга*; прабел. *яблък-* > бел. *я́блык*; прабел. *бльск-* > бел. *бліск(ýчы)*.

Гэтая самая змена адбылася і ў суседніх украінскіх гаворках.

Традыцыйна лічаць, што ў разгляданых спалучэннях сананты пасля страты слабых рэдукаваных зрабіліся складовымі, а іх складовасць была скасаваная ўстаўкай галоснага. Але довадаў таго, што прабеларускія (і праўкраінскія) дыялекты калі-небудзь праходзілі праз гэтую сярэднюю стадыю складовых санантаў[1], няма, і ніштo не пярэчыць прасцейшаму дапушчэнню, што пасля страты слабых *ераў* збегі зычных, якія атрымаліся ў яе выніку, часткова разбіваліся ўстаўкаю *ы*, радзей *і*, пасля санантаў. Варта зазначыць, што апісанае тут развіццё групаў "санант + рэдукаваны" – найбольш тыповае для пачатковага склада ў слове, якраз у пазіцыі, дзе слабыя рэдукаваныя страціліся рана.

Прысутнасць *ы* на месцы першапачатковага слабога *ъ* пасля санантаў упершыню адзначаецца ў тэкстах XV ст.: напр., *крывавы* (1489). Вынікам шматразовага развіцця рэдукаваных стала прабеларускае морфафанемнае чаргаванне ў шмат якіх каранях *о́* (*е́*) || #, якое пазней у беларускай мове набыло форму *о́* (*е́*) || *ы* (*і*): напр., *кроў* || *крывí*. Аднак – ці з прычыны паўторнага выраўноўвання ў межах парадыгмы, ці пад польскім уплывам (напр., *krwi* 'крыві', пачатак XVII ст.) – гэтыя морфафанемныя чаргаванні захоўваліся не заўсёды. Беларуская мова мае багата прыкладаў такога паўторнага выраўноўвання, часам з націскам на ўстаўным галосным: напр., *крышку* поруч з *крóшка*, *дрыўмí* (Т.скл. мн.) замест *дрóўмі* (але *дрэ́ва* < польск. *drzewo*). Мадэлямі тут ёсць адпаведна *крыхá* і **дрывá* (цяпер *дрóвы*).

---

[1] Традыцыйны погляд гл. у Карскага і Юргелевіча. Даўнія запазычанні з чэшскае мовы са складовымі санантамі запісваліся ў тэкстах XVI ст. паслядоўнасцю галоснага і сананта: напр., чэшск. *smrčina* 'сасновы бор' > старабел. *смырчынь*.

У слове *сляза́* (< *сльза*) літаратурная беларуская мова не мае слядоў спадзяваных формаў на *лі*.

Змена 41. Вакалізацыя *л* (> *ў*) на канцы слова і перад зычнымі (XV ст.). Паміж пачаткам IX ст. і пачаткам X ст. прабеларускія спалучэнні *ъл* лабіялізаваліся і вакалізаваліся (гл. змену 10), напр., прасл. **vъlkъ* > *вълкъ* > бел. *воўк*; параўн. утворанае ад гэтага кораня прозвішча *Вовчькевич* (1497), *до Волчого ~ Вовчого леса* (Брэст, 1566).

У пазнейшы час на шырокім абшары, які ахоплівaў беларускую і ўкраінскую мовы, а таксама некаторыя паўднёва-заходнія расійскія гаворкі (напр., на Смаленшчыне), канцавы *-л*, які пазначаў мужчынскі род адзіночнага ліку прошлага часу дзеясловаў, змяніўся на *-ў* незалежна ад якасці папярэдняга галоснага[1]: напр., бел. *чыта́ў* – параўн. рас. *чита́л*. Тое, што пераход *л* > *ў* быў абмежаваны толькі дзеясловамі, паказвае чыста марфалагічны характар гэтае змены. У іншых часцінах мовы, якія першапачаткова канчаліся на *-ль*, бакавыя не здолелі вакалізавацца: напр., *стол*, *мил* '*мілы*' (прэдыкатыўная форма). Прычынаю змены *-л* > *-ў* у дзеяслоўных формах мусіла быць змешванне з герундыямі, якія першапачаткова канчаліся на *-въ* (< *-ў*), пры гэтым абедзве формы ўжывалі ў прэдыкатыўнай функцыі.

У гаворках вакалізацыя *л* дзе-нідзе сустракаецца ў пазіцыі перад зычнымі: напр., дыял. [па́ўка] (літар. бел. *па́лка*), [ігóўка] (Ельня, на ўсход ад Смаленска; літар. бел. *ігóлка*)[2]. Пра нефанемны характар гэтае з'явы сведчыць тое, што вакалізацыя *-л-* не паслядоўная: параўн., напр., адсутнасць змены ў бел. *ярмóлка* (таксама бел. ід. *jármolke*);

---

[1] Вакалізацыя *л* адзначана таксама ў славенскай, царкоўнаславянскай, сербалужыцкіх, палабскай мовах і дзе-нідзе яшчэ, але гэтыя працэсы не маюць дачынення да змены, што адбылася ў беларускай. У польскай мове змена *л* > *ў* не адзначана аж да XVI ст.

[2] Першапачатковы $л'_{11}$ перад *ь* ніколі не пераходзіць у *ў*, нават калі бакавы пазней зацвярдзеў: напр., *па́льцы* > дыял. [пальцы] (але не *[паўцы]); [сíльны]. Вось жа можна дапусціць, што дыялектнае ацвярдзенне $л_{11}$ (< *ль*) адбылося пазней за змену *л* > *ў*. Беларускія тэксты XVI–XVII стст. маюць напісанні без *ь* пасля *л* перад суфіксам *-ьство* і сям-там перад *-н*, але гэта лёгка можна прызнаць за арфаграфічную манернасць. У *ДАБМ* дыстрыбуцыя $л < л'_{11}$ наўпрост не паказана, але прыблізны абсяг ацвярдзення можна вывесці з некаторых марфем, пашыранасць якіх паказана ў атласе (напр., карты 233, 260, 262). Беларускія татары не адрознівалі *л* і *л'* графічна.

неалагізмы ў вакалізацыі *л* не ўдзельнічаюць (у процілегласць вакалізацыі *в*: параўн. змену 28): *калга́с* (= *калекты́ўная гаспада́рка*), калька паводле мадэлі рас. *колхо́з* (= *коллекти́вное хозя́йство*)[1].

Першая адзнака марфалагічна абумоўленае змены ў дзеяслоўных формах з'яўляецца ў XV ст., калі графемы *в* і *л* пачынаюць часам ужываць на перамену. Раўназначнасць графем падказвае, што дзве гэтыя графемы ў некаторых пазіцыях маглі мець аднолькавае фанетычнае значэнне, напр., [ў]:

– напісанні *л* на месцы $в_{4,10}$: *взялши* < *възявъши* (суч. бел. *узя́ўшы*); у недзеяслоўных формах: *(у)волторник*, *у волторокъ* (XVI ст.; суч. бел. *аўто́рак*), але таксама *во второк* (1599), бел. лац. *w Wowtorok* (XVI ст.)[2].

– напісанні *в* на месцы $л_{10}$: бел. лац. *odolew* м.р. адз. прош.ч. (1638; суч. бел. *адо́леў*).

Беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом таксама адлюстроўваюць гэтую змену: напр., *ʾābāčiw θaradina* (XVII ст.; суч. бел. *аба́чыў у сярэ́дзіне*). Беларускія тэксты габрайскім пісьмом паказваюць змену *-л* > *-ў* непаслядоўна: напр., бел. габр. *byl* (1635, Вільня; суч. бел. *быў*); *zsʿšywwʾl* (1640; параўн. суч. бел. *жыў*); *dʾhylnʾwwʾ* (з метатэзаю?; параўн. дарэф. бел. *Даўгі́наў*, суч. бел. *Далгі́нава* ў Мінскай вобласці), але *byʾ* (пачатак XVII ст.; суч. бел. *біў*), *rʾzwy* (?) (1640; суч. бел. *рэ́заў*). Нават сучасныя дыялекты ідышу ва ўсіх храналагічных пластах Беларусі маюць мала слядоў беларускае змены *-л* > *-ў*. У шмат якіх выпадках ідыш захоўвае бакавы там, дзе беларуская мова мае *ў*: напр., бел. *ко́ўдра* (з польск. *kołdra* < сярэд.-в.-ням. *Kolter*), але ід. *kóldere*; бел. *каўне́р* – ід. *kólner* (польск. *kołnierz*). Параўн. таксама ід. *tólkač*, адпаведнае бел. *таўка́ч*. Па сутнасці, у ідышы тэндэнцыя аднаўляць *л* на месцы беларускага (або польскага) *ў* вядзе нават да гіперкарэкцый у спрадвечным лексіконе: напр., спрадвечнае ід. *bowx* 'страўнік' (параўн. літар. ням. *Bauch*) адзначаецца і як [bolx]. Прычынаю, дзеля якой беларускія матэрыялы габрайскім пісьмом даюць мала прыкладаў пераходу *л* > *ў*, магло быць або тое, што вакалізацыя

---

[1] Але дыял. [каўхос] (заўв. рэд.).

[2] У формах *сажавк*, *сажавок* (1529) *в*, відаць, спрадвечны; суч. бел. *са́жалка*, бадай, пазнейшае ўтварэнне. Параўн. бел. запазычанні ў літоўскіх тэкстах XVI–XVII ст.: *sažauka*, *sožiauka*.

бакавых не закранула ідышу, гутарковае мовы большасці пісараў, або ўплыў польскае мовы.

Вынікам абмежаванае кантэкстам вакалізацыі *л* у беларускай мове стала змешванне *л* перад зычнымі з рэфлексам *в* у гэтай пазіцыі; вось жа і *в*, і *л* могуць чаргавацца з *ў*:

$$л \rightarrow \begin{matrix} ў \\ \uparrow \\ в \end{matrix}$$

Прыклады нейтралізацыі *л* і *в* перад зычнымі гл. у бел. *дзе́ўбанне* (рас. *долбление*); *дзя́ўканне* (рас. *тявканье*). Адпаведна здараюцца і зрухі з аднаго чаргавання на другое. На падставе ўскосных склонаў з *ў* < *л*, напр., у слове *чо́ўна* (Р.скл. адз.) < *чьлна* ўвайшла ва ўжытак новая форма назоўнага склону адзіночнага ліку з *в*: *чо́вен* < *чьлнъ*.

Выбраная бібліяграфія

Я. Станкевіч. "Дыспаляталізацыя *л* у беларускай мове", *Запіскі* 1, 1928, 2.

N. Štif. ["Дыялекталагічныя працы М. Вэйнгера"] (ід.), *DYŠ* 14–15, 1929, 21.

В. Чэкман. *Гісторыя проціпастаўленняў па цвёрдасці–мяккасці ў беларускай мове*. Мн, 1970, 111.

Гл. таксама бібліяграфію да змены 10.

Змена 42. Развіццё ў дыялектах *ф*, *ф'* праз запазычаныя словы (да XV ст.). Хоць сучасная літаратурная беларуская мова мае $ф_{40}$ і $ф'_{41}$, у пераважнай большасці гаворак няма глухой пары для *в* і *в'*. Адзіная крыніца *ф* – запазычанні. Гістарычныя беларускія тэксты часта маюць *ф* у напісаніі запазычанняў, але ў іх лёгка можна знайсці і замены чужога *ф*, якія адлюстроўваюць сучасныя гутарковыя нормы вымаўлення. Беларускія тэксты цюркска-арабскім пісьмом даюць багата напісанняў з *ф*; гэта не дзіва, бо ў дзвюхмоўных людзей, як татары, якія часта ўмелі і па-беларуску, і па-польску (а ў польскай мове гук *ф* ёсць), – можна спадзявацца большае талерантнасці да гуку *ф*; напр., бел. цюрк. *fārṭūnu* 'фартуну' В.скл. адз. (XVII ст.), *frāṣunūq* (XVII ст.) < адпаведна польск. *fortuna*, *frasunek*.

Іншамоўны *ф* можа замяняцца ў беларускай мове па-рознаму: гукамі *п*, *х*, часам – *к*, *б*, *в*, *г* (*h*), і спалучэннямі *хв*, *хф* і *кв*: напр., *Ходор* (1510), *Хве́дар* побач з *Фе́дар*, якому ў каталікоў адпавядае *То́дар*, але

таксама *Ходоръ Федоровичъ* (1596–1597); *Ольхимъ* (1590; *Евхимъ*, 1580; параўн. ц.-сл. *Еуфимъ*, бел. *Яфім* побач з *Аўхім*/*Яўхім*); *Пилипъ* (1533; суч. бел. *Пілíп*); *викгоурою* ‘фігураю’ (XVI ст.), слаўгарадскае дыял. [в’іґýра] (суч. бел. *фігýра*; параўн. польск. *figura*); літар. бел. *фуфáйка* ў гутарковай мове вымаўляецца па-рознаму: [куфáйка, кухвáйка, кухáйка, куґáйка]. Цяжкасці з гукам *ф* у людзей, для якіх беларуская мова родная, адлюстроўваецца і ў гіперкарэктным напісанні сваіх слоў з гістарычна апраўданымі спалучэннямі: напр., *фороба* (1533; побач з чаканым *хвороба*; суч. бел. *хварóба*); *фалити* (1595, суч. бел. *хвалíць*); *Витофте* М.скл. адз. (XVIII ст.; суч. бел. *Вíтаўт*). Ціск сучаснае літаратурнае мовы (з *ф*) давёў таксама да аналагічных заменаў спалучэння *хв* на *ф* у сучаснай гутарковай беларускай мове: напр., у Навазыбкаве (на ўсход ад Гомеля, цяпер Расія) запісаная форма [фост] (~ *хвост*).

Выбар замены для *ф* не заўсёды звязаны з пэўнай гаворкай, але і не робіцца зусім адвольна. Напр., распад рысаў гуку *ф* на спалучэнне *хв* абмежаваны пазіцыяй перад галоснымі (напр., *хвакт*, літар. бел. *факт*)[1]. Перад *о* адзначаюць як *х*, так і *хв*. У канцы слова пасля зычнага ці галоснага перавагу мае *п*: напр., *торп* (літар. бел., польск. і рас. *torf*, *торф*); *Осип* (1582). На жаль, нам бракуе дэталяў з сучасных гаворак, каб рабіць шырэйшыя абагульненні пра дыстрыбуцыю гутарковых заменаў чужога *ф*. З тэарэтычнага боку выбар сваёй замены для чужога *ф* можна разглядаць як адлюстраванне розных спрадвечных лабіяльных сістэм, што ляжалі ў яго аснове; г. зн. можна спадзявацца, што розныя сістэмы будуць па-рознаму адказваць на ўздзеянне чужога *ф*. Такія рэакцыі маглі таксама з часам змяніцца. Але гэтыя розныя змены – у той меры, у якой яны існавалі ў мінулым, – мабыць, немагчыма аднавіць на падставе нашых цяперашніх ведаў у лінгвістычнай геаграфіі. *ДАБМ* (карта 44) паказвае геаграфію слова *фасóль*, *фасóля* (< польск. *fasola*, урэшце з грэцкае праз лаціну і сярэдняверхненямецкую). Формы з *ф-* канцэнтруюцца пераважна на паўночным

1

Рысы:	/ф/	>	/х/	/в/
глухі	+		+	
губна-зубны	+			+
фрыкатыўны	+		+	+

захадзе і сям-там рэпрэзентаваны ў іншых раёнах; формы з *кв-* пераважна на ўсходзе; варыянты з *п-* – на цэнтральна-заходнім абшары; варыянты на *хв-*, як правіла, перакрываюцца з формамі на *кв-*, хоць яны і не такія шматлікія, як апошнія[1]. Паколькі чужы *ф* мог замяняцца рознымі гукамі і нельга выключыць некаторых семантычных асацыяцый, трэба думаць, замена ў кожным слове мусіць мець уласны геаграфічны малюнак, што пацвярджаюць матэрыялы *ДАБМ.*

Узнікненне *ф* у тых нешматлікіх дыялектах (ці, дакладней кажучы, паддыялектах або раёнах), якія прынялі гэты сегмент, немагчыма датаваць дакладна, бо пісьмовыя сведчанні маюць спарадычны характар, а прыняцце *ф* часткова залежыць ад нормаў чужых моваў, уздзеяння на паасобных людзей, і ад іх знаёмства з мовамі-крыніцамі слоў з *ф* – а гэта фактары, якія, відавочна, цяжка рэканструяваць для ранейшых перыядаў. Можна думаць, што дзвюхмоўныя людзі накшталт беларускіх габраяў, караімаў і цыганоў маглі быць асабліва схільныя да прыняцця новага *ф*, бо гэты гук ёсць і ў караімскай, і ў цыганскай, і ў ідышы. З суседніх моваў толькі ў польскай і расійскай ёсць не толькі запазычаны, але і свой гук *ф* (< *в* на канцы слоў і перад глухімі зычнымі), але якраз з гэтымі дзвюма мовамі беларуская мова мела найбольшыя зносіны; іншыя суседнія мовы – украінская, літоўская і латышская – маюць *ф* толькі ў запазычаннях.

Такім парадкам, *ф* пашыраўся праз дзвюхмоўныя асяродкі і, у меншай меры, праз тэрытарыяльныя кантакты з суседнімі мовамі. Досыць шырока гэты гук прыйшоў разам з хрысціянствам, але перыяд інтэнсіўнейшых і шырэйшых кантактаў з *ф*, найпраўдападобней, прыпаў на канец XIV – пачатак XV ст., калі лексікон беларускае мовы апынуўся пад уплывам польскіх (а праз польскія таксама грэцкіх і лацінскіх) элементаў – моваў, якія маюць *f* (*ph*).

Тое, што гуку *ф* дагэтуль не ўдалося інтэгравацца ў большасць беларускіх гаворак, не зважаючы на сур'ёзныя кантакты з польскаю, а пазней расійскаю мовамі і не зважаючы на прысутнасць яго звонкае пары *в*, з тэарэтычнага боку можна вытлумачыць, дапусціўшы, што ў аснове сістэмы зычных у гэты перыяд ляжала не апазіцыя паводле звонкасці–глухасці, а

[1] Форму *басóля* зафіксавала Н. Калоша. "З лексікі вёскі Лукі", *Матэрыялы для слоўніка народна-дыялектнай мовы.* Пад рэд. Ф. Янкоўскага. Мн, 1960, 157.

карэляцыя паміж напружанымі і ненапружанымі зычнымі. У такой сістэме *в*, як ненапружаны член, быў бы найпрасцейшы, немаркіраваны член апазіцыі; адносна больш напружаны *ф* быў складанейшы паводле структуры, чым *в*, бо маркіраваўся напружанасцю. Паколькі мова ўжо мела немаркіраваны член апазіцыі, *в*, то прымаць маркіраваны глухі адпаведнік не было пільнае патрэбы. Тыя ж меркаванні могуць вытлумачыць, чаму $ч_{13}$ і $ц_{13}$ набылі звонкія пары прыблізна ў той самы час (гл. змену 44): $ч_{13}$ і $ц_{13}$ былі маркіраванымі напружанымі членамі апазіцыі, якая не мела немаркіраваных ненапружаных параў. Сітуацыя, калі ў мове ёсць маркіраваныя складнікі апазіцыі пры адсутнасці адпаведных немаркіраваных складнікаў, часта няўстойлівая. У выпадку беларускае мовы ўласцівая ёй няўстойлівасць была скасаваная набыццём у кожным выпадку немаркіраваных звонкіх параў *ǯ* і *ʒ*. Нашы довады будуць мацнейшыя, калі нам удасца паказаць, што абшар, на якім новы *ф* быў адкінуты, у значнай ступені адпавядаў тэрыторыі, на якой звонкія зычныя захаваліся на канцы слова і перад глухімі. Мы не маем сведчанняў, якія б пераканаўча даводзілі гэта, але параўнанне абшараў без *ф* у слове *фасоля* (*ДАБМ*, карта 44) і абшараў, дзе звонкія захоўваюцца (*ДАБМ*, карты 45, 46), выяўляе іх значнае супадзенне. Нашым разважанням пярэчыць той факт, што *ʒ* і *ǯ* не з'яўляюцца геаграфічна абмежаванымі – яны прынятыя ўсімі гаворкамі, незалежна ад паводзінаў першапачатковых звонкіх зычных.

Пра ўзнікненне $\bar{ф}$ на граніцы марфем гл. змену 25; як і іншыя губныя, новы *ф* перад *j* набыў эпентэтычны *л'* (шырэй пра гэта ў змене 3).

Выбраная бібліяграфія

C. Stang. *Die westrussische Kanzleisprache des Großfürstentums Litauen.* O, 1935, 86.

ЛГ 147, 165 {і наст.}, 292–294.

Змена 43. Афрыкатызацыя *т', д' > ц', ʒ'* (паміж XIV і XVI ст.). У большасці беларускіх гаворак $т'_{20}$ і $д'_{21}$ перайшлі ў афрыкаты *ц'* і *ʒ'* ва ўсіх пазіцыях, у т. л. і перад $в'_{4, 10}$, пры ўмове, што збег зычных *т + в'* або *д + в'* не рассякала граніца паміж марфемамі (пра ацвярдзенне зычных у некаторых спалучэннях зычных, што ўзніклі пасля страты слабога *ь*, гл. змену 25). З'ява афрыкатызацыі называецца ў беларускай мове "цеканнем" і "дзеканнем" (рас. "цеканье", "дзеканье", польск. "ciekanie" і "dziekanie" або проста "ciakanie", літ. "cekavimas", "dzekavimas"). Прыклады з сучаснае беларускае мовы: *ці́хі* (параўн.

рас. *ти́хий*); *пяць* (параўн. рас. *пять*); *дзень* (параўн. рас. *день*); *цвёрды* (параўн. рас. *твёрдый*); *дзверы* (параўн. рас. *дверь*). Адсутнасць афрыкатызацыі *д*, напр., у слове *адве́сці* абумоўленая тым, што *д* стаіць на граніцы марфем.

Афрыкатызацыя *т'* і *д'* адсутнічае толькі ў некалькіх мясцовых гаворках, пераходных да ўкраінскіх (гл. *ДАБМ*, карты 56, 57). На ўсходніх ускраінах тэрыторыі беларускае мовы афрыкатызацыя цяпер адступае. Напр., на ўсход ад Гомеля афрыкатызацыя $т'_{20}$ і $д'_{21}$ у 1927 г. адступіла ў параўнанні з перыядам 1890-х гг., а на Смаленшчыне было адзначана больш прыкладаў афрыкатызацыі ў першай палове XIX ст., як у другой палове. Гэтае аднаўленне *т'* і *д'* можна прыпісаць пазнейшаму ўплыву расійскае мовы (Расторгуев).

Афрыкатызацыя была, магчыма, не патрабаваннем існае фанетычнае сістэмы, а проста вынікам інтэнсіўнае палаталізацыі зубных змычных, іначай кажучы, гэта была сінтагматычная, а не парадыгматычная праблема. Непаслядоўнае адлюстраванне цекання і дзекання ў гістарычных беларускіх тэкстах (гл. ніжэй) можна вытлумачыць тым, што беларускія пісары не мелі патрэбы ў спецыяльнай графеме або ў змене ўсталяванае арфаграфіі, бо ўсе палаталізаваныя зубныя змычныя мелі тэндэнцыю да моцнае палаталізацыі[1]. Афрыкатызацыя ўскладніла апазіцыю паміж *т* і *т'*, *д* і *д'*, бо цяпер мяккія адпаведнікі *т* і *д* пачалі ўключаць у сябе і мяккасць, і асібіляцыю. З фанетычнага погляду новыя $ц'_{20}$ і $ʒ'_{21}$ – мяккія адпаведнікі $ц_{13}$ і $ʒ_{42}$ (апошні развіўся прыблізна ў той самы час, гл. змену 44), але з функцыянальнага боку (г. зн. морфафанемна) яны складаюць пару $т_5$ і $д_6$. Параўн. такія чаргаванні мяккіх і цвёрдых элементаў у адным корані, як, напр., *дзень* || *дня*, *ве́цер* || *ве́тру*, *цяць* || *тнуць*; а таксама дублеты *адо́нак* ~ *адзе́нак* ‘аснова стога сена’, якія могуць адлюстроўваць праславянскую флуктуацыю *-dъпо-* ~ *-dьпо-*.

---

[1] Воўк-Левановіч (1930) прыйшоў да высновы, што шукаць геаграфічнага цэнтру беларускага цекання і дзекання няма сэнсу, бо афрыкатызацыя, як рэакцыя на моцную палаталізацыю, была праблемай “псіхафізіялагічнай”. Шавялёў (*PFB*) таксама ўстрымліваецца ад лакалізацыі пункту дыфузіі афрыкатызацыі. Сёння ў некаторых людзей адзначаюць тэндэнцыю дыспалаталізацыі *ʒ'*, але аўтары нарматыўных працаў пазначаюць дзэканне як памылку ў вымаўленні (параўн. таксама с. 239). Гэтая рыса, відаць, уласцівая мове расійцаў, якія гавораць па-беларуску.

З'яву афрыкатызацыі датуюць па-рознаму – ад IX да XVI ст. Такая вялікая розніца ў часе вынікае з нязгоды ў пытанні, ці лічыць падставы афрыкатызацыі вонкавымі, г. зн. абумоўленымі ўплывамі суседніх заходнеславянскіх дыялектаў. Прапановы наконт храналогіі можна падзяліць на тры групы:

1. Цеканне і дзеканне – познія праславянскія з'явы, уласцівыя найперш паўночнаславянскім мовам (польскай, кашубскай і сербалужыцкім), а таксама дыялектам славацкае і расійскае моваў. Але дата з'яўлення афрыкатызацыі ў польскай і кашубскай мовах, як думаюць, XII–XIII стст., а ў славацкіх дыялектах – да XIV ст., што запозна, каб быць праславянскаю з'явою.

2. Цеканне і дзеканне развіліся ў IX–X стст. пад уплывам ляхіцкага (заходнеславянскага) субстрату, які, як кажуць, адыграў нейкую ролю ў этнагенезе беларусаў (Шахматов, Бузук, Цьвяткоў ды інш.). Аднак храналагічнае разыходжанне паміж меркаваным перыядам ляхіцкіх кантактаў з прабеларускаю моваю і афрыкатызацыяй старапольск. *t'*$_{20}$ і *d'*$_{21}$ у XII–XIII стст. завялікая; і калі ляхіцкія плямёны пашыралі гэтую рысу, дзіўна, чаму на Беларусь не пашырыліся іншыя тыповыя заходнеславянскія рысы – такія, як захаванне праславянскіх спалучэнняў *tl* і *dl*? (Параўн. таксама довады адносна ўплыву польскае мовы на ацвярдзенне *r'*$_{11}$ пад зменаю 33[1].)

3. Цеканне і дзеканне развіліся паміж XIII і XVI ст., магчыма, але не абавязкова, пад уплывам польскае мовы. Аднак польскі ўплыў трэба адкінуць, бо ў дзвюх гэтых мовах розніцца сам характар палаталізацыі (польск. *ć*, *ʒ́* пры бел. *c'*, *ʒ'*).

Пісьмовыя звесткі, хоць і нешматлікія, не пацвярджаюць погляду, што афрыкатызацыя развілася да XV ст. (як даводзілі Растаргуеў (Расторгуев 1918–1920), Якабсан (Jacobson), Калнынь, Курашкевіч (Kuraszkiewicz), Штыбэр (Stieber) ды інш.). Ранейшае датаванне грунтуецца на няпэўных і недастатковых довадах. Напр., Бузук прапанаваў канец XIII ст. на той падставе, што ў адным віцебскім дакуменце прыблізна 1300 г. сустракаецца напісанне *мець*, якое ён вытлумачыў

[1] Тэорыі ляхіцкай інтэрферэнцыі пярэчылі, сярод іншых, Бадуэн дэ Куртэнэ (Бодуэн де Куртене), Стэндэр-Пэтэрсэн (Stender-Petersen), Курашкевіч (Kuraszkiewicz), Штыбэр (Stieber). Карскі быў перакананы ў ляхіцкім уплыве, але пазней змяніў сваю думку.

як ‘медзь’ (параўн. рас. *медь*). Аднак форму *мець* у гэтым тэксце трэба разумець як *мечь* (суч. бел. *меч*) у паўночна-беларускім цокальным вымаўленні. Карскі прапанаваў быў XIV ст. на аснове такіх формаў, як *людзи* (1409). Але нешматлікасць прыкладаў з гэтага стагоддзя і магчымасць прыпісаць форму *людзи* ўплыву польскае мовы робіць XIV ст. менш праўдападобнаю датаю, чым XV ст. Нават у тэкстах XV–XVI стст. напісанні *ц’*, *ʒ’* досыць нешматлікія, з разгледжаных вышэй прычын. Беспасярэдне адлюстроўваюць *ц’*, *ʒ’* у тэкстах уласныя імёны *Гардзей* (1646) – ц.-сл. *Гордии*, *Дзмитр* (1670), памянш. *Змитрок* (1746) – ц.-сл. *Димитрии*.

Важную магчымасць для распазнання афрыкатызацыі даюць гіперкарэктныя напісанні. Напр., спроба ўнікнуць *ц’* і *ʒ’*, пішучы *ы* і *а* замест гістарычна правільных *и* і *я*, падказвае, што дзеканне і цеканне былі ўласцівыя гаворцы пісара: напр., *Дытрыха* Р.скл. адз. (уласнае імя, 1585); *тажъком* Т.скл. адз. м.р. (XVII ст.; суч. бел. *цяжкі*). Параўн. нават унікненне афрыкат у запазычаннях з польскае: напр., *денкуе* (канец XVI ст.) < польск. *dziękuje* (суч. бел. *дзя́куе*). Яшчэ адзін знак афрыкатызацыі – аказіянальнае напісанне *ь* (толькі пасля зубных): напр., *тьелятника* (суч. бел. *цяля́тніка*), *дьевку* В.скл. адз. (XVI ст. (Антонович); суч. бел. *дзе́ўка*). Параўн. таксама замену гістарычнага *ц* (< *к*) на *т*: напр., *шинкарте* М.скл. адз. (XVI ст.; суч. бел. *шынка́рка*).

Пачынаючы з XVI ст. некаторыя чужаземцы звярталі ўвагу на звычку беларусаў да афрыкатызацыі *т’* і *д’*. Такі характар маюць заўвагі барона фон Гэрбэрштайна (XVI ст.) і апісанне харвацкага аўтара XVII ст. Ю. Крыжаніча.

Беларускія матэрыялы канца XVI – пачатку XVII ст., пісаныя габрайскім пісьмом, не паказваюць выразных знакаў афрыкатызацыі: напр., *brsṭ’’y*[1] (канец XVI ст., Магілёў; суч. бел. *Брэ́ст* – рас. форма; старабел. *Берестье*, дарэф. бел. *Берасьце*), *ṭ[r]by[e]* (1635, Вільня; суч. бел. *цябе́*). Магчыма, канцавая графема *yod* у першым прыкладзе пазначае не афрыкатызацыю, а палаталізацыю. Сам выбар графемы *ṭ* (*ṭeṭ*), а не *t* (*tav*), якая магла вымаўляцца ў ашкеназійскім (беларускім)

[1] Падвойны апостраф – рыса габрайскае арфаграфіі, якая не мае фанетычнага значэння.

іўрыце як [т] або як [с] у залежнасці ад пазіцыі ў слове, можа пярэчыць погляду, што афрыкатызацыя ў той час існавала.

Беларускія матэрыялы цюркска-арабскім пісьмом больш інфарматыўныя. У тэкстах XVII ст. і $т_5$, $д_6$ (перад *о, ы, а*), і $т'_{20}$, $д'_{21}$ (перад *а, е, і, о*) перадаюцца адпаведна адною графемаю, а $ц_{13}$ перадаецца яго ўласнаю графемаю – гэта інавацыя беларускіх татараў, бо ні ў арабскім пісьме, ні ў турэцкім ці іранскім варыянтах арабскага пісьма няма літары для гуку [ц], вядомага з найдаўнейшых тэкстаў беларускіх татараў (г. зн. з першае паловы XVII ст.). Гэты факт можа паказваць, што ў XVII ст. гаворкі Мазыршчыны і паўднёвага кута Глушчыны (Магілёўская вобласць), адкуль, як кажуць, паходзілі аўтары найдаўнейшых беларускіх тэкстаў цюркска-арабскім пісьмом (Антонович), не мелі гукаў *ʒ'* і *ц'*, вось жа пісары не мелі патрэбы ў асобнай графеме. У XVIII ст. і аж да XX ст. таксама ўжывалі новы знак для пазначэння *ц'* < $т'_{20}$. Можна думаць, што гэта была, хоць і рэдкая, спроба пазначыць афрыкатызацыю $т'_{20}$. Афрыкатызаванае вымаўленне пашырылася сярод татараў нават на неславянскія карані: напр., *ʾabʒaθ* ‘мусульманскае рытуальнае абмыванне’ (XVII ст.) < перс. *ābdest*, гэтае слова вымаўляецца як [abʒ'es'] (Zajączkowski).

Сведчанні сумежных з беларускай і пашыраных на адной з ёю тэрыторыі моваў не вельмі дапамагаюць. Беларускі ідыш мае прыклады *ʒ'* і *ц'*, але яны збольшага абмежаваныя лексічнымі запазычаннямі з беларускае; гукавая сістэма ідышу ў цэлым засталася некранутая.

Запазычанні з беларускае ў балцкіх мовах у перыяд з 1547 да 1666 г. не паказваюць афрыкатызацыі беларускіх змычных: напр., літ. *telẽtyna* (бел. *цяля́ціна*) (Skardžius). Гэта можа тлумачыцца тым, што беларускія гаворкі, сумежныя з літоўскаю моваю, у пару запазычванняў яшчэ не мелі афрыкатызацыі. Аднак цяпер паўднёва-ўсходнія літоўскія дыялекты маюць афрыкаты перад *i* і *e* (пад беларускім уплывам?): напр., *žalcis* ‘вуж’ (літар. літ. *žaltỹs*), *Dzievas* ‘Бог’ (літар. літ. *Diẽvas*). Ускосным сведчаннем цекання ў беларускай мове, магчыма, ёсць дыял. [ск'і́рта] ‘сцірта’; форма сустракаецца ў тэксце 1508 г.: параўн. таксама рас. *скирд(á)*. Слова было запазычанае з літ. *stirta*, і іншыя славянскія мовы маюць яго з гукам *т*: напр., укр. *сти́рта* (але і *ски́рта*), польск. *sterta*, *styrta*). Паводле К. Бугі (Būga), беларусы замянілі групу *с'т'* на *с'к'*, бо *т'* у той час ужо перайшоў у *ц'*, і бела-

рускія пісары не хацелі пісаць *т*, бо ён вымаўляўся б як *ц*' (параўн. суч. бел. *сці́рта*). Але варыянты *k*~*t* маглі адлюстроўваць варыяцыю, адметную для балцкіх моваў (параўн. таксама знос. 2 на с. 93 і знос. 1 на с. 117).

Ва ўкраінскім дыялекце цыганскае мовы *т* > *ц* перад *і*: напр., *tsikno* 'малы', якому ў маскоўскім цыганскім дыялекце адпавядае *tikno*; але зусім няясна, ці мае гэтая з'ява нешта супольнае з беларускаю моваю.

Урэшце, украінскае слова *бадьорий* 'бадзёры' можа сведчыць, што ў час запазычвання, недзе пасля XIV ст. (найранейшая фіксацыя ва ўкраінскім тэксце датуецца 1627 г.), афрыкатызацыя зубных змычных яшчэ не ахапіла паўднёвабеларускіх дыялектаў. (Факт запазычвання відавочны з адлюстравання акання ў першым складзе і '*о* ў другім. Уласна ўкраінскім рэфлексам прасл. **bъdrъ* было б *бо́дрий*, параўн. суч. бел. *бадзёры*.) Вядома, магчыма, што ўкраінцы чулі гэтае слова з афрыкатызацыяй, але аднавілі палаталізаваны змычны, аднак гэта не вельмі праўдападобна, бо гэта быў час пашырэння гукаў *ʒ*~*ʒ*' ва ўкраінскай мове, і ў іншых запазычаннях з *ʒ*~*ʒ*' гэтыя гукі захаваліся (параўн. *дзьоба́ти* 'дзюбаць').

Агулам кажучы, цеканне і дзеканне развіліся, мабыць, на поўначы Беларусі паміж XIV і XVI стст., пасля распаду кіеўска-палескае дыялектнае групы, а тады пашырыліся на паўднёвую Беларусь, але запозна, каб ахапіць паўднёвыя раёны кіеўска-палескае зоны (цяпер паўночнаўкраінскія гаворкі).

Што да адноснае храналогіі, то афрыкатызацыю зубных змычных трэба лічыць пазнейшаю за ацвярдзенне $ц'_{13}$ у XIII ст., бо новы $ц'_{20}$, які развіўся з $т'_{20}$, ніколі не робіцца зацвярдзелым. Усе ранейшыя храналогіі для цекання і дзекання таксама можна выключыць, дзеля таго, што афрыкатызацыя залежыць (1) ад падзення слабых рэдукаваных і (2) ад апазіцыі паводле мяккасці–цвёрдасці перад пярэднімі галоснымі *і* і *е*; параўн. *дзве* < прасл. **dъvě*, дзе мяккасць *д*' магла развіцца толькі пасля страты *ъ*.

Важным вынікам уздзеяння цекання і дзекання на сістэму зычных гукаў беларускае мовы стала ўтварэнне мяккіх параў існым цвёрдым *ц* (< *ц*') і *ʒ* (параўн. змену 44). Такім парадкам, апазіцыя зычных паводле цвёрдасці–мяккасці набыла два новыя члены: параўн., напр.,

мінімальную пару *цэ́лы – це́лы*. Перад *о* і *і* ў беларускай мове з'явіліся некалькі мінімальных параў, якія адрозніваліся палаталізаванымі фрыкатыўнымі і новапалаталізаванымі афрыкатамі: напр., *прывязём, прывязіце́ – прывядзём, прыведзіце́* (параўн. рас. *привезём, приведём* і г. д.).

Выбраная бібліяграфія

Бодуэн де Куртене. "Лингвистические заметки и афоризмы". *ЖМНП* 346, апрель 1903.

А. Шахматов. *Введение в курс истории русского языка* 1. СПб, 1916, 105–106.

K. Būga. *RR* 2, 598.

П. Расторгуев. "Белорусская речь в ее современном и прошлом состоянии", *Курс белоруссоведения.* М, 1918–1920; "К вопросу о ляшских чертах в белорусской фонетике", *ТПКДРЯ* 9, 1927; *Говоры на территории Смоленщины.* М, 1960, 9–10, 74.

П. Бузук. "Некалькі слоў аб грамаце рыжан каля 1300 г.", *ПБДУ* 16, 1927.

І. Воўк-Левановіч. *Мова выданьняў Францішка Скарыны.* Мн, 1927, 6; "Еще к вопросу о "ляшских" чертах в белорусской фонетике", *SI* 9, 1930.

Л. Цьвяткоў. "Некаторыя рысы іншаславянскай фонэтыкі ў беларускім лексычным матар'яле", *Запіскі* 1, 1928, 46 {і наст.}.

R. Jakobson. "Remarques sur l'évolution phonologique du russe comparée à celle des autres langues slaves", *TCLP* 2, 1929. {Перадрук. у} *SW* 78.

М. Грунський. "Білоруська мова в її минулому і сучасному вивченні", *ЗКІНО* 4, 1930, 149.

P. Skardžius. "Die slavischen Lehnwörter im Altlitauischen", *TŽ* 7, 1931 {і асобн. выд.} Kau, 1931.

L. Ossowski. "Z fonetyki białoruskiej. 1. O chronologii 'ciekania' i 'dziekania'", *LS* 4, 1934.

A. Zajączkowski. "Lehistan Arazisinde Türk Unsurları", *Türklük* 6, 1939, 418.

Н. Вайтовіч. "Да пытання аб паходжанні беларускага дзекання і цекання", *Ученые записки Минского педагогического института*, 1, 1950.

PFB 23, 27.

A. Stender-Petersen. *Russian Studies.* Co, 1956, 31.

М. Корнеева-Петрулан. "К истории отдельных фонетических особенностей белорусского языка", *ДБРМ* 111–112.

З. Ніколаєнко. "Дзекання та цекання в перехідних говірках від української до білоруської мови", *Доповіді та повідомлення Ужгородського університету. Серія філологічна* 1959, 4.

А. Антонович. “Вопросы фонетики белорусского актового языка XVI в. По материалам судебной (актовой) книги Каунасского земского суда 1566–1567 гг.”, *Kalbotyra* 2, 1960, 107.

М. Бірыла. “Парныя па цвёрдасці–мяккасці *д–дз* (*д’*), *т–ц’* (*т’*) у беларускіх гаворках”, *Працы* 7, 1960.

Д. Калнынь, *Развитие корреляции твердых и мягких согласных фонем в славянских языках.* M, 1961, 61–63.

Wł. Kuraszkiewicz. *Zarys dialektologii wschodniosłowiańskiej z wyborem tekstów gwarowych.* W, 1963[2], 43, 84–85.

L. Otrębski. “Die Assibilation im Polnischen und Ostlitauischen”, *WSl* 13, 1968.

В. Чекман. “К развитию особенностей белорусского консонантизма”, *ВЯ* 1969, 2.

Z. Stieber, *Zarys porównawczej gramatyki słowiańskiej* 1. W, 1969, 90–91.

Змена 44. Развіццё цвёрдага *ʒ* і новага *ʒ́* (да XV ст.). Мяккі $ʒ'_{14}$ першапачаткова развіўся з *g* пры першай палаталізацыі заднепаднябенных і чаргаванні групаў *dj* і *gj* (змена 3). Пасля ён спрасціўся да $ž'_{14}$ у прабеларускі дапісьмовы перыяд, апрача пазіцыі пасля *ж’*, дзе афрыката захавалася (змена 14); пераход $ʒ'_{14} > ʒ́_{14}$ адбыўся да XIII ст. Аднак у некаторых марфемах, дзе мы спадзяемся знайсці *ž’* (>*ž́*), беларуская мова мае *ʒ́* (гл. змену 3). Украінская мова паказвае такую самую з’яву, хоць не абавязкова ў тых самых словах. Прыклады: *джа́ла* (параўн. укр. *жало́*, рас. *жа́ло* < прасл. **žędlo*); *ураджа́й* (укр., рас. *урожа́й* < прасл. **urodj-*) і зусім рэгулярна ў формах 1 асобы адзіночнага ліку і дзеепрыметніках залежнага стану прошлага часу ад дзеясловаў 4 класу: *загарадзіць* || *загараджу* || *загароджаны*. Яшчэ адна крыніца цвёрдага *ʒ* – запазычанні з іншых моваў, пераважна з польскае: напр., *джгнуць* (калі гэта з польск. *zgnąć* ~ *dzgnąć*, параўн. таксама разважанні на с. 135). У запазычаннях часам адбываецца флуктуацыя паміж *ж–ʒ* (а часам і паміж *з–ʒ*): бабруйскае дыял. [пінʒа́к], у выніку народнай этымалогіі *спінджак* (ад *спі́на*, літар. бел. *пінжа́к*, укр. *піджа́к*, рас. *пиджа́к* < анг. *pea-jacket*), [хаʒа́јін, хаʒ’а́јін] ‘гаспадар’ (параўн. рас. *хозя́ин*)[1]. Гэтая змена не ўласцівая нядаўнім русіз-

[1] Згодна з *ДАБМ* (карта 334) пашырэнне формы [хаʒа́јін] абмежаванае некалькімі пунктамі пераважна на поўдзень ад Слуцка, уздоўж дзяржаўнай граніцы з Украінай паміж Прыпяццю і Убарцю, і адным пунктам у

мам: параўн., напр., [ўаражáнін], адпаведнае літар. бел. *гараджáнін* (параўн. рас. *горожáнин*), [ўражáй] (рас. *урожáй*), бабруйскае дыял. [піжáк].

Пакідаючы ўбаку пагляд, што *ʒ́* у спрадвечнабеларускіх словах – просты працяг дагістарычнага *ʒ́* (Патабня, Шахматаў ды інш.), прысутнасць *ʒ́* тлумачылі як эмфатычнае памацненне *ж* (напр., такую думку выказвалі Жытэцкі, Сабалеўскі, Гурло ды інш.) або як вынік выраўноўвання ў межах парадыгмы. У дзеяслоўных асновах *ʒ́* сустракаецца, мабыць, таму, што ў іншых формах парадыгмы, з прычыны дзекання, прысутнічае афрыката *ʒ'* (гл. змену 43; напр., *загарадзíць*). Найдаўнейшыя прыклады напісання *ʒ́* у дакументах з'яўляюцца ў XV ст., пераважна ў тых асновах, дзе ёсць чаргаванне з *ʒ'*: напр., *уездджати* (параўн. суч. літар. бел. *уéзджваць*, рас. *уéзживать*). Вынікам гэтае марфалагічна абумоўленае з'явы стала ўвядзенне звонкае пары для *ч*, не абмежаванага пазіцыяй пасля *ж*. Пра фанемныя фактары, якія спрыялі набыццю цвёрдага *ʒ́*$_{41}$ (і *ʒ*$_{42}$) гл. змену 42.

Функцыянальная нагрузка *ʒ́* застаецца нізкаю, і ў гутарковай мове гэты сегмент часта замяняецца на *ж* (параўн., напр., інтэграцыю пададзеных вышэй запазычанняў). Мінімальныя пары з удзелам *ж* і *ʒ́*: параўн., напр., *прывóжу – прывóджу*.

Акрамя *ʒ́*, беларуская мова набыла некалькі выпадкаў цвёрдага *ʒ* з дзвюх крыніц: (1) *ʒ* узнікае на месцы гістарычна спадзяванага *з*; гэтыя словы часта маюць гукапераймальны характар; (2) запазычанні, звычайна з польскае. Прыклады першага тыпу – *дз(в)ынкаць, дз(в)ынканне*[1]. Прыклады запазычанняў з польскае – бел. *ксёндз* (параўн. польск. *ksiądz*), *нэ́ндза* (польск. *nędza*), магчыма, *дзю́ба*, *дзю́баць* (параўн. польск. *dziób*, *dziobać*). І ўсё ж такі, хоць *ʒ* тэарэтычна і мог быць лёгка прыняты ў сістэму як звонкая пара існаму *ц*$_{13}$, ён дагэтуль таксама застаецца ў беларускай мове маргінальным сегментам; мінімаль-

---

паўднёва-заходнім кутку (тэрыторыя ўкраінскае мовы). Гэтая форма можа грунтавацца на татарск. *ходжа* (тым часам *хозяин* паходзіць ад чувашскага *χoźa)*.

[1] Гэты корань можна звязаць з коранем *звон*. Дадатак напачатку зубнога змычнага прыпамінае ўкраінскую і польскую мовы, дзе такіх прыкладаў далёка больш: напр., польск. *dzwon*, укр. *дзвін* 'звон', *дзвя́кати* 'бразгаць'.

ных параў з удзелам *ʒ–ʒ'* і *ʒ–з* няма. У процілегласць украінскай мове, у беларускай гук *ʒ* ніколі не пашыраўся на спрадвечную частку беларускага лексікону, незалежную ад польскіх (або ўкраінскіх) мадэляў.

З фанетычнага погляду ёсць розніца паміж новымі афрыкатамі і групамі "змычны + фрыкатыўны" на граніцы марфем, г. зн. гукі *д + ж* у слове *паджаць* < *пад- + жаць* паводзяцца іначай, чым афрыката ў такім слове, як *ураджáй*.

Выбраная бібліяграфія

G. Shevelov. "A Latent Phoneme in the Making: the Affricate *ʒ* in Slavic", *Miscellánea homenaje a André Martinet* 1. La Laguna, 1957. {Перадрук. у} *ТА*.

Змена 45. Пераход у дыялектах *о* (*а*) у *у*, найперш у атачэнні губных (да XV ст. і пазней).

У паўднёва-заходніх дыялектах (у іншых гаворках радзей) *о* ў ізаляваных словах пачаў пераходзіць у *у*. Умоваю гэтае гукавое змены ёсць суседства губнога зычнага, напр., зах.-бел. [дру́бн'эн'к'ijэ] 'дробненькія', паўдн.-зах.-бел. [пам'у́рла] (< [пам'орла]); параўн. таксама ў канчатках меснага склону адзіночнага ліку – паўдн.-зах.-бел. [чы́стум] 'чыстым', [ц'о́мнум] 'цёмным' – і роднага склону множнага ліку, напр. [с'о́струв] 'сёстраў'. Гэты пераход, мабыць, адбыўся ў адказ на тыповае для губных зычных акругленне губ пры вымаўленні. Ён закранае першапачатковы *о* і *о* < *е*, дзеля гэтага яго трэба датаваць перыядам пасля лабіялізацыі *е* (гл. змену 18). Найдаўнейшыя прыклады пераходу *о* > *у* ў дакументах можна датаваць XIV і XV стст., напр., *потоуплены* 'патоплены' (параўн. суч. бел. *патапíць*), магчыма, *щадкум* 'нашчадкам' Д.скл. мн. (1408).

Асаблівы выпадак – з'яўленне гуку *у* ў дзеяслоўным суфіксе *-ава-*, які ўжываецца ў аснове інфінітыва, напр., *танцава́ць* – быхаўскае дыял. [танцувац'і], *начава́ць* – сенненскае дыял. [нучувац']. Тут *у* перайшло з асновы цяперашняга часу: *начу́ю* і г. д. Такія формы сустракаюцца сям-там па ўсёй усходняй Беларусі, асабліва канцэнтруючыся вакол Гомеля (гл. *ДАБМ*, карта 25). Іх храналогія няпэўная, але хіба не даўнейшая за XVII ст.

Выбраная бібліяграфія

Белорусы 1, 117–123, 193–194.

В. Жучкевич. *Топонимика Белоруссии*. Мн, 1968, 157, 164.

Змена 46. Статус апазіцыі паводле цвёрдасці–мяккасці, V: перад *е* (XV ст.). Апошняй пазіцыяй перад галоснымі, на якую пашырылася процістаўленне паводле цвёрдасці–мяккасці, было становішча перад *е*. Процістаўленне паводле цвёрдасці–мяккасці перад усімі іншымі галоснымі зрабілася магчымаю ў выніку ранейшых працэсаў (параўн. змены 15, 18, 19, 22). Беларускія зычныя перад *е* былі, агулам кажучы, мяккія. Тыя, што ацвярдзелі ў XII–XIV стст. (*ш*, *ж*, *ч*, *ц* і *р* – параўн. змены 33, 34, 36, 38), мяккімі не былі, але апазіцыі цвёрдых і мяккіх параў зычных у гэтым становішчы яшчэ не існавала.

Першае сведчанне пра цвёрдыя зычныя перад *е* ў тэкстах – літара *э*, якая з'явілася ў напісанні запазычаных слоў на канцы XV – на пачатку XVI ст. (напр., у лацінскім выразе *инъ эксъцельсисъ* (*in excelsis* 'на вышынях', канец XV ст.), *апрэлѧ* (XVI ст.) і ў спрадвечнабеларускіх словах, пачынаючы з XVI ст.: *перэдъ*, *чэрэз*, *шэстнадцать*, *жэлеза*, *цэрков*).

Пашырэнне процістаўлення паводле цвёрдасці–мяккасці на пазіцыю перад галоснымі пярэдняга раду сярэдняга ўздыму было абумоўленае як вонкавымі, так і ўнутранымі працэсамі. Пачынаючы з XIV ст. беларуская мова пачала рабіць запазычанні з польскае, у якіх *е* магло стаяць і пасля парных цвёрдых зычных: напр., суч. бел. *люстэ́рка* < польск. *lusterko*, *мэ́бля* < польск. *meble*. За іх прыкладам пайшлі і некаторыя ўласнабеларускія словы: напр., *сэ́рца* (параўн. змену 34). Крыніцаю *э* пасля цвёрдых зычных у сярэднебеларускіх гаворках ёсць таксама пашырэнне канчатка вінавальнага склону множнага ліку *-е́* > *-э́* ў назоўніках, што канчаюцца на мяккі зычны, на канчатку назоўнага склону множнага ліку "цвёрдых" назоўнікаў, перад якімі, аднак, зычныя не памякчаліся: напр., *братэ́* 'браты'. Паколькі гэтая абумоўленая марфалогіяй з'ява абмежаваная сярэднебеларускімі гаворкамі, яе паходжанне трэба датаваць перыядам пасля XVI ст. (параўн. змену 20).

Выбраная бібліяграфія

Л. Калнынь, "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959, 90 {і наст.}.

В. Чэкман. *Гісторыя проціпастаўленняў па цвёрдасці–мяккасці ў беларускай мове*. Мн, 1970, 128 {і наст.}.

Змена 47. Развіццё ў дыялектах дыфтонгаў пасля губных (пасля XV ст.); **агубленне ў дыялектах *ы* > *у* пасля губных** (сярэдзіна XVI ст.?). Гл. адпаведна ў зменах 29 і 19.

Змена 48. Пазіцыйнае ацвярдзенне *л'* (> *л*) (XVI ст.). Параўн. разважанні ў змене 41.

Змена 49. Дыялектная лабіялізацыя *аў* (> *оў*) (пасля XVI ст.).

Перад *ў* галосны *а* ў некаторых дыялектах лабіялізаваўся ў *о*. Гэтая змена ўласцівая пераважна поясу паміж Гроднам і Мінскам у сяроднебеларускіх гаворках, хоць яна здараецца і ў некаторых іншых мясцовасцях (гл. *ДАБМ*, карта 28). Лабіялізацыя можа адбывацца перад *ў*, які ёсць працягам $ў_4$, і $ў < л_{10}$: напр., *а* > *о* перад $ў_4$ у слове *пра́ўда* ~ дыял. [про́ўда]; *а* > *о* перад $ў_{10}$ у слове *хава́ў* ~ дыял. [хавоў]. Паколькі ў старых тэкстах няма прыкладаў лабіялізацыі *аў*, а яшчэ і зважаючы на геаграфічнае пашырэнне гэтае з'явы, мы лічым яе досыць позняй[1].

Гэтая з'ява ўласцівая і некаторым украінскім гаворкам; пашырылася яна і на суседнія дыялекты ідышу. У беларускай мове гэтая рыса цяпер адступае пад ціскам літаратурнае мовы; ёсць мясцовасці, дзе формы з *о* адзначаюцца толькі ў старых людзей.

Згодна з некаторымі назіральнікамі, вынікі гэтага агублення не зліваюцца з існым складам *оў*, які развіўся з лабіялізацыі і вакалізацыі спалучэння *ъл* (напр., *воўк*), бо *оў* < *аў* даўжэйшае за *оў* < *ъл* (*ЛГ*). Калі гэта праўда, гэтыя беларускія гаворкі ў абмежаванай ступені аднавілі процістаўленне доўгіх і кароткіх складоў, страчанае ў прабеларускай мове.

Выбраная бібліяграфія

Е. Карский. "Заметки по русской диалектологии. Белорусское *оў* на месте *ал* > *ав*", *РФВ* 34, 1895. {Перадрук. у} *Труды.*

Я. Станкевіч. "Мова крывіцкага (беларускага) рукапісу XVI стаг., «Аль Кітаб»", *Калосьсе* 1938, 4, 250–251.

Л. Калнынь. "Категория твердых–мягких согласных фонем в белорусском языке", *УЗИСл* 17, 1959.

ЛГ 160, 268–269.

[1] Станкевіч сцвярджаў, што знайшоў прыклады агублення ў тэкстах беларускіх татараў XVII (згодна з ягоным датаваннем, XVI) ст. На жаль, ягоная транслітарацыя няпэўная, а іншыя даследчыкі гэтых тэкстаў не спамінаюць яўна гэтае рысы.

Змена 50. Пашырэнне дыфтонгаў у дыялектах на гістарычна неапраўданыя пазіцыі (храналогія няпэўная). Параўн. разважанні ў змене 19.

Змена 51. Развіццё поствакальнага *iy* > *iў* (храналогія няпэўная). Гл. разважанні ў змене 28.

Табліца 25. Зрэз 11С-V. Беларускія сістэмы зычных і галосных да XVI ст.

$p_{1,\,16}$	p'_{16}	t_5			k_{13}	k'_{13}
$b_{2,\,17}$	b'_{17}	d_6			$(g_{14,\,37})$	$(g'_{14,\,38})$
(f_{39})	(f'_{40})	s_7	s'_{15}	$š_{15}$	x_{15}	x'_{15}
$w/v_{4,\,10,\,19}$	v'_{19}	z_8	z'_{14}	$ž_{14}$	$γ_{14}$	$γ'_{14}$
		c_{13}	c'_{20}	$č_{13}$		
		$(ʒ_{42})$	$ʒ'_{21}$	$(ǯ_{41})$ 14		
$m_{3,\,18}$	m'_{18}	n_9	n'_9			
		l_{10}	l'_{10}			
		r_{11}	$(r'_{11,\,36})$			
				j_{12}		
$\bar{p}_1$	$\bar{p}_{16}$	$\bar{t}_5$				
$\bar{b}_2$	$\bar{b}'_{17,\,22}$	$\bar{d}_6$				
	$(\bar{f}'_{40})$	$\bar{s}_7$	$\bar{s}'_{15,27}$	$\bar{š}_{33}$		
	$(\bar{v}_{23})$	$\bar{z}_8$	$\bar{z}_{28}$	$\bar{ž}_{14,\,34}$		
		$\bar{c}_{13,\,29}$	$\bar{c}'_{20,\,25}$	$\bar{č}_{13,\,35}$		
		$\bar{ʒ}_{42}$	$\bar{ʒ}'_{21,\,26}$	$\bar{ǯ}_{14,\,34}$		
$\bar{m}_3$	$(\bar{m}'_{24})$	$\bar{n}_9$	$\bar{n}'_{9,\,30}$			
			$\bar{l}_{10,\,31}$			
		$(\bar{r}_{32})$	$(\bar{r}'_{32})$			

націскныя галосныя	$i(ý)_{1,\,3,\,4,\,7}$			$ú_{1,\,2,\,3,\,4,\,5,\,6,\,7,\,9,\,10,\,11}$
	$é_{3,\,5,\,6,\,8}$		$ó_{3,\,4,\,5,\,6,\,9,\,10}$	
		$á_{6,\,9,\,10}$		
	$(\widehat{ié}_{3,\,5,\,6,\,8})$		$(\widehat{uó}_{3,\,4,\,5,\,6})$	
ненаціскныя галосныя	$i(y)/j_{1,\,3,\,4,\,7}$			$u/w_{2,\,3,\,4,\,5,\,6,\,11}$
	$(e_{3,\,5,\,6,\,8})$		$(o_{3,\,4,\,5,\,6})$	
		$a_{3,\,4,\,6,\,8,\,9,\,10}$		

8. Абагульненне. Сучасныя беларускія фаналагічныя сістэмы ў іх гістарычнай перспектыве: працэсы, якія адбываліся пасля XVII ст.

Позірк на 11 зрэзаў, што ахопліваюць перыяд ад прабеларускіх дыялектаў VII ст. да сучасных беларускіх гаворак, паказвае ўражвальны рост сістэмы зычных пры змяншэнні ліку галосных сегментаў. Скарачэнне сістэмы галосных было выклікана часткова стратаю фанемнае колькасці і тону, а часткова – пашырэннем процістаўлення паводле цвёрдасці–мяккасці ў сістэме зычных. Паколькі гэтыя працэсы адбываліся не толькі ў прабеларускіх, але і ў некаторых іншых славянскіх дыялектах, іх можна аднесці да канца праславянскага перыяду. Параўноўваючы гукавыя змены ў прабеларускай і беларускай мове з працэсамі ў суседніх і славянскіх мовах, мы ўбачылі, што на працягу трынаццаці стагоддзяў развіцця прабеларускае і беларускае мовы было няшмат інавацый, уласцівых толькі прабеларускім ці беларускім гаворкам. Пераважная большасць інавацый у прабеларускай і беларускай мове была ўласцівая і суседнім усходнеславянскім дыялектам, якія абдымаюць розныя прасторы па-за межамі Беларусі, у залежнасці ад храналогіі ды геаграфічнага паходжання інавацый. Прычына існавання шматлікіх супольных ізаглосаў, якія злучаюць сучасную беларускую мову з расійскаю і ўкраінскаю мовамі, – у тым, што большасць гэтых інавацый вяла пачатак ад адной з дзвюх ранніх усходнеславянскіх (або прабеларускіх) дыялектных групаў, якія, з прычыны перападзелаў дзяржаўных граніц, урэшце крышталізаваліся ў выключна "беларускія", "расійскія" і "ўкраінскія" гаворкі толькі каля XV ст. Інавацый, якія б ахоплівалі (пра)беларускія і нейкую з няўсходнеславянскіх гаворак, не было, акрамя, магчыма, афрыкатызацыі мяккіх зубных змычных, якія можна знайсці і ў некаторых заходнеславянскіх дыялектах. Аднак, хоць фактар уплыву польскае мовы на беларускую нельга выключыць цалкам, больш слушна разглядаць афрыкатызацыю мяккіх зубных у польскай і беларускай мовах як самастойныя працэсы.

З апошняга зрэзу відаць, што сістэма зычных у сучаснай беларускай мове шырока карыстае з узаемасувязі паміж апазіцыямі паводле

звонкасці–глухасці і цвёрдасці–мяккасці. Суадносіны паводле звонкасці–глухасці ўласцівыя большасці сегментаў (з іх выключаныя толькі *j*, *р*, *л* і насавыя); суадносіны паводле цвёрдасці–мяккасці граюць больш сціплую функцыянальную ролю, бо ў зазубных фрыкатыўных і афрыкат няма мяккіх параў. Асаблівая сітуацыя існуе з адносінамі паміж *т*, *д* і *ц*, *дз* да *ц'*, *дз'*. З гістарычнага і функцыянальнага боку *ц'*, *дз'* – мяккія пары *т*, *д*, з фанетычнага – *ц'*, *дз'* – мяккія пары *ц*, *дз*. Фанетычнае змякчэнне захоўваецца ў выпадку з большасцю падвойных зычных, бо даўжыня ў зычных амаль заўсёды звязаная з мяккасцю (акрамя, што важна, выпадку з групамі зазубных і падваеннем, якое ўзнікае на граніцы марфем). Не ўсе выпадкі фанемнае палаталізацыі захавалася. Пашырыўшы палаталізацыю на губныя, зубныя і зазубныя, да XII ст. прабеларуская мова зрабілася сістэмаю з вельмі багатым інвентаром зычных. Але суадносіны паводле цвёрдасці–мяккасці паслядоўна захоўваліся толькі ў выпадку зубных, і нават тут з некаторымі агаворкамі. З часам палаталізацыя была часткова адкінутая – і там, дзе яна была фанемная, і там, дзе яна была проста лішняю фанетычнаю рысаю. Вось жа ў большасці гаворак цалкам страцілася мяккасць гуку *р'* (магчыма, ужо ў XII ст.) і, у некаторых пазіцыях, усіх губных (таксама ў XII ст.), а пасля ў гаворках у некаторых пазіцыях нават гукам *л'* (гл. змену 48). У гэтых сегментах мяккасць аказалася найбольш трывалаю ў пазіцыі перад галоснымі пярэдняга раду. На канцы слова сучасная беларуская мова адрознівае толькі *н–н'*, *т–ц'*, *с–с'* і *л–л'*, а ў некаторых гаворках (пераважна на паўднёвым захадзе) таксама *д–дз'*, *з–з'*. Беларуская мова захоўвала першапачатковую фанетычную мяккасць зазубных шыпячых і афрыкат, атрыманых у спадчыну ад праславянскае мовы, прыблізна да XII ст. Пасля гэтага часу спачатку *ш'* і *ж'*, а тады *ч'* і *ц'* ацвярдзелі, вось жа да XIII–XIV стст. недыферэнцыяльная палаталізацыя шыпячых, створаная трыма палаталізацыямі заднепаднябенных і спрашчэннем спалучэнняў з *j*, была скасаваная.

Фаналагічная гісторыя беларускае мовы як такой досыць кароткая, бо перыяд супольнае гісторыі паўночнае часткі кіеўска-палескае з заходняй і паўднёва-заходняй часткамі полацка-разанскае дыялектных групаў пачаўся толькі ў XV або XVI ст. На працягу XV–XVI стст. паўночная частка кіеўска-палескае зоны зазнала “беларусізацыі”, а

паўднёвая – "украінізацыі". Паўночная і ўсходняя часткі полацка-разанскае зоны, якія, зыходзячы з іх гістарычнага развіцця да XV ст., маглі зрабіцца часткаю беларускае мовы, замест гэтага адарваліся ад астатняе полацка-разанскае зоны і зазналі працэс "русіфікацыі"[1].

Пасля распаду кіеўскае-палескае і полацка-разанскае дыялектных зонаў і наступнага фармавання ўласна беларускае мовы гукавых зменаў развілося няшмат. Акрамя зменаў 40–51, некаторыя ранейшыя з'явы (рысы), згаданыя ў папярэдніх раздзелах аб прабеларускай і беларускай мове, заставаліся жывымі і/ці зазналі геаграфічнага пераразмеркавання:

1) *е* > *ѣ̂о* ў адкрытых складах у паўднёвабеларускіх гаворках (гл. змену 19);
2) *ѣ̂е* (<*ѣ*) пад націскам працягвае выціскацца гукам *э*/*е* ў сучасных паўднёва-заходніх дыялектах (гл. змену 20);
3) устаўны *е* пашырыўся далей на спалучэнні зычных з удзелам сананта на канцы слова (гл. змену 25);
4) *-чн-* > *-шн-* (гл. змену 25): гэтая з'ява тыповая для тэрыторыяў на ўсход ад лініі Полацк–Бабруйск–Петрыкаў; у астатніх мясцовасцях *-чн-*, збольшага, захоўваецца. Адпаведна ізаглоса *-чн-*/*-шн-* рассякае тэрыторыю беларускае мовы на ўсходнюю і заходнюю часткі;
5) зваротная часціца *-ся* > *-са* (т. зв. "саканне") (гл. змены 25, 34);
6) дысіміляцыйнае аканне пашырылася на гаворкі з недысіміляцыйным або моцным аканнем і наадварот (гл. змену 31);
7) *р'* вярнуўся ў паўночна-ўсходнія гаворкі (гл. змену 33);
8) *с'* > *с* у слове *сэ́рца* (гл. змену 34): ізаглоса зацвярдзелага *с'* у гэтым слове збольшага адпавядае адзначанай вышэй ізаглосе захавання *-чн-*, акрамя поўдня, дзе яна пралягае значна далей на захад.

Акрамя пералічаных вышэй з'яваў, якія ўсе да нейкае ступені адбіліся ў тэкстах, можна таксама пералічыць колькі інавацый, якія немагчыма ўбачыць у тэкстах; іх існаванне можна выявіць адно з нядаўніх і/або сучасных апісанняў гутарковае мовы. Мы не можам ні датаваць развіцця гэтых з'яваў, ні акрэсліць іх геаграфічнага абсягу.

---

[1] Фармулёўка Растаргуева (Расторгуев), паводле якой Смаленск "перастаў быць беларускім", крыху анахранічная.

Усе наступныя рысы сучасныя ўнармавальнікі мовы лічаць ненарматыўнымі; паколькі сучасная літаратурная беларуская мова грунтуецца найперш на нормах сяроднебеларускіх гаворак, можна дапусціць, што гэтыя рысы большасці сяроднебеларускіх гаворак неўласцівыя:

1) працяг эрозіі паўночнае зоны, у якой першапачаткова існавала змешванне шыпячых са свісцячымі (гл. змену 17);
2) ацвярдзенне *с'*, *з'* перад мяккім зычным: напр., *зняць* [зн'ац']. Гэтую рысу нельга прыпісаць уплыву расійскае мовы, бо палаталізацыя *с'*, *з'* перад мяккім зычным у расійскай мове захоўваецца (прынамсі ў літаратурнай). У літаратуры можна сустрэць меркаванне, што ацвярдзенне *с'*, *з'* было выклікана ўплывам правапісных нормаў, уведзеных з 1933 г. у Савецкім Саюзе (да 1933 г. пісалі *зьняць*, пасля 1933 г. – *зняць*; Янкоўскі). Гэты погляд неперакананаўчы: непазначэнне мяккасці *с'* і *з'* перад мяккім зычным у расійскай мове не выклікае іх ацвярдзення. Ацвярдзенне, відаць, не адбываецца ні ў якіх групах, апрача тых, што пачынаюцца на *с*, *з* (гл. змену 25);
3) у прыметніках, утвораных ад асноў, што канчаюцца на *-н*, падвойны цвёрды *н* звычайна можна знайсці на граніцы марфем паміж коранем і суфіксам *-н-*: напр., *старáнны*, але *старáння* (гл. змену 25). Значыць, утварылася апазіцыя паміж групаю *-нны* (на граніцы марфем) і адзіночным *н* у дзеепрыметніках (напр., *намаляваны*) і невытворных прыметніках (*чырвоны*, *юны*). У некаторых людзей, што гавораць па-беларуску, фіксуецца гіперкарэктнае падваенне *н* у вымаўленні формаў тыпу *юны* і пад., дзе яно пашыраецца па падабенстве;
4) падвойныя мяккія зычныя фіксуюць не толькі паміж галоснымі (гл. змену 32), а яшчэ і на граніцы марфем, дзе яны ўзнікаюць дзякуючы прыпадабненню (гл. змену 25), напр., [карыс'ц'у] (Т.скл. адз.) пры літар. бел. [карыс'ц'у];
5) ацвярдзенне *ʒ'* і *ц'*, г. зн. дзэканне, цэканне замест уласцівых літаратурнай беларускай мове дзекання, цекання (гл. змену 43 і знос. 1 на с. 224) – з'ява не ўласнабеларуская, а характэрная для дзвюхмоўных людзей.

У табл. 7 мы паказалі перагрупаванне гаворак, якое адбылося да XV–XVI стст. і ў гэтыя два стагоддзі. Цяпер можна вярнуцца да тых

разважанняў, каб згадаць лінгвістычныя змены, уласцівыя кожнай з трох першапачатковых групаў, і інавацыі, якія адбыліся пасля XV–XVI стст. і закранулі адзіную беларускую мову, што ўтварылася на тэрыторыях кіеўска-палескае і полацка-разанскае дыялектных групаў. Мы разгледзім тут (1) рысы, першапачаткова агульныя для папярэднікаў сучасных паўночнабеларускіх гаворак і для пскоўскай ды разанскай гаворак расійскае мовы; (2) рысы, якія першапачаткова былі агульныя паўднёвабеларускім і паўночнаўкраінскім гаворкам; (3) рысы, супольныя для паўночна- і паўднёвабеларускіх гаворак.

1. Рысы, першапачаткова агульныя для папярэднікаў сучасных паўночнабеларускіх гаворак і пскоўскага ды разанскага дыялектаў расійскае мовы. Гэтыя рысы паходзяць са старое полацка-разанскае дыялектнае групы. З пскоўскім дыялектам у паўночнабеларускіх гаворак агульныя аканне і яканне; ацвярдзенне *р*'; пераход *в* > *у* і *у* > *в*; *ѣ* > *е́*; *ф* > *х*; цоканне ~ чоканне; *ъ*, *ь* > *о*, *е* пасля групы "зычны + *л*, *р*"; цеканне і дзеканне (цяпер на Пскоўшчыне яны знікаюць); С'*а*С' > С'*е*С'. Найлепш у пскоўскім дыялекце захаваліся найдаўнешыя рысы: *ѣ* > *е*; *кв* у **квѣт*; пераход перад зычнымі *ъл* > *óўлаў*. З разанскім дыялектам паўночнабеларускія гаворкі маюць супольныя: *ѣ* > *е*; *кв*; моцнае аканне; афрыкатызацыю *g*; верагодна, пераход перад зычнымі *ъл* > *óўлаў* (у разанскіх дыялектах рэшткавы). Паўднёварасійскія гаворкі, вядомыя як бранска-арлоўскія, якія цяпер лічацца пераходнаю зонай паміж паўночнабеларускімі гаворкамі і расійскімі, першапачаткова мелі, мабыць, такі самы характар. Гэтыя паўднёварасійскія дыялекты перажывалі агульнае развіццё з беларускаю моваю, у процілегласць паўднёварасійскім гаворкам, пашыраным на ўсход ад іх. Спачатку прабеларускія рысы пашыраліся ў іх з Полацка ў выніку каланізацыі на паўднёвы ўсход, асабліва за часамі ВКЛ, але пазней гэты абшар падпаў расійскаму ўплыву.

2. Рысы, першапачаткова агульныя для паўднёвабеларускіх і паўночнаўкраінскіх гаворак. Яны былі ўласцівыя старым кіеўска-палескім дыялектам да інкарпарацыі гэтых земляў у ВКЛ. Вось гэтыя рысы: пераход перад зычнымі *ъл* > *óўлаў*; пераход ненаціскнога *ę* > *е*; дыфтонгі, што развіліся з *о*, *е* ў складах, якія сталі закрытымі пасля страты слабых рэдукаваных; слабыя *ъ*, *ь* > *ы*, *і* пасля *р*, *л*.

3. Рысы, супольныя для паўночна- і паўднёвабеларускіх гаворак. Гэтыя рысы маюць дваякае паходжанне: (а) паўночныя рысы, якія пашырыліся на поўдзень, але не закранулі паўночнаўкраінскіх гаворак: напр., аканне, магчыма, цеканне–дзеканне ды інш.; (б) паўднёвыя рысы, якія пашырыліся на поўнач, напр., аднаўленне розніцы паміж зубнымі і зазубнымі, ацвярдзенне *р'*.

Пашыраныя на ўсёй Беларусі рысы не ўласцівыя разанскай гаворцы, калі яны вядуць пачатак з перыяду, у які прабеларускія землі ўжо ўвайшлі ў ВКЛ, што паслабіла іх зносіны з Разанню. Гэта такія агульнабеларускія рысы, як падвойныя мяккія зычныя; новы *ґ* у чужых словах; *ѯ*; *ъ*, *ь* > *ы*, *і* пасля санантаў; прыстаўныя галосныя. Тыпова паўднёвабеларускіх рысаў, якія б пашырыліся на Разаншчыну, няма.

Ніжэй мы абагульняем фаналагічныя адрозненні, якія дзеляць сучасную тэрыторыю беларускае мовы на асноўныя паўночна-ўсходнюю і паўднёва-заходнюю зоны. Гэтыя рысы пералічаныя ў тым парадку, у якім мы іх разглядалі *[...]*. Абагульненне не ўключае звестак пра ізаглосы, супольныя для беларускае і суседніх, а таксама пашыраных на той самай тэрыторыі, што і беларуская, моваў.

Паўночна-ўсходняя група гаворак:

1) адсутнасць *л'* пасля губных у некаторых формах дзеясловаў 3-га класу (змена 3);
2) дысіміляцыйнае аканне і яканне; некаторыя раёны на паўночным захадзе (асабліва полацкая падгрупа) захоўваюць моцнае аканне і яканне поруч з дысіміляцыйнымі тыпамі. Моцнае аканне ў канцавых адкрытых складах пасля цвёрдага зычнага (змена 7);
3) у паўночнай падгрупе рэшткі цокання; але паасобныя словы з гэтаю рысаю пашыраныя па ўсёй Беларусі (змена 17);
4) зліццё націскнога *е́*$_8$ з *е́* (змена 20);
5) аглушэнне звонкіх зычных перад глухім зычным і на канцы слова (змена 26);
6) развіццё падвойных мяккіх зычных пасля страты групаў з *j* (змена 32);
7) аднаўленне апазіцыі *р'* і *р* у некаторых гаворках віцебска-магілёўскае падгрупы (змена 33);
8) развіццё прыстаўнога *в-* (змена 37).

Паўднёва-заходняя група гаворак:

1) *л'* пасля губных па ўсёй парадыгме дзеясловаў 3-га класу (змена 3);
2) моцнае аканне і яканне пераважаюць, але ў паўднёва-заходніх раёнах гэтае дыялектнае зоны дысіміляцыйнае яканне сустракаецца поруч з моцным яканнем. Аканне бывае няпоўнае ў канцавых адкрытых складах пасля цвёрдага зычнага на поўдзень ад умоўнае лініі Ліда–Слуцк. Гэта адзіная зона ў Беларусі, якая мае таксама оканне (у паласе гаворак на поўнач ад Прыпяці, пераходных да ўкраінскае мовы; змена 7);
3) *ę* > *е* ў паслянаціскных складах у гаворках, дзе няма поўнага аканння, напр. [за́јэц], [па́м'эц'] (гл. змену 15);
4) дыфтонгі (< *о*, *е*) у закрытых складах пад націскам (змена 19);
5) зліццё ненаціскнога $*\check{e}_8$ з *е*; дыфтангізацыя націскнога $*\acute{\check{e}}_8 > \widehat{ie}$ (змена 20);
6) захаванне звонкасці зычных на канцы слова і перад глухім зычным (змена 26);
7) ацвярдзенне *р'* (змена 33);
8) прыстаўны *γ-* у заходніх раёнах (змена 37);
9) *аў* > *оў* (хоць гэтая змена ўласцівая не ўсёй паўднёва-заходняй зоне; змена 49).

Адметнаю для цэнтральных беларускіх гаворак рысаю здаецца частае ўжыванне адзіночнага мяккага зычнага перад $*ьj$ (са стратаю *j* або без гэтае страты) (змена 32).

Сістэму зычных і галосных у сучаснай беларускай мове чытач можа паглядзець у табл. 25, з тою агаворкай, што ў сучасны перыяд ёсць новыя дадатковыя крыніцы для *j* ($i_{1,3,4,7}$) і *w* ($u_{2,3,4}$). Наборы фанем, якія ў некаторых дэталях розняцца ад табл. 25, можна знайсці ў Кавалёва (Ковалів), Бідўэла (Bidwell) і ў *PoS*.

Выбраная бібліяграфія

PFB 53, 63, 74, 92; *PoS* 596, 635.

З. Гапановіч, Ю. Мацкевіч. "Пытанні класіфікацыі сучасных беларускіх гаворак", *Працы* 6, 1959; "О классификации белорусских диалектов", *ВЯ* 1959, 6.

П. Расторгуев. *Говоры на территории Смоленщины.* М, 1960, 186.

Ю. Мацкевіч. "Да характарыстыкі моўных асаблівасцей беларускіх гаворак", *Працы* 8, 1961.

В. Орлова. "Русско-белорусские языковые отношения по данным диалектологических атласов", *МИРД* 2, 1961.

З. Жакова. "К вопросу об исторических связях северо-восточных белорусских и смоленских говоров", *З даследаванняў па беларускай і рускай мовах.* Мн, 1961; [З. Жакава], Э. Блінава. *Пытанні беларускай дыялекталогіі.* Мн, 1962.

C. Bidwell. *Slavic Historical Phonology in Tabular Form.* H, 1963, 66.

А. Мурашко, Г. Орешонкова. "До питання про класифікацію білоруських говорів", *Праці.*

Ф. Янкоўскі. *Беларускае літаратурнае вымаўленне.* Мн, 1966.

В. Мокиенко. "К вопросу о лексических связях белорусских и псковских говоров", *Белорусская лексикология и этимология. Тезисы докладов.* Мн, 1968.

ЛГ 196–7, 205 {і наст.}, 212–214, 224.

ПАКАЗАЛЬНІК
беларускіх слоў і выразаў

Беларускія словы кірыліцаю

абачыў у сярэдзіне 219 *аб шчасці і ўдачах* 188 *агвяздзіць* 93 *агонь* 176, 213 *ад ціны* 180 *адвесці* 224 *аддаць* 180 *адзежа* 156 *адзёжа* 156, 157 *адзёнак* 224 *адолеў* 219 *адонак* 224 *аж* 62 *азёры* 67, 151, 213 *ай кітаб* 96 *акно* 111, 153, 177, 210 *Аксён* 187 *Акцябр* 177 *аладка* 128 *Александру/ю* 203 *але ў [в]апошні* 188 *алуп* 214 *аль кітаб* 96 *Амсціслаў* 185 *анёл* 132 *анъела* 132 *апрычны* 178 *апрэля* 233 *апсац* 147 *апцас* 147 *апчас* 147 *араць* 114 *аржаны(й)* 184, 209 *(а)рохвіны* 212 *арошына* 212 *Артемъ* 211 *арчыца* 214 *арыгінал* 132 *Арэса* 212 *асёл* 122 *аспадар* 132 *аўторак* 186, 219 *А/Яўхім* 221 *ахтовръ* 177 *ацец* 111, 156, 206

бадзёры 228 *балгарскі* 124 *балота* 116 *барана* 115 *Баршчэўскі* 190 *басоля* 222 *баўгарскі* 124 *бедзен* 174 *бедная* 174 *беззаганны* 174 *безь цябе* 178 *бераг(і)* 127, 193 *Берасьце* 226 *Берестье* 226 *бероза* 162 *бесѣда* 153 *бёдры* 151 *бёрда* 156 *біў* 219 *бліск(учы)* 217 *благі* 134 *бласлаўленне* 132 *бласловлѣнье* 132 *бог* 134 *Браньску* 203 *братэ* 233 *браць* 174 *Брэст* 226 *Буг* 134 *буду* 191 *будучымъ* 205 *будзь* 191 *будь* 144 *бура* 95 *буря* 202 *буў* 191 *буць* 191 *быдла* 101 *было й дзіўна, і радасна* 188 *быў* 124, 219 *Быхаў* 191 *быць* 103 *б'ю* 121 *бяздзейнічаць* 178, 193 *бярёза* 151 *бяроза* 115, 151, 153 *бярозе* 153 *бяру* 174 *бярэма/я* 115 *бяседа* 153 *бясёда* 153

в(ъ)(-) 188, 210 *ва-* 210 *ваўчыха* 125 *вагонь* 213 *вада* 106, 111, 112 *ваджу* 98 *вадзіць* 98 *вады* 106 *вазёры* 213 *вакно* 210 *вакол* 211 *вакон* 177 *(В)алеся* 188 *вантраблянка* 66 *вантрабянка* 66 *вароны* 119 *вароты* 127 *Вартема* 211 *вас* 179 *вастрыня* 1211 *ввесь* 30 *в Витебьшче* 146 *везла* 152 *вераббя* 199 *вербніца* 125 *верх* 152, 155, 168, 202 *весь* 30 *ветру* 176, 224 *вецер* 176, 224 *вёдраў* 177 *вёдры* 153 *вёсны* 153 *взялши* 219 *викгоурою* 221 *витепского* 182 *Витовт* 187 *Витофте* 221 *вігура* 221 *Вілія* 122 *вінны* 179 *Вітаўт* 221 *Віцебск* 182 *во-* 210 *во второк* 219 *во ймя* 187 *во мя* 187 *Вовчого* 218 *Вовчькевич* 218 *водка* 182 *воды* 112 *вожык* 210 *возера* 67, 128, 195, 210, 213 *возеро* 261 *возьме(ць)* 211 *вокал* 211 *вокан* 177 *вокнаў* 177 *вокны* 210 *волторокъ* 219 *Волчкевич* 193 *Волчого* 218 *вольха* 100, 210 *воля* 95 *ворла* 213 *ворчык* 211 *восень* 129, 210 *воспа* 172 *востры* 210, 211 *восудар* 214 *воўк* 125, 218, 234 *Воўчаса* 125 *вочы* 210 *вош* 210 *вперодъ* 155 *вроны* 119 *вугал* 168, 210 *вугаль* 210 *вугол* 168 *вуда* 213 *вуж* 210 *вуздзечка* 207 *(в)уздэчка* 207 *вулей* 210 *(в)унія* 211 *вусень* 214 *вусы* 210 *вуха* 210 *вучацца* 180 *вучыцца* 180 *вучышся* 180 *вучэбны* 151, 190 *вы-* 103, 210 *выда* 106 *вынасіць* 112 *выносіць* 112 *вышолъ* 154 *вядзёр* 177 *вядро* 177 *вязла* 152

вялікі 193 *вялікдзень* 136 *Вялля* 122 *вянгліна* 102 *вяндліна* 102 *вянок* 163 *вярба* 125 *вяроўка* 119 *вясло* 197 *вясна* 153 *вяцічы* 139

ґ брату 136 *ґ верху* 179 *ґвалт* 215 *ґрамушка* 136 *ґуз* 136 *ґузік* 215

ґаражанін 230 *ґозера* 67

гадзіна 134 *гадзіннік* 179 *газета* 151 *галава* 116 *ганак* 136 *Ганчара* 110 *гараджанін* 230 *гарба* 125 *Гарбачэўскі* 190 *Гардзей* 226 *гарнастай* 119 *гарох* 127, 212 *гарохвіны* 212 *гарошына* 212 *гарчыца* 214 *Гарэса* 212 *гарэўка* 126 *гаспадар* 132 *гаспадарка* 187 *гасудар* 214 *гвалт* 136 *гвязда* 93 *гвяздачка* 93 *гедвабем* 212 *Гелель* 133 *Гелена* 133 *генвара* 203 *герой* 193 *ґ(і)баць* 174 *гінуць* 136 *гіншы* 212 *гледзець* 140 *гледзячи* 140 *глотка* 217 *глядзець* 140 *гляк* 99, 125 *гнёзды* 153 *гной* 134 *гнуць* 174 *гозеро* 212 *голуб* 190, 214 *Гомей* 96 *Гомель* 96 *Гомъи* 96 *Гончар* 110 *горад* 115, 127 *Горадна* 31 *горан* 176 *горб* 125 *горла* 101, 213 *горна* 176 *Готард* 182 *готьскы* 158 *гоусь* 30 *гоўка* 126 *грабеж* 209 *гразь* 172 *гразёй* 201 *граззю* 207 *графіць* 97 *графлю* 97 *грэх* 134, 161, 163 *гроб* 172 *Гродна* 31, 57 *губа* 140 *гуж* 212 *гуз* 136 *гуліца* 212, 214 *гусеніца* 214 *гусь* 30, 214 *гэрой* 193 *гжсь* 30

дажджом 151 *дажджу* 138 *дакончан* 146 *Далгінава* 134, 219 *даўбня* 125 *Даўгінаў* 134, 219 *два* 174 *дёгаць* 151 *денкуе* 226 *джала* 230 *джґнуць* 136, 230 *дзве* 179, 228 *дзверы* 224 *дз(в)ынканне* 231 *дз(в)ынкаць* 231 *дзе* 132, 133 *дзеўка* 226 *дзень* 173, 224 *дзерава* 156 *дзерці* 174 *дзесяць* 140 *дзеці* 164 *дзецюкі* 195 *дзёгаць* 151, 154 *дзёран* 155, 176 *дзёрну* 176 *дзёўбанне* 220 *дзіця* 174 *Дзмитр* 226 *дзюба(ць)* 231 *дзякаваць* 140 *дзякую* 226 *дзярно* 176 *дзяру* 174 *дзяўканне* 220 *дзяцюк* 195 *дикихъ* 192 *дня* 173, 224 *дожгь* 138 *дождж* 138 *дожчю* 138 *доконцан* 146 *дом* 121, 190 *Дорогичинъ* 134 *доўг* 124, 125 *доўгі* 124 *доўгу* 125 *дошак* 177 *дошка* 91 *дошкаў* 177 *дошцы* 91 *Драгічын* 134 *драмаць* 97 *драмлю* 97 *драць* 174 *дроб* 172 *дровы* 217 *дрожджы* 99, 138 *дроўмі* 217 *друбненькіе* 232 *другую* 132 *Друть* 203 *Друцк* 132 *Друць* 203 *друю* 132 *дрыўмі* 217 *дрыва* 217 *Дрыса* 103 *Дрьють* 203 *дрэва* 217 *дрэміш* 97 *дрэмлеш* 97 *дрэнь* 140 *дух* 98 *душа* 98 *дъжчѣ внымъ* 198 *Дыпрыха* 226 *дьевку* 226

евина 128 *-евіч* 193 *Евхимъ* 221 *евья* 128 *евя* 128 *едваб* 212 *ежджу* 99 *ездзіць* 99 *Езярышча* 128 *есь(ць)* 153

ёлка 151 *ён* 213 *ён ідзе* 188 *ён ішоў* 171 *ёсць* 153 *ёўня* 128

жарало 101 *жару* 174 *жаць* 140 *жбанок* 146 *жгут* 136 *жджэ* 138 *женцовъ* 174 *жеравлевый* 176 *жеравль* 176 *Жыкгмонт* 133 *жнец* 121, 174 *жняца* 174 *жолаб* 116 *жонка* 151 *жоны* 154, 171 *жорава* 96 *жораў* 96 *жорув* 96 *жраць* 174 *журавель* 96, 176 *жураўля* 96, 176 *жыў* 219 *жыццё* 153 *жэлеза* 233 *жэрці* 174

з(ъ) 173, 184 *загадчык* 180 *загараджу* 230 *загарадзіць* 230, 231

загароджаны 230 *зайсці ў школу* 188 *заjэц* 242 *замесці* 164 *замятаць* 164 *заперла* 152 *запёр* 152 *запрэгчы* 140 *зара* 93 *заслаў* 141 *Заслаўе* 141 *засъпалъ* 141 *засыхаць* 104, 123 *зацвитуть* 93 *зацвярдзелы* 179 *заяц* 99 *збаўлены* 97 *збавени* 97 *збан(ок)* 146 *збіць* 178 *збожжа* 198 *з᾽в᾽а р̄ о* 198 *звер* 186 *звечара* 187 *звёзды* 153 *звон* 231 *звонам* 173 *звязда* 93 *згінуць* 136, 178, 193 *згрѣбье* 132 *згрэб'е* 132 *Зезюли* 132 *земле* 171 *землі* 164, 171 *земль* 177 *земляў* 177 *земскі* 190 *ззяць* 198 *зліваць* 178 *злото* 118 *змерзлы* 150 *змесці* 178 *Змитрок* 226 *знаць* 141 *з(ᷠ)няць* 141, 178, 239 *золата* 116 *зорка* 93 *зрэб'е* 132 *зъ дѣтьми* 184 *зьберці* 174 *зьбирать* 179 *зяўзюля* 132 *зязюля* 132 *зялены* 149 *зялёны* 149 *зямель* 177 *зямельны* 176 *зямлі* 164 *зямля* 164, 177 *Зꙗславъ* 141

і 171, 188 *ідэя* 188 *іголка* 126, 218 *ігоўка* 218 *іевя* 128 *из* 183, 185 *Изꙗславль* 141 *израгелевыхъ* 133 *(і)зруб* 186 *ілба* 173 *Иллиничи* 199 *ілжывы* 185 *ільняны* 185 *Илья* 199 *імг(л)а* 121, 185 *імхі* 185 *імхом* 185 *імху* 185 *(і)начай* 188 *инъ эксъцельсисъ* 233 *іовина* 128 *іовя* 128 *іржаны* 184 *іржаць* 2120, 212 *іржы* 185 *існаваць* 176 *(і)спас* 186 *істота* 176 *(і)стужка* 186 *ишла* 171

й 187, 188

к брату 136 *к верху* 179, 192 *каге* 136 *кае* 136 *кажаш* 62 *кажэ* 136 *как ыванъ* 171 *калгас* 219 *калодзеж* 147 *калодзезь* 147 *калодзец* 147 *калоссе* 198 *калосьть* 198 *кам'а* 132 *камяга* 132 *канец* 167, 174 *канечне* 178 *канца* 174 *каня* 167 *карабель* 176 *карабельшчык* 176 *карабля* 176 *каралева* 151 *каробка* 182 *карова* 115, 127 *кароль* 119 *карыс᾽ц᾽у* 239 *карысць* 178 *касьба* 180 *каўнер* 219 *каўхоз* 219 *кветка* 93 *кветноуть* 93 *квѣт(ы)* 93, 240 *квѣтье* 93 *квят(кі)* 93 *кгвязда* 93 *кгде* 133 *кгдыж* 133 *Кготарду* 182 *Кготардъ* 182 *Кготарту* 182 *Кготартъ* 182 *-кевіч* 193 *кемлівы* 193 *клейнод* 182 *клейнотъ* 182 *клустасць* 102 *клусты* 102 *кляйноды* 182 *князь* 99 *князя* 99 *коворъ* 154 *колле* 198 *комягъ* 132 *конець* 174 *коні* 164 *конь* 95, 164, 167 *косцю* 198 *коўдра* 219 *Коўна* 58 *крви* 217 *кроль* 119 *крошка* 217 *кроў(ю)* 169, 186, 199, 217 *крывавы* 217 *крыввю* 199 *крывёй* 199 *крыві* 169, 186, 217 *крыга* 134 *крыха* 217 *крышку* 217 *крэмень* 136 *ксёндз* 231 *кто* 177 *кугайка* 221 *куй* 209 *купцом* 151 *куфайка* 221 *кухайка* 221 *кухвайка* 221

лавіць 96 *Лагойск* 136 *ламіць* 96 *ламлю* 96 *лаўке* 193 *лаўлю* 96 *лаўцы* 193 *лебедзь* 162 *Леманка* 122 *лен* 168 *лень* 172 *Лепль* 95 *лес* 195 *лета* 157 *лето* 111 *лёгкі* 131, 151 *лёд* 162 *лён* 168, 172 *Ліпль* 95 *лісіны* 146 *лисья* 146 *Літва* 179 *Літве* 179 *ліць* 198 *Ліцьве* 179 *лічбы* 182 *лишии* 146 *лишка* 146 *ллю* 198 *лоб(а)* 173 *Логожескъ* 205 *Логожьскъ* 136, 205 *Логойскъ* 136, 205 *Лотва* 122 *лоўлю* 97 *лоўлять* 97 *луг і поле* 171 *л᾽у͡од* 162 *Лучосѣ* 154 *любві* 174 *люблю* 96 *любові* 174 *любовъ* 190 *любоў* 96, 174 *людзі* 226 *людскі* 127 *люстэрка* 233 *лягчэй* 168 *лялек* 177 *Лямно* 122 *лянота* 172 *лясы* 195

Магілеў 134, 190 *Магілеўскага* 154 *Магілёў(скага)* 134, 154, 190 *магу* 137

магчы 98 *магчыма і ў каледжы* 188 *магчыма [j] учора* 188 *мазгі* 135 *маладня* 198 *малады* 111 *малако* 116 *маланья* 119 *маланка* 119 *малання* 198 *малочны* 178 *малошны* 178 *мара* 163 *Марачанка* 117 *Мардухаевичу* 110 *мароз* 172 *Марожа* 117 *масла* 105 *масло* 163 *маткі* 193 *матцы* 180 *махі* 185 *м(ꙗ)ед* 149 *мѣдницъ* 191 *мезенец* 164 *менеиыхъ* 154 *меноным* 154 *Мѣнескъ* 57 *Менск* 57 *Мѣньскъ* 57 *мерзлы* 152, 155 *мець* 225, 226 *меч(ь)* 226 *мѣхи* 193 *мёд* 149, 154, 190 *мёрзлы* 151, 152, 155 *мігла* 185 *мил* 218 *міласцю* 198 *міласэрны* 176 *Мінск* 57 *млець* 185 *мне* 185 *мноуе ржы* 185 *мной/ю* 185 *мняса* 190 *мова* 125 *Могиловского* 154 *мой* 209 *можа* 137 *молвить* 125 *молоний* 119 *молыт* 125 *мора* 162 *мох* 168, 185 *мохам* 185 *моху* 185 *моц(цу)* 66, 201 *моцы* 201 *мошчы* 66 *мроі* 185 *Мсціслаў* 185 *музыка* 127 *мука* 127 *мула* 191 *мусе* 91 *м(ꙗ)у͡од* 159 *муха* 91 *мучыць* 140 *мы(д)ла* 101,191 *мый/ю* 121 *мыць* 121 *Мыша* 103 *мышай* 201 *мышшу* 198, 201 *мэбля* 233 *мэд* 149 *мэнчыць* 140 *мядніца* 191 *мяжа* 98 *мязга* 135 *мяккі* 131 *мяне* 185 *Мярэч* 117 *мяса* 190 *мястэчка* 207 *мясцечка* 207 *мяхка* 131

на кватэры ў [в]алеся 188 *Навагрaдак* 134 *Навагрудак* 134 *навука* 211 *навучаны* 211 *нага* 91 *над водамі і ў сваю чаргу* 188 *наде всех* 169 *надежда* 65 *надежи* 65 *надзея* 66 *надъ* 184 *наёмны* 190, 210 *назе* 91 *на(й)-* 209 *налѣтѣй* 209 *намаляваны* 239 *намений* 209 *намесника* 176 *наперш* 209 *наўгад* 212 *начаваць* 232 *начны* 178 *начую* 232 *не вмѣли* 187 *неба* 151 *нельга* 99 *немъчина* 190 *ненавісць* 151 *несла* 152 *несці* 140 *неўласцівы* 188 *нехаця* 151 *Нёман* 122, 179 *нёс* 151–153, 155 *новыи* 121 *нож* 98 *ножка* 181 *нос* 153 *ноцщу* 201 *ноч(чу)* 98, 178, 198, 201 *ночны* 178 *ну͡оч* 159, 162 *нучуваць* 232 *нэндза* 231 *нябёсы* 151 *нягеґлы* 215 *нянавісць* 151 *Нясвіж* 57, 176, 182 *нясвіжскі* 176 *нясеш* 153 *нясём* 153 *нясла* 152 *нясу* 140 *нясьвіскі* 176

-овіч 193 *од(ъ)* 184 *одъ Олексеева* 184 *озера* 67, 213 *озма* 211 *оканне* 211 *Олькерта* 133 *Ольхимъ* 221 *опришне* 178 *ордэн* 211 *оржаное* 184 *оржаныи* 184 *Орол* 155 *Ортемъ* 211 *орыйнал* 132 *Осип* 221 *от(ъ)* 180, 184 *оу* 187 *оу Смольнѣскъ* 187 *оувесь* 30

пабёг 153 *павук* 211 *павуціна* 211 *павучына* 211 *павучыны* 211 *пад вярбой* 179 *пад'езд* 197 *паддзець* 179 *паджаць* 232 *падлога* 134 *паду* 101 *пал(ь)цы* 218 *пала* 101 *палка* 125, 218 *палова* 176 *палоззе* 198 *пам᾽эц᾽* 163, 242 *памажы* 91 *памёр* 152 *памерла* 152 *памёрла* 232 *памерці* 119 *памюрла* 232 *памярґоўны* 136 *памяркоўны* 136 *памяці* 163 *памяць* 140 *парог(і)* 91 *пасёк* 153 *пастух* 176 *пасьба* 176 *патапіць* 232 *паук* 211 *паў* 101 *паўка* 218 *пацер(ы)* 65 *пачаць* 138 *пачну* 138 *пен* 172 *пена* 172 *пень* 168, 172 *пе͡ра* 198, 200 *пе͡ра* 200 *перад(а)* 156, 185 *перада мною* 185 *передъ* 184 *перці* 119 *першы* 151 *перэдъ* 233 *перя* 200 *пеці* 91 *пёк* 153 *піжак* 231 *пін(д)жак* 230 *Піліп* (*Пилипъ*) 221 *писара* 203 *пісьмо* 179 *пі(це)* 209 *плакаць* 98 *плацце* 198 *плачу* 98 *плюшч* 99 *пляла* 101 *пляту* 101 *плячо* 67 *погиб(ъ)* 193 *под(ъ)* 171, 179, 184 *подышла* 171 *позно* 176 *пойсковати* 209 *Полац(а)к* 117, 174 *полк* 125 *Полотескъ* 174

Полотьска 174 *Полотьсце* 164 *Полътескъ* 174 *полымя* 118 *польски* 209 *пометають* 140 *помози* 91 *порадков* 203 *порах* 118 *пороґъ* 91 *порози* 91 *порядку* 203 *порядок* 202 *потоуплены* 232 *прадмет* 151 *праз зямлю* 178 *прасіць* 98 *праточны* 178 *праўда* 234 *працце* 198 *прах* 118 *прашу* 98 *прогледзяла* 140 *прозьбу* 182 *проўда* 234 *пропости* 110 *просьба* 172, 182 *просьбою* 182 *процвекнет* 93 *прут* 139 *прутковы* 140 *прыведзіце* 173 *прывезці* 180 *прывесці* 180 *прыводжу* 234 *прывожу* 231 *прывядзём* 229 *прывязіце* 229 *прывязём* 229 *прыемны* 210 *прыёмны* 190 *пуд* 139 *пулковніка* 126 *пусціць* 99 *пушчу* 99 *пчала* 122 *пшанічны* 178 *пытанне* 198 *пякельны* 193 *пялёнка* 119 *пялёсканне* 119 *пяць* 162, 224 *пячы* 91

рад 141 *Радимъ* 96 *Радимъе* 96 *рай* 209 *разжыцца* 180 *рака* 178 *рала* 114 *расквеціць* 93 *рассыпаць* 180 *расцвітаць* 93 *рачны* 178 *рѣдко* 173 *редька* 173 *рѣмѣнь* 163 *ризкихъ* 192 *розга* 135 *розка* 135 *розквитнуся* 193 *рост* 114 *рот(а)* 173 *роускии* 192 *рубель* 176 *рубля* 176 *русі* 91 *рух(і)* 91 *ручнік* 178 *рушнік* 178 *рыб͡а* 199 *рэдзька* 173, 194, 203 *рэдка* 173 *рэзаў* 219 *рэзаць* 122 *рэмень* 163 *рэчны* 178 *рэчцы* 180 *ряк* 201 *рят* 201

с(ъ) 183, 185 *с Сібіры* 178 *са* 173, 184 *са звонам* 184 *-са* 238 *сабор* 141 *савет* 187 *сажавк* 219 *сажавок* 219 *сажалка* 219 *салаўві* 199 *с'а͡м'а* 199 *саўгас* 187 *сват(ы)* 141 *сведкі* 181 *свет* 186 *светкі* 181 *светла* 198 *светлы* 101 *свечка* 98 *свиребка* 182 *свірэпа* 182 *свиреп(екъ)* 182 *свякліца* 102 *святліца* 102 *святы* 141, 163 *сельскі* 124 *селязёнка* 116 *сем* 162, 189 *сена* 162 *сеньтебра* 203 *серабро* 119 *серада* 116 *серебрыны* 119 *серп* 152, 155 *серце* 176 *сестръ* 177 *сёл(ы)* 151, 153, 177 *сёстраў* 177 *сёструв* 232 *сёстры* 154 *с'е͡м* 162 *с'е͡на* 162 *сілны* 218 *скарада* 117 *скародзіць* 117 *скепаюць* 92 *скепка* 92 *скерыць* 92 *скінуць* 178 *скірта* 227 *след* 178 *слёзы* 193 *слышишь* 285 *слышышь* 205 *сляза* 218 *смага* 134 *Смаленск(а)* 122, 174 *смачны* 178 *Смольнеск* 174 *Смольнѣскъ* 187 *сморад* 115 *смоутекъ* 169 *смуродны* 115 *смутак* 169 *смырчынь* 217 *смятана* 178 *снег* 178 *сну* 173 *Сож* 122 *соллю* 201 *соляй* 201 *сон* 167, 173 *сонца* 176 *сосен* 177 *соснаў* 177 *сот* 173 *соўнца* 176 *сохнуць* 104 *спелы* 178 *спёка* 151, 155 *спіна* 230 *спінджак* 230 *сподарь* 132 *спражка* 66 *спроншка* 66 *спутаць* 191 *спытаць* 191 *сродак* 118 *ссаць* 179 *старана* 111 *стараннъ* 239 *старання* 239 *старасветчына* 180 *старихъ* 203 *старожа* 98 *стары(х)* 209 *сто* 173 *стол* 218 *суддзя* 198 *сусед(ка)* 161, 182 *сустракаць* 102 *(су)стрэць* 102 *сухі* 104, 123 *схінуцца* 193 *сцены* 112 *сцерагу* 98 *сцірта* 228 *сцяжок* 155 *сцяна* 112 *сынымъ* 171 *сьвет* 179 *сьветкі* 181 *сэрца* 206, 207, 233, 238 *сэрцэмъ* 206 *-ся* 180, 238 *сябар* 141 *сябёр* 141 *сядзіш* 164 *сядло* 101 *сяло* 153, 177 *сярдзіты* 176, 207 *сярпа* 152 *сярэбро* 119 *сястра* 154, 163, 177 *сясцёр* 177

таварыства 176 *таварыш* 176 *тажъком* 226 *танцаваць* 232 *танцуваці* 232 *тарпа* 118 *таўкач* 219 *тёмны* 151 *тиотка* 154 *тлустасць* 102 *тлусты* 66, 102 *тнуць* 224 *Тодар* 220 *той* 167 *толк* 125 *торп* 118, 221 *торф* 221 *тоўстасць* 102 *тоўсты* 66, 102 *трасу* 140 *трасца* 139 *трывога* 217 *трымаць* 65 *трэсці* 140 *Тураў* 186, 187 *Турава* 186 *тый* 167 *Тышкевич* 193

тьвет 93 *тьелятника* 226

у(-) 187, 188 *у імя* 187 *у руцэ і ўсё* 188 *у школу* 188 *увесь* 30, 99, 211 *(у)волторник* 219 *уге* 136 *уго* 136 *удава* 187 *уезджати* 231 *уездж*ваць 231 *ужо* 136, 153, 187, 210, 212 *ужэ* 136 *узаемны* 210 *(у)зруб* 186 *узяўшы* 219 *уласцівы* 188 *уліваць* 211 *унук* 30, 211 *упапярок* 203 *уперад* 155 *ураджай* 211, 230, 232 *уражай* 230 *уродзай* 65 *усь* 216 *усяго* 212 *уфъ* 133 *уцерла* 152 *уцёр* 152

ў 188 *ўдавы* 187

факт 221 *фалити* 221 *фасоль* 221 *фасоля* 221, 223 *Федоровичъ* 221 *Фёдар* 220 *фігура* 221 *фороба* 221 *фост* 221 *фуфайка* 221

хаваў 234 *хавоў* 234 *хаджаін* 230 *хадзяін* 230 *хаўрус* 186 *хацеў* 163 *хвакт* 221 *хваліць* 221 *хвароба* 221 *Хведар* 220 *хвороба* 221 *хвост* 221 *хеўра* 186, 193 *хисторий* 133 *хітры* 176 *хіцёр* 176 *хлеў* 153 *хлёў* 153 *хлопец* 118 *хмурны* 115 *Ходор(ъ)* 220, 221 *хотелъ* 163 *храберъ* 174 *храбр-* 118 *хрэст* 153 *хто* 122, 177 *хэўра* 193

цапаві(д)ла 101 *цареставъ* 174 *царква* 91 *царстваў* 174 *царэўна* 151, 190 *цвет* 93, 204 *цвёрды* 151, 155, 224 *целы* 229 *церпёны* 153 *церці* 119 *цешча* 156 *цёмнум* 232 *цёмны* 151, 172, 189, 190 *цётак* 174 *цётка* 174 *цёшча* 156 *ціхі* 223 *Цна* 122 *цорны* 62 *цурка* 146 *цэлы* 91, 229 *цэрков* 233 *цябе* 226 *цяжкі* 226 *цялятніка* 226 *цяляціна* 147, 227 *цялячы* 147 *цялячына* 146 *цяпер* 156, 203 *цярпець* 95 *цярплю* 95 *цяць* 224

чало 149 *чарнець* 154 *час* 147 *чатырох* 203 *чатыры* 164 *чацвер* 132, 155 *чацвёрты* 155 *чацвярга* 132, 155 *чацьверты* 155 *четверкъ* 133, 182 *член* 151 *човен* 220 *чоло* 249 *чорны* 62, 151, 154, 155 *чорствы* 152 *чоўна* 220 *чырвоны* 239 *чыстум* 232 *чысьлѣ* 179 *чытаў* 218 *чэрап* 116, 127 *чэрнь* 154 *чэрствы* 152 *чэрэз* 233

шавец 122, 174 *шалом* 117 *шасты* 128 *шаўца* 174 *швец* 174 *шинкарте* 226 *шкерыць* 91 *шкло* 122 *шолудзі* 155 *шост* 128, 151 *шосты* 128 *шоўк* 125 *што* 177, 178 *шчавей* 96 *шчака* 129 *шчасліывым* 176 *шчасце* 176, 198 *шчаўе* 96 *шчокі* 129 *шчэрыць* 92 *шынкарка* 226 *шэстнадцать* 233 *шэсць* 128, 129

щадкум 232

-ьство 218

юны 239 *Юрьевичъ* 203

я [j] апраўдваю 188 *яблык* 217 *яблына/я* 118 *явар* 123, 131 *явга* 128 *явья* 128 *явя* 128 *яга* 100 *яго* 134, 213 *ягонь* 213 *ядваб* 212 *яец* 209 *яечня* 178 *яешня* 178 *яйка* 100 *яйцо* 100 *яна* 213 *яна [j]дзе* 188 *яно* 213 *ярмолка* 218 *Яфім* 221 *яшчэ* 153

Беларускія словы лацініцаю

czetwer 132 *czetyroch* 203

Drahaczyn 134

henwara 203 *Homia* 96, 134 *Hrehore* 134

Mogilew 154 *Mohylowskiego* 154

Nograt 182

odolew 219

w Wowtorok 219 *Withawdus* 182 *Withawt* 182

znasou 146

Беларускія словы арабскім пісьмом

t(u)rū/ōbi 187 *t(u)rū/ōb(i)ja* 187 *wāntīt* 139

Беларускія словы цюркска-арабскім пісьмом

ʾābāčiw θaradina 219 *ʾabǯaθ* 227 *ʾānyawl* 154

būh 134

θarcūm 207

čūmu 154

dūhūt 154 *dūwhū* 125 *dūžč* 138

fārṭūnu 220 *frāṣunūq* 220

hraḥ 134

kwarḥu 179, 192

liǯbi 182

māṭki 193

nabyawṣā 154 *nāwčūniḥ* 211

pakalnūhū 193 *pāmati* 163 *pismw* 179 *priūl* 154 *prwzbā* 182

qwarḥu 192

raḍāc 163

ṣarcaḥ 206

vāchtāch 177

walikiy 193 *wāṣ* 179 *wwačur* 163 *wžū* 187

yahū 134 *yāyac* 209

žẓ̌at 138

Беларускія словы габрайскім пісьмом

ʾlqnyq 211 *ʾwlkynyqy* 211

brsṭ"y 226 *bukhʾv* 191 *bwh* 134 *byʾ* 219 *byl* 219

dʾhylnʾwwʾ 134, 219

hʾrʾdnʾ 31 *homjw* 96 *hwrnwstyywwycʾ* 119

kwrwpkʾ 182

lyoʾxqīm 131

mʾhlʿww 134 *mʿdnycʾ* 191

nʾwwʾrdʾk 134 *nʾwwyhwrwdk* 134 *nyʿmn* 179 *nʿš/swwyz* 58, 182

rʿzwy 219

ṭʿbyʾ 226

wnntyt 139 *wwʾlqnyq* 211 *wwylqʾnyq* 211 *wwntyt* 139 *wwytʿpsq* 182 *wyṭwld* 182 *wyṭwlṭ* 182

yʿhʾ 134

zš/sywwʾl 219

Паказальнік сегментаў

Першая лічба паказвае раздзел; нумар змены пастаўлены ў дужках.

a 5 (7, 15, 16, 20, 21, 25, 27, 31); 6 (37); 7 (45, 49); 8
ā 5 (7, 11)
aw 5 (10); 7 (49); 8
b 4.1; 5 (3, 26, 29); 7 (42, 47); 8

b̄ 5 (25)
b' 5 (15, 16, 18, 23, 26, 29); 7 (46); 8
b̄' 5 (25, 32)
c 6 (38); 7 (43); 8
c̄ 5 (25); 6 (38)
c' 5 (1, 4, 15, 16, 17, 34); 6 (38); 7 (43, 46); 8
c̄' 5 (32, 34); 6 (38); 8
č 6 (34, 36); 8
č̄ 5 (25, 34); 6 (36)
č' 5 (1, 3, 12, 15, 16, 17, 18, 25, 34); 6 (36); 7 (43); 8
č̄' 5 (32, 34); 6 (36); 8
d 4.1; 5 (5, 25, 26); 7 (44); 8
d̄ 5 (25)
d' 5 (15, 16, 18, 23, 25, 26, 34); 7 (43)
d̄' 5 (25, 32)
e 5 (7, 12, 15, 18, 19, 20, 21, 25, 27, 29, 31, 33, 34); 7 (46); 8
ę 5 (2, 4, 15, 16, 20); 8
ęa 4.1; 5 (1, 7, 12, 19)
ęā (*ęě*) 4.1; 5 (1, 7, 11, 12, 16, 18, 20); 8
ęal 5 (8)
ęar 5 (8)
f 7 (42); 8
f' 7 (42); 8
f̄' 5 (25); 7 (42)
g 4.1; 5 (1, 4, 5, 13, 16, 30); 6 (39); 7 (44); 8
g' 5 (25, 30); 6 (39); 8
γ 5 (13, 30); 6 (37, 39); 8
γ' 5 (30); 6 (39); 7 (46)
i 4.1; 5 (1, 4, 7, 9,10, 22, 27, 28, 31); 6 (35); 7 (40, 51); 8
ī 4.1; 5 (1, 4, 11)
i͡e 5 (19, 20); 7 (47, 50); 8
j 4.1; 5 (3, 9, 12, 16, 18, 28, 32); 6 (35, 37); 8
k 4.1; 5 (1, 4, 5, 13, 16, 25, 30); 7 (42); 8
k' 5 (25, 30); 7 (46)
l 4.1; 5 (9, 10, 25, 27); 7 (40, 41, 48); 8
l' 5 (3, 15, 16, 18, 23); 7 (46, 48); 8
l̄' 5 (25, 32)
m 4.1; 5 (3, 27, 29); 7 (47); 8

m̄ 5 (25)
mʾ 5 (15, 16, 18, 23, 29); 7 (46); 8
m̄ʾ 5 (32)
n 4.1; 5 (25); 8
n̄ 5 (25); 8
nʾ 5 (3, 15, 16, 18, 23); 7 (46); 8
n̄ʾ 5 (25, 32)
o (*ë*) 5 (7, 9, 12, 16, 18, 19, 20, 21, 25, 27, 29, 31, 33, 34); 6 (37); 7 (45, 49); 8
o̧ 5 (2, 15)
o͡a 4.1; 5 (7, 19)
o͡ā 4.1; 5 (7, 11)
o͡al 5 (8)
o͡ar 5 (8)
ow 5 (10); 7 (49); 8
ōw 7 (49)
p 4.1; 5 (3, 29); 7 (42, 47); 8
p̄ 5 (25)
pʾ 5 (15, 16, 18, 23, 29); 7 (46); 8
p̄ʾ 5 (25, 32)
r 4.1; 5 (9, 27, 33); 7 (40); 8
r̄ 5 (32, 33)
rʾ 5 (3, 15, 16, 18, 23, 33); 8
r̄ʾ 5 (32, 33)
s 4.1; 5 (25, 34); 8
s̄ 5 (25)
sʾ 5 (1, 4, 15, 16, 17, 18, 23, 25, 34); 7 (46); 8
s̄ʾ 5 (25, 32); 8
š 5 (34); 8
s̄̌ 5 (34)
šʾ 5 (1, 3, 12, 15, 16, 17, 18, 25, 34); 8
s̄̌ʾ 5 (32, 34); 8
t 4.1; 5 (5, 25); 8
t̄ 5 (25)
tʾ 5 (15, 16, 18, 23, 25, 34); 7 (43)
t̄ʾ 5 (25, 32)
u 4.1; 5 (4, 9, 15, 16, 28, 29); 6 (35, 37); 7 (45, 47, 51); 8
ū$_1$ 4.1; 5 (4, 6, 11, 22); 6 (37)
ū$_2$ 4.1; 5 (4, 6, 11); 6 (37)

ꙋо 5 (16, 19, 20); 6 (37); 7 (47, 50); 8
v 5 (1, 22, 28); 6 (37); 7 (41); 8
v' 5 (18, 28); 7 (46)
v̄ 5 (32)
w 4.1; 5 (3, 10, 25, 28, 29); 7 (41, 51); 8
w' 5 (15, 16, 23, 28, 29, 32)
x 4.1; 5 (1, 4, 13, 16, 25, 30); 7 (42); 8
x' 5 (30); 7 (46)
y 5 (9, 21, 22, 29); 6 (35); 7 (40, 47); 8
ȳ 5 (6, 11, 16)
z 4.1; 5 (25, 26); 7 (44); 8
z̄ 5 (25)
z' 5 (13, 14, 15, 16, 17, 18, 23, 25, 26); 7 (46); 8
z̄' 5 (32)
ž 5 (34); 7 (44); 8
ž̄ 5 (25, 34)
ž' 5 (1, 3, 12, 13, 14, 15, 16, 17, 18, 25, 26, 34); 7 (44); 8
ž̄' 5 (32, 34); 8
ʒ 7 (42, 44); 8
ʒ̄ 5 (25)
ʒ' 5 (1, 4, 13, 14, 17); 7 (43, 44); 8
ʒ̄' 5 (25); 7 (43)
ǯ 5 (34); 7 (42, 44); 8
ǯ' 5 (1, 3, 12, 14, 15, 16, 17, 18, 26, 34); 7 (44); 8
ǯ̄' 5 (32, 34)
ь 5 (9, 10, 16, 18, 19, 21, 24, 27, 29); 7 (40); 8
ъ 5 (9, 10, 16, 18, 19, 21, 24, 27); 7 (40); 8

Навуковае выданне

Вэкслер Пол

Гістарычная фаналогія беларускае мовы

Каардынатар праекту Юрась Бушлякоў
Рэдактар Уладзімір Маруцік
Карэктар Настасся Мацяш

Падпісана да друку 23.08.2004. Фармат 62x84 1/16.
Гарнітура Times. Афсетны друк. Папера афсетная.
Ум.-друк. арк. 17. Ул.-выд. арк. 16,2.
Наклад 500 асобнікаў. Замова №

Выдавец І. П. Логвінаў.
220050, г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 19-5
Ліцэнзія 02330/013307
ад 30.04.04 (№321) Міністэрства інфармацыі РБ



ПОЛ ВЭКСЛЕР (Paul Wexler) нарадзіўся ў 1938 г. у Філадэльфіі, скончыў Ельскі і Калумбійскі універсітэты. З 1969 г. выкладае на лінгвістычным факультэце Тэль-Авіўскага універсітэта. У полі навуковых зацікаўленняў — славянскае і габрайскае моўнаўства, гістарычная лінгвістыка, праблемы білінгвізму. Аўтар 13 кніг.

Асноўныя манаграфіі

Пурызм і мова. Даследаванне сучаснага ўкраінскага і беларускага нацыяналізму (1840—1967)
Purism and language. A study in Modern Ukrainian and Belorussian nationalism (1840—1967) 1974

Даследаванні ў галіне габрайска-славянскага моўнаўства
Explorations in Judeo-Slavic linguistics 1987

Ідыш — 15-ая славянская мова
Yiddish — the 15th Slavic language 1991

Ашкеназійскія габраі:
славяна-цюркі ў пошуках габрайскай ідэнтычнасці
The Ashkenazic Jews: A Slavo-Turkic people in search of a Jewish identity 1993

Негабрайскія пачаткі сефардыйскіх габраяў
The non-Jewish origins of the Sephardic Jews 1996

Двухроўневая рэлексіфікацыя ў ідышы
(габраі, сербалужычане, хазары і кіеўска-палескі дыялект
Two-tiered relexification in Yiddish
(Jews, Sorbs, Khazars and the Kiev-Polessian dialect) 2002

ISBN 985-6701-41-4
9 789856 701415